МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Беларускі нацыянальны
тэхнічны ўніверсітэт

Кафедра “Гісторыя, сусветная і айчынная культура”

К.І. Баландзін
Дз.М. Хромчанка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

*Дапаможнік*

Мінск
БНТУ
2015

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Кафедра “Гісторыя, сусветная і айчынная культура”

К.І. Баландзін
Дз.М. Хромчанка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Дапаможнік
для студэнтаў спецыяльнасцей тэхнічнага
і тэхналагічнага профіляў адукацыі

Пад рэдакцыяй У.А. Бажанава

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб’яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў па гуманітарнай адукацыі*

Мінск
БНТУ
2015

УДК 94(476)(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я7
Б20

Р э ц э н з е н т ы :
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры
"Гісторыя і беларусазнаўства" Мінскага дзяржаўнага
лінгвістычнага ўніверсітэта *С.Я. Новікаў;*

кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры
"Гісторыя Беларусі" Беларускага дзяржаўнага педагагічнага
ўніверсітэта імя Максіма Танка *В.П. Паўлоўская*

**Баландзін, К.І.**

Б20 Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі : дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасцей тэхнічнага і тэхналагічнага профіляў адукацыі / К.І. Баландзін, Дз.М. Хромчанка ; пад рэд. У.А. Бажанава. – Мінск : БНТУ, 2015. – 217 с.
ISBN 978-985-550-219-8.

У выданні на падставе аналізу гістарычнага матэрыялу, змешчанага ў метадычнай літаратуры, гістарычных даследаваннях, дакументальных крыніцах, у сціслым выглядзе падаецца сістэматызаваная гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён, прасочваюцца характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця беларускіх зямель у старажытнасці, у перыяды ўваходжання ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, Рэчы Паспалітай, Расійскай дзяржавы, у савецкі час, на этапе станаўлення самастойнай беларускай дзяржавы.

Для студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ, шырокага кола чытачоў, якія цікавяцца айчыннай гісторыяй.

**УДК 94(476)(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)я7**

**ISBN 978-985-550-219-8**

© Баландзін К.І.,
Хромчанка Дз.М., 2015
© Беларускі нацыянальны
тэхнічны ўніверсітэт, 2015

# Да чытача

Вучэбны дапаможнік прадстаўляе сабой спробу ў сціслым выглядзе выкласці гісторыю Беларусі з элементамі сусветнай гісторыі са старажытных часоў да нашых дзён. Аўтары ставілі перад сабою мэту, з аднаго боку, пазбегнуць спрошчанага падыходу да асвятлення найважнейшых гістарычных падзей, з другога, па магчымасці, не перанасычваць дапаможнік часам другараднымі фактамі, датамі, зрабіць яго больш зразумелым для чытача і ў той жа час прывесці матэрыял у адпаведнасць з Праграмай па гісторыі Беларусі, рэкамендаванай Міністэрствам адукацыі РБ для вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Структура вучэбнага дапаможніка грунтуецца галоўным чынам на праблемна-храналагічным метадзе вывучэння гісторыі і разлічана на студэнтаў усіх спецыяльнасцяў, а таксама на тых, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй.

Аўтары спадзяюцца, што матэрыялы кнігі “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі” дапамогуць студэнтам знайсці адказы на хвалюючыя пытанні, сістэматызаваць атрыманыя раней гістарычныя веды, глыбей пазнаёміцца з асноўнымі падзеямі айчыннай гісторыі.

## Тэма 1. Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі”

*1.1. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі. Перыядызацыя гісторыі Беларусі.*
*1.2. Крыніцы і гістарыяграфія.*

### 1.1. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі. Перыядызацыя гісторыі Беларусі

Як толькі людзі навучыліся гаварыць, яны пачалі расказваць гісторыі з мінулага. Але гэта былі толькі папулярныя аповеды. Вытокі ж гісторыі як навукі адносяцца да перыяду старажытных цывілізацый. Першыя працы па гісторыі тых ці іншых дзяржаў пачалі ствараццa яшчэ ў глыбіні тысячагоддзяў: у старажытнай Грэцыі Герадотам, Фукідзідам, Рыме – Цітам Лівіем, Палібіем, Кітаі – Сыма Цянем і іншымі. Тады ж вызначыліся і задачы гісторыі як навукі, якая вывучае працэс развіцця чалавечага грамадства ва ўсёй яго канкрэтнасці і разнастайнасці. Важна зразумець гэтае мінулае з усімі яго супярэчнасцямі і дасягненнямі. У гісторыі, дарэчы, як і сёння, побач стаяць праяўленні духа і баязлівасці, гераізму і здрадніцтва. Разуменне гісторыі – гэта разуменне шмат якіх прычынна-выніковых сувязяў мінулых гадоў і сучаснага жыцця. Яна таксама дае магчымасць прагназіравання будучага на аснове законаў развіцця чалавецтва.

Задачамі гісторыі Беларусі з’яўляецца вывучэнне заканамернасцяў і рэгіянальных асаблівасцяў развіцця беларускага народа ва ўзаемасувязі з іншымі народамі і краінамі, розных бакоў яго дзяржаўна-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай жыццядзейнасці. Гэта самастойная інтэгратыўная дысцыпліна, якая займае важнае месца ў сістэме гуманітарных навук. Яна, у сваю чаргу, абапіраецца на такія навукі, як археалогія, этнаграфія, паліталогія, эканамічная тэорыя і іншыя. Кожная з іх таксама пазнае праблемы гісторыі, але праз прызму сваёй спецыфікі, сваімі метадамі, што дазваляе больш глыбока высвеціць свой прадмет. Такім чынам, гісторыя, з аднаго боку, узбагачае іншыя навукі гістарычнымі фактамі і аналізам, з другога, карыстаецца іх

дасягненнямі для больш поўнага раскрыцця гістарычнага працэсу ва ўсёй яго шматбаковасці.

Кожны народ імкнецца ведаць сваю гісторыю, свае гістарычныя карані. Гэта неабходна, каб адчуваць не толькі сувязь часоў, але і каб выкарыстоўваць гістарычны вопыт, не паўтараць памылак, а браць з мінулага ўрокі, неабходныя для вырашэння сучасных праблем. Гістарычныя веды з’яўляюцца важным фактарам развіцця нацыянальнай самасвядомасці людзей, асновай фарміравання маральна-этычных і патрыятычных асноў грамадства. Увогуле, нельга ўявіць сабе цывілізаванага чалавека, а тым больш, грамадзяніна той ці іншай краіны, які б не ведаў гісторыю сваёй Айчыны. Ва ўсім свеце назіраецца ўстойлівая цікавасць не толькі да мінулага насельнікаў пэўнага рэгіёна, але і імкненне максімальна і беражліва захаваць сваю гістарычную спадчыну – як матэрыяльную, так і духоўную. Гэты факт з’яўляецца аксіёмай, паказчыкам цывілізаванасці. У наш час фактычна ўсюды гістарычнае бяспамяцтва лічыцца вялікай заганай, непаўнацэннасцю.

Беларускі народ мае багатую гістарычную спадчыну. У апошнія дзесяцігоддзі цікавасць да гісторыі значна ўзрасла, яна падаецца больш разнастайна, перш за ўсё, праз дзейнасць людзей, гістарычных асоб. Іншымі словамі, яна набыла чалавечы воблік замест гісторыі сацыяльных канфліктаў. Павышаны інтарэс да гісторыі выкліканы аб’ектыўнымі фактарамі. Ідзе пабудова самастойнай дэмакратычнай беларускай дзяржавы. Зразумела, гэта патрабуе больш грунтоўнага вывучэння яе мінулага. Аднаўляюцца гістарычныя помнікі, адгортваюцца новыя старонкі гісторыі, што не можа не вызваць зацікаўленасці. Але ўсё гэта падаецца больш аб’ектыўна, у адрозненне ад, напрыклад, дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя, таму і цікавасць стала больш ураўнаважанай, без налёта сэнсацыйнасці.

Паколькі Беларусь не толькі па геаграфічнаму месцазнаходжанню, але і па свайму геапалітычнаму становішчу знаходзіцца ў цэнтры ўвагі іншых дзяржаў, яе гісторыя таксама цесна звязана з іх гісторыяй, выяўляецца нямала агульнага: прыкладна аднолькавыя з улікам рэгіянальных асаблівасцяў і храналагічных рамак этапы развіцця форм дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця. З гэтага вынікае, што галоўным метадам у яе вывучэнні становіцца параўнальна-

гістарычны метад, хаця выкарыстоўваюцца таксама статыстычны, структурна-функцыянальны і іншыя. Усе яны ўзаемазвязаны паміж сабою, дапаўняюць адзін аднаго і таму выкарыстоўваюцца ў розных спалучэннях. Але, з другога боку, выяўляюцца і метадалагічныя складанасці, звязаныя з тым, што беларускія землі на працягу стагоддзяў з'яўляліся асновай або часткай розных дзяржаўных утварэнняў, а дзяржаўныя межы Беларусі не заўсёды супадаюць з этнічнай беларускай тэрыторыяй.

Задачы па вывучэнні гісторыі Беларусі ў шырокім сэнсе вынікаюць з сацыяльных функцый гісторыі.

Гэта, перш за ўсё, пазнавальная функцыя. Увесь змест курса спрыяе пашырэнню ведаў аб мінулым нашай краіны, інтэлектуальнаму развіццю асобы, пашырэнню яе светапогляду.

Не менш важнай з'яўляецца выхаваўчая функцыя. Вывучэнне, веданне гісторыі Беларусі дапамагае выпрацаваць грамадзянскую пазіцыю, выхаваць павагу і любоў да свайго края і народа, з'яўляецца важным фактарам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці людзей..

Трэцяя функцыя – прагнастычная, або прыкладная. Яна заключаецца ў выяўленні не толькі заканамернасцяў, але і тэндэнцый гістарычнага развіцця, па-першае, каб не паўтараць памылак мінулага або, наадварот, выкарыстаць у практычных мэтах станоўчы вопыт продкаў; па-другое, дазваляе даследаваць не толькі адзін шлях развіцця, але і іншыя, каб выпрацаваць на будучае найбольш аптымальныя.

Усе гэтыя функцыі ўзаемазвязаныя, яны дапаўняюць адна другую.

Гісторыя Беларусі падзяляецца на пэўныя перыяды. Тым не менш, існуе праблема яе перыядызацыі. Яна вынікае, перш за ўсё, з вызначэння крытэрыяў, па якім можна выдзяляць тыя ці іншыя этапы ў развіцці грамадства.

Доўгі час у савецкай гістарычнай навуцы дамінíраваў фармацыйны падыход да перыядызацыі гісторыі, які ў цэнтр увагі ставіў стан вытворчасці, вытворчыя адносіны як аснову фарміравання гістарычных супонасцей людзей. Яго абгрунтавалі К. Маркс, Ф. Энгельс і творча пашырыў У.І. Ленін. Сутнасць фармацыйнай канцэпцыі ў тым, што гістарычны працэс вызначаецца развіццём вытворчых сіл. Калі ж яны пачынаюць

супрацьстаяць вытворчым адносінам, то пачынаецца змена грамадска-эканамічных фармацый. Згодна з гэтым былі вызначаны наступныя фармацыі, якія адпавядаюць пэўным этапам грамадскага развіцця: першабытнаабшчынны лад, рабаўладальніцкі, феадалізм, капіталізм, сацыялізм і ў перспектыве – камунізм. Гэтая канцэпцыя зыходзіць з прынцыпаў адзінага, заканамернага і прагрэсіўнага гістарычнага працэсу, дынаміку развіцця якога вызначае вытворчая сфера. Як бачым, яна адлюстроўвае адналінейны характар гістарычнага развіцця. На самой справе, развіццё асобных краін не такое простае, тут магчыма бачыць і поспехі, і адступленні назад, пры гэтым вызначаецца яно не толькі працай. але і гістарычнымі асобамі, іх паводзінамі, асабліва ў экстрэмальных сітуацыях, духоўнай сферай.

Відавочна, што гэтая канцэпцыя больш адносіцца да ўсеагульнай гісторыі чалавецтва і не заўсёды яе можна прымяніць у адносінах да гісторыі асобных краін. Так, напрыклад, для Беларусі праблематычна развіццё рабаўладальніцкага ладу ў класічным выглядзе, ды і капіталізм не паспеў поўнасцю развіцца.

Сучасныя вучоныя, гісторыкі ўсё больш увагі надаюць цывілізацыйнаму падыходу да перыядызацыі гісторыі, асновы якой былі распрацаваны яшчэ ў XIX ст. амерыканскім антраполагам Л. Морганам і нямецкім вучоным Ф. Энгельсам, якія падзялілі працэс развіцця грамадства на наступныя этапы: дзікасць, варварства і цывілізацыя. Цывілізацыя характарызуецца пэўным узроўнем патрэбаў, здольнасцяў, ведаў чалавека, грамадскай свядомасці, культуры, тэхналагічным і эканамічным спосабамі вытворчасці, сістэмай палітычных і грамадскіх адносін,. Адпаведна і гісторыя грамадства, згодна з цывілізацыйным падыходам да яе перыядызацыі, падзяляцца на наступныя этапы: старажытны свет, сярэднявечча, новы і навейшы часы.

Такім чынам, цывілізацыйны падыход больш разнабаковы, у адрозненне ад фармацыйнага, ён у цэнтр увагі ставіць не толькі вытворчасць і вытворчыя адносіны, не толькі выцякаючыя з гэтага сацыяльныя канфлікты, але і самога чалавека, яго ролю ў гісторыі, развіццё палітычных інстытутаў, грамадскай свядомасці, культуру і інш. Ён можа быць ужываемы да гісторыі кожнай краіны або групы краін і арыентуе на пазнанне гісторыі як шматварыянтнага працэса. Згодна з гэтым і падыходы да перыядызацыі больш разнастайныя.

Напрыклад, прадстаўнікі цывілізацыйнага падыходу М. Данілеўскі, А. Тойнбі, О. Шпэнглер і іншыя зыходзілі з таго, што няма адзінага гістарычнага працэса, а ёсць развіццё асобных цывілізацый, якое носіць цыклічны характар і вызначаецца рэлігійнымі, культурнымі, палітычнымі, грамадска-эканамічнымі і іншымі фактарамі.

Раскрыццё заканамернасцяў і асаблівасцяў дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага, духоўнага развіцця беларускага народа менавіта з улікам цывілізацыйных характарыстык пакладзены аўтарамі ў аснову вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі”.

## 1.2. Крыніцы і гістарыяграфія

Звесткі аб мінулым нам даюць гістарычныя крыніцы, якія магчыма ўмоўна класіфікаваць наступным чынам: археалагічныя, этнаграфічныя, пісьмовыя, кіна-фота-фона-аўдыёдакументы, лінгвістычныя, вусныя і інш.

Археалагічныя крыніцы дазваляюць заглянуць у глыбіню вякоў, калі яшчэ не было пісьменнасці. Каштоўнасць іх таксама ў тым, што яны пастаянна абнаўляюцца, праводзяцца раскопкі, выяўляюцца новыя знаходкі. Недахопам жа з’яўляецца недакладнасць. На аснове археалагічных пошукаў мы не можам з дакладнасцю вызначыць, калі адбыліся тыя ці іншыя падзеі, вызначыць імёны ўдзельнікаў падзей і г.д.

Этнаграфічныя крыніцы, перш за ўсё, прадметы побыту, адзенне дазваляюць бліжэй пазнаёміцца з жыццём, гаспадарчай дзейнасцю, культурай нашых продкаў. Але яны таксама нясуць абмежаваную інфармацыю, паколькі раскрываюць у асноўным толькі бытавы бок жыцця людзей. Багаты матэрыял аб мінулым жыцці беларусаў дае вусная народная творчасць: прымаўкі, прыказкі, песні, быліны і г.д. Высветліць некаторыя бакі нашай гісторыі дапамагаюць таксама назвы мясцовасцяў, рэк, азёр, паселішчаў, моўныя рэгіянальныя асаблівасці.

Спецыфічную групу крыніц прадстаўляюць творы выяўленчага мастацтва, кіна-фота-фона-аўдыёдакументы. Яны даносяць да нас вобразы, галасы ўдзельнікаў падзей, тварцоў гісторыі, адлюстроўваюць імгненні гэтай гісторыі.

Асобнае месца займаюць пісьмовыя крыніцы. Гэта найбольш грунтоўная па зместу група дакументаў, якая дазваляе выявіць не толькі падзеі мінулага, але і іх удзельнікаў, вызначыць больш дакладна храналогію гэтых падзей. Гэта летапісы і хронікі, заканадаўчыя акты, статыстычныя матэрыялы, мемуары, літаратурныя і публіцыстычныя творы, матэрыялы перыядычнага друку. Адной з найбольш старажытных крыніц з'яўляецца "Аповесць мінулых гадоў", у якой змешчаны першыя згадкі аб плямёнах, жыўшых на тэрыторыі сучаснай Беларусі, гістарычных асобах і падзеях X–XII стст., каштоўныя звесткі мы таксама знаходзім у Лаўрэнцьеўскім, Іпацьеўскім, Радзівілаўскім летапісах і асабліва ў рэгіянальных летапісах, хроніках, такіх, як,«Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх», Беларуска-Літоўскі летапіс 1446 г., «Хроніка Вялікага княства Літоўскага, і Жамойцкага», «Хроніка Быхаўца», Баркулабаўскі летапіс XVI–XVII ст., які мае пэўныя рысы і дзённіка. У іх змешчаны дадзеныя аб княжацкіх дынастыях, палітычных падзеях, якія адбываліся ў межах Вялікага Княства Літоўскага, гаспадарцы ў асобных рэгіёнах. Шэраг матэрыялаў аб сярэднявечнай Беларусі даюць нямецкія і польскія хронікі. Сярод іх выдзяляюцца "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі" М. Стрыйкоўскага, створаная на аснове розных крыніц у сярэдзіне XVI ст.

Гістарычныя звесткі маюцца таксама ў юрыдычных, статыстычных дакументах, матэрыялах справаводства.

У XVI–XVII з'яўляюцца творы беларускіх філосафаў і публіцыстаў Ф. Скарыны, С. Буднага, П. Скаргі, І. Пацея, М. Літвіна, А. Рымшы і інш., у якіх адлюстраваны праблемы таго часу.

Шматлікую групу крыніц складаюць літаратурныя мастацкія, публіцыстычныя творы, пачынаючы са "Слоў" Кірылы Тураўскага, апісання жыццяў святых, напрыклад, Ефрасінні Полацкай і заканчваючы творамі паэтаў і празаікаў XX – пачатку XXI стст. Пазней важнае значэнне набыў перыядычны друк.

З XVI ст. вядома мемуарная літаратура, яна становіцца даволі папулярнай у наступныя стагоддзі. Адлюстроўваючы ў храналагічным парадку падзеі, аўтары мемуараў, дзённікаў (дыярыушаў) даволі выразна выказвалі свае асабістыя погляды на тыя ці іншыя падзеі, што надае ім суб'ектыўнае гучанне. Цікавая інфармацыя аб падзеях XVI–XVII стст. утрымліваецца ў

“Гістарычных запісках “ Ф. Еўлашоўскага, “Дыярыушы” А. Філіповіча, мемуарах Я. Пачобута-Адляніцкага, Я. Сапегі, дзённікавых запісах падарожнікаў, дыпламатаў У. Кокса, Ж. Жылібера і інш.

Адным з першых вучоных, якія пачалі сістэматызацыю гістарычных звестак, быў А. Нарушэвіч, які ў другой палове XVIII ст. падрыхтаваў шматтомную “Гісторыю польскага народа”. 9-томную “Гісторыю літоўскага народа” распрацаваў у першай палове XIX ст. Т. Нарбут. У гэтых творах змешчана нямала цікавых і важных звестак аб Вялікім Княстве Літоўскім, падзеях на беларускіх землях.

Значны ўклад ў заснаванне і развіццё беларускай гістарычнай навукі, крыніцазнаўства гісторыі Беларусі ўнеслі прафесары Віленскага ўніверсітэта І. Даніловіч, І. Лялевель і інш. І. Даніловіч прааналізаваў і часткова апублікаваў ў першай палове XIX ст. 2400 выяўленых ім крыніц па гісторыі Беларусі, у тым ліку Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 г., Беларуска-Літоўскі летапіс 1446 г. І. лялевель у сваіх працах раскрываў перш за ўсё гісторыю Літвы, Русі, а не толькі Польшчы, ён распрацаваў курс лекцый па крыніцазнаўству і гістарыяграфіі.

Пачынальнікам жа беларускай археаграфіі стаў І. Грыгаровіч, які сабраў значную колькасць статыстычных і іншых матэрыялаў, што дазволіла выдаць у 1824 г. зборнік «Белорусский архив древних грамот». Пазней пры яго непасрэдным удзелу быў выдадзены шматтомны зборнік дакументаў “Акты Заходняй Расіі”.

Адным з першых зрабіў спробу сістэматызаваць звесткі аб Беларусі В. Турчыновіч, які ў сярэдзіне XIX ст. падрыхтаваў даследаванне “Агляд гісторыі Беларусі са старажытнейшых часоў”. Значны ўклад у развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі ўнеслі браты Я. і К. Тышкевічы. Важнае значэнне для вывучэння гісторыі Беларусі маюць працы краязнаўцаў другой паловы XIX – пачатку XX стст. П. Шпілеўскага, А. Кіркора, П. Баброўскага, Е. Раманава, Я. Карскага, І. Насовіча, М. Нікіфароўскага і іншых. Яны зыходзілі з прызнання самастойнага беларускага этнасу, яго самабытнасці, багатай гістарычнай спадчыны. Вучоны і грамадскі дзеяч А. Кіркор напісаў асобны том, прысвечаны Беларусі, у шматтомным выданні “Живописная Россия”. Пісьменнік и этнограф П. Шпілеўскі займаўся вывучэннем беларускага фальклора, напісаў кнігу

“Падарожжа па Палессю і Беларускаму краю”. Вывучэннем народнага фальклору займаліся таксама П. Шэйн, Е. Раманаў, І. Насовіч. Е. Раманаў падрыхтаваў пяць тамоў “Беларускага зборніка”, дзе змешчаны казкі, прымаўкі, песні беларусаў. Я. Карскі вядомы сваёй трохтомнай працай “Беларусы”. Шмат звестак аб матэрыяльнай культуры беларусаў, их побыту, а таксама абрадах, звычаях змешчана ў даследаванні П. Баброўскага “Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния», выдадзеным у 1863 г.

Першым сістэмным дапаможнікам па вывучэнню гісторыі краю стала “Кароткая гісторыя Беларусі” В. Ластоўскага, якая была выдадзена ў 1910 г. у Вільні.

У савецкі час былі надрукаваны шматлікія зборнікі дакументаў, сярод іх двухтомная гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах (1936, 1940 гг.), зборнікі дакументаў па гісторыі Беларусі перыяду феадалізму, капіталізму, савецкага часу, партызанскаму і падпольнаму руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выдадзеныя у другой палове XX ст.

У гэты перыяд з’явіліся сотні навуковых прац па гісторыі Беларусі, пачалі выдавацца падручнікі і іншыя сістэмныя даследаванні.

Важнымі падзеямі ў гістарыяграфіі Беларусі сталі працы У. Ігнатоўскага “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі” і М. Доўнар-Запольскага “Гісторыя Беларусі”, падрыхтаваныя ў 1920-я гг., даследаванні беларускіх гісторыкаў 1920–1930-х гг. К. Кернажыцкага, У. Пічэты, В. Шчарбакова, А. Цвікевіча, Ф. Турука і іншых. Хаця ў іх нярэдка адчувалася ідэалагізацыя і палітызацыя, нягледзячы на тое, што некаторыя вучоныя былі рэпрэсіраваны, у цэлым жа менавіта на гэты час выпадае даволі актыўнае развіццё беларускай гістарычнай навукі, чаму нямала садзейнічалі дзяржаўная палітыка беларусізацыі, меры ўлады, накіраваныя на развіццё адукацыі і навукі.

У пасляваенны час значная ўвага беларускіх даследчыкаў была адведзена савецкаму перыяду гісторыі Беларусі, вывучэнню падзей, звязаных з Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыяй, рэвалюцыйным рухам на Беларусі, Вялікай Айчыннай вайной, хаця ў той жа час шмат прац было прысвечана і іншым праблемам і перыядам беларускай гісторыі. Паглыбленню і пашырэнню ведаў і

даследаванняў па айчыннай гісторыі садзейнічала і адносная дэмакратызацыя савецкага грамадства, якая пачалася з другой паловы 1950-х гг. Можна назваць дзесяткі імён беларускіх гісторыкаў, шырока вядомых не толькі ў сваёй краіне, але і далёка за яе межамі. Гэта Э.М. Загарульскі, І.М. Ігнаценка, А.П. Ігнаценка, Н.В. Каменская, А.П. П’янкоў, А.І. Залескі, Э.Р. Ёфэ, З.Ю. Капыскі, П.Ф. Лысенка, Я.Н. Мараш, В.П. Панюціч, П.Ц. Петрыкаў, С.М. Самбук, М.С. Сташкевіч, В.М. Фамін, Г.В. Штыхаў і іншыя.

У 1960–1980-я гг. апублікаваны абагульняючыя фундаментальныя працы: «История Белорусской ССР» у 2 тамах, чатырохтомная «История рабочего класса Белорусской ССР», пяцітомная “Гісторыя Беларускай ССР”, але ў іх большая частка матэрыялаў тычылася менавіта савецкага перыяду беларускай гісторыі.

Значны штуршок для павышэння цікавасці да гісторыі Беларусі і, як вынік, павялічвання колькасці публікацый даў пераход рэспублікі да самастойнай дзяржаўнасці і новае асэнсаванне гісторыі Бацькаўшчыны. У 90-я гады XX ст. і ў пачатку XXI ст. з’явілася вялікая колькасць публіцыстычных матэрыялаў, артыкулаў у перыядычным друку, матэрыялаў шматлікіх навуковых канферэнцый. Характэрна, што беларускія даследчыкі сталі больш увагі ўдзяляць старажытным перыядам гісторыі Беларусі. Гэтыя праблемы даследаваны ў працах Г.М. Сагановіча, А.К. Цітова, А.К. Краўцэвіча, М.І.Ермаловіча і інш. Але яны таксама не былі пазбаўлены элементаў суб’ектывізму, гэтак жа, як і ў шэрагу прац навукова-публіцыстычнага характару, якія выйшлі ў 1990- я гг., некаторыя падзеі і з'явы пададзены некалькі спрошчана, а часам з адценкам ідэалагізацыі, недастаткова навукова абгрунтаваны выкладанне гістарычных фактаў, дейнасць гістарычных асоб.

З цягам часу, у пачатку XXI ст., гістарычныя даследаванні становяцца больш дэталёвымі, ацэнкі больш узважанымі, палажэнні і вывады больш абгрунтаванымі. Адпаведна ў гістарычнай навуцы з’яўляецца цэлы шэраг новых імён беларускіх гісторыкаў. У бібліяграфічным даведніку “Гісторыкі Беларусі ў пачатку XXI ст.”, выдадзеным у 2007 г., змешчаны даныя на 457 вучоных, якія ўнеслі свой уклад у гістарычную навуку. Сярод іх такія вядомыя навукоўцы, як П.І. Брыгадзін, Г.Я. Галенчанка, А.А. Каваленя, М.П. Касцюк,Я.К. Новік, І.А. Саракавік,П.Г. Чыгрынаў, і іншыя.

Новыя гістарычныя умовы, пашырэнне кола гістарычных крыніц, даступных даследчыкам, магчымасцяў для даследаванняў, больш грунтоўнае і ўсебаковае асэнсаванне падзей і праблем патрабавалі і стварылі пэўныя ўмовы для падрыхтоўкі абагульняючых прац па гісторыі Беларусі. У 1994–1995 гг. выпускам выдання “Нарысы гісторыі Беларусі” у 2-х частках была зроблена першая спроба стварэння такой абагульняючай працы. У ёй многія праблемы, якія раней раскрываліся ў гістарычных працах, былі асэнсаваны з новых, часам небясспрэчных пазіцый.

У наступныя годы у Беларусі было выдадзена значная колькасць у пэўным сэнсе абагульняючых прац – падручнікаў па гісторыі Беларусі. Сярод іх можна вызначыць «Историю Беларуси» у дзвюх частках пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля (1998 г.), “Историю Беларуси» у двух частках пад рэдакцыяй Я.І. Трашчанка, “Очерки истории Беларуси” П. Г. Чыгрынава і іншыя. Асаблівую цікавасць для нас прадстаўляюць падручнікі па гісторыі Беларусі, выдадзеныя ў апошнія гады. Іх аўтарамі з’яўляюцца І. А. Саракавік, А.І. Котаў, П. І. Брыгадзін і інш.

Каштоўнымі крыніцамі з’яўляюцца 6-томная “Энцыклапедыя гісторыі Беларусі”, якая выдадзена ў 1993–2003 гг., 6-томнае выданне “Гісторыя Беларусі”, якое друкавалася з 2000 г. і завершана да 2010 г., 18-томнае выданне “Беларуская энцыклапедыя”, апошні том якога выйшаў у свет у 2005 г..

## Тэма 2. Фарміраванне беларускага этнасу (VI ст. – пачатак XX ст.)

*2.1. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель.Славянскі этап засялення Беларусі.*

*2.2. Фарміраванне беларускага этнасу ў XIV– XVIII стст.*

*2.3. Далейшае развіццё беларускага этнасу ва ўмовах складвання рынкавых адносін у XIXст.*

*2.4. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX – XIX стст.*

### 2.1. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель. Славянскі этап засялення Беларусі.

Чалавек з’явіўся на Зямлі звыш 2 мільёнаў гадоў назад у Афрыцы. Існуе некалькі версій і гіпотэз па пытанню яго паходжання: ад біблейскай міфалогіі або мутацыі асобных відаў малпаў у выніку рэзкага павышэння ўзроўню радыяцыі да эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна і уфалагічнай канцэпцыі. Каля мільёна гадоў назад людзі пачалі рассяляцца на еўрапейскім кантыненце і ў прамежку ад 100 да 40 тысяч гадоў, у перыяд сярэдняга палеаліта, яны з’явіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Аб гэтым сведчаць находкі каменных прылад працы каля вёсак Абідавічы Быхаўскага раёна і Клеявічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Можна дапусціць больш ранняе засяленне чалавекам гэтай мясцовасці, але ўсе магчымыя сляды знішчаны ледавікамі. Вядомы некалькі найбольш буйных абледзяненняў, якія закранулі рэгіён сучаснай Беларусі: Бярэзінскае, Дняпроўскае, Паазёрскае, апошняе адбылося 95–14 тысяч гадоў назад і пашырылася толькі на паўночную і часткова цэнтральную часткі Беларусі..

Першыя насельнікі былі неандэртальцамі. Галоўнымі іх заняткамі былі паляванне і збіральніцтва. У гэты час людзі ўжо маглі здабываць агонь, рабіць каменныя прылады працы. Жылі яны мацярынска-родавымі абшчынамі. У пачатку верхняга палеаліта (40–10 тыс. гадоў да нашай эры), калі ўжо адступілі ледавікі і палепшыліся ўмовы жыцця, на змену неандэртальцам прыйшлі людзі сучаснага тыпу – краманьёнцы. Яны ўжо выраблялі больш складаныя прылады працы. На тэрыторыі Гомельшчыны, каля вёсак

Юравічы Калінкавічскага і Бердыж Чачэрскага раёнаў адкрыты і даследаваны рэшткі дзвюх познепалеалітычных стаянак чалавека, узрост якіх датуецца 26–24 тысячамі гадоў назад. У перыяд сярэднякаменнага веку – мезаліта (прыкладна 9–5 тыс. гадоў да нашай эры) пачалося больш масавае засяленне тэрыторыі Беларусі. Людзі асвоілі больш дасканалыя спосабы апрацоўкі крэмню: рэтушыраванне вострых краёў, вырабы з дапамогай мікралітаў, гэта значыць, невялікіх вострых асколкаў камней, складаныя прылады працы. Былі вынайдзены лук і стрэлы, што зрабіла больш эфектыўным паляванне на звяроў, човен і рыбалоўныя сеткі. Родавыя абшчыны аб’ядноўваліся ў больш буйныя тэрытарыяльныя ўтварэнні – плямёны. Археалагічныя раскопкі дазваляюць ужо вызначыць некаторыя асаблівасці розных рэгіёнаў, або археалагічныя культуры гэтага часу. Гэта плямёны грэнскай і днепра-дзіснянскай археалагічных культур на ўсходзе і паўднёвым усходзе Беларусі, свідэрскай, затым нёманскай на захадзе. Яны адрозніваюцца, галоўным чынам, формай наканечнікаў стрэл.

На заключным этапе каменнага века – неаліце (5–3 тыс. гадоў да нашай эры) у найбольш спрыяльных для жыцця чалавека рэгіёнах, Егіпце і Месапатаміі, некалькі пазней, у Індыі і Кітаі людзі ўжо стварылі першыя цывілізацыі, галоўнымі прыкметамі якіх былі з’яўленне дзяржаўнасці, пісьменнасці, каменнага будаўніцтва, развітай рэлігіі і міфалогіі.

Неалітычнае грамадства Еўропы знаходзілася на больш нізкай ступені свайго развіцця. Яно не стварыла цывілізацыі. Але, тым не менш, назіраецца значны прагрэс у развіцці вытворчых сіл і вытворчых адносін, які затым атрымаў назву “неалітычная рэвалюцыя”. Ён заключаецца, перш за ўсё, у развіцці земляробства і жывёлагадоўлі, прадзення і ткацтва, вытворчасці керамікі, больш дасканалай апрацоўцы крэмню шляхам шліфоўкі і свідравання, зараджэнні рамяства і прымітыўнага гандлю. Яркім прыкладам апошняга з’яўляюцца неалітычныя шахты каля пасёлка Краснасельскі Ваўкавыскага раёна, дзе здабываўся крэмень. Побач былі адкрыты майстэрні па апрацоўцы крэмню, аб’ёмы вытворчасці якіх значна перавышалі патрэбы мясцовых плямён. Гэтыя шахты глыбінёй да 2–3 метраў, якіх налічвалася некалькі дзесяткаў, і майстэрні функцыяніравалі каля тысячы гадоў.

На змену прысвойваючай гаспадаркі, калі асноўнай крыніцай забеспячэння жыццяздольнасці насельніцтва было выкарыстанне гатовых дароў прыроды шляхам збіральніцтва, палявання на звяроў і лоўлі рыбы, у перыяд неаліту прыходзіць вытворчая гаспадарка. Людзі сталі весці больш аседлы вобраз жыцця. Яны ахатнілі жывёл: коней, свіней, птушку, распрацоўвалі палі, сеялі жыта і іншыя сельскагаспадарчыя культуры, навучыліся ткаць і вырабляць з тканін адзенне. У перыяд неаліта на тэрыторыі Беларусі ўжо вызначана больш за 600 стаянак першабытных людзей, галоўным чынам, у басейнах рэк Прыпяць, Сож, Нёман. Па форме посуду (вострадонныя, кругладонныя), арнаменту археолагі вызначаюць наступныя культуры гэтага перыяду: нёманскую на захадзе, днепрадонецкую на поўдні, верхнедняпроўскую на ўсходзе і днепрадзвінскую на поўначы. Даныя антрапалогіі, гідранімікі (старажытныя назвы рэк і азёр) дазваляюць зрабіць вывад, што прыкладна з V тысячагоддзя да нашай эры на паўночным усходзе сучаснай Беларусі пражывалі фіна-ўгорскія плямёны (культура ямачна-грабенчатай керамікі). Этнічную прыналежнасць насельніцтва іншых рэгіёнаў вызначыць да гэтага часу пакуль што немагчыма.

Пераход да земляробства, будаўніцтва стацыянарнага жылля прывялі да аседласці, павялічвання абшчыны. Пачалося расслаенне ўнутры яе. Старэйшыя абшчыны, племянныя кіраўнікі паступова прысвойвалі сабе лепшыя землі, атрымануюваенную здабычу, усё больш распараджаліся абшчыннымі здабыткамі.

У эпоху каменнага века пачынаюць зараджацца элементы матэрыяльнай і духоўнай культуры: мастацтва, скульптура, рэлігія. На мезалітычных і неалітычных стаянках Беларусі знойдзена нямала вырабаў з косці, керамікі, пакрытых арнаментам, у тым ліку, сімвалічным. На паселішчах Юравічы ў Калінкавіцкім раёне, Асавец у Бешанковіцкім раёне знойдзены выявы чалавека на касцяных і каменных вырабах. Даволі распаўсюджаны знаходкі амулетаў, у тым ліку, з прасвідраваных зубоў мядзведзя, дзіка, касцяныя фігуркі жывёл, што сведчыць аб праявах фетышызму.

Прыкладна ў III і II тысячагоддзях да нашай эры, у эпоху бронзавага і жалезнага вякоў, калі адбылося так званае першае “вялікае перасяленне народаў” тэрыторыю сучаснай Беларусі пачалі засяляць індаеўрапейцы. Гэта вялікая група народнасцяў, якая стаяла на адносна высокай ступені развіцця, вяла паўаседлы вобраз

жыцця. Ёсць некалькі гіпотэз адносна прарадзімы індаеўрапейцаў: паўночнапрычарнаморская, балканская, але ў апошні час усё большую ўвагу даследчыкаў займае гіпотэза аб малаазіяцкім паходжанні індаеўрапейцай, абгрунтаваная вучонымі В. Іванавым і Т. Гамкрэлідзе. Частка індаеўрапейцаў (сябе гэтыя плямёны называлі “арыі”) у выніку міграцыі пастунова выйшла да пабярэжжа Каспійскага мора, ад іх затым сфарміраваліся народнасці іранцаў, таджыкаў.

Другая частка дайшла да берагоў Інда і далей. Гэтыя плямёны сталі заснавальнікамі індыйскай цывілізацыі.

Трэцяя група індаеўрапейцаў рухалася ў Еўропу. Менавіта яны, асіміліруючыся з аўтахтонным насельніцтвам, стварылі мікенскую культуру, папярэдніцу антычнай цывілізацыі, паклалі пачатак грэчаскай, італьянскай, германскай, славянскай, балцкай групам народаў. Адно з адгалінаванняў індаеўрапейцаў, балты, аселі на большай частцы сучаснай Беларусі і далучылі мясцовае насельніцтва да больш развітых форм вядзення гаспадаркі, сваёй мовы, культуры. Напрыклад, індаеўрапейцы ўжо карысталіся колавым транспартам, плугам. Яны былі носьбітамі археалагічнай культуры “баявых сякер” або шнуравой керамікі. Апошняя так названа таму, што пры абпальванні посуду на яго паверхні заставаліся адбіткі шнура, якім звязваліся вырабы. Ад гэтага часу засталася вялікая колькасць шліфаваных тапароў, якія, магчыма, мелі не толькі прыкладное, але і культавае значэнне. Асноўнымі заняткамі былі земляробства, жывёлагадоўля, паляванне і лоўля рыбы. Хаця прыход індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі супаў з бронзавым векам, але гэты метал тут ужываўся вельмі рэдка. Зброя, прылады працы па ранейшаму ў асноўным выраблялі з каменю, косці і дрэва. Выраблялі таксама кераміку, большай часткай пласкадонны посуд. Пазней, у сярэдні і позні перыяд бронзавага веку, індаеўрапейцы падзяліліся на шэраг асобных, хаця і роднасных паміж сабой культур. Акрамя плямён шнуравой керамікі Панямоння і Палесся, тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў арэал паўночнабеларускай, сярэднедняпроўскай, прыбалтыйскай, пазней шчацінецка-сосніцкай археалагічных культур, а ў канцы эпохі ў Беларусі з’яўляецца штрыхаваная кераміка.

З прыходам індаеўрапейцаў звязваецца і паступовая замена мацярынска-родавых адносін патрыярхальна-родавымі,

мацярынскага рода бацькоўскім. Асновай грамадскай арганізацыі, гаспадарчай ячэйкай становіцца патрыярхальная абшчына, якая складвалася з некалькіх пакаленняў бліжэйшых родзічаў па бацьку.

Балты пражывалі на тэрыторыі Беларусі на працягу дзвюх тысячагоддзяў У I тысячагоддзі большую частку тэрыторыі Беларусі засялялі балцкія плямёны днепра-дзвінскай археалагічнай культуры, культуры штрыхаванай керамікі (яна ахоплівала тэрыторыю сучаснай цэнтральнай і паўночна-заходняй Беларусі, пазней змянілася банцараўскай). На поўдні краіны распаўсюджваўся арэал мілаградскай культуры, якая паступова змянілася зарубінецкай і якая, як лічаць гісторыкі Л.Д. Побаль і інш., мела элементы славянскага ўплыву.

У гэты перыяд, які атрымаў назву жалезнага веку, адбываецца значны прагрэс у развіцці вытворчых сіл. Асновай гаспадаркі сталі земляробства і жывёлагадоўля. Удасканальваліся спосабы апрацоўкі глебы, пачало практыкавацца земляробства з прымяненнем рала. Усё гэта садзейнічала павялічванню вытворчасці прадуктаў харчавання, назапашванню матэрыяльных каштоўнасцяў, развіццю абмена, і, як вынік гэтага, з’яўленню асабістай уласнасці, маёмаснай няроўнасці. Пачасціліся набегі на суседнія абшчыны з мэтай грабяжу. Таму не выпадкова, што асноўным тыпам пасяленняў балтаў сталі ўмацаваныя гарадзішчы.

На тэрыторыі Беларусі выяўлена каля тысячы такіх паселішч, у кожным з іх пражывала ад 50 да 70 чалавек. У гэты час існавала вялікасямейная патрыярхальная родавая супольнасць, якая мела сваю пэўную тэрыторыю для пражывання, апрацоўкі глебы, выпасу жывёлы. З цягам часу паступова назіраецца аслабленне родавых сувязяў і на іх змену прыйшлі суседскія тэрытарыяльныя абшчыны, якія, у сваю чаргу, аб’ядноўваліся ў плямёны і саюзы плямён. Далейшы працэс вёў да дыферэнцыяцыі ўнутры абшчын і плямён, калі пачалі выдзяляцца племянныя вярхі, а таксама асобныя групы абшчыннікаў, якія ў асноўным займаліся абаронай сваіх умацаваных паселішчаў і набыццём багацця за кошт рабавання іншых плямён. З ліку апошніх паступова фарміраваліся ваенныя дружыны.

I тысячагоддзе нашай эры было адзначана важнымі падзеямі ў жыцці народаў Еўропы і Беларусі. Яны былі звязаны з другім “вялікім перасяленнем народаў” і міграцыяй на ўсход славянскіх

плямён. Славян лічаць адным з адгалінаванняў індаеўрапейцаў, якія дасягнулі Заходняй Еўропы. Антычныя аўтары Тацыт, Пліній Старэйшы, Клаўдзій Пталамей, візантыец Пракопій Кесарыйскі, гоцкі гісторык Іардан называлі іх па-рознаму, часцей за ўсё, венедамі, антамі, склавенамі, з цягам часу замацавалася назва “склавены”– “славяне”. На думку многіх даследчыкаў, прарадзімай славян была Цэнтральная і Усходняя Еўропа, мясцовасць паміж рэкамі Одэр і Віслай, магчыма таксама, паміж Прыпяццю і Дняпром, Віслай і Днястром. Іх міграцыя была вызвана некалькімі прычынамі. Гэта, перш за ўсё, “вялікае перасяленне народаў” – рух ваяўнічых плямён готаў, гунаў. Яны пачалі выцясняць аседлыя плямёны з цэнтральнай Еўропы пераважна на ўсход, а таксама на поўдзень. Другой прычынай стала аслабленне Рымскай імперыі, якая да гэтага часу з’яўлялася стрымліваючым фактарам іншаземнай агрэсіі. Цяпер жа, наадварот, яе багатыя абшары сталі вабіць заваёўнікаў. Неабходнасць асваення новых зямель была выклікана і дэмаграфічнымі працэсамі.

Частка славян пачала рухацца на поўдзень і ў працэсе асіміляцыі з мясцовым насельніцтвам утварыла групу народнасцяў, аб’яднаную назвай “паўднёвыя славяне”. Гэта балгары, сербы, харваты, македонцы і іншыя. Міграцыйны рух другой часткі, заходніх славян, быў адносная нязначным. Трэцяя частка, усходнія славяне, з’явілася асновай для пазнейшага заснавання рускай,беларускай і ўкраінскай народнасцяў. Славянскае засяленне Беларусі працягвалася з VI па IX стст. нашай эры. Пачалося яно з Палесся, менавіта там знойдзены помнікі найбольш старажытнай славянскай археалагічнай культуры – пражскай. Славяне адтуль пачалі прасоўвацца на поўнач, пазней таксама з захаду на ўсход, з поўначы на ўсход, змешваючыся з балцкім насельніцтвам. Паколькі апошніх было не вельмі шмат, згодна з падлікамі па колькасці гарадзішч, каля ста тысяч, і жылі яны разрэджана, то каланізацыя беларускіх зямель славянамі праходзіла пераважна мірным шляхам. Як паказваюць археалагічныя даследаванні, у балцкім арэале з’явіліся тыповыя славянскія прыкметы: жыллё – паўзямлянкі з печамі-каменкамі ў вуглу, у той час, як у балтаў ачаг размяшчаўся ў цэнтры памяшкання; каменныя жорны, славянскія кераміка, упрыгожанні, звычаі трупаспаленняў у круглых курганах, славянская гідраніміка.

Злучэнне славянскіх і балцкіх элементаў характэрна для банцараўскай і калочынскай археалагічных культур, якія ў V–VIII стст. нашай эры займалі большасць тэрыторыі сучаснай Беларусі. Складаныя працэсы этнічнага ўзаемадзеяння славян і балтаў адбываліся на працягу трох стагоддзяў, у выніку славяне часткова выцяснілі балтаў, часткова асіміліраваліся з імі. У IX–XI стст. славяна-балцкая мяжа, як лічыць гісторык П.Р. Чыгрынаў, пралягла прыкладна па лініі сучасных гарадоў Гродна – Ліда – Вілейка – Мядзель – Браслаў. У выніку ўзаемадзеяння славян і балтаў на тэрыторыі Беларусі стварыліся пераважна славянскія этнічныя супольнасці – крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Крывічы былі найбольш буйным племянным аб’яднаннем, якое падзялялася на тры групы: пскоўскую, смаленскую і полацкую. Полацкія крывічы займалі басейн Заходняй Дзвіны. На Палессі і ў цэнтральнай частцы сучаснай Беларусі аселі дрыгавічы. У басейне р. Сож пасяліліся радзімічы. У культуры гэтых плямён балцкімі элементамі з’яўляліся бранзалеты са змяінымі галовамі на канцах, спіральныя пярсцёнкі, шыйныя грыўны балцкага тыпу, зоркападобныя спражкі. Асноўнымі ж прыкметамі славянскіх элементаў крывіцкай культуры былі бранзалетападобныя скроневыя кольцы, радзіміцкай – сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, дрыгавіцкай – буйныя металічныя пацеркі альбо скроневыя кольцы з круглага дроту з замацаванымі на іх трыма металічнымі пацеркамі невялікага памеру, а таксама кераміка.

Мова іх, як сцвярджаецца ў “Аповесці часовых гадоў”, была славянскай. Існуе шмат версій, якія растлумачваюць паходжанне назваў гэтых плямён. Найбольш вядомыя з іх выводзяць назву плямён ад характару мясцовасці, ад імён правадыроў, ад роднасных сувязяў. Дрыгавічы, радзімічы і крывічы займалі амаль усю тэрыторыю сучаснай Беларусі. Але часткова яе закраналі і іншыя ўсходнеславянскія супольнасці: вяцічы, паляне, драўляне, валыняне, бужане. У Панямонні пражывала таксама вялікая група яцвяжскіх плямён – судзінаў, дайновы і ўласна яцвягаў, а на паўночным захадзе – плямёны аўкштайтаў, жэмайтаў, латгалаў і інш.

Расцягнутая на стагоддзі, славянская каланізацыя тэрыторыі Беларусі праходзіла ва ўмовах разлажэння першабытнаабшчыннага ладу і зараджэння раннефеадальных адносін. Пры гэтым

характэрнай асаблівасцю гэтага працэса быў непасрэдны пераход усходніх славян ад першабытнасці праз ваенную дэмакратыю непасрэдна да феадалізму, мінуючы рабаўладальніцкі лад. У гэты час асновай сацыяльна-гаспадарчага жыцця заставалася буйная патрыярхальная абшчына, але ў яе недрах з развіццём прыватнай уласнасці пачалі з'яўляцца элементы сацыяльнага расслаення. Выдзяляўся пласт насельніцтва, які павялічваў сваю ўласнасць, у тым ліку, і на сродкі вытворчасці, зямлю. З другога боку, з асяроддзя збяднелых людзей утваралася залежнае сялянства, якое яшчэ не страціла сваёй свабоды, але ўжо стаяла на сацыяльнай лесвіцы ніжэй за многіх сваіх супляменнікаў.

Перасяленні і каланізацыя новых зямель далі штуршок працэсу маёмасна-сацыяльнага расслаення, узвышэнню і ўзбагачэнню знаці, перш за ўсё, ваенна-племянных вярхоў. Апорай ваенна-племяннной арыстакратыі станавілася ваенная дружына – аб'яднанне прафесійных воінаў. Фарміравалася асобная палітычная арганізацыя з органамі кіравання – правадыром, саветам старэйшын, народным сходам. Пры гэтым народны сход складаўся са свабодных мужчын, здольных насіць зброю. Такая форма арганізацыі грамадства і яго кіравання атрымала назву "ваеннай дэмакратыі" і ўзнікла напярэдадні ўтварэння дзяржаўнасці.

У першым тысячагоддзі нашай эры матэрыяльная і духоўная культура ўсходніх славян была даволі багатай. Ускладнілася апрацоўка вырабаў з метала, іх арнаментацыя. Складвалася міфалогія. Славяне абагатваралі прыроду, пакланяліся сонцу, верылі ў замагільнае жыццё. Аднымі з першых форм вераванняў былі фетышызм (абагатварэнне неадушаўлённых прадметаў), анімізм (вера ў духаў), татэмізм (вера ў роднасць пэўных груп людзей і татэмаў – жывёл, раслін), магія. Характэрнай рысай язычніцкай (паганскай) рэлігіі славян стаў палітэізм – вера ў вялікую колькасць Багоў, шматбожжа. Славяне пакланяліся Пяруну (Богу маланкі і грому), Сварогу (Богу неба), Дажбогу, Хорсу (Багам сонца), Ярыле (Богу вясны), Жыжалю (Богу агню), Знічу (Богу падземнага агню), Стрыбогу (Богу вятроў), Велесу (апякуну жывёл), Лёле (Багіні вясны) і інш.

Такім чынам, к канцу першага тысячагоддзя нашай эры на тэрыторыі сучаснай Беларусі склаліся пэўныя ўмовы для фарміравання беларускага этнасу.

## 2.2. Фарміраванне беларускага этнасу ў XIV – XVIII стст.

Паўстае пытанне: якім чынам і калі са славянскіх і іншых плямён, пражываўшых у старажытнасці, узнік беларускі этнас? На гэта дакладнага адказу няма. Ёсць розныя версіі, але прыняць адназначна адну з іх нельга з-за адсутнасці дакладных аргументаў.

Л. Галембоўскі, А. Рыпінскі і іншыя прыхільнікі польскай канцэпцыі яшчэ ў XIX ст. прыйшлі да высновы, што беларусы з'яўляюцца часткай польскага этнасу.

Аўтары вялікарускай тэорыі А. Сабалеўскі, М. Каяловіч і іншыя вучоныя XIX ст. сцвярджалі, што беларускі этнас не існаваў, а беларуская мова – гэта дыялект рускай мовы. Беларусь жа не што іншае, як паўночна – заходні край Расійскай імперыі. Доўгі час вялікаруская тэорыя з'яўлялася асновай афіцыйнай ідэалогіі расійскіх улад.

Крывічскую тэорыю абгрунтаваў В Ластоўскі, які лічыў продкамі беларусаў толькі крывічоў.

Крывіцка-радзіміцка-дрыгавіцкую канцэпцыю, якая з'явілася ў пачатку XX ст., сфармуліравалі беларускія гісторыкі Я. Карскі, У. Пічэта, М. Доўнар-Запольскі. Яны зыходзілі з таго, што аснову беларускай народнасці паклалі не толькі крывічы, але і радзімічы, дрыгавічы.

Расійскі даследчык В. Сядоў лічыў, што субстратам для паступовага фарміравання беларускага этнасу былі балты і славяне.

Аўтар фінскай тэорыі І. Ласкоў на аснове фінаўгорскага паходжання некаторых гідронімаў на тэрыторыі Беларусі прыйшоў да высновы, што пэўны ўклад у стварэнне беларускай народнасці ўнеслі фінаўгорскія плямёны, якія пазней былі асіміліраваны балтамі, а яшчэ пазней змяшаліся са славянамі.

Беларускі вучоны М.Ф. Піліпенка у пачатку 1990-х гг. абгрунтаваў сваю канцэпцыю паходжання беларускага народа. Піліпенка лічыць, што ў выніку змешвання славянскіх плямён з балтамі да X ст. утварылася першапачатковая этнічная супольнасць на славянскай аснове, свайго роду протанароднасць, якая, ў сваю чаргу, у X–XI стст. разам з іншымі ўсходнеславянскімі супольнасцямі кансалідавалася ў новую агульнаславянскую старажытную супольнасць з агульнай этнічнай тэрыторыяй, якая атрымала назву Русь. Пры гэтым на тэрыторыі сучаснай Беларусі па асаблівасцях

мовы і культуры выдзяляліся дзве этнаграфічныя зоны – Палессе, з аднаго боку, і падзвінска-падняпроўская частка, якая пазней, у сярэднявеччы атрымала назву Белая Русь. Пасля распаду Кіеўскай Русі на аснове ўзаемадзеяння гэтых дзвюх зон з заходнеславянскім (польскім) і балцкім этнасамі на тэрыторыі паміж Дняпром і Нёманам паступова сфарміравалася беларуская народнасць і замацавалася назва “Белая Русь”.

Паходжанне назвы “Белая Русь” тлумачыцца па-рознаму. А. Кіркор, Я. Карскі і інш. выводзілі назву ад прыгажосці зямлі, зімовай заснежанасці, колеру традыцыйнага адзення, антрапалагічных рысаў мясцовых жыхароў і г.д. Больш абгрунтаванымі, відавочна, з’яўляюцца наступныя версіі: М. Любаўскага – незалежнасць ад татара-манголаў, М. Доўнар–Запольскага – адносная свабода не толькі ад татара-манголаў, але і ад крыжаносцаў і літвы, Я. Юхо – больш ранняе прыняцце хрысціянства ў параўнанні з Чорнай Руссю (заходняй часткай сучаснай Беларусі), дзе яшчэ доўгі час заставалася паганская вера, П. Крапівіна – шырокае распаўсюджванне ў тапаніміцы назваў са словам “белая”.

Упершыню тэрмін “Белая Русь” успамінаецца ў гістарычных дакументах XII ст. і датычыцца Уладзімірска-Суздальскага княства. Пазней, пачынаючы з XV ст., ён сустракаецца ў сувязі з Маскоўскімі, Смаленскімі, Пскоўскімі, Наўгародскімі, Кіеўскімі, Чарнігаўскімі землямі. У адносінах да падзвінска-падняпроўскага рэгіёна тэрмін “Белая Русь” лакалізуецца ў XIV–XVI стст., пазней распаўсюджваецца на поўдзень і захад – да Прыпяці і Нёмана. Ад назвы тэрыторыі “Белая Русь” паходзіць і назва жыхароў – спачатку “беларусцы”, затым “беларусы”. Прыкладна у гэты перыяд – XIV–XVI стст. – фарміруецца і старабеларуская мова. Паўночна-Заходні край, Віцебская і Магілёўская губерні ў перыяд уваходжання ў склад Расійскай дзяржавы атрымалі назву “Беларускае генерал-губернатарства” ці ва ўжытку “Белоруссия”.

Развіццё Беларусі перыяду знаходжання яе ў складзе Вялікага Княства Літоўскага супала з еўрапейскім Адраджэннем, асноўнай рысай якога быў творчы зварот да антычных традыцый. Рэлігійная па форме, культура Адраджэння была свецкай па зместу, гуманістычнай па светапогляду. Росквіт Рэнесанса ў Еўропе, галоўным чынам, прыйшоўся на XV–XVI стст., калі ў Італіі хуткімі

тэмпамі развіваліся культавая і свецкая архітэктура, навука, літаратура, ствараліся шэдэўры выяўленчага мастацтва. Адраджэнне знайшло свой водгук і на беларускіх землях. Гэтаму садзейнічалі больш цесныя сувязі пасля Крэўскай уніі з Польшчай, якая стала свайго рода мастом паміж заходнееўрапейскай культурай і культурай усходніх княстваў і дзяржаў.

Рэнесанс знайшоў адлюстраванне ў развіцці адукацыі, беларускім кнігадрукаванні, творчасці беларускіх асветнікаў-гуманістаў, у архітэктуры і выяўленчым мастацтве, іншых напрамках культуры.

Хаця беларускі народ быў і ўцягнуты ў агульнаеўрапейскі працэс, але Адраджэнне на Беларусі мела свае адрозненні ў параўнанні з заходнееўрапейскім рэнесансам. ВКЛ тэрытарыяльна знаходзілася на перыферыі Еўропы, у свой час тут менш адчуваўся непасрэдны ўплыў антычных традыцый. Беларускае Адраджэнне было больш духоўным па сваёй сутнасці, у адрозненне ад еўрапейскай, больш свецкай культуры. Развіццё рэнесанснай культуры ў ВКЛ супала па часу з фарміраваннем беларускай народнасці, з'явілася адным з галоўнаўтваральных фактараў ў гэтым працэсе. Менавіта ў перыяд уваходжання у ВКЛ культура насельніцтва беларускіх зямель пачала набываць свае, самабытныя рысы.

Як вядома, характэрнымі прыкметамі любой народнасці з'яўляюцца наяўнасць адзінай тэрыторыі, адметнасці мовы, культуры, народных традыцый, а таксама этнічная самасвядомасць і саманазва (этнонім).

У перыяд уваходжання ў Кіеўскую Русь у Полацкім і Тураўскім княствах ужо пачалі праяўляцца прыкметы этнічнай кансалідацыі, але гэты працэс ішоў запаволена. Феадальная раздробленасць прывяла да з'яўлення шматлікіх земляцкіх супольнасцяў – удзельных княстваў і ў той жа час садзейнічала адмежаванню насельніцтва беларускіх зямель ад агульнай культурнай, эканамічнай, этнатэрытарыяльнай прасторы былой Кіеўскай Русі. Заснаванне ВКЛ паскорыла працэс этнагенезу беларусаў.

Вялікае Княства Літоўскае прадстаўляла сабой палітэтнічнае і шматканфесійнае ўтварэнне. Тут назіралася ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў розных этнасаў. На думку Г.Я. Галенчанкі, І.П. Крэня, У.Я. Казлякова і іншых даследчыкаў Вялікае Княства Літоўскае

было біэтнічнай, славяна-балцкай дзяржавай з дамінаваннем усходнеславянскага элемента, якая пазней трансфармавалася ў паліэтнічную. У XIV–XVI стст. па розных прычынах прыток на беларускія землі іншаземцаў не спыніўся, а нават узрос. Гэта праявілася ў пашырэнні іншаэтнічных элементаў ў народнай гаворцы, абрадах, адзенні і г.д. Важным было тое, што на тэрыторыі ВКЛ не было вострых міжэтнічных і міжканфесійных канфліктаў. Людзі розных этнасаў і вераванняў мірна суіснавалі, узаемна духоўна абагачаліся.

Этнічная стракатасць, безумоўна, мела свой ўплыў, але дамініруючае палажэнне ў стварэнні этнакультурнай прасторы заставалася за ўсходнімі славянамі або “русінамі”, як іх называлі, паколькі яны пераважалі па колькасці, культурнаму ўзроўню. У аснову ВКЛ былі закладзены прынцыпы дзяржаўнага кіравання, якія склаліся ў рускіх княствах, “руская” (старабеларуская) мова справаводства, на ёй жа рыхтаваліся большасць дакументаў, літаратурныя выданні. На працягу ўсёй гісторыі ВКЛ адчувалася ідэнтыфікацыя насельніцтва на дзве групы: “ліцвінаў” і “русінаў”, хаця усе яны па ўваходжанню ў адну дзяржаву называліся “ліцвінамі”. “Агульныя этнакультурныя карані ўсходніх славян, падабенства ў мове, культуры замаруджвалі працэс самаідэнтыфікацыі беларусаў. Але ў XIV–XVI стст., калі паняцце “Русь” усё менш і менш адлюстроўвала этнакультурныя адметнасці пэўных рэгіёнаў, паступова “русіны” , перш за ўсё, жыхары сучаснай цэнтральнай і ўсходняй Беларусі, пачалі называць сваю тэрыторыю Белай Руссю, а сябе “беларусцамі”. У гэты перыяд з развіццём эканомікі ўзмацняліся сувязі паміж асобнымі рэгіёнамі ВКЛ, што таксама садзейнічала этнакультурнай, эканамічнай, моўнай інтэграцыі і самаідэнтыфікацыі. Паступова фарміравалася этнічная самасвядомасць насельніцтва пэўных рэгіёнаў. Ядро этнічнай тэрыторыі беларускай народнасці ў асноўных рысах адпавядала арэалам рассялення крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Даволі дакладна прасочвалася этнічная мяжа паміж імі і балцкім насельніцтвам, якая пралягала прыкладна каля Ашмян і Браслава і ў наступныя тры стагоддзі амаль не змянілася, менш выразна з другімі славянскімі этнасамі, будучымі рускімі і ўкраінцамі. Кампактныя групы этнасаў, якія жылі побач са славянамі, з’явіліся

дадатковым кампанентам фарміравання беларускай народнасці, але ўвогуле не парушалі цэласнасці этнічнай тэрыторыі беларусаў.

Асобнай і важнай праявай этнасу з’яўляецца мова. Старажытная пісьменнасць на беларускіх землях была заснавана на стараславянскай мове. Але ўжо ў пісьмовых крыніцах XIII ст., у час існавання Полацкага і Тураўскага княстваў, зафіксаваны першыя праявы мясцовых дыялектаў. Менавіта сярэднебеларускія гаворкі выступілі ў якасці асноўнага элемента пры складванні агульнабеларускай мовы. Фарміраванне асноўных фанетычных, граматычных і лексічных адметнасцяў, уласцівых беларускай мове, працягвалася да XVI ст. Менавіта ў адзначаны час праявіліся такія яе асаблівасці, як цвёрдае “р”, “дзэканне” і “цэканне”, “аканне” і “яканне”, фрыкатыўны гук “г”, прыстаўны гук “в”. Пэўны ўплыў на станаўленне гэтых адметнасцяў і пашырэнне слоўнікавага запасу старабеларускай мовы аказалі запазычанні з моў іншых этнасаў, якія пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, або з якімі існавалі цесныя кантакты: палякаў, ліцвінаў, татараў, з агульнаеўрапейскай лацінскай мовы, а таксама царкоўнаславянізмы.

Развіццю старабеларускіх моўных асаблівасцяў спрыяла тое, што дзяржаўнай мовай у ВКЛ была “руская”, а папярэднікі жыхароў сучаснай Літвы доўгі час зусім не мелі сваёй пісьменнасці. Таму пры ўтварэнні ВКЛ у вядзенні справаводства часцей за ўсё ужывалася мова справаводства “рускіх” княстваў. А паколькі ядро ВКЛ складалі, акрамя літоўцаў, княствы, існаваўшыя на тэрыторыі сучасных Беларусі і Літвы, то ў літаратуру і справаводства пранік лі перш за ўсё асаблівасці гаворак мясцовага насельніцтва. Назіраўся ўзаемадапаўняльны працэс: з аднаго боку, мясцовыя дыялекты ляглі ў аснову дзяржаўнай мовы, з другога боку, у ходзе развіцця ВКЛ гэта мова з пашырэннем уплыву розных этнасаў і развіццём мясцовых асаблівасцяў усё больш набывала рысы мовы менавіта старабеларускай народнасці. Пачынаючы з 1696 г., старабеларуская мова паступова губляла свой дзяржаўны стату, замяняючыся ў справаводстве польскай, але захавалася ў народнай гаворцы.

## 2.3. Далейшае развіццё беларускага этнасу ва ўмовах складвання рынкавых адносін у XIX ст.

У Беларусі ў XIX ст., значна пазней, чым у Еўропе, пачалося фарміраванне беларускай нацыі. Замаруджванне гэтага працэсу тлумачыцца некалькімі прычынамі. Па-першае, адмоўную ролю сыгралі палітыка паланізацыі ў перыяд уваходжання Беларусі ў склад Рэчы Паспалітай і русіфікацыі ў пазнейшы час. Умацаванню нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва перашкаджала, сярод іншага, і тое, што ў сярэднявеччы дзяржаву – Вялікае Княства Літоўскае часта называлі скарочана Літвой, а жыхароў адпаведна – ліцвінамі. Па-другое, замаруджвала кансалідацыю беларускай нацыі і тое, што беларусы складалі ў асноўным вясковае насельніцтва, а гарады, дзе галоўным чынам канцэнтравалася інтэлектуальнае, культурнае, палітычнае жыццё, друк, былі іншаэтнічнымі. Тут пераважалі яўрэі, рускія, палякі, беларусы ж складалі ў канцы XIX ст. толькі 13,2%.

Беларуская інтэлігенцыя пераважна была або апалячанай, або русіфікаванай. Захавальнікам жа беларускай ідэі на этнічным узроўні было сялянства, якое складала 90 % насельніцтва. Менавіта з гэтага стасунку згодна перапісу 1897 г. 73% насельніцтва пяці заходніх губерняў Расійскай імперыі назвалі сябе беларусамі.

Тым не менш, нягледзячы на неспрыяльныя фактары, у XIX ст. усё выразней пачалі праяўляцца прыкметы беларускай нацыі. У гэты час, асабліва пасля адмены прыгоннага права, больш інтэнсіўна пачала развівацца таварна-рыначная гаспадарка, сяляне, памешчыкі, рамеснікі сталі больш вырабляць прадукцыі на продаж, адпаведна актывізаваліся гандлёвыя сувязі. Умацаванню эканамічных сувязяў паміж рознымі рэгіёнамі Беларусі спрыяла будаўніцтва чыгунак і іншых шляхоў зносін, рост колькасці гарадоў і мястэчак, якія станавіліся цэнтрамі лакальных мясцовых рынкаў.

У першай палове XIX ст. быў пакладзены пачатак развіццю беларусазнаўства. Першымі крокамі ў гэтым напрамку сталі працы расійскіх вучоных І. Ляпёхіна і В. Севергіна, якія ў пачатку стагоддзя арганізавалі навуковыя экспедыцыі на далучаныя да Расіі землі. Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні заходніх губерняў Расіі рабілі прафесары Віленскага ўніверсітэта І. Даніловіч, М. Баброўскі. Да сярэдзіны XIX ст. актывізавалася краязнаўчая

дзейнасць мясцовых даследчыкаў. Менавіта ў гэты час выходзіць шэраг этнаграфічных прац Я. Чачота, Я. Тышкевіча, П. Шпілеўскага і іншых навукоўцаў. Па ініцыятыве Яўстафія Тышкевіча ў Вільні ў 1855 г. быў заснаваны першы музей старажытнасцяў. Беларусазнаўства развівалася ў неспрыяльных умовах паланізацыі і русіфікацыі, але, тым не менш, унесла значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай самасвядомасці і фарміраванне беларускай нацыі.

Багаты фальклор, які знайшоў сваё адлюстраванне і ў першых працах беларускіх этнографаў, з’явіўся асновай духоўнага нацыянальна-культурнага адраджэння беларусаў, якое пачалося ў першай палове XIX ст. Менавіта з ім звязана і адраджэнне літаратурнай беларускай мовы. Прыкрываючыся лацініцай, беларуская мова загучала ў такіх выдатных народных творах, як “Гутаркі”, і ў ананімных паэмах “Тарас на Парнасе” і “Энеіда навыварат”.

У першай палове XIX ст. пачала адраджацца беларуская літаратура. Ля яе вытокаў стаялі Ян Чачот (“Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны”), Ян Баршчэўскі (“Шляхціч Завальня або Беларусь ў фантастычных апавяданнях”), В. Дунін-Марцінкевіч (“Сялянка”, “Вечарніцы”, “Пінская шляхта”). З імем Дуніна-Марцінкевіча звязана і стварэнне першай нацыянальнай тэатральнай трупы. 9 лютага 1852 г. у час прэм’еры камічнай оперы “Сялянка”(аўтар лібрэтта В. Дунін-Марцінкевіч, кампазітары С. Манюшка, К. Кжыжаноўскі) са сцэны Мінскага тэатра ўпершыню загучалі беларускія песні, гаворкі, прымаўкі.

Адным з першых вядомых нам паэтаў пачатку XIX ст., выхадцам з сялянскага асяроддзя, з’яўляецца Паўлюк Багрым. З усёй яго літаратурнай спадчыны да нас дайшоў адзін верш “Зайграй, зайграй, хлопча малы”, але гэты адзіны твор сведчыць аб вялікім таленце Багрыма, спецыфіцы яго творчасці. Адным з вядомых літаратараў першай паловы XIX ст. быў Уладзіслаў Сыракомля. Адзін з яго вершаў, перакладзеных на рускую мову, стаў вядомай песняй “Ямщик”.

У XIX ст. паступова стабілізавалася этнічная тэрыторыя беларусаў, якая вызначалася агульнасцю побыта, мовы, самасвядомасці яе жыхароў. Менавіта ў канцы XIX–пачатку XX стст. вучоныя-этнографы Я. Карскі і іншыя па выніках палявых даследаванняў ужо змаглі распрацаваць карты этнічнай тэрыторыі беларусаў. Яны

не супадалі з сучаснымі дзяржаўнымі межамі, ахоплівалі таксама і частку Беласточчыны, Віленшчыны, Смаленшчыны.

У гэты перыяд пачала адраджацца беларуская літаратурная мова. Як вядома, з канца XVII ст. адзінай дзяржаўнай мовай у Рэчы Паспалітай замацоўвалася польская. Беларускія гаворкі працягвалі існаваць толькі ў вуснай і дыялектнай форме і іх ужывалі пераважна сялянства і ніжэйшыя слаі гарадскога і мястэчкавага насельніцтва.

Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі ліквідавала эканамічную замкнёнасць беларускіх зямель. Пашырэнне гаспадарчых і культурных сувязяў садзейнічала нівеліроўцы шматлікіх дыялектаў, канцэнтрацыі мясцовых гаворак у адзіную нацыянальную мову. Яна складвалася ў асноўным на аснове вуснай народнай творчасці і мясцовых дыялектаў, хаця пэўны ўплыў аказала таксама і русіфікатарская палітыка ўлад.

Беларуская мова развівалася, галоўным чынам, як мова мастацкай літаратуры і часткова публіцыстыкі. Яе аднаўленне і ўнармаванне адбывалася павольна, у неспрыяльных умовах забароны ўрадам друкавання беларускамоўнай літаратуры. Тым не менш, беларуская мова ў XIX–XX стст. узбагацілася, пачалі складвацца асноўныя правапісныя і граматычныя нормы. Яна фарміравалася, галоўным чынам, на аснове сярэднебеларускіх гаворак. Мастацкія творы гэтай пары адлюстроўвалі працэс нацыянальнага адраджэння, садзейнічалі росту нацыянальнай самасвядомасці. Яны звернуты да простага чалавека, чалавека тутэйшага, беларуса, напісаны на яго роднай мове, носяць востры сацыяльны адбітак. Яркімі прыкладамі вострасацыяльнай публіцыстыкі, напісанай на высокім мастацкім узроўні і ў той жа час на мове, зразумелай простым людзям, з'яўляюцца 7 нумароў газеты "Мужыцкая праўда", а таксама "Лісты з-пад шыбеніцы", напісаныя К. Каліноўскім.

Крытычны пафас уласцівы і творам В. Дуніна-Марцінкевіча "Пінская шляхта", "Залёты", напісаным у 50–60-я гг. XIX ст. Ужо сам факт карыстання беларускай мовай у гады русіфікатарскай палітыкі улад з'яўляецца грамадзянскім подзвігам.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. і наступлення рэакцыі развіццё нацыянальнай літаратуры запаволілася, але не спынілася. У паэзіі Ф. Багушэвіча, сканцэнтраванай у зборніках "Дудка беларуская" і "Смык беларускі", упершыню ў новай беларускай

літаратуры з поўнай сілай загучала тэма патрыятызму і нацыянальнай годнасці. У цэнтры ўвагі твораў Ф. Багушэвіча нялёгкае жыццё беларускага селяніна. Спачуваннем і сімпатыямі да простага чалавека, нацыянальным пафасам прасякнуты амаль усе творы паслядоўнікаў Ф. Багушэвіча – А. Гурыновіча і Я. Лучыны (І. Неслухоўскага). Зборнік вершаў Я. Лучыны "Вязанка", выдадзены ў 1903 г., з'яўляецца адлюстраваннем лірызму беларускай паэзіі таго часу. У ім адчуваецца вера ў лепшую будучыню Бацькаўшчыны.

Новым этапам у развіцці беларускай літаратуры стаў пачатак XX ст., калі назіраліся ўздым беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і актывізацыя культурна-асветніцкай працы. У 1905 г. была знята забарона на друкаванне твораў на беларускай мове, пачалі працаваць беларускія выдавецтвы "Загляне сонца і ў наша ваконца", "Наша хата", выдаваліся беларускія часопісы "Саха", "Лучынка", выходзіла газета "Наша ніва". Менавіта ў гэты час бліскуча праявіўся талент маладых літаратараў Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі (А. Пашкевіч), М. Багдановіча, А. Гаруна, К. Буйло, Я. Журбы. Ва ўмовах развіцця рэвалюцыйнага і нацыянальна-дэмакратычнага руху галоўнымі тэмамі ў творчасці гэтых пісьменнікаў сталі нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, адраджэнне Бацькаўшчыны, сцвярджэнне чалавечай годнасці беларускага мужыка. Зборнікі вершаў Цёткі "Скрыпка беларуская", "Хрэст на свабоду" сталі першымі арыгінальнымі творамі беларускай паэзіі XX ст. Зборнікі заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы Я. Купалы і Я. Коласа "Шляхам жыцця", "Песні жальбы" звернуты да простага чалавека, селяніна. У іх адчуваецца імкненне абудзіць свядомасць беларускага народа. Глыбокім філасофскім роздумам, тонкай лірыкай прасякнуты вершы М. Багдановіча, якія ўвайшлі ў зборнік "Вянок". У цэлым, у гэты час беларуская культура, у прыватнасці, літаратура, дасягнула значных поспехаў. Яна выйшла за этнаграфічныя межы і стала поруч з культурай іншых народаў.

### 2.4. Духоўная і матэрыяльная культура жыхароў беларускіх зямель у IX – XIX стст.

На развіццё культуры, духоўнасці Беларусі ранняга сярэднявечча вялікі ўплыў аказала прыняцце хрысціянства. Яно ўводзілася

рознымі сродкамі, існавала часам паралельна з паганствам, часам у барацьбе са старымі паганскімі вераваннямі. Пачаткам увядзення хрысціянства на Русі лічыцца 988 г., калі князь Уладзімір ахрысціў жыхароў г. Кіева. Умоўнай жа датай прыняцця хрысціянства на Беларусі прынята лічыць 992 г. – год заснавання Полацкай епархіі, хаця, відавочна, яно пачало уводзіцца раней. Епархія ў Тураве была заснавана некалькі пазней – у 1005 г. Распаўсюджванне хрысціянства супала па часе з зараджэннем асноў дзяржаўнасці на Полаччыне і Тураўшчыне, ідэя адзінага бога адпавядала цэнтралізацыі княжацкай улады, царква стала духоўнай асновай раннесярэднявечнай дзяржавы. У выніку хрысціянізацыі значна ўзрос міжнародны аўтарытэт Полацкага і Тураўскага княстваў. Сувязі з хрысціянскімі краінамі, перш за ўсё, з Канстанцінопалем, садзейнічалі развіццю рамёстваў, гандлю, а яшчэ больш, культурнаму прагрэсу. Шырокае распаўсюджванне атрымалі мураванае дойлідства, манументальны жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Прыняцце хрысціянства садзейнічала развіццю асветы і пісьменнасці, літаратурнай справы.
Менавіта з Х ст. на землях Беларусі пачала распаўсюджвацца кірыліца – азбука, створаная славянамі па паходжанню, Кірылам і Мяфодзіем. Праз Балгарыю гэта старажытнаславянская мова перайшла да ўсходніх славян. На ёй зроблены надпісы на пячатцы полацкага князя Ізяслава канца Х ст., так званых, “Барысавых“і ”Рагвалодавых” камянях, знойдзеных на рэках Заходняя Дзвіна і Днепр, самшытавым грэбені канца ХІІ ст., каменнях у падмурку Полацкага Сафійскага сабора, прасліцах з археалагічных раскопак у Пінску, Віцебску, берасцяных граматах ХІ–ХІІІ стст., надпісу на крыжы Лазара Богшы, які датуецца ХІІ ст. З грэчаскай на стараславянскую мову перакладаліся царкоўныя кнігі. Найбольш старажытнымі літаратурнымі помнікамі з’яўляюцца “Тураўскае евангелле” канца ХІ ст., “Аршанскае евангелле” канца ХІІ–пачатку ХІІІ стст. Вядома, што ў старажытным Полацку была вялікая бібліятэка, якая, як лічыцца, загінула ў час Лівонскай вайны. Да нас дайшла толькі частка Полацкага евангелля. Кнігі пісаліся ўручную, асобым шрыфтам – “уставам” на пергаменце ў свайго рода майстэрнях – скрыпторыях. Асобныя раздзелы падзяляліся каляровымі застаўкамі. Вокладкі рабіліся з дрэва і ўпрыгожваліся золатам і каштоўнымі камянямі.

У юрыдычных дакументах таго часу – грамаце полацкага князя Ізяслава ад 1265 г., дагаворнай грамаце паміж Полацкам, Смаленскам і Рыгай, якая датуецца пачаткам XIII ст., ужо ёсць асобныя элементы старабеларускай мовы.

Да нас дайшлі таксама і асобныя творы – “Словы”, малітвы, лісты, створаныя вядомымі асветнікамі таго часу Кірылам Тураўскім і Кліментам Смаляцічам, а таксама агіяграфічныя аповесці – “Жыціе і хаджэнне Еўфрасінні Полацкай” аб аднайменнай выдатнай асветніцы, “Жыціе Кірылы Тураўскага”.

Асобнае месца сярод помнікаў пісьменнасці разглядаемага перыяду займаюць Іпацьеўскі летапісны звод, складзены ў канцы XIII ст., які ўключае чатыры летапісы: “ Аповесць мінулых гадоў”, Кіеўскі летапіс, Галіцка-Валынскі летапіс, і “Слова аб палку Ігаравым”, у якіх змешчаны звесткі аб старажытнай гісторыі плямён і княстваў, якія існавалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Падзеі на тэрыторыі Полацкага княства адлюстраваны і ў “Слове аб палку Ігаравым” – вяршыні мастацкай пісьменнай літаратуры XII ст. На Полаччыне было шмат і рознай перакладной літаратуры, перш за ўсё, антычнага свету. Папулярнай на беларускіх землях была і вусная народная творчасць.

Распаўсюджванне пісьменнасці, асветы на беларускіх землях у XII ст. цесна звязана з імёнамі дзеячаў культуры Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага і Клімента Смаляціча.

Ефрасіння Полацкая (Прадслава) была ўнучкай князя Усяслава Брачыслававіча (Чарадзея). Дабраахвотна выбраўшы дарогу ў манастыр, яна ўсё сваё жыццё прысвяціла асвеце, займалася перапіскай кніг, заснавала два манастыры і дзве царквы, па яе заказу ў 1161 г. быў зроблены знакаміты крыж – узор мясцовага мастацкага майстэрства.

Кірыла Тураўскі, выхадзец з заможнай сям’і, атрымаў добрую адукацыю ў Тураве. Пастрыгшыся ў манахі, ён заняўся літаратурнай дзейнасцю. Выдатнай красамоўнасцю выдзяляюцца яго ўрачыстыя і дыдактычныя пропаведзі, казанні, “Словы” (павучанні), прытчы, каля 30 малітваў і некалькі канонаў.

Клімент Смаляціч таксама жыў у манастыры, быў вельмі адукаваным чалавекам. У сваім пасланні смаленскаму прасвітару Фаме ён даказваў, што разумець біблію трэба з дапамогай

рацыянальных ведаў, у прыватнасці, вывучаючы творы антычных аўтараў.

Візантыйскі ўплыў на беларускіх землях у X–XIII стст. асабліва адчуваўся ў развіцці матэрыяльнай культуры: дойлідстве, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. У IX–XIII стст. тут ужо існавала 35 гарадоў, прычым, як паказваюць раскопкі ў Бярэсці, Мінску, Навагародку, Гародні, яны ні ў чым не саступалі еўрапейскім. Напрыклад, у Бярэсці XII ст. ўжо існавалі драўляныя маставыя, рыначная плошча.

Менавіта з X ст., пасля прыняцця хрысціянства, на Русі пачалося будаўніцтва мураваных будынкаў. Усяго на тэрыторыі Беларусі выяўлена і даследавана 25 мураваных помнікаў культавай і грамадзянскай архітэктуры IX–XIII стст. З іх поўнасцю або часткова захавалася невялікая частка, але па выніках раскопкаў іх фундаментаў можна вызначыць форму, тэхніку збудавання. Помнікі архітэктуры можна падзяліць на культавыя і абарончыя збудаванні. У культавых пабудовах выразна адчуваўся ўплыў Канстанцінопаля, у абарончых жа, старажытных замках – больш заходнееўрапейскі.

Як і ў Візантыі, на Беларусі пачалі будаваць храмы крыжовакупальнага тыпу або шматкупальныя. Яны былі, як правіла, прамавугольныя або выцягнутыя ў плане, з выкарыстаннем для аздаблення будынкаў керамікі, часцей за ўсё, з адным купалам. Вядомы 13 культавых пабудоў IX–XIII стст. у Полацку, але зберагліся толькі два – Сафійскі сабор і Спаса-Прэабражэнская царква Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Гэтыя культавыя пабудовы, а таксама ансамбль Бельчыцкага манастыра, Благавешчанская царква ў Віцебску і іншыя дазваляюць выдзяліць полацкую архітэктурную школу. Для яе характэрны тэхніка мураванння са схаваным радам плінф, выцягнуты падкупальны барабан. Маючы свае самабытныя рысы, полацкая школа дойлідства, тым не менш, абапіралася на візантыйскія традыцыі, але прымяненне пры пабудове Полацкага Сафійскага сабора контрфорсаў сведчыць і аб нейкім уплыве раманскага стылю. Пры гэтым, як сведчаць апошнія знаходкі беларускіх археолагаў, па плошчы забудовы Полацк быў роўны Кіеву.

Своеасаблівыя культавыя збудаванні былі ўзведзены ў Навагародку, Гародні, у прыватнасці, Ніжняя царква ў Гародне і Барысаглебская (Каложская) царква. Для апошняй характэрна

большая дэкаратыўнасць, чаргаванне кладкі з мураванымі рознакаляровымі камянямі і маёлікавымі пліткамі, наяўнасць у сценах галаснікоў для паляпшэння акустыкі.

Абарончыя збудаванні гэтага перыяду прадстаўлены Камянецкай вежай, рэшткамі Навагародскага замка . Тут ужо больш адчуваецца заходнееўрапейскі ўплыў, у прыватнасці, раманскі архітэктурны стыль, для якога характэрны масіўнасць, адсутнасць дэкора і г.д.

Фрэскавыя размалёўкі ў культавых пабудовах, перш за ўсё, у Полацкім Сафійскім саборы і Спаса-Ефрасіннеўскай царкве, напрыклад, “Невядомая святая”, “Васіль Вялікі” і інш., даюць прадстаўленне аб манументальным жывапісу ранняга сярэднявечча, які быў асновай мастацтва таго часу. Другой формай яго былі кніжныя мініяцюры. У манументальным жывапісу, кніжнай графіцы адчуваецца моцны візантыйскі ўплыў. Гэта выражаецца ў падкрэсліванні аскетызму, адсутнасці аб’ёмнасці вобразаў.

Значна больш у параўнанні з выяўленчым было развіта дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. У старажытным Полацку былі вядомы больш за 60 розных відаў мастацтва. Асабліва цікавымі з’яўляюцца ювелірныя вырабы. Шэдэўрам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XII ст.(1161 г.) з’яўляецца багата арнаментаваны крыж, створаны Лазарам Богшам па заказу Ефрасінні Полацкай. Акрамя крыжа Лазара Богшы, месцазнаходжанне якога ў цяперашні час невядома, практычна ва ўсіх гарадах Беларусі, як паказалі археалагічныя раскопкі, знойдзены сляды залатарства і рэшткі ювелірных майстэрняў.

З ювелірнай справай цесна звязана мастацкая апрацоўка камяню. Найбольш цікавым відам каменнай пластыкі XII–XIII стст. з’яўляюцца абразкі, якіх выраблялі з бронзы, косці і камяню. Іх знаходзілі ў час раскопак у Полацку, Мінску, Навагародку, Ваўкавыску, Віцебску і інш. Напрыклад, зроблены з каменю абразок з выявай святых Канстанціна і Алены, знойдзены ў Полацку, аб’ядноўвае візантыйскі, раманскі і мясцовы ўплывы.

Выключнай рознабаковасцю вызначаюцца і іншыя вырабы з косці, камяню, знойдзеныя ў час археалагічных раскопак, у тым ліку, арыгінальныя высокамастацкія шахматныя фігуркі.

Такім чынам, развіццё кніжнай справы, дойлідства, манументальнага жывапісу, кніжнай графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дробнай пластыкі старажытных зямель

Беларусі X–XIII стст. адбывалася ў рэчышчы візантыйскай традыцыі з аднaчасовым засваеннем раманска-гатычных рысаў. Але на гэтай аснове ў гэты час ужо паступова вызначалася самабытная своеасаблівая культура, характэрная, нягледзячы на наяўнасць асобных княстваў, у цэлым для ўсяго рэгіёна зямель сучаснай Беларусі.

На працягу XIV–XVI стст. на беларускіх землях ішло станаўленне і развіццё духоўнай і матэрыяльнай культуры, якая ўсё больш набывала нацыянальныя адметнасці і ператваралася ў важны фактар, характарызуючы станаўленне беларускай народнасці. Адметнай рысай тагачаснай культуры быў моцны рэлігійны ўплыў. Да пачатку XVI ст. сістэма адукацыі на беларускіх землях яшчэ была слаба развіта. Нешматлікія школы дзейнічалі ў асноўным пры цэрквах і манастырах. Але, тым не менш, моладзь магла атрымаць нядрэнную адукацыю, у тым ліку і вышэйшую, у еўрапейскіх навучальных установах. Пранікненне на беларускія землі спачатку каталіцызма, затым рэнесансавага гуманізму і рэфарматарскіх ідэй значна актывізавала літаратурнае жыццё, кнігавыдавецкую справу. Традыцыйна, апрача твораў царкоўна-рэлігійнага зместу, працягвалася і летапісанне. Але летапісы набылі, па-першае, рэгіянальны характар, па-другое, яны станавіліся больш пашыранымі, белетрызаваліся, нагадваючы часам свецкія гістарычныя аповесці. Найбольш вядомымі летапісамі былі “Хроніка Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”, “Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх”, Беларуска-Літоўскі летапіс 1446 г. Важнымі літаратурнымі помнікамі сярэднявяковай Беларусі з’яўляліся разнастайныя дзяржаўныя, юрыдычныя дакументы, у першую чаргу, Метрыка ВКЛ і Статуты ВКЛ. З’явіліся першыя гістарычныя даследаванні, напрыклад “Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсяе Русі” М. Стрыйкоўскага.

Новым у развіццi літаратуры сталі пераход з пергамента на паперу і пачатак кнігадрукавання ў пачатку XVI ст., што дазволіла павялічыць колькасць выпускаемых кніг і зрабіць іх больш таннымі. Беларуская друкарская і асветніцкая справа звязана з імем усходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны. Ён нарадзіўся каля 1490 г. у Полацку ў сям’і заможнага купца. Францыск Скарына атрымаў добрую адукацыю: скончыў

універсітэты ў Кракаве і Падуі. Яго перадавыя погляды і гуманістычная накіраванасць былі ўвасоблены ў прадмовах, каментарыях, перакладах з латыні на старaславянскую, вельмі набліжаную да старабеларускай, мову 23 кніг Бібліі, надрукаваных ў 1517–1519 гг. у Празе. Пасля пераезду ў Вільню Ф. Скарына арганізаваў першую ў ВКЛ друкарню, у якой былі выдадзены “ Малая падарожная кніжыца” і “Апостал”. Кнігадрукарства, пачатае Скарынай, хутка пашырылася ў іншых гарадах ВКЛ. У першай палове XVI ст. былі заснаваны друкарні ў Бярэсці, Нясвіжы, Заблудаве, Полацку, Мінску, Любчы, Слуцку, Пінску, Іўі і інш. У тэкстах Бібліі, Евангелля, надрукаваных ў Бярэсці і Цяпіна, добра прасочваўся ўплыў старабеларускай мовы.

У сярэдзіне XVI ст. беларуская літаратура развівалася пад моцным уплывам рэфарматарскіх ідэй заходнееўрапейскага пратэстантызму. У ВКЛ ён праявіўся галоўным чынам у форме кальвінізму. Яго заснавальнік Ж. Кальвін вялікую ўвагу ўдзяляў прадвызначанасці лёсу, а крытэрыем богавыбранасці лічыў асабістыя поспехі ў жыцці, у тым ліку, і набыццё багацця сумленным шляхам. Гэта імпаніравала маёмасным колам, таму сацыяльнай апорай кальвінізму у ВКЛ сталі магнаты, частка шляхты. Пратэстантызм у Беларусі не набыў такіх вострасацыяльных формаў, як у некаторых краінах Заходняй Еўропы. У ВКЛ ён выразіўся, галоўным чынам, у асветніцтве, прапагандысцкай дзейнасці, у палемічнай літаратуры.

Сярод дзеячаў беларускай Рэфармацыі значнае месца займаў Сымон Будны. Ён выдаў у Нясвіжскай друкарні на старабеларускай мове “Катэхізіс”, напісаў шэраг філасофска-палемічных трактатаў, самыя значныя з іх – “Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам”, “Пра свецкую ўладу”. С. Будны заклікаў да сацыяльнай гармоніі, фарміравання справядлівай дзяржаўнасці.

Блізкіх поглядаў прытрымліваўся Васіль Цяпінскі. Яму належыць першы пераклад на старабеларускую мову Евангелля. У прадмове ён заклікаў да захавання і развіцця роднай мовы.

Асаблівасцю развіцця літаратуры ў ВКЛ з’явілася большая разнабаковасць яе форм, перавага свецкага пачатку.

Пачынальнікам свецкай літаратуры у гэты час можна лічыць М. Гусоўскага. Яго пяру належаць 3 паэмы, асноўная з іх – “Песня пра зубра” і 10 вершаў. Гусоўскі таленавіта апісваў мясцовую прыроду,

расказваў пра мінулае, паэтычна ўслявіў Вітаўта. Пад уплывам Рэнесанса і Рэфармацыі значна пашырылася палемічная і публіцыстычная літаратура. Шырокую вядомасць атрымалі трактаты А. Волана па маральных праблемах, Міхалона Літвіна па этнічных пытаннях, ананімны “Дзённік Люблінскага сейма 1569 г.” і інш.

Значную ролю ў духоўным жыцці беларусаў, развіцці іх самасвядомасці мела вусная народная творчасць, перш за ўсё, цыклы абрадавых і святочных песен, звязаных з сезоннымі палявымі работамі, вялікаднём, іншымі рэлігійнымі святамі, Купаллем, памінальнымі Дзядамі, а таксама казкі, паданні і г.д. Пазней гэтая творчасць ярка ўвасобілася ў народным лялечным тэатры “Батлейка.”

У архітэктуры XIV–XVI стст. адчуваўся значны ўплыў заходняй сярэдневяковай Еўропы, дзе пераважалі ў гэты час раманскі і гатычны стылі, Візантыі і рускага дойлідства, але ў той жа час праяўляліся мясцовыя асаблівасці, характэрныя менавіта для беларускай народнасці.

Знешняя і ўнутраная абстаноўка ў ВКЛ, шматлікія войны, унутрыпалітычныя крызісы і сацыяльныя канфлікты прывялі да развіцця абарончага дойлідства. Другім важным напрамкам ў архітэктуры стала будаўніцтва культавых пабудоў. Абарончыя збудаванні ўзводзіліся, у асноўным, у раманскім стылі, для якога характэрна масіўнасць, арачныя перакрыцці, адсутнасць упрыгожанняў. Такімі былі замкі ў Крэве, Лідзе, Віцебску, Гародне, Оршы, Міры, Навагародку, апошні дабудоўваўся з сярэдзіны XIII ст. да XV ст. На змену раманскаму стылю прыйшла готыка, а ў канцы XVI ст. барока.

Для стылю готыкі характэрны паўаркі (аркбутаны), рабрыстае (нервюрнае) скляпенне, стральчатыя вокны, шпілі і высокія дахі. Але беларуская готыка мела пэўныя адрозненні: гэта адносная прастата і большая масіўнасць. Помнікам гатычнага культавага дойлідства з’яўляецца касцёл у вёсцы Ішкальдзь у Баранавіцкім раёне. Унікальнымі з’яўляюцца гатычны храм-крэпасць ў вёсцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна і гатычна-рэнесансны храм-крэпасць у вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна на Гродзеншчыне. Прыстасаваным для абароны быў таксама кальвінісцкі храм у г. Смаргоні. У пачатку XVI ст. прыватны гатычны замак быў

узведзены В. Гаштольдам у вёсцы Геранёны Іўеўскага раёна. Будаваліся таксама праваслаўныя цэрквы ў візантыйскім або псеўдарускім стылі, для якога характэрны большая дэкаратыўнасць, шматкупальнасць.

Выяўленчае мастацтва ў XIII–XVI стст. мела пераважна рэлігійны характар і знаходзілася пад уплывам візантыйскай і старажытнарускай культур. Для яго характэрны аскетызм вобразаў святых, адсутнасць аб'ёмнасці, абстрактна-сімвалічны аднаколерны, часцей за ўсё, залацісты фон. Прыкладам з'яўляюцца іконы " Параскева-Пятніца", "Маці боская Адзігітрыя (заступніца) Смаленская" з в. Дубінец Столінскага раёна, "Маці боская Ерусалімская" з Пінска. Але паступова візантыйскі ўплыў зніжаўся і адначасова ўсё больш праяўляліся мясцовыя асаблівасці.

Да помнікаў сярэдневяковага мастацтва адносяцца таксама кніжныя мініяцюры, напрыклад, у Радзівілаўскім летапісу, гравюры, змешчаныя ў выданнях Ф. Скарыны. Новым у гэты час стала зараджэнне свецкага жывапісу, так званага, "сармацкага" партрэта. Прыкладам можа служыць партрэт Юрыя Радзівіла пачатку XVI ст.

У рамках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў XIV–XVI стст. развіваліся драўляная скульптура, разьба па дрэву, чаканка па металу, выраб керамікі.

Такім чынам, XIV–XVI стст. сталі перыядам роста этнічнай самасвядомасці беларусаў, фарміравання беларускай народнасці, пашырэння ўплыву Рэнесанса і Рэфармацыі, зараджэння і развіцця элементаў самабытнай беларускай культуры.

На культуру Беларусі другой паловы XVI–XVIII стст. значны ўплыў аказалі еўрапейскае Адраджэнне, Рэфармацыя і Контррэфармацыя, Асветніцтва. У XVI ст. Рэнесанс у Еўропе прайшоў ужо стадыі перададраджэння, ранняга адраджэння і ўступіў у перыяд высокага і позняга адраджэння. У гэты час у сувязі з пашырэннем культурных кантактаў, а таксама дзякуючы аб'яднанню з Польшчай, якая была больш звязана з еўрапейскай культурай, культура Адраджэння пачала пашырацца на беларускіх землях. Паколькі ж яны, як ужо адзначалася, знаходзіліся ў пэўным сэнсе на перыферыі, то ўступілі ў эпоху Адраджэння значна пазней за Еўропу, зараджэнне і ранні этап яго ў Беларусі адносіцца да першай паловы XVI ст., а росквіт – на канец XVI – XVII стст. Рэфармацыя

пачала пранікаць у Вялікае Княства Літоўскае яшчэ ў першай трэці XVI ст., пераважна ў выглядзе кальвінізму. Ён вабіў людзей патрабаваннямі адмены царкоўных падаткаў і скарачэння землеўладанняў, суполкамі з самакіраваннем. Яе падтрымалі магнаты, у тым ліку буйнейшы – Мікалай Радзівіл Чорны, які заснаваў у Бресце і Нясвіжы пратэстанцкія друкарні. У многіх гарадах ствараліся кальвінісцкія суполкі, будаваліся цэрквы, адкрываліся школы, друкарні. Але паступова з другой паловы XVI ст. колькасць пратэстантаў на беларускіх землях пачала змяншацца. Гэтаму нямала садзейнічалі і меры, прынятыя каталіцкай царквой па ўмацаванню свайго становішча. Пачаўся перыяд Контррэфармацыі. Значную ролю ў развіцці Контррэфармацыі ў ВКЛ, як і ва ўсёй Еўропе, адыграў манаскі ордэн езуітаў, які з 1570 г. пачаў дзейнічаць у Вільні, а затым і ў іншых гарадах. Разумеючы важнасць прапагандысцка-выхаваўчай работы сярод людзей, перш за ўсё моладзі, езуіты пачалі адкрываць вучэбныя ўстановы– калегіўмы, стваралі друкарні і бібліятэкі, адкрывалі аптэкі, займаліся дабрачыннасцю.

У пачатку XVIII ст., калі Еўропа пасля працяглых войнаў уступіла ў перыяд адносна спакойнага жыцця, адбыліся значныя зрухі ў эканоміцы, навуцы, адукацыі. Светапогляд людзей, культура набылі больш свецкі характар, у цэнтр увагі былі пастаўлены асвета, рацыяльнае мысленне замест рэлігійнага. Усё гэта атрымала назву Асветніцтва. Культура, ідэалогія Асветніцтва ў XVIII ст. пачалі распаўсюджвацца і на беларускіх землях.

На развіццё беларускай культуры ў перыяд уваходжання ў склад Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай значны ўплыў аказалі і міжканфесійныя адносіны, якія склаліся ў гэты час. Як вядома, у перыяд заснавання ВКЛ “рускія” княствы прытрымліваліся праваслаўя, літоўскія плямёны яшчэ заставаліся ў паганстве. Пасля Крэўскай уніі, вяліканяжацкіх прывілеяў 1387 і 1413 гг. насельніцтва стала пераводзіцца ў каталіцызм, а праваслаўная вера аказалася ў дыскрымінацыйным становішчы. Гэта вызвала канфрантацыю на рэлігійнай аснове, якая перапляталася з палітычнай барацьбой і нават з’явілася адной з прычын раскола дзяржавы ў перыяд грамадзянскай вайны 1430-х гг. Каб прыцягнуць на свой бок праваслаўных феадалаў, каралём і вялікім князем ВКЛ ў былі выдадзены два прывілеі, якія ўраўноўвалі ў правах католікаў і

праваслаўных. Але пасля заканчэння грамадзянскай вайны зноў узмацнілася акаталічванне, хаця да вострай адкрытай канфрантацыі справа не даходзіла. Да ўтварэння Рэчы Паспалітай на землях Беларусі, пераважна ў заходняй яе частцы, дзейнічалі каталіцкія манаскія ордэны, але на ўсходзе заставаліся моцнымі пазіцыі праваслаўя, асабліва з боку асноўных пластоў беларускага насельніцтва. Правы каталіцкай царквы сістэматычна пацвярджаліся ва ўсіх агульнадзяржаўных прывілеях. Распаўсюджванне Рэфармацыі ў ВКЛ у другой палове XVI ст. ускладніла манапольную двухканфесійную царкоўна-хрысціянскую супольнасць.

У гэты час павялічыўся прыток на беларускія землі яўрэяў, эмігрантаў з ліку пратэстантаў. Адпаведна пачаў пашырацца іўдаізм. Другой значнай этнаканфесійнай групай былі татары, якія пачалі перасяляцца на землі Беларусі з XIV ст. Адпаведна на гэтых землях пачаў распаўсюджвацца і іслам. Але асноўны напрамак міжканфесійных зносін усё ж вызначаўся хрысціянствам, якое падзялілася ў гэты час на католікаў, праваслаўных і пратэстантаў, пераважна кальвіністаў. У другой палове XVI ст., акрамя кальвіністаў, на землях Беларусі пачаў праяўляцца і больш радыкальны накірунак Рэфармацыі–антытрынітарыі, “арыяне”, якія выступалі супраць асноўнага дагмата царквы аб трыядзе айца, сына і святога духа, заклікалі да ўсеагульнай роўнасці. У часы Рэфармацыі і Контррэфармацыі ў Беларусі існавалі самыя розныя рэлігійныя аб’яднанні: каталіцкі ордэн езуітаў, праваслаўныя брацтвы, пратэстанцкія суполкі кальвіністаў, арыян, манаскія ордэны базыльян і інш., канфесіі нацыянальных меншасцяў, але адносіны паміж імі будаваліся ў асноўным у рэчышчы рэлігійна-філасофскай палемікі,не даходзілі да вострых міжканфесійных канфліктаў.

У 1596 г. у Бярэсці была заключана царкоўная ўнія, асноўная сутнасць якой была пабудавана на кампрамісу: праваслаўная царква прызнавала верхавенства Папы Рымскага, але ў асноўным захоўваліся праваслаўная літургія і царкоўныя дагматы. Служба вялася, у тым ліку, і на старабеларускай мове. Унія ўводзілася рознымі мерамі: і мірнымі, і гвалтоўнымі. Да канца XVIII ст. ва ўніяцкую веру перайшлі каля 75% насельніцтва беларускіх зямель.

Адраджэнне, Рэфармацыя і Контррэфармацыя, шматканфесійнасць, агульная эканамічная і палітычная абстаноўка

аказалі ўплыў і на літаратуру, перш за ўсё публіцыстычную, і на выяўленчае мастацтва, і на адукацыю, і на развіццё матэрыяльнай культуры.

Адукацыя развівалася галоўным чынам з дапамогай рэлігійных аб'яднанняў. У буйных беларускіх гарадах былі адкрыты езуіцкія каталіцкія калегіўмы, брацкія праваслаўныя школы, пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі – уніяцкія, а таксама базыліянскія школы. У 1579 г. езуіты заснавалі Віленскую акадэмію. Пад уплывам Адраджэння ў школах і акадэміі, акрамя тэалагічных прадметаў, больш увагі сталі ўдзяляць граматыцы, рыторыцы, геаграфіі, астраноміі, фізіцы, матэматыцы. У эпоху Асветніцтва свецкі напрамак у адукацыі яшчэ больш узмацніўся. Гэта выразілася ў школьнай рэформе, якая была ажыццёўлена заснаванай у 1773 г. Адукацыйнай камісіяй – першай у Еўропе цэнтралізаванай свецкай установай па кіраўніцтву асветай. У яе падначаленне перайшлі навучальныя ўстановы езуіцкага ордэна, таксама былі створаны на месцах акруговыя і падакруговыя школы. Навучанне ў іх насіла ў асноўным свецкі характар, тэалогія была зведзена да мінімуму. Ніжэйшай ступенню адукацыі сталі парафіяльныя школы. У выніку рэформы павялічылася колькасць навучальных устаноў, адукацыя набыла больш свецкі характар. У канцы XVIII ст. у Беларусі існавала 130 пачатковых школ, 33 сярэднія і няпоўныя сярэднія школы, каля 40 школ розных ордэнаў, а таксама яўрэйскія рэлігійныя школы. У іх навучалася каля 4 тысяч чалавек. Хаця навучэнцаў было адносна няшмат, усё ж гэта быў значны крок наперад у навучанні моладзі ў параўнанні з папярэднімі стагоддзямі.

Развівалася навука. Далёка за межамі Бацькаўшчыны быў вядомы выдатны вучоны першай паловы XVII ст. Казімір Семяновіч. У яго кнізе " Вялікае майстэрства артылерыі", якая выйшла ў 1650 г. у Амстэрдаме, былі выказаны новыя ідэі ў ваеннай справе, нават ў галіне ракетнай тэхнікі. Адным з вядомых астраномаў быў рэктар галоўнай Літоўскай школы, дырэктар Віленскай абсерваторыі Марцін Пачобут-Адляніцкі. У гістарычнай навуцы вызначыўся Альберт Каяловіч, які напісаў "Гісторыю Літвы". Вялікі ўплыў на фарміраванне рацыянальнага светапогляду сучаснікаў аказаў вучоны, філосаф, грамадскі дзеяч Казімір

Лышчынскі, які быў спалены на вогнішчы за атэістычныя погляды, выказаныя ў трактаце “Аб неіснаванні Бога”.

У Новы час больш align="" рознабаковай стала літаратура. Складаныя міжканфесійныя адносіны, падрыхтоўка і правядзенне царкоўнай уніі спарадзілі багатую палемічную публіцыстыку. Гэта мемуарна-публіцыстычная літаратура (“Фрынас” М. Сматрыцкага, “Дыярыуш” А. Філіповіча, “Допісы” аршанскага старасты Ф. Кміты-Чарнобыльскага, “Дзённік” Ф. Еўлашоўскага); палемічныя пропаведзі С. Зізанія, І. Пацэя; свецкія прамовы Р. Хадкевіча, Л. Сапегі, парадыйна -сатырычныя творы (“Прамова Мялешкі”, “Ліст да Абуховіча”). У сувязі з адносна слабым развіццём буржуазных адносін, носьбітамі ідэй Асветы на Беларусі былі перш за ўсё шляхта і святары.

Традыцыйнае летапісанне набыло формы гісторыка-літаратурных мастацкіх твораў, рэгіянальны характар. Арыгінальным помнікам такой літаратуры з’яўляецца “Баркулабаўская хроніка”, напісаная ў XVI–XVII стст.

У гэты час развівалася паэзія як самастойны від літаратурнай творчасці. Яна звязана, перш за ўсё, з іменем Сімяона Полацкага і яго зборнікамі паэзіі “Рыфмаліён” і “Вертаград шматколерны”. Значны след у развіцці літаратуры пакінуў таксама таленавіты педагог, паэт Мацей Казімір Сарбеўскі. Шмат зрабіў у галіне асветніцтва Ілья Капіевіч.

Новай з’явай у культурным жыцці Беларусі стала з’яўленне тэатра. Спачатку былі школьныя тэатры, дзе ставіліся звычайна п’есы маральна-этычнага характару і на рэлігійныя тэмы. Біблейскія сюжэты пераважалі і ў лялечным тэатры “батлейка”, які ўзнік у XVI ст. Затым іх змянілі бытавыя гумарыстычныя сцэнкі. Звычайна рэпертуар батлейкі складаўся з кананічных (рэлігійных) і свецкіх (народных) твораў. У XVIII ст. батлеечны тэатр пачынае дзейнічаць пераважна як народная лялечная дзея. У беларускай батлейцы вядома 20 народных сцэнак. Героем іх з’яўляецца весялун, жартаўнік Несцерка, які выступае ў ролі народнага заступніка. У другой палове XVIII ст. значнае развіццё атрымалі прыгонныя тэатры, якія ствараліся ў маёнтках буйных феадалаў. Найбольш вядомымі былі тэатры Агінскага ў Слоніме, Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, дзе ставіліся галоўным чынам аўтарскія п’есы Уршулы Францішкі Радзівіл, тэатры ў Шклове, Слуцку, Магілёве і інш. Для

кіраўніцтва імі і навучання артыстаў нярэдка запрашаліся прафесійныя настаўнікі з Заходняй Еўропы. У XVIII ст. атрымалі распаўсюджванне прыгонныя аркестры, капэлы, якімі таксама кіравалі прафесійныя капельмайстры. Існавалі музычныя школы, ствараліся новыя музычныя творы. Шырокую вядомасць у канцы XVIII–пачатку XIX стст. атрымаў кампазітар Міхал Клеафас Агінскі.

У выяўленчым мастацтве адчуваўся заходнееўрапейскі ўплыў, які спалучаўся з мясцовымі самабытнымі рысамі. Як і раней, развіваўся іконапіс, але ў XVII ст. у культавым мастацтве пачалі адрозніваць тры жывапісныя школы: магілёўскую, віцебскую і палескую. Найбольш прыбліжанай да заходнееўрапейскага мастацтва была магілёўская школа. У сюжэтах з’явіліся элементы пейзажу, партрэта. Найбольш яскрава мясцовыя самабытныя рысы праглядваюцца ў іконе “Нараджэнне Марыі”, якую напісаў Пётр Яўсяевіч з Галынца. Рэалізм і ўплыў барока характэрны для манументальных роспісаў у храмах. Свецкі напрамак у жывапісу прадстаўлены парадным, або, так званым, сармацкім партрэтам. На мяжы XVIII і XIX стст. жанры жывапісу пашыраюцца: з’яўляецца сюжэтны накірунак, пейзаж.

Скульптура XVII–XVIII стст. развівалася ў стылі барока. Найбольш распаўсюджанымі былі выявы святых, але ў эпоху асветніцтва пашыралася і свецкая скульптура.

Стыль барока пераважаў і ў архітэктуры. Найбольш раннім помнікам барока стаў езуіцкі касцёл у Нясвіжы (архітэктар Дж. М. Бернардоні). Працягвалася будаўніцтва замкаў, хаця яны і страцілі свае абарончыя функцыі. Спалучэнне стыляў барока і класіцызма назіраецца ў Нясвіжскім замку. Асаблівасцю беларускай архітэктуры XVIII ст. стала, так званае, віленскае барока, характэрнае пластычнасцю аб’ёмаў, ажурнымі вежамі.

Развівалася дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, перш за ўсё, мастацкая разьба па дрэву, ткацтва. Шырока вядомымі сталі слуцкія паясы.

Да пачатку XIX ст. на беларускіх землях, далучаных да Расійскай імперыі, захоўвалася старая сістэма навучання – школы пры розных рэлігійных арганізацыях і навучальныя ўстановы былой Адукацыйнай камісіі. У пачатку XIX ст. у Беларусі у Віленскай навучальнай акрузе дзейнічалі адкрыты ў 1803 г. на базе Галоўнай

школы ВКЛ Віленскі ўніверсітэт, Полацкая езуіцкая акадэмія. Універсітэт быў буйнейшай вышэйшай навучальнай установай. Тут дзейнічалі 4 факультэты: маральна-палітычных навук, літаратуры і вольных мастацтваў, фізіка-матэматычны і медыцынскі, а таксама медыцынская, ветэрынарная, агранамічная школы, абсерваторыя, батанічны сад, некалькі музеяў, друкарня. Сярэдняе і ніжэйшае звенні адукацыі таксама былі прыведзены ў адпаведнасць з расійскай сістэмай: семігадовыя гімназіі ў губернскіх гарадах, павятовыя чатырохгадовыя для дзяцей мяшчан і купцоў і прыходскія вучылішчы для ніжэйшых саслоўяў. Езуіцкія калегіўмы захавалі сваю аўтаномію і перайшлі пад кіраўніцтва Полацкай езуіцкай акадэміі, якая існавала ў 1812–1820 гг. Дзейнічалі шматлікія яўрэйскія рэлігійныя навучальныя ўстановы, жаночыя пансіёны пры каталіцкіх кляштарах. Працавалі таксама каля 20 школ узаемнага навучання (ланкастэрскія). У навучальных установах у пачатку XIX ст. працягвала панаваць польская мова.

Некаторыя змены ў сістэме адукацыі адбыліся ў 1830–1850-я гг. Пасля паўстання 1830– 1831 гг. быў закрыты Віленскі ўніверсітэт як “расаднік вальнадумства”, замест яго ў Вільні былі створаны медыка-хірургічная і духоўная рымска-каталіцкая акадэміі. Школы пачалі пераводзіцца на рускую мову навучання, але адначасова быў зроблены крок да пашырэння пачатковай адукацыі, у гэты час адкрыліся больш за 100 школ для сялянскіх дзяцей. Дзейнічалі прыватныя навучальныя ўстановы закрытага тыпу–пансіёны. Узмацнілася цікавасць і да прафесійнай адукацыі, пры гімназіях адкрываліся прафесійныя школы або класы. У 1848 г. на базе земляробчай школы быў адкрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут, які праіснаваў да 60-х гадоў XIX ст. У цэлым жа, нягледзячы на пэўныя зрухі, напярэдадні 1861 г. навучаннем была ахоплена невялікая частка насельніцтва Беларусі – 16,5 тысяч чалавек, або 0,5 %.

Значную ролю ў развіцці беларускага выяўленчага мастацтва адыграў Віленскі ўніверсітэт, дзе было аддзяленне жывапісу. Менавіта там атрымалі адукацыю вядомыя беларускія мастакі В. Ваньковіч, В. Дмахоўскі і іншыя. У цэлым для выяўленчага мастацтва першай паловы XIX ст. характэрны рысы класіцызму, рамантызму і паступовы пераход да рэалізму. З сюжэтнага пункта погляду характэрны апераджальнае развіццё партрэтнага жанру і

пейзажа. Выдатным мастаком быў В. Ваньковіч, які працаваў пераважна ў партрэтным жанры. У стылі рамантызма выкананы партрэт паэта А. Міцкевіча. І. Хруцкі на беларускай глебе развіў лепшыя традыцыі рускага партрэтнага жанру. Але ён найбольш вядомы як майстар нацюрморта. Значныя поспехі ў партрэтным жанры меў таксама І. Аляшкевіч. Цікавым партрэтыстам і гістарычным жывапісцам быў мастак Ю. Пешка.

Я. Дамель спалучаў у сваёй творчасці элементы класіцызму, рамантызму і рэалізму. Гэта знайшло адлюстраванне ў шэрагу гістарычных палотнаў: “Смерць Глінскага ў няволі”, “Вызваленне Касцюшкі з цямніцы”, “Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.” і інш. Заснавальнікам жанру беларускага рэалістычнага пейзажа лічыцца В.Дмахоўскі.

Патрэбы капіталістычнага развіцця, тэхналагічны пераварот і ўдасканаленне прамысловай і сельскагаспадарчай таварнай вытворчасці патрабавалі пашырэння адукацыі сярод насельніцтва. Але, з другога боку, на развіццё сеткі навучальных устаноў у Расійскай імперыі, у тым ліку і ў Беларусі, значны ўплыў аказала рэпрэсіўная палітыка ўлад, асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг. У гэты час была закрыта адзіная ў Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова– Горы–Горацкі земляробчы інстытут, амаль усе прыватныя навучальныя ўстановы. Асноўнай формай навучання, такім чынам, сталі пачатковыя школы, якія згодна з “Часовымі правіламі” 1864 г. былі пастаўлены пад кантроль улад і праваслаўнага духавенства, а выкладанне пераведзена на рускую мову. У 1868 г. у Беларусі налічвалася 1391 навучальная установа, з іх 1249 пачатковых школ. У гэты час для кантролю за іх дзейнасцю былі ўведзены пасады інспектараў народных вучылішч і дырэктараў народных вучылішч. Пачатковая школа прыходзілася на некалькі дзесяткаў вёсак, матэрыяльная база была слабай. З пераводам школ на рускую мову навучання абвастрылася праблема настаўніцкіх кадраў, таму ў 1864–1876 гг. у Маладзечна, Нясвіжы, Полацку і Свіслачы былі адкрыты настаўніцкія семінарыі. У перыяд контррэформаў у 1884 г. выйшла палажэнне, згодна з якім народныя вучылішчы пераўтвараліся ў царкоўна-прыходскія школы з адпаведнай зменай у навучальных праграмах. Але іх колькасць значна павялічылася. У павятовых і губернскіх гарадах Беларусі дзейнічалі няпоўныя сярэднія і сярэднія навучальныя ўстановы – прагімназіі і гімназіі,

але доступ для дзяцей простага народа быў практычна закрыты з-за высокай платы за навучанне і згодна з так званым цыркулярам “аб кухарчыных дзецях”, які быў выдадзены ў 1887 г. Усяго ж у канцы XIX ст. у Беларусі налічваліся 6813 навучальных устаноў розных тыпаў, у якіх навучаліся 216 тысяч дзяцей.

У пачатку XX ст. у сістэме школьнай адукацыі Беларусі адбыліся пэўныя змены. Колькасць навучальных устаноў, у асноўным, пачатковых школ, да 1914 г. павялічылася да 7492. Такім чынам, пачатковая сістэма адукацыі заставалася пануючай, але ў той жа час значна зменшылася колькасць царкоўна-прыходскіх школ і адпаведна павялічылася колькасць школ, якія знаходзіліся ў веданні Міністэрства народнай асветы і мясцовых земстваў. Гэта азначала значны крок уперад, але ў цэлым узровень адукацыі заставаўся нізкім, навучанню падлягалі толькі 20–25% хлопчыкаў і дзяўчынак.

Новым у сістэме навучання ў канцы XIX – пачатку XX стст. стала пашырэнне сеткі прафесійных навучальных устаноў: прамысловых, камерцыйных вучылішчаў, сельскагаспадарчых, ветэрынарна-фельчарскіх школ.

Навука другой паловы XIX – пачатку XX стст. была прадстаўлена галоўным чынам этнаграфічнымі даследаваннямі Беларусі. Значную ролю ў гэтым, за адсутнасцю ВНУ, адыгралі навуковыя таварыствы: Паўночна-Заходняе аддзяленне Рускага геаграфічнага таварыства ў Вільні, таварыства па вывучэнню Беларускага краю ў Магілёве, таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі ў Мінску.

Даследаванні ў галіне іншых навук праводзілі таксама створаныя ў другой палове XIX ст. навуковыя таварыствы ўрачоў, губернскія таварыствы сельскай гаспадаркі. Яны займаліся выдавецкай, асветніцкай дзейнасцю, спрыялі папулярызацыі навуковых дасягненняў сярод шырокіх колаў насельніцтва.

Афіцыйны друк быў прадстаўлены ў другой палове XIX ст. “Губернскими ведомостями”, якія выдаваліся ва ўсіх губернскіх гарадах. У апошняй чвэрці XIX ст. сталі выдавацца “Минский листок”, “Виленский листок”– газеты, у якіх друкавалі свае артыкулы многія беларускія краязнаўцы. У пачатку XX ст. перыядычны друк стаў больш align разнабаковым. У 1906 г. у Беларусі ўжо выдавалася звыш 60 газет і часопісаў, у асноўным, рускамоўных. Пасля зняцця забароны кнігадрукавання на беларускай мове ў беларускім

выдавецтве “Загляне сонца і ў наша ваконца” было выдадзена 77 найменаванняў беларускіх кніг. У гэты час пачала выходзіць першая беларуская грамадска-палітычная газета “Наша доля”, якая затым была перайменавана ў “Нашу ніву”. Яна пакінула глыбокі след у гісторыі нацыянальнага і культурнага адраджэння беларускага народа. Але гэтае ажыўленне беларускай перыёдыкі было спынена з пачаткам сусветнай вайны.

У архітэктуры ў другой палове XIX ст. назіраецца распад стылявога адзінства і на змену класіцызму прыйшоў стыль эклектыкі. Ён вызначаўся спалучэннем рознастылявых форм. Пры гэтым касцёлы будаваліся з перавагай элементаў неаготыкі або неараманскага стылю (касцёл св. Сімяона і Алены ў Мінску), праваслаўныя храмы ў неарускім стылю (цэрквы ў Барысаве і іншых гарадах), для тэатраў было характэрным барока, банкі, установы, чыгуначныя вакзалы мелі элементы рэнесанса. У гэты час шырокае распаўсюджванне атрымалі палацава-паркавыя ансамблі, дзе таксама спалучаліся розныя стылі. Упор рабіўся на вонкавую дэкаратыўнасць фасадаў, манументальнасць пабудоў.

У канцы XIX–пачатку XX стст. у збудаваннях вытворчага прызначэння і ў жылых дамах пачалі праяўляцца рысы новага архітэктурнага стылю – мадэрна. Яго адрозненнем было выкарыстанне сучасных канструкцый, метала, шкла, іншых разнастайных матэрыялаў, асіметрычнасць кампазіцыі. Аднак мадэрн шырокага распаўсюджвання не атрымаў.

Беларускі жывапіс другой паловы XIX ст. развіваўся ў рэчышчы дэмакратычнага рэалізму, блізкім да крытычнага рэалізму рускіх мастакоў-перасоўнікаў. Мастак К. Альхімовіч унёс нямалы ўклад у далейшае развіццё гістарычнага жанру. Вядомы яго карціны “Пахаванне Гедыміна”, “Смерць Міхаіла Глінскага ў турме” і іншыя. У гэтым жанры працягваў працаваць і другі мастак – В. Дмахоўскі. У гістарычным жанры вызначыўся і Н. Орда, які быў таксама таленавітым музыкантам і кампазітарам.

Выдатным прадстаўніком пейзажнага жанру быў А. Гараўскі. Найбольш значныя яго карціны – “Бераг ракі Свіслач”, “На Бацькаўшчыне”, “Вечар у Мінскай губерні” і інш. былі ім створаны менавіта ў Беларусі.

Вядучым жа жанрам у беларускім выяўленчым мастацтве стаў бытавы, перш за ўсё, партрэтны жывапіс. Вострасацыяльную

афарбоўку набыла карціна “Пастух” Н. Сілівановіча і іншыя яго работы. Гэта тэма атрымала далейшае развіццё ў працах мастакоў пачатку XX ст. Ю. Пэна, Ф. Рушчыца “Зямля”, “Ля касцёла”. Але ў гэты час у жывапісу таксама пачалі праяўляцца новыя рысы мадэрна. Гэта было характэрным для творчасці М. Шагала, В. Бялыніцкага-Бірулі.

Рэпрэсіі пасля паўстання 1863–1864 гг. адмоўна адбіліся на развіцці нацыянальнага тэатральнага мастацтва. У гэты час у асноўным развіваўся аматарскі тэатр, які меў выразна дэмакратычны напрамак, а ў гарадах гастралявалі акцёры рускіх і іншых тэатраў. У 1890 г. у Мінску было створана таварыства аматараў мастацтва і адначасова быў адкрыты пастаянны тэатр.

У пачатку XX ст. працягвалі дзейнічаць шматлікія музычна-драматычныя гурткі. На іх аснове і ўзнікла першая прафесійная беларуская трупа – тэатр Ігната Буйніцкага. І. Буйніцкі і яго акцёры актыўна гастралявалі, у тым ліку ў Пецярбургу і Варшаве.

Другая палова XIX ст. стала важным этапам у развіцці беларускай музыкі. Гэтаму садзейнічала актывізацыя этнаграфічнай працы, у выніку якой у канцы XIX ст. выйшлі з друку песенныя фальклорныя зборнікі “Песни белорусские”, аўтар А. Чэрня, і “Белорусские песни Минской губернии”, аўтар М. Янчук, “Беларускія песні з нотамі” А. Грыневіча, “Беларускі песеннік з нотамі для народных і школьных хораў” Л. Рагоўскага. Музычны фальклор беларускага народа выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці вядомыя рускія кампазітары М. Рымскі-Корсакаў, М. Мусаргскі, А. Глазуноў і іншыя.

Прыкметную ролю ў развіцці музычнага мастацтва адыгралі літаратурна-музычныя гурткі і таварыствы аматараў прыгожых мастацтваў, якія ствараліся ў канцы XIX – пачатку XX стст. У пачатку XX ст. пачалі дзейнічаць і першыя музычныя навучальныя ўстановы.

## Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.

*3.1. Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Полацкае і Тураўскае княствы, іх узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам.*
*3.2. Утварэнне і развіццё Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)*
*3.3. Цывілізацыйныя працэсы Новага часу. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – XVIII стст.)*

### 3.1. Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Полацкае і Тураўскае княствы, іх узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам

У VI–IX стст. нашай эры ў Беларусі, як і ў цэлым у Еўропе, праходзіў працэс разлажэння першабытнаабшчыннага ладу, зараджэння і развіцця новых феадальных адносін. У Заходняй Еўропе гэты працэс развіваўся шляхам сінтэзу познерымскага рабаўладальніцкага ладу і еўрапейскіх родаплемянных адносін. Ва Усходняй Еўропе, у тым ліку і Беларусі, пераважаў бязсінтэзны, больш замаруджаны працэс феадалізацыі. Ён пачаўся некалькі пазней і праходзіў без ярка выражанага рабаўладальніцкага этапа.

Асновай гаспадаркі на гэтых землях у другой палове I тысячагоддзя нашай эры было земляробства і жывёлагадоўля. Удасканальваліся прылады працы, перш за ўсё, за кошт шырокага ўжывання жалеза. Шырока выкарыстоўваліся сохі з жалезнымі наканечнікамі. Апрача сельскай гаспадаркі, людзі займаліся таксама промысламі: паляваннем, рыбнай лоўлей, бортніцтвам, ткацтвам, ганчарствам, кавальскай і нават ювелірнай справай.

Найбольш буйныя славянскія паселішчы, якія з’яўляліся цэнтрамі абшчыннага, племяннога асяроддзя і звычайна ўмацоўваліся, у тым ліку агароджваліся, паступова ператвараліся ў гарады. З цягам часу некаторыя з іх сталі цэнтрамі, якія ажыццяўлялі кіраванне пэўнымі тэрытарыяльнымі акругамі. У гарадах пачала канцэнтравацца і рамесніцкая вытворчасць. Яны часцей за ўсё ўзнікалі і пашыраліся каля водных шляхоў зносін, таму большасць найстаражытных гарадоў Беларусі атрымалі назву ад рэк, на якіх яны былі заснаваны.

Адначасова з гаспадарчым развіццём мяняліся і вытворчыя адносіны. На працягу VIII–IX стст. на змену буйным патрыярхальным абшчынам, якія абаранялі інтарэсы сваіх членаў у сутыкненні з іншымі людзьмі і выконвалі ўнутраныя вытворчыя і адміністрацыйныя функцыі, прыйшла новая грамадская форма – сельская (суседская) абшчына. Яна складвалася, у асноўным, з малых індывідуальных сем’яў і ўяўляла сабой тэрытарыяльнае аб’яднанне непасрэдных вытворцаў-земляробаў, не абавязкова звязаных родавымі сувязямі. У пісьмовых крыніцах гэта абшчына атрымала назву “верв” або “мір”. Асноўным месцам пражывання сялян-абшчыннікаў былі неўмацаваныя паселішчы – “весі”, пазней з’явілася і іншая назва – “сёлы”.

Сельская абшчына нясла ў сабе яшчэ рысы патрыярхальнага ўкладу, але ўжо пачаўся працэс сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства. Узвышалася верхавіна ўнутры абшчын, плямён. Складвалася дружынная арганізацыя, якая займалася не толькі абаронай сваіх зямель, але і ваеннымі набегамі на суседзяў з мэтай захопу здабычы. Гэтая здабыча, а таксама даніна з сялянскіх абшчын, збіраемая на яе ўтрыманне, вялі да паступовага ўзбагачэння старэйшых дружыннікаў, якія затым атрымалі назву “баяры”, і кіраўнікоў дружын – князёў. Апошнія з цягам часу канцэнтравалі не толькі ваенную, але і адміністрацыйную, судовую ўладу. У гэты ж час зараджаліся і элементы рабства, крыніцай якога з’яўляліся палонныя, захопленыя ў час ваенных набегаў. Але з-за геаграфічных умоў, асаблівасцяў сацыяльна-эканамічнага развіцця яно не набыло ва ўсходніх славян такіх класічных форм, як у старажытнай Грэцыі або Рыме.

Паступовае ўзвышэнне племянных і ваенных вярхоў, узмацненне іх ваеннай моцы прывяло да пераходу да іх права ўласнасці на зямлю, умацавання ўлады над супляменнікамі і стварэння адміністрацыйна-ваенных аб’яднанняў з пэўнай уладнай структурай у форме княжэнняў. Гэта былі свайго рода протадзяржаўнасці.

У развіцці феадальных адносін і складванні класавых адносін ва Усходняй Еўропе, у тым ліку і на беларускіх землях, можна ўмоўна выдзеліць два этапы. На першым з іх пераважала дзяржаўная форма ўласнасці, калі саўладальнікамі зямлі былі князь і старэйшая дружына.

Абшчыннікі-сяляне страцілі магчымасць карыстання даходамі з зямель, якія сталі ўласнасцю княжэнняў. Князь і дружына збіралі дань з сялян, якія працавалі на іх землях, праз “палюддзе”, пазней у пэўных вызначаных месцах – пагостах. Гэтыя землі разам з сялянамі князі маглі перадаваць у карыстанне прадстаўнікам сацыяльных вярхоў грамадства. З XII ст. пачаўся другі этап у развіцці феадальных адносін, калі землеўладанне падзялялася на землі, якія належалі непасрэдна князю, баярскую вотчыну і царкоўнае землеўладанне. Згодна з гэтымі формамі ўласнасці ва ўсходніх славян, у тым ліку, і на землях сучаснай Беларусі, у раннім сярэднявеччы склалася наступная сацыяльная структура.

Асноўнымі класамі становяцца феадалы і феадальна-залежныя сяляне. Большасць сялян складалі абшчыннікі, якія былі яшчэ асабіста свабоднымі, вялі сваю гаспадарку, але былі абавязаны ўносіць у карысць органаў кіравання пэўную даніну і выконваць шэраг павіннасцей. З развіццём феадальных адносін, калі з’явілася вотчынная ўласнасць, частка сялян трапіла ў эканамічную залежнасць непасрэдна да феадалаў або плаціла даніну царкве і манастырам. Гэтых асабіста свабодных сялян-абшчыннікаў называлі смердамі. Былі таксама смерды, якія часткова страцілі сваю асабістую свабоду. Іх называлі закупамі. Яны мелі асабістую гаспадарку, але з-за беднасці ішлі ў эканамічную кабалу да феадала, бралі ў яго пазыку, купу, за гэта павінны былі працаваць на гаспадара. Паколькі гэта праца ў асноўным ішла на пагашэнне працэнтаў, то адпрацаваць поўнасцю купу было даволі цяжка і селянін мог пажыццёва застацца ва ўласнасці феадала. Закупы, якія ўсё ж разлічваліся з феадалам, траплялі ў катэгорыю ізгояў, гэта значыць, людзей, якія страцілі сувязь з абшчынай. Акрамя закупаў, часткова залежнымі былі і радовічы, якія заключалі дагавор – “рад” і на гэты тэрмін пераходзілі ў поўную залежнасць ад феадала. Існавалі таксама і халопы, гэта значыць, поўнасцю залежныя людзі, фактычна, рабы.

У гарадах таксама ішоў працэс маёмаснага расслаення. Асноўную масу гарадскога насельніцтва складалі рамеснікі, але вядучае становішча займалі купцы, заможныя гараджане, царкоўная вярхушка.

На працягу VIII–IX стст. у выніку развіцця феадальных адносін, узмацнення эканамічных сувязяў пачалі складвацца славянскія

племянныя саюзы, якія паступова перараслі ў протадзяржаўныя аб’яднанні – княжэнні. Аб’яднаўчыя тэндэнцыі прывялі да стварэння ў IX ст. паўночнага саюза княжэнняў з цэнтрам у г. Ноўгарадзе, куды ўвайшлі ноўгарадскія славены і крывічы разам з фінскім племем весь. Аналагічны працэс на базе княжэння палян адбыўся ў сярэднім Падняпроўі, дзе паўднёвы саюз згрупіраваўся вакол горада Кіева. Пасля авалодвання ў 882 г. ноўгарадскім князем Алегам Кіевам гэтыя два цэнтры аб’ядналіся ў адзін, які затым атрымаў назву Русь.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў гэты час існавалі два буйныя княствы: Полацкае і Тураўскае. Полацкае княства кантралявала значны ўчастак важнейшага воднага шляху “з вараг у грэкі”, гэта значыць, з Балтыйскага да Чорнага мора, таму з самага пачатку заснавання Русі знаходзілася ў сферы інтарэсаў і Ноўгарада, і Кіева. Ужо першы ўспамін у летапісу аб Полацку пад 862 г. звязвае яго гісторыю з Ноўгарадам. Але праз некалькі гадоў, у 865 г., полацкую зямлю спрабаваў падпарадкаваць Кіеў. Пасля стварэння адзінай дзяржавы, Кіеўскай Русі, Полацк увайшоў у яе склад на правах аўтаноміі. У 885 г. кіеўскі князь Алег падпарадкаваў радзімічаў, якія раней знаходзіліся ў залежнасці ад хазараў.

Паступова самастойнасць Полацка ўзмацнілася і да 980 г., у час праўлення князя Рагвалода, ён фактычна стаў трэцім па значнасці дзяржаўным утварэннем нараўне з Ноўгарадам і Кіевам. Але пасля захопу Полацка ноўгарадскім князем Уладзімірам, які адначасова стаў і кіеўскім князем – кіраўніком Русі, ён часова страціў сваю незалежнасць. Першая спроба яе аднаўлення, зробленая князем Брачыславам Ізяслававічам, была няўдалай. У 1021 г. у час бітвы на р. Судамір яго войска пацярпела паражэнне ад ваяроў князя Яраслава, тым не менш, у выніку дамоўленасці паміж князямі Полацкае княства набыло гарады Віцебск і Усвяты і, такім чынам, стала кантраляваць гандлёвы шлях “з вараг у грэкі” на ўсім яго працягу.

Найбольшую магутнасць княства набыло пры Усяславе Брачыслававічу, які вядомы таксама пад іменем Чарадзей. У гэты час яно займала тэрыторыю сучаснай цэнтральнай і ўсходняй Беларусі, на поўначы межавала з Ноўгарадскай і Пскоўскай землямі і дасягала Балтыйскага мора, на ўсходзе – са Смаленскай, на поўдні – з Тураўскай, на захадзе і паўночным захадзе – з землямі балтаў.

Сярод гісторыкаў няма адзінай думкі па наступнаму пытанню: Полацкае княства ў гэты час было поўнасцю незалежным або на пэўных умовах уваходзіла ў склад Кіеўскай Русі? Але відавочна адно: у любым выпадку Усяслаў праводзіў сваю самастойную палітыку. Спачатку ён жыў у згодзе з кіеўскімі князямі, нават удзельнічаў у сумесных паходах супраць полаўцаў, але з 60-х гадоў XI ст. адносіны змяніліся. Усяслаў спрабаваў узмацніць княства за кошт Пскова, Ноўгарада, неаднойчы вёў войны з кіеўскімі князямі (у летапісу, "Слове аб палку Ігаравым" даволі падрабязна апісваецца бітва на р. Нямізе ў сакавіку 1067 г.), некаторы час займаў кіеўскі вялікакняжацкі прастол, затым некалькі гадоў вёў барацьбу з вярнуўшымся на княжанне ў Кіеў Ізяславам за Полацк. Паспяхова яе завяршыўшы, ён спрабаваў пашырыць межы княства за кошт Смаленска, у 1078 і 1084 гг. адбіў два напады Уладзіміра Манамаха на Лагожаск, Лукамль, Мінск. Пасля смерці Усяслава ў 1101 г. Полацкае княства было падзелена на некалькі ўдзелаў паміж яго сынамі, у выніку ўтварыліся, акрамя непасрэдна Полацкага, Віцебскае, Лагожскае (Лагойскае), Друцкае, Мінскае і іншыя княствы. У XII ст. цэнтрам аб'яднання стала адно з гэтых удзельных княстваў – Мінскае. Мінскі князь Глеб Усяслававіч спрабаваў пашырыць межы княства ў 1116 г. за кошт дрыгавічоў, затым разам з палачанамі зрабіў паходы на Ноўгарадскую і Смаленскую землі, але пацярпеў паражэнне ад Уладзіміра Манамаха. Мінскае і Полацкае княствы трапілі ў залежнасць ад Кіева. Пазней, у гады феадальнай раздробленасці, калі суседнія Кіеўскае і Смаленскае княствы аслабелі, беларускія княствы аднавілі сваю самастойнасць, але працягвалі барацьбу паміж сабою, што вяло да іх аслаблення.

Тураўскае княства ўтварылася ў канцы X ст. на тэрыторыі рассялення племені дрыгавічоў. Амаль увесь час свайго існавання яно знаходзілася ў падпарадкаванні кіеўскіх князёў. Праўда, у пачатку XI ст. тураўскі князь Святаполк зрабіў спробу аддзяліцца ад Кіеўшчыны, але няўдала. Пасля смерці князя Уладзіміра Святаполк, як старэйшы сын, некаторы час займаў кіеўскі вялікакняжацкі пасад, але ў міжусобнай барацьбе з братам Яраславам пацярпеў паражэнне. Толькі ў сярэдзіне XII ст. у Тураве на кароткі час устанавілася самастойная княжацкая дынастыя, але хутка княства распалася на шэраг удзельных: Тураўскае, Пінскае, Слуцкае, Клецкае, Дубровіцкае, Навагародскае, Слонімскае. Заходняя частка

княства з гарадамі Бярэсце, Драгічын увайшла ў склад Галіцка-Валынскага княства.

У канцы XII–пачатку XIII стст. усё большае значэнне стала набываць Пінскае княства Але і Тураўская, і Пінская землі знаходзіліся ў залежнасці ад Кіеўскага і Галіцка-Валынскага княстваў.

Сістэма кіравання ў Полацкім і Тураўскім княствах мела шмат падабенстваў. На чале іх стаялі князі, якія ажыццяўлялі адміністрацыйную, ваенную, судовую ўладу. Але дзейнасць князя значна абмяжоўвалася радай і вечам – агульным сходам, які збіраўся для вырашэння розных праблем. Веча магло запрасіць або пазбавіць улады князёў, як гэта і здарылася ў перыяд аслаблення цэнтралізаванага кіравання ў Полацку ў 1128, 1132, 1151, 1159 гг. Пасля ўвядзення хрысціянства значную ролю пачалі адыгрываць епіскапы. Вышэйшую ўладу ажыццяўляла таксама княжацкая адміністрацыя: падвойскі, які выконваў распараджэнні князя і рашэнні веча, ключнік, які займаўся фінансамі, цівун – гаспадарчы кіраўнік. Ваенную сілу складала дружына на чале з ваяводам, якая, у сваю чаргу, падзялялася на старэйшую і малодшую. З ліку старэйшых дружыннікаў – баяр, камплектавалася і княжацкая адміністрацыя. На месцах у гарадах таксама існавалі веча. Але звестак аб іх дзейнасці практычна няма. Тым не менш, можна зрабіць выснову, што гэтыя веча падпарадкоўваліся веча княжацкай рэзідэнцыі. На месцах гаспадарчымі справамі займаліся пасаднікі, а ваеннымі – тысяцкія. Пасаднікі і тысяцкія выбіраліся вечам або прызначаліся князем. Адрозненнем у кіраванні Тураўскага княства была значна большая роля пасадніка. Звычайна кіеўскі князь быў адначасова і тураўскім, таму ён, як правіла, знаходзіўся ў Кіеве. На гэты час усе яго функцыі ў Тураве выконваў намеснік – пасаднік. Калі ж вялікі князь прыбываў у Тураў, то фактычна ўсталёўвалася двоеўладдзе.

У цэлым жа палітычнае ўпарадкаванне Полацкага і Тураўскага княстваў было падобным да сістэмы кіравання ў іншых княствах, якія ўваходзілі ў склад кіеўскай Русі.

Закладзеныя ў X–XI стст. падмуркі эканамічнай і ваеннай магутнасці Полацкага княства сталі перадумовай таго, што ў XIII ст. яно даволі паспяхова адстойвала сваю самастойнасць і інтарэсы ў барацьбе з агрэсіяй крыжаносцаў і набегамі ардынцаў. Нямецкая

экспансія пачалася ў Прыбалтыцы з пачатку XIII ст. Заснаваўшы каля вытокаў Заходняй Дзвіны ў 1201 г. крэпасць Рыгу, крыжаносцы ўзялі пад свой кантроль важны ўчастак гандлёвага шляху "з вараг у грэкі" і пачалі пагражаць Полацкаму княству. Спачатку ім даволі пасяхова супрацьстаялі гарады Кукэйнос і Герцыке, якія былі фарпостам Полацка ў гэтым рэгіёне. Але становішча змянілася праз чвэрць стагоддзя. Заснаваны рыжскім епіскапам Альбертам Буксгэўдэнам (фон Апельдэрнам) рыцарскі ордэн мечаносцаў аб'яднаўся ў 1237 г. з Тэўтонскім ордэнам, які ў гэты час вёў вайну з прусамі, імкнучыся захапіць іх землі. З благаславення Папы Рымскага зноў створаны Лівонскі ордэн пачаў шырокамаштабную экспансію на землі Падзвіння. З другога боку, рускія княствы ў гэты час перажывалі перыяд феадальнай раздробленасці і былі аслабленымі. У выніку былі страчаны крэпасці Кукэйнос і Герцыке і на працягу дзесяткаў гадоў Полацк і іншыя рускія княствы павінны былі весці жорсткую барацьбу з крыжаносцамі (так называлі рыцараў лівонскага ордэна з нагоды крыжа, нашытага на іх плашчах). Поспеху ў барацьбе з рыцарамі садзейнічаў саюз паміж Ноўгарадам і Полацкам, замацаваны дынастычным бракам Аляксандра Неўскага з дачкой князя Брачыслава. З дапамогай полацкай дружыны Аляксандр Неўскі атрымаў перамогі над крыжаносцамі ў 1240 г. у бітве на р. Няве і ў 1242 г. на лёдзе Чудскага возера. Гэта на значны час спыніла нямецкую экспансію на рускія княствы.

Ёсць версіі, што полацкія і тураўскія дружыны ўдзельнічалі ў складзе аб'яднаных сіл старажытнарускіх княстваў і ў бітве 1223 г. на р. Калка супраць ардынскага войска. Атрымаўшы перамогу, татара-манголы на чале з ханам Батыем пачалі буйнамаштабны шматгадовы паход на захад. Яны захапілі і разрабавалі Разань, Каломну, Маскву, накіраваліся ў бок Смаленска, але абыйшлі яго і ўварваліся ў паўднёварускія землі. Захапіўшы і разрабаваўшы Кіеў, Уладзімір, Галіч, яны дасягнулі прастораў цэнтральнай Еўропы. Такім чынам, татара-манголы абыйшлі з поўдня тэрыторыю Полацкага княства, але захаваліся звесткі аб сутычках з перадавымі ардынскімі атрадамі каля гарадоў Гомель, Бярэсце, Мазыр, магчыма, каля Крутагор'я; аб абкладанні данінай некаторых гарадоў Паўднёвай Беларусі.

### 3.2. Утварэнне і развіццё Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)

У першай палове XIII ст. у Еўропе дамінавалі некалькі буйных дзяржаўных фарміраванняў – Свяшчэнная Рымская імперыя, Францыя, Іспанія. Гэтыя каталіцкія дзяржавы, асабліва Германія, прызнавалі верхавенства Ватыкана. Менавіта папства заахвочвала духоўна-мілітарысцкую актыўнасць манаскіх і рыцарскіх ордэнаў, члены якіх рэкруціраваліся пераважна на нямецкіх землях, спачатку супраць Палесціны, а затым і супраць хрысціянскіх краін, якія прытрымліваліся праваслаўя або рэгіёнаў, дзе заставалася паганская вера. Гэта ваенная экспансія пад выглядам абароны і распаўсюджвання каталіцызма галоўным чынам праводзілася ў Прыбалтыцы, дзе дзейнічаў Лівонскі ордэн. Перамога над крыжаносцамі ў 1240 і 1242 гг. кааліцыі наўгародскага і полацкага княстваў на некаторы час прыпыніла яе, але пагроза засталася. Крыжаносцы працягвалі рабіць шматлікія набегі на суседнія землі. Перад раздробленымі балцкамі плямёнамі і рускімі княствамі паўстала альтэрнатыва кансалідацыі і барацьбы з захопнікамі або прызнання іх улады.

Ваенна-палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе ўскладнілася ў сувязі з паходам мангольскага хана Батыя на Русь у 1237–1240 гг. Татара-манголы заваявалі і спустошылі землі Паўднёвай Русі. Хаця яны закранулі толькі ўскрайкі беларускай тэрыторыі, зрабіўшы набегі на гарады Гомель, Мазыр, па некаторых звестках, Бярэсце, але гэта не выключала пагрозы іх далейшай экспансіі.

На захадзе, у Польшчы, дзе манархія Пястаў распалася на тры асноўных дзяржаўных утварэнні: Вялікапольскае, Малапольскае і Мазавецкае, у гэты час назіраўся спад знешняй ваеннай актыўнасці, але набегі на памежныя тэрыторыі працягваліся.

Такім чынам, прыбалтыйскія плямёны і княствы на тэрыторыі Беларусі аказаліся ў складанай геапалітычнай сітуацыі, калі практычна з усіх бакоў можна было чакаць агрэсіі. Гэта стала асноўнай знешнепалітычнай прычынай аб’яднання ў адно дзяржаўнае ўтварэнне.

Унутранымі перадумовамі аб’яднання сталі развіццё феадальных адносін, эканамічных зносін, асаблівасці палітычнай сістэмы Русі,

працяглы вопыт міжэтнічных кантактаў з суседнімі землямі, пачатак цэнтралізацыі балцкіх плямён і выклікане гэтым з'яўленне моцных уладароў у суседняй Літве.

Гаспадарчае развіццё, рост гарадоў садзейнічалі ўмацаванню гаспадарчых сувязяў паміж асобнымі княствамі і землямі. Акрамя таго, пашырэнне права ўласнасці на нерухомасць вяло да абвастрэння сацыяльных супярэчнасцяў, што таксама спрыяла зацікаўленасці землеўладальнікаў у моцнай дзяржаўнай уладзе.

У першай палове XIII ст. на абшарах Кіеўскай Русі існавала вялікая колькасць раздробленых княстваў. На тэрыторыі сучаснай Беларусі Полацкае і Тураўскае княствы таксама распаліся на больш дробныя ўдзелы, утварыліся новыя княствы, у тым ліку і Новагародскае. Яны былі аслабленымі ў ваенных адносінах, але даволі развітымі ў эканамічнай, культурнай сферах, мелі агульныя рысы ў развіцці эканомікі, культуры, духоўнай сферы, сістэме кіравання.

Балцкія плямёны ў пачатку XIII ст. знаходзіліся на больш нізкай ступені палітычнага і культурнага развіцця. Тут існавалі плямёны, якія паступова аб'ядноўваліся ў саюзы на чале са старэйшымі князямі. Такі саюз, дзе ў ліку старэйшых адзначаўся будучы заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага Міндоўг, быў утвораны ў 30-я гг. XIII ст. Аснову яго складалі плямёны Дзяволтва, Нальшчаны, Жамойць, Аўкштайты, Літва, якія займалі тэрыторыю Прыбалтыкі і паўночна-заходняй часткі Беларусі і ў гістарычных крыніцах сталі называцца “Літвой” у шырокім сэнсе, гэтак жа тэрмін ужываецца і ў дапаможніку. Гэта аб'яднанне было даволі стабільным, нягледзячы на ўнутраныя разнагалоссі і з 1210 г., назіраецца ваенная актывізацыя літоўскіх князей. Яны зрабілі паходы на Ноўгарад, Смаленск, Полацк (аб гэтым у паэтычнай форме нават згадваецца ў “Слове аб палку Ігаравым”), Польшчу, Валынь праз Пінскае княства. У Пскове, Полацку, Друцку, Віцебску пачалі кіраваць князі літоўскай дынастыі. Балцкія плямёны з пераменным поспехам вялі барацьбу з крыжаносцамі, якія ажыццяўлялі актыўную экспансію ў Прыбалтыцы. Паходы, якія былі здзейснены літоўцамі ў 40-я гады XIII ст., ужо ўзначальваў Міндоўг, сын уладара Кернаўскага княства Рынгольда, згодна з “Ліфляндскай рыфмаванай хронікай”, вялікага князя, “ які не меў сабе роўных у Літве”. Міндоўг атрымаў ад бацькі ўдзел, які затым

пачаў называцца “Літва Міндоўга”, а пасля смерці бацькі ўзначаліў кааліцыю. Прыкладна ў 1244–1246 гг. Міндоўг ужо характарызаваўся “Ліфляндскай рыфмованай хронікай” як “магутны кароль” і “уладар Літоўскай зямлі”. Менавіта ён, абапіраючыся не толькі на мясцовае баярства і сваю вотчыну, але і на ўвесь ваенны патэнцыял Літвы ў шырокім сэнсе, стаў заснавальнікам Вялікага княства Літоўскага.

Аб’яднанне літоўскіх і рускіх (беларускіх) зямель было выгадным абодвум бакам. Літва атрымала ўжо сфарміраваны і развіты апарат кіравання, больш высокую культуру, рускія ж княствы маглі абаперціся на ваенную моц літоўцаў.

Пачатак утварэнню ВКЛ быў пакладзены аб’яднаннем у першай палове XIIIст. Навагародскай зямлі і Літвы пад уладай Міндоўга. Гэта амаль адразу выклікала супрацьдзеянне як з боку Жамойціі, якая таксама прэтэндавала на ролю аб’яднальніка зямель, так і з боку іншых суседзяў – Галіцка-Валынскага княства, Лівонскага ордэна і нават татара-манголаў, якія не адмовіліся ад намераў падпарадкаваць усю Русь. Галіцка-Валынскі князь Даніла тройчы рабіў паходы на Навагародак і Гародню. У такіх складаных умовах Міндоўг папрасіў заступніцтва ў Папы Рымскага, прыняў хрышчэнне па каталіцкаму абраду і ў 1253 г. каранаваўся. Саступіўшы частку Жамойціі крыжаносцам, а Навагародак – Галіцка-Валынскаму княству, Міндоўг гэтым самым нейтралізаваў сваіх галоўных ворагаў, затым здолеў перамагчы сваіх праціўнікаў у Літве і адбіць напад татарскага войска пад камандаваннем Бурундая каля 1258 г.

Умацаваўшы сваё становішча, Міндоўг парваў з каталіцтвам і падтрымаў барацьбу Жамойціі супраць крыжаносцаў, але ў 1263 г. быў забіты ў выніку змовы літоўскіх удзельных князёў. Аб’яднаўчы працэс прадоўжыў сын Міндоўга Войшалк, які з дапамогай пінскай дружыны і войска Галіцка-Валынскага князя здолеў у 1264 г. стаць на чале ВКЛ. Ён заваяваў землі змоўшчыкаў – Нальшчаны і Дзяволтву, пашырыў уплыў княства на Полацк і Віцебск. У 1267 г. ён перадаў уладу галіцкаму князю Шварну, які праз тры гады памёр. На працягу наступных трыццаці гадоў, перш за ўсё, у час праўлення Трайдзеня, да ВКЛ былі далучаны землі яцвягаў, адбіты спробы экспансіі з боку татара-манголаў і крыжаносцаў. У канцы XIII–пачатку XIV стст. пры князю Віцене працягвалася барацьба з

крыжаносцамі, у 1307 г., згодна з рашэннем полацкага веча, за княствам быў замацаваны Полацк. У 1320–1330-я гг., у час праўлення Гедыміна, тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага значна пашырылася за кошт Берасцейскай, Тураўскай, Пінскай зямель, Мінскага і Віцебскага княстваў. Сталіцай яго з 1323 г. стала Вільня.

Пры Альгердзе а затым і Вітаўце былі далучаны сучасныя ўкраінскія землі, Смаленскае і Бранскае княствы і дзяржава стала называцца Вялікім Княствам Літоўскім і Рускім. У склад Вялікага Княства Літоўскага пасля перамогі ў Грунвальдскай бітве ўвайшла і Жамойцкая зямля, а княства стала афіцыйна звацца Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Яно займала тэрыторыю ад Польшчы на захадзе да Падмаскоўя на ўсходзе, ад Балтыйскага мора на поўначы да Чорнага мора на поўдні і па свайму памеру раўнялася буйнейшым еўрапейскім краінам. Па этнічнаму складу ВКЛ на першай стадыі фарміравання было, як лічаць многія даследчыкі, літоўска-беларускім утварэннем, у перыяд праўлення Гедыміна і Альгерда – літоўска-беларуска-ўкраінскім і ў час канчатковага фарміравання – ўжо паліэтнічным, у асноўным, літоўска-беларуска-украінска-рускім, у якім тэрыторыя Беларусі складала каля 30% агульнай плошчы.

Шляхі ўваходжання ў ВКЛ беларускіх і іншых зямель былі рознымі: акрамя ваенных захопаў, праз дабраахвотнае ўключэнне на дагаворнай аснове, напрыклад, рашэннем Полацкага веча; шлюбныя сувязі, прыкладам можа быць далучэнне Віцебшчыны шляхам шлюбу Альгерда з мясцовай князёўнай; міждзяржаўныя дамоўленасці, такім чынам, праз дамоўленасць з Польшчай была далучана Валынь; у выніку вызвалення ад іншаземных захопнікаў, як гэта было з украінскімі землямі пасля перамогі Альгерда над татарамі ў бітве на рацэ Сінія Воды. Аб'яднанне зямель у адзіную дзяржаву ажыццяўлялася пераважна мірным шляхам, паколькі ў большасці выпадкаў гэта было выгадна абодвум бакам. Гэтаму садзейнічала і ўзважаная палітыка князёў, якія прытрымліваліся правіла "старае не рушыць, новае не ўводзіць". На далучаных землях спачатку захоўвалася старая сістэма кіравання, розныя пласты насельніцтва практычна не прыніжаліся ў правах, не рабілася ломка форм уласнасці.

Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага на працягу яго развіцця паступова мяняўся. На чале яго стаяў князь, які меў адміністрацыйную, судовую, ваенную ўладу. Але яго ўлада была неаднолькавай на рознай тэрыторыі. ВКЛ спачатку складвалася з вялікай колькасці дробных удзельных княстваў і дзялілася на дзве часткі: цэнтральную і, так званыя, "прыслухоўваючыя" землі. Вялікі князь ажыццяўляў кіраванне дзяржавай праз удзельных князёў, прычым іх улада ў "прыслухоўваючых" землях была большай. Яны дзейнічалі на правах аўтаноміі і на аснове дамоўленасцяў з вялікім князем. З сярэдзіны XIV ст. удзельныя княствы пачалі ліквідавацца, а замест іх уводзіліся ваяводствы, першымі – Віленскае і Трокскае. Канчаткова адміністрацыйная рэформа была завершана ў сярэдзіне XVI ст., калі княства было падзелена на 13 ваяводстваў і 30 паветаў.

Улада князя абмяжоўвалася радай і сеймам, прычым з цягам часу іх роля ў кіраванні дзяржавы павышалася. Спачатку рада не мела пастаяннага складу, прызначалася князем з ліку свайго прыбліжэння і найбольш уплывовых асоб і мела толькі дарадчыя функцыі. Да сярэдзіны XV ст. яна ўжо набыла адносна самастойнае значэнне як вышэйшы орган дзяржаўнай ўлады і стала называцца паны – рада. У яе склад уваходзілі вышэйшыя службовыя асобы княства. Роля рады яшчэ больш пашырылася ў канцы XV–пачатку XVI стст. Згодна з прывілеямі князя Адяксандра 1492 і 1506 гг. паны–рада атрымала права абмяжоўваць уладу князя, без яе згоды апошні не мог прымаць важнейшыя рашэнні.

З XV ст. побач з панамі – радай пачаў дзейнічаць заканадаўчы орган – агульнадзяржаўны (вальны) сейм. Спачатку, як і ў радзе, пэўнага складу сейма не было, у яго ўваходзілі буйныя феадалы, шляхта, але з 1512 г. былі ўведзены выбарнасць дэлегатаў з ліку шляхты. Паступова роля сеймаў павялічвалася. У Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1529 г. ужо прама адзначалася неабходнасць выдаваць вялікакняжацкія прывілеі выключна на вальным сейме.

Князь выконваў свае абавязкі пры дапамозе адміністрацыі, вышэйшых службовых асоб, якія пажыццёва прызначаліся з ліку прадстаўнікоў найбольш знатных прозвішчаў. Маршалак земскі старшынстваваў на пасяджэннях сойма, з'яўляўся ахоўнікам парадку і этыкета пры вялікакняжацкім двары, кіраваў прыёмам паслоў. З цягам часу была ўведзена таксама пасада маршалка дворнага. Гетман найвышэйшы камандаваў узброенымі сіламі, якія

складаліся з шляхецкага "паспалітага рушэння", наёмнікаў. Яго намеснікам быў гетман польны. Дзяржаўнай канцылярыяй кіраваў канцлер, разам са сваім памочнікам падканцлерам ён удзельнічаў у падрыхтоўцы дзяржаўных дакументаў, завяраў іх дзяржаўнай пячаткай. Дзяржаўнымі фінансамі ведаў падскарбій земскі. Яго намеснікам быў падскарбій дворны.

Характар дзяржаўнага ладу не заставаўся нязменным. Князь імкнуўся да цэнтралізацыі ўлады, але гэта зачастую сустракала супрацьдзеянне ўдзельных князёў. У гэтай барацьбе князі спрабавалі абаперціся на ваенна-служылае саслоўе – шляхту, ў выніку шляхта атрымала значныя правы, у тым ліку, права абмяжоўваць уладу князя праз сойм. Дзяржаўнае кіраванне набыло рысы саслоўна-прадстаўнічай манархіі.

На месцах нейкі час захоўваліся княствы, якімі кіравалі ўдзельныя князі. Пры іх былі такія службовыя асобы, як ключнік, канюшы, гараднічы, цівун, ляснічы.

Пасля ўтварэння ваяводстваў гэтыя адміністрацыйныя адзінкі ўзначальвалі ваяводы, якія пажыццёва прызначаліся вялікім князем і радай. У сваёй дзейнасці яны абапіраліся на намеснікаў – падваявод, якія выконвалі адміністрацыйныя і судовыя абавязкі, кашталянаў, якія стаялі на чале войска, гараднічых – камендантаў замкаў, ключнікаў, цівуноў, адказных за спагнанне падаткаў і чыншу, за ўлік дзяржаўнай маёмасці.

Кіраўнікамі адміністрацыі ў паветах былі старасты. Да ліку службовых асоб адносіліся іх намеснікі – падстарасты, харунжыя, якія збіралі апалчэнне, ахоўвалі сцягі – харугвы, маршалкі – кіраўнікі павятовых сеймікаў, а ў ваенныя часы – камандзіры апалчэнняў, цівуны, канюшыя і інш.

Саслоўна-прадстаўнічымі органамі ў ваяводствах і паветах былі ваяводскія і павятовыя сеймікі.

Ніжняй ступенню сістэмы дзяржаўнага кіравання былі дзяржаўцы. Яны ажыццяўлялі нагляд за маёнткамі. Памочнікамі дзяржаўцаў былі сельскія войты, соцкія, дзесяцкія.

У гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права, г. зн., права на самакіраванне, пэўныя ільготы, таксама ствралася гарадская адміністрацыя – магістрат, які складаўся з гарадской рады і лавы. Рада займалася справамі кіравання горадам, а лава прадстаўляла сабой судовы орган. Службовымі асобамі былі войты, бурмістры,

радцы і лаўнікі, апошнія ўдзельнічалі ў рабоце бурмістарска-радскага або войтаўска-лаўніцкага судоў.

Судовая сістэма складалася з двух катэгорый судоў – агульных і саслоўных. Да агульных адносіліся вялікакняжацкі, суд паноў – рады, камісарскі, гродскі або замкавы, апошні ўзначальваў ваявода, да саслоўных: феадальна-шляхецкі – земскі і падкаморскі, для мяшчан – войтаўска-лаўніцкі, для духавенства – царкоўны, для сялян – копны. У 1581 г. быў створаны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага– вышэйшы апеляцыйны суд княства, дзейнічаўшы з 1582 г. Суды разглядвалі справы на аснове звычаёвага права, вялікакняжацкіх прывілеяў, былі выдадзены таксама юрыдычныя зборнікі права – судзебнік князя Казіміра 1468 г., Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг.

Грамадскі лад ВКЛ меў тыповую для феадальнага ладу структуру. Існавалі два галоўныя класы: феадалаў-землеўладальнікаў і феадальна-залежных людзей. Буйныя земле-ўладальнікі, якія да таго ж удзельнічалі ў рабоце рады, з XV ст. пачалі называцца “панамі” або “баронамі”. Да іх адносіліся магнаты, частка вышэйшага духавенства.

Другую, больш шматлікую групу складалі сярэднія і дробныя феадалы, у тым ліку, асноўная частка духавенства, якія валодалі залежнымі сялянамі. Большасць з іх была прадстаўлена ваенна-служылым саслоўем – “шляхтай”, у асобных выпадках называемай “баярамі”. Яна складала невялікую частку насельніцтва ВКЛ. Паступова шляхта, акрамя права набываць землі з залежнымі сялянамі, атрымала шмат іншых правоў і прывілей: палітычную, асабістую, маёмасную недатыкальнасць, права свабоднага выезду за мяжу, магчымасць у якасці дэпутатаў сеймаў удзельнічаць у кіраўніцтве дзяржавай, займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады, падсуднасць свайму саслоўнаму суду. Яна была вызвалена ад падаткаў і павіннасцяў, акрамя выплаты падаткаў на ваенныя патрэбы і ўдзелу ў шляхецкім апалчэнні (паспалітым рушэнні). Пры гэтым прывілеі шляхты перадаваліся нашчадкам.

Да прывілегіраванага саслоўя ў ВКЛ адносілася і духавенства. Яно валодала такімі ж правамі, як і шляхта. Але духавенства па свайму маёмаснаму становішчу было неаднародным: вышэйшае прыраўнівалася да магнатаў, а нізы – да мяшчан і асабіста свабодных заможных сялян.

Гарады ў ВКЛ дзяліліся на вялікакняжацкія і прыватнаўласніцкія. Гараджане былі свабоднымі, але плацілі падаткі. Памеры іх ў прыватнаўласніцкіх гарадах вызначаў сам феадал. У гарадах, якія карысталіся магдэбургскім правам, мяшчане вызваляліся ад шэрагу абавязкаў, але ўзамен павінны былі ўдзельнічаць у выпадку войнаў у абароне горада.

Насельніцтва гарадоў было неаднародным па свайму маёмаснаму стану. Сацыяльныя вярхі прадстаўлялі заможныя купцы, уладальнікі буйных майстэрняў; сярэднія пласты – дробныя гандляры, рамеснікі і нізы – вучні майстроў, хатнія слугі і інш.

Сялянства было найбольш шматлікім саслоўем у ВКЛ. У залежнасці ад таго, каму належала зямля, сяляне падзяляліся на дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх і царкоўных.

Па ступені залежнасці сяляне адносіліся да наступных катэгорый: “пахожыя”, гэта значыць, тыя, якія яшчэ фармальна мелі права перахода з аднаго маёнтка ў другі; “непахожыя” або “отчычы”– страціўшыя гэтае права, “чэлядзь нявольная”, фактычна рабы, яны адрозніваліся ад “непахожых” тым, што не карысталіся зямлёй; “закупы” – часова залежныя.

Па форме выплаты феадальнай рэнты сяляне дзяліліся на цяглых, іх асноўным абавязкам была паншчына; чыншавых, якія ў асноўным плацілі грашовую рэнту і сялян-даннікаў, якія выплочвалі даніну прадуктамі промыслаў і сельскай гаспадаркі. Былі таксама сяляне-слугі, якія працавалі пры двары феадала.

Становішча сялян не было нязменным. Калі спачатку пераважалі “пахожыя”, якія працавалі на зямлі феадала, плацілі падаткі, але былі яшчэ асабіста свабоднымі, то згодна з прывілеем князя Казіміра 1447 г. феадалам забаранялася прымаць у сваіх маёнтках беглых сялян, а ў яго ж судзебніку 1468 г. прадугледжвалася суровае пакаранне асоб, якія садзейнічалі ўцёкам сялян. Гэтыя дакументы паклалі пачатак заканадаўчаму афармленню прыгоннага права. У выніку аграрнай рэформы 1557 г. усе сяляне замацоўваліся за валокамі і поўнасцю пераходзілі ў стан “непахожых”. Статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг. канчаткова завяршылі працэс запрыгоньвання сялян: спачатку абмежаваўшы магчымасць пераходу да другога феадала некалькімі днямі, затым устанавіўшы 10-гадовы тэрмін пошуку беглых сялян, а па Статуту ВКЛ 1588 г. вызначаўся ўжо 20-гадовы тэрмін пошуку беглых сялян.

Унутраная палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–XVI стст. вызначалася трыма асноўнымі фактарамі. Гэта барацьба за ўладу, супярэчнасці, выкліканыя імкненнем вялікіх князёў да цэнтралізацыі ўлады і сепаратызмам удзельных князёў, паланізацыя і акаталічванне насельніцтва, што вызывала канфлікты на рэлігійнай і этнічнай глебе. Усе яны былі цесна ўзаемазвязанымі: у барацьбе за ўладу той ці іншы прадстаўнік дынастыі абапіраўся на буйных феадалаў і ўдзельных князёў, якія пры гэтым імкнуліся дасягнуць сваіх мэтаў: захавання мясцовай улады, абароны маёмасных правоў; апазіцыя ж, як правіла, выступала пад сцягам абароны сваіх этнічных правоў і сваёй рэлігіі, хаця на самой справе ірвалася да ўлады. У выніку Вялікае Княства Літоўскае неаднаразова падвяргалася ўнутрыпалітычным крызісам. Яны пачаліся яшчэ ў пачатку заснавання ВКЛ, калі ішла барацьба паміж літоўскімі дынастыямі за аб'яднанне зямель і ў якую ўступіў сын Міндоўга Войшалк. Але ўнутрыпалітычная сітуацыя найбольш абвастрылася ў XIV–XV стст., што прывяло фактычна да грамадзянскай вайны і расколу ВКЛ.

Чарговы ўнутрыпалітычны крызіс узнік пасля смерці Гедыміна. Не згодныя з узвядзеннем на вялікакняжацкі прастол сына Гедыміна Яўнута, два яго браты Альгерд і Кейстут ажыццявілі дзяржаўны пераварот і сталі суправіцелямі княства. У гэты час пачалася актыўная перадача ўдзельных княстваў нашчадкам Гедыміна. Яны з цягам часу станавіліся не толькі прадстаўнікамі ўлады, але і буйнымі землеўладальнікамі, што, у сваю чаргу, рыхтавала глебу да ўзмацнення федэратыўных тэндэнцый. Але насаджэнне літоўскага землеўладання на славянскіх землях, цэнтралізацыя ўлады супярэчылі інтарэсам мясцовых феадалаў і, такім чынам, закладвалі аснову да новых унутрыпалітычных канфліктаў.

Яшчэ адзін крызіс узнік у 1377 г. пасля смерці Альгерда. Два яго сыны, Ягайла і Андрэй (Вінгальд) Полацкі распачалі барацьбу за ўладу. Ахрышчоны ў праваслаўі іменем Андрэй, князь Полацкага ўдзела зрабіў стаўку на ўсходніх праваслаўных феадалаў, рускія суседнія княствы і на збліжэнне з Маскоўскай дзяржавай. Ягайла прымусіў Андрэя ўцячы ў Пскоў і на яго месца паставіў свайго брата Скіргайлу. Выкарыстаўшы раздор паміж братамі, у 1381 г. вярхоўную ўладу ў дзяржаве захапіў Кейстут, але неўзабаве быў

узяты ў палон Ягайлам і задушаны ў Крэўскім замку. У гэтым жа годзе палачане, незадаволеныя князем-язычнікам і ўзмацненнем празаходняга накірунку ва ўладзе, паднялі паўстанне і вярнулі на княжанне ў Полацк Андрэя Альгердавіча. Андрэй у 1386 г. спрабаваў зноў выступіць супраць Ягайла, але яго войска было разбіта. Барацьба за вярхоўную ўладу працягвалася.

Каб узмацніць свае пазіцыі, Ягайла 14 жніўня 1385 г. у Крэве заключыў пагадненне з палякамі аб аб’яднанні Польшчы і Літвы, якое замацоўвалася яго шлюбам з польскай каралевай Ядвігай. Згодна з пагадненнем, Ягайла далучаў землі Вялікага Княства Літоўскага да Польшчы, станавіўся адначасова і польскім каралём. У пачатку 1387 г. Ягайла выдаў два прывілеі, у якіх абавязваў насельніцтва прыняць каталіцкую веру, знаць каталіцкага веравызнання атрымлівала неабмежаваныя правы валодання сваімі вотчынамі, а таксама вызвалялася ад шэрагу дзяржаўных падаткаў. Усё гэта азначала, па сутнасці, інкарпарацыю Вялікага Княства Літоўскага ў склад Польшчы, паланізацыю і акаталічванне насельніцтва, удзельныя ж князі гублялі сваю самастойнасць. Такая дыскрымінацыя значнай часткі арыстакратыі ВКЛ вызвала рэзкае нездавальненне. Пачаўся чарговы ўнутрыпалітычны крызіс. Узнік грамадска-палітычны рух, накіраваны супраць Ягайлы і супраць уніі. Яго ўзначаліў сын Кейстута Вітаўт. Ён выступіў з праграмай стварэння самастойнага дзяржаўнага ўтварэння, якое б супрацьстаяла, з аднаго боку, Польшчы, з другога, Маскве. Унутры дзяржавы для ажыццяўлення праграмы Вітаўт пачаў абапірацца на апазіцыйную польска-каталіцкай экспансіі знаць, за межамі ВКЛ – на крыжаносцаў. Гэта барацьба вялася з пераменным поспехам і скончылася заключэннем пагаднення паміж Ягайла і Вітаўтам у 1392 г. у маёнтку Вострава каля Ліды.

Згодна з ім, Ягайла заставаўся польскім каралём, а Вітаўт станавіўся Вялікім князем Літоўскім і прызнаваў верхавенства Ягайлы. Пазней, у 1401 г., пры заключэнні Віленска-Радамскай уніі, гэта дамоўленасць была яшчэ раз пацверджана. Але “рускага” пытання прыход Вітаўта да ўлады не вырашыў. Па дагавору паміж ВКЛ і Польшчай 1401 г. і Гарадзельскаму прывілею 1413 г. каталіцкая знаць узвышалася і атрымлівала шырокія правы, а праваслаўная знаць ВКЛ трапляла ў дыскрымінацыйнае становішча. Да гэтага трэба дадаць і ўзмацненне сепаратысцкіх настрояў

ўдзельных князёў у час барацьбы літоўскай дынастыі за вярхоўную ўладу. Пасля смерці Вітаўта гэта праблема яшчэ больш абвастрылася і пачаўся чарговы ўнутрыпалітычны крызіс.

Вялікім князем у 1430 г. стаў Свідрыгайла Альгердавіч, які да гэтага княжыў у Віцебску, пазней у Бранску, Чарнігаве, Ноўгарад-Северску. Ён пачаў дапускаць да дзяржаўнага кіравання буйных праваслаўных землеўладальнікаў, дарыць ім землі. Значную падтрымку ён знайшоў у Полацку. Гэта выклікала нездаволенасць ужо літоўскай арыстакратыі. На княжацкі пасад у 1432 г. быў узведзены Жыгімонт Кейстутавіч, які пачаў праводзіць прапольскую палітыку. Яго падтрымалі літоўскія і заходнебеларускія землі. На бок Свідрыгайлы сталі Полацкая, Віцебская, Смаленская, Кіеўская землі, Валынь і Усходняе Падолле. Супрацьстаянне прывяло да грамадзянскай вайны 1432–1436 гг. Некалькі гадоў працягваліся ваенныя дзеянні. Пасля абнародвання ў 1432 і 1434 гг. двух прывілеяў караля і князя Жыгімонта аб ураўніванні правоў католікаў і праваслаўных частка феадалаў адышла ад Свідрыгайла, ён пацярпеў паражэнне. Але і Жыгімонт , які атрымаў перамогу, быў забіты ў 1440 г. Пасля яго смерці Вялікім князем Літоўскім, а пазней і каралём Польскім стаў Казімір IV, затым, пасля кароткага княжання Аляксандра, Жыгімонт Стары. З часу кіравання Казіміра была адноўлена практыка сумяшчэння пасады караля і вялікага князя, пачатая Ягайлам.

Унутраная палітыка, якая праводзілася князямі ВКЛ, накладвала свой адбітак на знешнюю і, у сваю чаргу, адчувала значны ўплыў знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ.

Асноўнымі напрамкамі знешняй палітыкі ВКЛ у XIV–XVI стст. сталі на захадзе – адносіны з Польшчай, на паўночна-заходнім накірунку – з крыжаносцамі, на ўсходзе – з Маскоўскай дзяржавай, на паўднёвым усходзе і на поўдні – з татара-манголамі.

Ужо з пачатку XIV ст. крыжаносцы рабілі частыя набегі на землі Польшчы і ВКЛ. Яны не толькі сілай імкнуліся набыць новыя землі, але і актыўна ўмешваліся ў дынастычную барацьбу, якая не сціхала амаль увесь час у княстве. Ваенныя акцыі ВКЛ у адказ ажыццяўляліся радзей і былі менш значнымі. Напрыклад, у час праўлення Альгерда і Кейстута крыжаносцы зрабілі каля сотні набегаў, ліцвіны ж – толькі трыццаць і не заўсёды ўдалыя. Пагроза з боку крыжаносцаў падштурхоўвала і Польшчу, і ВКЛ да збліжэння.

Гэты саюз быў выгадны Вялікаму Княству Літоўскаму, паколькі адрываў Польшчу ад сувязяў з крыжаносцамі, засцерагаў ад небяспекі заходнія рубяжы і дазваляў Ягайлу ўмацаваць сваё становішча, атрымаўшы карону польскага караля, паколькі ён быў сынам Альгерда ад другой жонкі, значыць, не старэйшым. Крэўская ўнія паміж Польшчай і ВКЛ, заключаная ў 1385 г., з аднаго боку, садзейнічала мірнаму суіснаванню абодвух краін, але, з другога боку, ушчамляла суверэнітэт літоўска-беларускіх земель, мела вынікам паланізацыю і акаталічванне насельніцтва. Саюз паміж Польшчай і ВКЛ дазволіў аб'яднаць сілы ў барацьбе супраць крыжаносцаў. У 1409–1411 гг. адбылася "вялікая вайна", якую вялі Польшча і ВКЛ, з аднаго боку, і Лівонскі ордэн, з другога. Кульмінацыйным пунктам яе стала Грунвальдская бітва 15 ліпеня 1410 г., якая закончылася разгромам крыжацкага войска. З гэтага часу баявая моц ордэна была аслаблена і ён страціў дамініруючае становішча ў Прыбалтыцы.

Важным напрамкам знешняй палітыкі ВКЛ былі ўзаемаадносіны з Маскоўскай дзяржавай. Спачатку ў другой палове XIII–XIV стст. ваенная перавага была на баку ВКЛ, якое вяло актыўную палітыку па далучэнню былых земель Кіеўскай Русі. На Маскву неаднаразова рабіў паходы Альгерд, на Смаленск – Вітаўт. Альгерд далучыў да ВКЛ землі на Дняпры і Сожы, большую частку Украіны, частку заходніх земель сучаснай Расіі. Вітаўт канчаткова авалодаў Смаленскам, устанавіў пратэктарат над Ноўгарадам і Псковам, спрабаваў, карыстаючыся аслабленнем Маскоўскай дзяржавы і міжусобіцамі ў Залатой Ардзе, з дапамогай татарскага хана Тахтамыша стаць уладаром усёй Рускай зямлі, але атрымаў паражэнне ў 1399 г. у бітве з ардынскім войскам на рацэ Ворскле.

У XV ст. назіралася пэўная раўнавага ва ўзаемаадносінах паміж Масквой і ВКЛ. У канцы XV–пачатку XVI стст. Маскоўскае княства ўзмацнілася, ператварылася ў цэнтралізаваную дзяржаву, павысіла свой уплыў у Ноўгарадзе, Цверы і пасля канчатковага вызвалення з-пад апекі Залатой Арды з 1480 г. накіравала сваю дзейнасць на зварот і аб'яднанне земель, якія раней уваходзілі ў Кіеўскую Русь. Гэта супала з абвастрэннем унутрыпалітычных і ўнутрыканфесійных супярэчнасцяў унутры ВКЛ і ўзмацненнем прамаскоўскіх настрояў ва ўсходніх княствах ВКЛ. Пад лозунгам абароны праваслаўя Масква імкнулася рознымі шляхамі далучыць іх да

Маскоўскай дзяржавы. З канца XV ст. пачалася серыя войнаў: ваенныя кампаніі 1492–1494 гг., 1500–1503 гг; 1507–1508 гг.; 1512–1522 гг.; 1534–1537 гг., у выніку якіх Маскоўская Русь адваявала трэцюю частку ўсходніх зямель ВКЛ. Пералом у ходзе ваенных дзеянняў не адбыўся і ў выніку перамогі войска ВКЛ 8 верасня 1514 г. пад Оршай. Вялікае Княства Літоўскае страціла Смаленск, вайна перакінулася ўжо на тэрыторыю Беларусі і Украіны.

У 1558 г. пачалася вайна паміж Рускай дзяржавай, якая прэтэндавала на выхад да Балтыйскага мора, і Лівонскім ордэнам. Пасля таго, як ВКЛ ўзяла ордэн пад сваю апеку, тэрыторыя Беларусі стала асноўным тэатрам вайны. У 1563 г. быў захоплены Полацк. Гэта стварыла сур'ёзную небяспеку для захавання цэласнасці ВКЛ і стала адной з прычын заключэння Люблінскай уніі паміж ВКЛ і Польшчай.

На поўдні ВКЛ амаль з самага пачатку свайго існавання вяла барацьбу з татара-манголамі, якія перыядычна рабілі набегі на гэтую тэрыторыю. У 1362 г. ваяры пад камандаваннем Альгерда разбілі ардынскае войска ў бітве на рацэ Сінія Воды і надоўга спынілі агрэсію Арды. Выкарыстаўшы міжусобіцы ўнутры Залатой арды, Вітаўт заключыў пагадненне з ханам Тахтамышам аб сумеснай барацьбе супраць Маскоўскай дзяржавы, але далейшыя іх сумесныя дзеянні былі няўдалымі. З другой паловы XV ст. абвастрыліся адносіны паміж ВКЛ і Крымскім ханствам. Толькі з 1500 па 1569 гг. войскі крымскага хана 45 разоў ўрываліся ў межы ВКЛ. У выніку буйнай бітвы пад Клецкам 6 жніўня 1506 г. і іншых ваенных дзеянняў ВКЛ здолела абараніць свае межы.

Такім чынам, знешняя палітыка ВКЛ была даволі markднабаковай: ад дыпламатычных дамоўленасцяў і заключэння міждзяржаўных саюзаў да адкрытай барацьбы, якая мела і наступальны, і абарончы характар.

Асновай эканамічнага жыцця ў XIII – першай палове XVI стст. была сельская гаспадарка. Зямля ў гэты час належала феадалам. Спачатку вярхоўным яе ўласнікам лічыўся вялікі князь, які дараваў зямельныя ўгоддзі прыбліжаным ў часовае карыстанне. Паступова яны пераходзілі ў спадчыннае ўладанне і ўжо прыкладна з XIV ст., акрамя княжацкай або дзяржаўнай, пачалі пашырацца прыватнаўласніцкія і царкоўныя формы ўласнасці на зямлю. Рост феадальнага землеўладання адбываўся рознымі шляхамі:

вялікакняжацкімі падараваннямі, дарэннямі з боку буйных феадалаў васалам ці царкве, купляй-продажам, залогам (заставай) і інш. Найбольш буйным землеўладальнікам быў сам вялікі князь. Спачатку не было дакладнага раздзялення на яго непасрэдную ўласнасць і ўласнасць дзяржавы. Але з цягам часу пачаў утварацца непасрэдна вялікакняжацкі домен, свайго рода яго вотчына, і асобна – дзяржаўныя, магнацкія, царкоўныя землеўладанні. Калі ў XIV ст. пад уладай вялікага князя было 80% сялян, то ў 20-я гг. XV ст. іх колькасць зменшылася да 30%. За магнатамі захавалася кіруючая палітычная роля ў дзяржаве. Да XVI ст. прыватнае землеўладанне стала ўжо пераважным і налічвала каля 65% ўсіх зямель. Для Вялікага Княства Літоўскага характэрнай была наяўнасць менавіта буйнага землеўладання. У сярэдзіне XV ст. 29 магнатаў валодалі 40% усіх прыватнаўласніцкіх зямель. Ва ўладанне феадалам даваліся цэлыя воласці, маёнткі, вёскі з насельніцтвам. Адпаведна і сяляне падзяляліся на дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх, царкоўных. Галоўнымі іх заняткамі былі земляробства, жывёлагадоўля, а дапаможнымі – паляванне, рыбалоўства.

Па меры развіцця феадальных адносін ў XV–XVI стст. асноўнай формай абавязкаў стала паншчына і грашовы аброк – чынш. За карыстанне зямельнымі надзеламі сяляне павінны былі таксама выплочваць даніну прадуктамі раслінаводства, якая называлася “дзякла”, а таксама мяснымі прадуктамі – “мезлева”.Акрамя таго, сяляне павінны былі выходзіць на сумесныя работы – талокі, згоны, будаваць і рамантаваць замкі, масты, дарогі, ўтрымліваць войска, адвозіць на фурманках грузы, несці вартавую службу і г.д. Людзі, якія ў асноўным адпрацоўвалі паншчыну на землях феадала, называліся цяглымі, якія ж пераважна плацілі грашовы чынш – асаднымі. Феадальная рэнта спаганялася звычайна з асобных сялянскіх гаспадарак, якія ў гістарычных крыніцах фігуруюць пад тэрмінам “дым”. Практыкаваўся збор даніны і з некалькіх сем’яў, звычайна сваяцкіх, якія складалі асобныя адзінкі падаткаабкладанняў – дворышчы. У XIV–XVI стст. у асяроддзі сялян ужо развівалася маёмасная дыферэнцыяцыя. Пра яе наяўнасць сведчаць адрозненні ў забяспячэнні асобных сялянскіх гаспадарак зямлёй, памерах падаткаў. Разам з самастойнымі ў гаспадарчых адносінах вытворцамі ў многіх маёнтках былі і збяднелыя сяляне, іх называлі агароднікамі, кутнікамі, халупнікамі.

Развіццё таварна-грашовых адносін, рост попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю на Захадзе садзейнічалі ўздыму сельскай гаспадаркі, прымушалі ўдасканальваць феадальную сістэму гаспадарання, павялічваць вытворчасць прадукцыі на продаж.

З мэтай павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці, павялічвання даходнасці маёнткаў у 1557 г. Жыгімонт II Аўгуст правёў на дзяржаўных землях аграрную рэформу, якая затым атрымала назву "валочная памера". Уся зямля дзялілася на валокі памерам 33 моргі (морг раўняўся 0,71 га) або 21,36 га., лепшыя з якіх адводзіліся непасрэдна пад гаспадарку землеўладальніка, якая называлася фальварак. Іншыя раздаваліся сялянам у падворнае карыстанне. "Устава на валокі" прадугледжвала суадносіны фальваркавага і сялянскага ворыва як 1 да 7. Гэта значыць, што адну фальваркавую валоку апрацоўвалі прыгонныя, якія карысталіся 7 валокамі. У залежнасці ад колькасці і якасці атрыманай у карыстанне зямлі вызначаўся і памер павіннасцяў, якія выконвалі сяляне. Яны былі рознымі для цяглых і асадных земляробаў. Цяглыя сяляне павінны былі за адну валоку адпрацоўваць паншчыну 2 дні ў тыдзень, а таксама плаціць чынш ад 6 да 21 грошаў з валокі і аброк прадуктамі. Асадныя сяляне ў асноўным плацілі чынш ад 66 да 106 грошаў у год з валокі, у залежнасці ад яе якасці. Акрамя таго, для ўсіх заставаліся такія павіннасці, як гвалты і талокі, розныя віды работ па пабудове і рамонту збудаванняў, дарог, мастоў і г.д.

Аграрная рэформа не толькі ўпарадкоўвала землеўладанні і павялічвала іх даходнасць, але і замацоўвала сялян за валокамі, усе яны станавіліся "непахожымі". Па выніках рэформы колькасць зямельных участкаў, якія былі ў сялянскім карыстанні, зменшылася, справа ў тым, што памеры павіннасцяў у разліку з валокі былі настолькі высокімі, што ў сярэднім адну валоку апрацоўвалі дзве сям'і. Ажыццяўленне рэформы прывяло да паступовай замены абшчыннага землекарыстання падворным.

Валочная памера садзейнічала развіццю фальварачна-баршчыннай сістэмы гаспадарання і вызначыла напрамак развіцця сельскай гаспадаркі на цэлыя стагоддзі, да адмены прыгоннага права. Змянілася ў бок павышэння таварнасці і сутнасць фальваркаў: у іх большая частка атрыманай прадукцыі выкарыстоўвалася ўжо не для асабістага спажывання, а для продажу на рынках.

Паступова ўслед за вялікакняжацкім даменам гэта рэформа была праведзена і на прыватнаўласніцкіх, царкоўных землях, але ў асноўным у заходняй і цэнтральнай Беларусі. На ўсходзе яна праводзілася больш марудна або зусім не практыкавалася. Прычына заключалася ў частых войнах з Маскоўскай дзяржавай, якія закраналі гэту тэрыторыю, зменах дзяржаўных межаў.

У XIII–XVI стст. у ВКЛ, як і ў цэлым у Еўропе, хутка развіваліся рамесная вытворчасць, гандаль і адпаведна павялічвалася колькасць гарадоў. У Беларусі ў гэты час налічвалася каля 40 гарадоў і больш за 200 мястэчак, якія адрозніваліся ад гарадоў меншай колькасцю насельніцтва і адсутнасцю абарончых збудаванняў. Каля 40 % гарадоў і амаль усе мястэчкі былі прыватнаўласніцкімі, гэта значыць, належалі феадалам. Астатнія былі вялікакняжацкімі або дзяржаўнымі. З цягам часу ў некаторых дзяржаўных гарадах з'явіліся юрыдыкі, гэта значыць, асобныя кварталы або часткі, якія належалі феадалам або царкве.

Дакументы XVI ст. згадваюць пра наяўнасць больш за 100 відаў рамёстваў, найбольш распаўсюджанымі з іх былі апрацоўка металаў, ювелірная справа, ганчарства, ткацтва і інш. У гарадах і мястэчках регулярна наладжваліся кірмашы. Акрамя ўнутранага рынка, значная частка прадукцыі адпраўлялася на продаж за мяжу. Рамеснікі ў XV–XVI стст. для абароны інтарэсаў пачалі ствараць свае прафесійныя аб'яднанні – цэхі. Рамеснікі прыватнаўласніцкіх гарадоў частку сваёй прадукцыі здавалі ў гаспадарку феадала.

### 3.3. Цывілізацыйныя працэсы Новага часу. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – XVIII стст.)

Пачатак Новага часу характэрны значнымі зменамі ў сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці еўрапейскіх і азіяцкіх краін. У выніку вялікіх геаграфічных адкрыццяў – Амерыкі з яе вялікімі багаццямі, марскога шляху з Еўропы ў Індыю і інш., а таксама значнага павялічвання колькасці навуковых дасягненняў, якія потым атрымалі назву навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, пачалося хуткае развіццё прадукцыйных сіл і накапленне багацця ў вядучых краінах. На змену сярэднявеччу з пераважна натуральнай гаспадаркай прыйшоў новы тып эканомікі, сацыяльнай структуры, ідэалогіі. Пачаўся працэс фарміравання буржуазіі, з аднаго боку,

наёмных рабочых, з другога, і адначасова рост сацыяльнай напружанасці ў грамадстве. У палітычнай сферы праявілася тэндэнцыя да фарміравання спачатку саслоўных манархій, а затым і абсалютызма, геапалітычнай сістэмы буйных дзяржаў. Такімі абсалютысцкімі рэжымамі былі Свяшчэнная Рымская імперыя, Шведскае каралеўства, Іспанія, Англія, Францыя, Расія, Асманская імперыя. Абвастрыліся супярэчнасці паміж гэтымі дзяржавамі, пачасціліся выпадкі экспансіі. Імкнуліся да пашырэння свайго, перш за ўсё, палітычнага ўплыву і бліжэйшыя суседзі Беларусі – Расійская дзяржава і Польшча.

У сярэдзіне XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае аказалася ў складаным становішчы. Яно вяло барацьбу супраць нападаў з поўдня, поўначы. У 1558 г. рускі цар Іван IV пачаў вайну з Лівонскім ордэнам за выхад да Балтыйскага мора. Лівонія звярнулася за дапамогай да Вялікага Княства Літоўскага, якое згадзілася ўзяць ордэн пад свой пратэктарат. У выніку ваенныя дзеянні перакінуліся на тэрыторыю Беларусі. 15 лютага 1563 г. рускія войскі захапілі г. Полацк. Стварылася пагроза захавання цэласнасці і самастойнасці ВКЛ. Не хапала сіл і рэсурсаў. Быў патрэбен саюзнік. Пагроза з боку Маскоўскай дзяржавы з’явілася адной з важнейшых прычын утварэння Рэчы Паспалітай. З пункту гледжання знешняй палітыкі ў такім саюзе была зацікаўлена і Польшча, якая спадзявалася такім чынам павялічыць сваю моц і тым самым засцерагчыся ад магчымых нападаў туркаў.

Да ўнутраных прычын заключэння ўніі можна аднесці зацікаўленасць у ёй сярэдняй і дробнай шляхты ВКЛ, якая адчувала засілле буйных магнатаў і была не супраць атрымаць тыя ж правы, як і ў шляхты Кароны. З другога боку, шляхта Польшчы хацела пашырыць за лік тэрыторыі ВКЛ свае зямельныя ўладанні. Ва ўніі была зацікаўлена і каталіцкая царква, якая спадзявалася такім чынам пашырыць свой уплыў на Усходзе.

Заключэнню ўніі садзейнічалі папярэдняе эканамічнае, палітычнае і культурнае збліжэнне ВКЛ і Кароны, якое адбывалася на працягу стагоддзяў, пачынаючы з Крэўскай уніі 1385 г., а таксама адзіная адміністрацыя каталіцкай царквы.

У 1562 г. шляхта ВКЛ на палявым сейме каля г. Віцебска прыняла і накіравала вялікаму князю прапанову аб заключэнні ўніі з Польшчай. Віленскі сейм 1563 г. згадзіўся з ёй і выбраў дэлегацыю

для перагавораў з Польшчай. Перамовы былі цяжкімі і працяглымі, паколькі польскі бок настойваў на інкарпарацыі Вялікага Княства Літоўскага ў склад польскай дзяржавы, і толькі ў студзені 1569 г. пачаў сваю працу супольны сейм у г. Любліне. Літоўская дэлегацыя імкнулася да раўнапраўнага саюза, але безпаспяхова. Польскі бок пайшоў на дэманстрацыю сілы, захапіўшы з дапамогай указа караля землі, якія ўваходзілі ў той час у склад ВКЛ: Падляшша, Падолле, Валынь і Кіеўшчыну. У гэтых абставінах дэлегацыя ВКЛ вымушана была 1 ліпеня 1569 г. падпісаць унію аб утварэнні разам з Польшчай агульнай дзяржавы– Рэчы Паспалітай. Вышэйшым органам аб'яўляўся аб'яднаны вальны сейм, які збіраўся ў Польшчы і ў якім пераважалі дэпутаты ад Польшчы. Узначальваў дзяржаву выбарны кароль, ён жа захоўваў тытул Вялікага князя ВКЛ. Палякі атрымалі права набываць маёнткі ў ВКЛ, а ліцвіны – ў Польшчы. У ВКЛ захоўваліся ранейшы адміністрацыйны апарат, асобнае ад Польшчы заканадаўства, судовая арганізацыя, войска, асобная фінансавая сістэма.

Рашэнні Люблінскага сейма насілі ў цэлым дыскрымінацыйны характар у адносінах да ВКЛ. Але за гады так званага "безкаралеўя", якое цягнулася некалькі гадоў, цэнтральная ўлада аслабла і гэта выкарысталі кіраўнікі Вялікага Княства Літоўскага для дэнансацыі шэрагу палажэнняў Люблінскай уніі. Так, напрыклад, у прынятым у 1588 г. Статуце ВКЛ палякам забаранялася набываць землі ў ВКЛ. Там жа юрыдычна замацоўвалася ў якасці мовы справаводства старабеларуская мова. Насуперак уніі, у ВКЛ сталі збірацца асобныя сеймы, а з XVII ст. кожны трэці сейм стаў праходзіць у княстве, у г. Гродна. У 1581 г. быў створаны, а з 1582 г. пачаў дзейнічаць асобны вышэйшы судовы орган – Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага.

З уваходжаннем ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай мясцовая сістэма кіравання засталася ранейшай, але дзяржаўны лад некалькі змяніўся. На чале дзяржавы стаяў выбарны манарх-кароль. Але яго паўнамоцтвы былі абмежаваны сеймам. Яшчэ з часу праўлення ў 1574 г. Генрыха Валуа была ўведзена практыка прыняцця ад караля ў час выбараў на каранацыйным сейме пэўных абавязацельстваў перад магнатамі і шляхтай, а таксама пацвярджэнне раней прынятых папярэднікамі. Згодна з "Генрыкавымі артыкуламі" і "Пакта канвента" правы караля былі вельмі абмежаваны сеймам і

сам ён знаходзіўся пад кантролем 16 сенатараў. Кароль абавязваўся захоўваць вольнасці шляхты, з другога боку, шляхта атрымала права ўтвараць аб’яднанні (канфедэрацыі) і ў выпадку адмовы караля выконваць дамоўленасці аказваць яму ўзброенае супраціўленне (рокаш). Хаця фармальна ён яшчэ тытулаваўся вялікім князем, але ў кіраванні дзяржавай землі ВКЛ не дыферэнцыраваліся. Адпаведна страціла сваё значэнне паны-рада, хаця фармальна яна працягвала сваё існаванне.

Заканадаўчая ўлада належыла сейму, але паслы ад ВКЛ мелі на ім толькі трэцюю частку месц. Па прыкладу Польшчы сейм Рэчы Паспалітай стаў падзяляцца на дзве палаты: Сенат, які складаўся з прадстаўнікоў адміністрацыі, магнатаў, вышэйшага духавенства, і Пасольскую Ізбу. У гэтую ніжнюю палату дэпутаты выбіраліся на павятовых сейміках. Усе важныя рашэнні кароль павінен быў прымаць са згоды сейма, але работа сеймаў была фактычна паралізавана пасля ўвядзення ў 1652 г. права “ліберум вета”, гэта значыць, выключна аднагалоснага прыняцця рашэнняў. Аслабленне цэнтральнай улады вяло да феадальнай анархіі. Так, з 1652 па 1764 гг. 48 пасяджэнняў сейма з 55 былі сарваны з-за выкарыстання “ліберум вета”.

З другой паловы XVII ст. з мэтай павялічвання польскага ўплыву на ВКЛ пачалася паланізацыя і акаталічванне, што прывяло ў Рэчы Паспалітай да дэзінтэграцыі грамадства па нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці. Магнаты і шляхта ўсё больш апалячваліся. У 1696 г., насуперак Статуту ВКЛ 1588 г., адзінай мовай справаводства стала польская, у выніку беларуская мова захавалася толькі ў гаворках простага народа. У гэтым жа годзе шляхта ВКЛ, якая ўжо амаль цалкам асімілiравалася, была канчаткова ўраўнена ў правах з польскай у адносінах кантроля за дзейнасцю вышэйшых службовых асоб. Гэта быў значны крок у сацыяльнай і палітычнай кансалідацыі прывілеяваных саслоўяў.

Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі з другой паловы XVI ст. вызначалася аграрнай рэформай 1557 г. Жыгімонта Аўгуста (Валочная памера). Ішоў працэс фарміравання і развіцця фальварачна-баршчыннай гаспадаркі. Вынікам аграрнай рэформы былі ўдасканаленне арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, фарміраванне і развіццё фальварачна-баршчыннай гаспадаркі. Але

Валочная памера адначасова ўзмацніла і феадальны ўціск сялян, завяршыла іх канчатковае запрыгоньванне.

Пасля кароткачасовага эканамічнага пад'ёму з другой паловы XVII ст. пачаўся эканамічны заняпад, выкліканы шматлікімі войнамі, якія вяла ў гэты час Рэч Паспалітая, скарачэннем ў два разы насельніцтва ў выніку войнаў, эпідэмій, неўраджаеў, адпаведна, змяншэннем колькасці ворыўных зямель, а таксама феадальнымі міжусобіцамі, калі ў ходзе міжусобных ваенных дзеянняў таксама руйнаваліся паселішчы і знішчаліся пасевы. Усё гэта прыводзіла да ўзмацнення феадальнага ўціску, павялічвання падаткаў. Сяляне ў асноўным адпрацоўвалі паншчыну і плацілі чынш. Але да сярэдзіны XVIII ст. колькасць адпрацовачных дзён у тыдзень на сям'ю з цяглай валокі даходзіла да 12 і нават 16, хаця па "Уставе на валокі" сям'я павінна была адпрацоўваць толькі два дні за валоку. Адпаведна ўзраслі і грашовыя паборы, якіх даследчыкі налічылі 56 найменняў. Плацілі нават за права хадзіць у панскі лес, за права выйсці замуж у другую воласць. Акрамя таго, сяляне павінны былі рамантаваць дарогі і масты, удзельнічаць у згонах і талоках, плаціць дзяржаўныя падаткі ("падымнае", "рэйтаршчыну" і інш), выконваць іншыя шматлікія павіннасці.

З другой паловы XVII ст. стала шырока практыкавацца перадача маёнткаў у арэнду, але гэта прывяло да яшчэ большай эксплуатацыі сялянства. Усе падарожнікі, якія праязджалі ў гэты час праз беларускія землі і пакінулі свае запісы, адзначалі галечу насельніцтва. Напрыклад, польскі дзеяч Ю. Выбінскі ў 1776 г. пісаў: "Спосаб жыцця сялян жудасны. Іх спосаб жыцця нельга параўнаць з палажэннем жывёлы, якая знаходзіцца ў руках добрага гаспадара". Цяжкае эканамічнае становішча сялянства прыводзіла да сацыяльных канфліктаў, хаця яны не атрымалі ў Беларусі такіх шырокіх маштабаў, як, напрыклад, сялянскія войны ў Расіі. Прычыны былі не толькі ў ментальнасці беларускага насельніцтва, але і ў прыродных асаблівасцях. Сялян часта ыратоўвалі ад голада дары лесу, дзічына, рыба ў шматлікіх рэках, або міграцыя на Украіну, да казакаў. Тым не менш, хваля выступленняў ахапіла Палессе, Віцебшчыну, Аршаншчыну, Случчыну. Найбольш буйнымі сялянскімі выступленнямі былі паўстанні 1740–1744 гг. у Крычаўскім старостве і 1754–1756 гг. у Мазырскім павеце.

Паступовы эканамічны пад’ём пачаўся толькі з 30–40-х гг. XVIII ст. Гэтаму садзейнічалі рост попыту на знешнім і ўнутраным рынках на сельскагаспадарчыя тавары з прычыны павялічвання колькасці гарадоў і насельніцтва ў іх, прынятыя меры па развіццю гандлю і сродкаў зносін: пракладзены каналы, тракты, зацверджаны адзіныя меры вагі, аб’ёму, даўжыні. У гэты час улады і землеўладальнікі пачалі стымуляваць заворванне сялянамі свабодных валок шляхам часовага вызвалення ад павіннасцяў за гэтыя землі і перасялення іх на так званыя “слабоды”. У выніку да сярэдзіны XVIII ст. агульная плошча сялянскіх надзелаў была адноўлена. У панскіх гаспадарках удасканальвалася агратэхніка вырошчвання асноўных сельскагаспадарчых культур, развівалася жывёлагадоўля. Але адначасова павялічваўся феадальны прыгнёт сялянства, узмацнялася сацыяльная дыферэнцыяцыя насельніцтва вёсак. Гэта сведчыла аб пачатку разлажэння феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі.

Прыкладна аналагічны працэс праходзіў і ў гарадах. Другая палова XVI і першая палова XVII стст. былі адзначаны значным ростам колькасці гарадоў і гарадскога насельніцтва, але ў часы ваеннага ліхалецця другой паловы XVII ст. большасць гарадоў і мястэчак Беларусі была спустошана, некаторыя цалкам спалены. З гэтай прычыны сейм Рэчы Паспалітай нават быў вымушаны прыняць пастанову аб вызваленні гарадоў ад падаткаў. Аднаўленне эканамічнага жыцця ў гарадах і мястэчках пачалося ў другой палове XVIII ст., але да канца гэтага стагоддзя так і не была адноўлена колькасць гараджан, якая была ў першай палове XVII ст. Да гэтага часу цэхавая сістэма паступова ўступала ў стадыю разлажэння, хаця рамёствы былі распаўсюджаны ў гарадах.

Новым у развіцці прамысловасці стала з’яўленне мануфактурнай вытворчасці. Спачатку мануфактуры былі заснаваны на прыгоннай працы. Першая шкляная мануфактура была створана ў Налібоках цяперашняга Стаўбцоўскага раёна, затым з’явілася фаянсавая мануфактура ў пасёлку Свержань гэтага ж раёна. Буйнымі прадпрыемствамі для таго часу былі шкляная мануфактура ва Урэччы, дзе выраблялі посуд з крышталя, мануфактура па вытворчасці паясоў у Слуцку, суконная і палатняная мануфактуры ў мястэчку Ружаны і іншыя. У канцы XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўжо дзейнічалі звыш 50 прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу.

Адначасова з пад'ёмам эканомікі, ростам гарадоў і развіццём прамысловасці ў XVIII ст. значна ажывіўся гандаль. Ва ўнутраным гандлі спачатку пераважалі кірмашы, затым усё большае распаўсюджанне сталі набываць крамы.

Такім чынам, Беларусь у сваім сацыяльна-эканамічным развіцці на працягу XVII–XVIII стст. прайшла перыяд заняпаду, а з другой паловы XVIII ст. эканамічнае становішча пачало пастутова паляпшацца. Усё большае значэнне стала набываць таварная вытворчасць, з'явіліся новыя формы прамысловасці, актывізаваўся гандаль.

У другой палове XVIII ст. Рэч Паспалітая была значна аслабленай у ваеннай, эканамічнай і палітычнай сферах, што выкарысталі суседнія дзяржавы для яе падзелу. Прычыны заняпаду былі наступнымі.

Рэч Паспалітая, у тым ліку і Беларусь, у гэты час стала арэнай ваенных дзеянняў паміж буйнымі еўрапейскімі дзяржавамі. Лівонская вайна, якая працягвалася з 1558 па 1582 гг., закончылася ў цэлым паспяхова. Па Ям-Запольскаму мірнаму пагадненню, заключанаму з Расійскай дзяржавай, да Рэчы Паспалітай адыходзіла большая частка Лівоніі, а таксама ўласныя землі, захопленыя рускімі войскамі падчас ваенных дзеянняў. Хутка пасля Лівонскай вайны пачаліся ваенныя дзеянні паміж Польшчай і Швецыяй, якія цягнуліся з 1600 па 1629 гг., прычым, нягледзячы на гэта, польскі кароль адначасова зрабіў спробу ўмацаваць свой уплыў на ўсходзе. У 1604–1609 гг. Рэч Паспалітая тройчы распачынала інтэрвенцыю супраць Маскоўскай дзяржавы, спачатку пад прыкрыццём міфа аб узвядзенні на маскоўскі трон царэвіча Дзмітрыя, малодшага сына Івана IV, а затым і прамую, прычым небезпаспяхова. На працягу 1610–1612 гг. маскоўскім царом быў сын польскага караля Уладзіслаў, але затым ён усё ж быў вымушаны пакінуць межы дзяржавы. Тым не менш, да Рэчы Паспалітай адышлі Смаленск і Чарнігава-Северская зямля.

Хутка пасля гэтага пачалося паўстанне казакаў пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Пасля няўдалай для паўстанцаў бітвы пад Лоевым, якая адбылася ў 1649 г., Б. Хмяльніцкі звярнуўся за дапамогай да Расіі. Рада казакаў у Пераяслаўлі ў 1654 г. прыняла рашэнне аб уваходжанні Украіны ў склад Расійскай дзяржавы на правах аўтаноміі. У выніку гэтага паўстанне перарасло ў руска-польскую вайну, якая зноў закранула землі Беларусі, прыносячы

спусташэнні. Адначасова ў 1655 г. шведскі кароль Карл X Густаў пачаў вайну супраць Рэчы Паспалітай і захапіў Варшаву. Польска-шведская вайна цягнулася да 1660 г., руска-польская – аж да 1667 г. Апошняя закончылася Андрусаўскім перамір'ем, згодна з якім да Расіі адыходзілі Смаленскае, Чарнігаўскае ваяводствы, левабярэжная Украіна разам з г. Кіевам, Запарожжа. У выніку гэтых войн насельніцтва Беларусі зноў скарацілася ў 2 разы. У час руска-шведскай вайны 1700–1721 гг. частка беларускіх магнатаў падтрымала шведаў, частка – расійскага цара Пятра I, у выніку чаго вайна ўскладнілася супрацьстаяннем магнацкіх груповак, якое суправаджалася знішчэннем маёнткаў, вёсак сваіх працаўнікаў, за гады "Паўночнай вайны" загінуў кожны трэці жыхар Беларусі, ды і ў цэлым Рэч Паспалітая к канцу XVIII ст. аказалася аслабленай у палітычных, эканамічных, дэмаграфічных адносінах. Яе становішча ўскладнялася таксама нацыянальна-рэлігійнымі і сацыяльнымі канфліктамі. Гэтыя канфлікты, асабліва рэлігійныя, ўсяляк заахвочвалі суседнія дзяржавы, якім было выгадна мець слабага суседа.

Моц дзяржавы падрывалася таксама феадальнай анархіяй. Улада караля была вельмі слабай, дзейнасць сеймаў паралізавала права "ліберум вета". Гэта анархія ўзмацнялася барацьбой паміж магнацкімі групоўкамі. Узброеныя сутыкненні часам перараслі ў сапраўдныя бітвы з удзелам тысяч людзей, прымяненнем цяжкага ўзбраення, асадай замкаў і г.д., фактычна, набывалі форму вайны ўнутры дзяржавы. Так было, напрыклад, у час буйнага канфлікта паміж групоўкай магнатаў на чале з гетманам Казімірам Сапегам і антысапегаўскай апазіцыяй, які цягнуўся з 1696 па 1700 гг. Гэта анархія яшчэ больш абвастралася барацьбой буйных магнатаў за ўладу. Сапегі то падтрымлівалі караля, то выступалі супраць яго, Радзівілы займалі то прашведскую пазіцыю, то прафранцузскую, Пацы – прааўстрыйскую, Чартарыйскія – прарускую. Супрацьстаянні паміж групоўкамі Пацаў, Агінскіх суправаджаліся чалавечымі ахвярамі і разбурэннямі.

Эканамічны заняпад і палітычны разброд аслаблялі ваенную магутнасць Рэчы Паспалітай. Шляхта з неахвотай і неарганізавана збіралася на "паспалітыя рушэнні" і па сваіх баявых якасцях уступала рэгулярным войскам іншых краін.

Жорсткія формы феадальнай эксплуатацыі, захаванне адсталых форм паншчыны пазбаўлялі сялян стымулаў да працы, прыводзілі да самага нізкага ўзроўню жыцця і гэтым самым аслаблялі ў цэлым эканоміку краіны.

У 1764 г. на польскі трон быў узведзены Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Ён паспрабаваў правесці абмежаваныя рэформы: часткова адмяніў права "ліберум вета", некаторыя эканамічныя прывілегіі шляхты, зрабіў захады па ўпарадкаванню фінансавай сістэмы дзяржавы. Але гэта не задавальняла суседнія дзяржавы, асабліва Расію і Прусію, якія былі зацікаўлены ў слабасці Рэчы Паспалітай. У 1764 г. паміж імі была нават заключана дамоўленасць, некаторыя артыкулы якой прадугледжвалі захаванне ў Рэчы Паспалітай шляхецкіх вольнасцяў, права "ліберум вета", выбараў караля. Падставай для прамога ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай стала рэлігійнае пытанне. Пад выглядам абароны правоў праваслаўных і ўніятаў Расія і Прусія садзейнічалі стварэнню ў Слуцку праваслаўнай, у Торуні пратэстанцкай канфедэрацый. На дапамогу ім былі накіраваны рэгулярныя войскі. Калі ж у 1767 г. сейм Рэчы Паспалітай ураўняў правы католікаў і праваслаўных, гэта ўжо выклікала нездавальненне часткі каталіцкай шляхты і магнатаў. Яны стварылі ў 1768 г. у г. Бары каталіцкую канфедэрацыю. Пачаліся ваенныя дзеянні, у якіх актыўна ўдзельнічалі і рускія войскі. Гэтую сітуацыю выкарысталі Расія, Прусія і Аўстрыя, якія ў 1772 г. прынялі рашэнне аб першым падзеле Рэчы Паспалітай. Згодна з ім, да Прусіі адышла паўночна-заходняя частка Польшчы, Аўстрыі – поўдзень Польшчы і Галіцыя, Расіі – ўсходнія землі Беларусі і Украіны.

З мэтай захавання астатняй часткі дзяржавы сейм Рэчы Паспалітай, які працягваўся чатыры гады, з 1788 па 1792 гг., аб'явіў сябе генеральнай канфедэрацыяй, каб не прымяняць права "ліберум вета", і прыняў шэраг законаў, накіраваных на ўзмацненне цэнтральнай улады. Важнейшыя з іх увайшлі ў Канстытуцыю, якая была прынята 3 мая 1791 г. Згодна з ёю, заканадаўчая ўлада належала сейму, пры гэтым адмянялася права "ліберум вета", забараняліся канфедэрацыі. Выканаўчая ўлада належала цэнтральнаму ўраду (Стражы Правоў) на чале з каралём. Акрамя старшыні, урад складаўся з кіраўніка (прымаса) каталіцкай царквы і пяці міністраў. Адмянялася выбарнасць караля, яго ўлада

аб'яўлялася спадчыннай. Пашыраліся паўнамоцтвы караля. Ліквідаваўся падзел на Карону і Вялікае Княства Літоўскае, хаця ў дадатковым дакуменце "Узаемная гарантыя дзвюх народаў" адзначалася, што ў дзяржаўных камісіях павінен быць аднолькавы лік ліцвінаў і палякаў. Некалькі абмяжоўваліся правы шляхты, у прыватнасці, павышаўся маёмасны і ўзроставы цэнз пры выбарах дэпутатаў сейма. У той жа час пашыраліся правы мяшчан. У войска, акрамя шляхты, дазвалялася рэкрутаваць сялян.

Частка шляхты, нездаволеная стратай шляхецкіх вольнасцяў, у 1792 г. абвясціла Таргавіцкую канфедэрацыю з мэтай адмены Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Расія, зацікаўленая ў паслабленні цэнтральнай улады ў Рэчы Паспалітай, накіравала на дапамогу канфедэратам 100-тысячную армію. Пры гэтым яна выкарыстала склаўшуюся сітуацыю і ў студзені 1793 г. разам з Прусіяй ажыццявіла другі падзел. Згодна з ім, да Прусіі адышла цэнтральная частка Польшчы, да Расіі – цэнтральная частка Беларусі. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. была адменена, аднаўлялася выбарнасць караля.

У сакавіку–лістападзе 1794 г. на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, уцалелай ад дзвюх падзелаў, разгарнулася паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Мэтай яго было аднаўленне Канстытуцыі 3 мая 1791 г., Рэчы Паспалітай ў межах 1772 г. Паўстанцы авалодалі Вільняй, барацьба разгарнулася ў Літве і Заходняй Беларусі. Тут яе ўзначаліў Якуб Ясінскі. Была створана найвышэйшая Рада Вялікага княства Літоўскага, затым перайменаваная ў Цэнтральную Дэпутацыю ВКЛ. Яна падпарадкоўвалася Найвышэйшай Нацыянальнай Радзе ў Варшаве. Найбольш значныя сутыкненні паўстанцаў з расійскімі войскамі адбыліся пад Слонімам, Вільняй. Паўстанне было падаўлена, пасля чаго ў 1795 г. адбыўся трэці падзел Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй. Да Расіі адышлі Прыбалтыка, уся Беларусь і Украіна. Прусія і Аўстрыя падзялілі застаўшуюся частку Польшчы.

Такім чынам, у выніку трох падзелаў Рэч Паспалітая як дзяржава спыніла сваё існаванне. Беларускія землі адышлі да Расійскай імперыі. З аднаго боку, пашырэнне ўнутранага рынку і эканамічнай прасторы, больш спакойныя ўмовы жыцця без феадальнай анархіі і шматлікіх войн спрыялі эканамічнаму развіццю Беларусі. Але, з другога боку, асноўная маса насельніцтва трапіла пад больш цяжкі гнёт расійскай манархіі. Узраслі падаткі. Калі раней праводзілася

апалячванне, то з першай паловы XIX ст. пагроза паланізацыі засталася, але, акрамя гэтага, пачалася і русіфікацыя.

## Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.)

*4.1. Пачатак індустрыяльнай цывілізацыі. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пасля ўваходжання ў склад Расійскай дзяржавы.*

*4.2. Палітыка расійскай улады на беларускіх землях у першай палове XIX ст.*

*4.3. Вайна 1812 г. і Беларусь. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX стст.*

*4.4. Адмена прыгоннага права і буржуазныя рэформы другой паловы XIX–пачатку XX стст. Асаблівасці іх правядзення ў Беларусі.*

*4.5. Першая сусветная вайна і Беларусь. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі.*

### 4.1. Пачатак індустрыяльнай цывілізацыі. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пасля ўваходжання ў склад Расійскай дзяржавы

Канец XVIII–пачатак XIX стст. адзначаны значнымі поспехамі ў навуцы і тэхніцы, зменамі тэхналагічных працэсаў у вытворчасці, якія затым атрымалі назву прамысловай рэвалюцыі. Яна пачалася спачатку ў Англіі, Германіі, затым перамясцілася ў іншыя краіны Еўропы, ЗША, Расію і закранула ў першую чаргу лёгкую прамысловасць. Пазней, у сярэдзіне і другой палове XIX ст., ядром прамысловага перавароту стала цяжкая прамысловасць і, перш за ўсё, машынабудаванне. Вытворчы працэс паскорыла вынаходніцтва ў Англіі паравога рухавіка, механічнага ткацкага станка, што, у сваю чаргу, садзейнічала ўдасканальванню шляхоў і сродкаў зносін. Сапраўдную рэвалюцыю ў гэтым плане зрабіла вынаходніцтва ў 1814 г. англійскім інжынерам Стэфенсанам паравоза. На змену парусным судам прыйшлі параходы. У канцы XVIII ст. лідарам у развіцці прамысловасці стала Англія, але затым яе пачала даганяць Германія. Мануфактуры выцясняліся фабрычнай вытворчасцю.

Расла колькасць гарадскога насельніцтва. Аднак хуткае развіццё машыннай вытворчасці суправаджалася ўзмацненнем эксплуатацыі наёмных рабочых і адпаведна абвастрэннем сацыяльнай напружанасці. Яна вылілася ў чартысцкі рух у Англіі (масавы збор подпісаў пад харціямі), паўстанні ткачоў у Германіі і інш.

Расія некалькі пазней уступіла на шлях капіталістычнага развіцця. Працэс паступовага разлажэння феадальна-прыгонніцкіх адносін тут пачаўся ў пачатку XIX ст. У прамысловасці гэта праявілася ў хуткім росце мануфактурнай вытворчасці, з'яўленні першых фабрык і заводаў, дзе ўжо выкарыстоўвалася наёмная праца. Новыя рысы намеціліся і ў сельскай гаспадарцы, яна стала больш арыентаванай на рынак, але гэтаму супярэчылі кансерватыўныя формы вядзення гаспадаркі і прыгонніцкія адносіны. Памешчыкі імкнуліся павялічыць даходнасць сваіх гаспадарак шляхам змяншэння сялянскіх надзелаў, павялічвання дзён баршчыны, аброка. Гэта абвастрала сацыяльныя адносіны.

Для Беларусі былі характэрны тыя ж рысы гаспадарання, як і ў цэлым у Расіі. Яна была аграрнай ускраінай Расійскай імперыі. Амаль усе сяляне былі прыгоннымі, прычым каля 70 % належалі памешчыкам, пераважна буйным, астатнія – дзяржаве, дваранам, царкве. З далучэннем да Расійскай імперыі павялічылася колькасць рускіх землеўладальнікаў. Да пачатку XIX ст. ім былі пажалаваны землі разам з 250 тыс. рэвізскіх (мужчынскіх) душ сялян. Жыццё патрабавала павышэння таварнасці сельскай гаспадаркі, таму памешчыкі пачалі пашыраць пасевы тэхнічных культур, перш за ўсё ільну, цукровых буракоў, бульбы. У шэрагу гаспадарак пачалі выкарыстоўвацца сельскагаспадарчыя машыны.

У сувязі з патрабаваннямі рынку ў першай палове XIX ст. пачала вызначацца спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці па асобных рэгіёнах: вырошчванне льну і бульбы на ўсходзе і развіццё жывёлагадоўлі на захадзе. Развівалася памешчыцкая прадпрымальніцкая дзейнасць, ствараліся падсобныя промыслы, перш за ўсё, па вытворчасці гарэлкі. Да 50-х гг. XIX ст. у Беларусі дзейнічалі каля 3 тысяч невялікіх вінакурань. Прыбытак ад гэтага віду промыслаў складаў да 60% усяго даходу многіх памешчыцкіх гаспадарак. У 1852 г. у Беларусі дзейнічала 12 цукровых заводаў, якія перапрацоўвалі буракі і выраблялі да 10 тыс. пудоў цукру ў год. Некаторыя памешчыкі, напрыклад, І. Храптовіч, для павышэння

матэрыяльнай зацікаўленнасці сваіх прыгонных сялян уводзілі элементы частковай платы за іх працу. Але большасць землеўладальнікаў працавалі, як і раней, імкнучыся пабольшыць даходнасць сваіх гаспадарак шляхам узмацнення эксплуатацыі прыгонных сялян, павялічвання аброку, колькасці дзён баршчыны. Гэта вяло да збяднення сялян. Яны не маглі ў поўнай меры выконваць свае абавязкі перад гаспадарамі і дзяржавай, пачасціліся сялянскія выступленні.

Паглыбленне крызісу ў сельскай гаспадарцы прымусіла ўлады правесці рэформу, якая пачалася перш за ўсё сярод дзяржаўных сялян. Было створана Міністэрства дзяржаўнай маёмасці на чале з графам П.Д. Кісялёвым, таму пазней гэтыя меры пачалі называцца рэформай Кісялёва. Яна праводзілася на працягу 1840–1857 гг. у дзяржаўных маёнтках і прадугледжвала тры асноўныя накірункі: перабудова кіравання дзяржаўнай вёскай, палітыка “апякунства” над дзяржаўнымі сялянамі і люстрацыя (інвентарызацыя) маёнткаў. Была ўведзена трохступенчатая сістэма кіравання: губерніі – акругі – сельскія ўправы. На месцах павышалася роля абшчыны. Апякунская палітыка прадугледжвала аграномічныя мерапрыемствы, пашырэнне колькасці прыходскіх школ, паляпшэнне медыцынскай дапамогі, стварэнне страхавых фондаў і матэрыяльную дапамогу дзяржаўным сялянам у выпадках неўраджаяў. Была праведзена інвентарызацыя дзяржаўных маёнткаў і ўведзена рэгламентацыя сялянскіх павіннасцяў. З 1844 г. у дзяржаўных уладаннях Беларусі сяляне пераводзіліся з паншчыны на аброк, прычым змяншалася грашовая рэнта. Малазямельным павялічваліся памеры надзелаў. У выніку рэформы некалькі палепшылася становішча дзяржаўных сялян, але яна спрыяла і росту маёмаснай дыферэнцыяцыі. Гэту рэформу ўлады спрабавалі распаўсюдзіць і на памешчыцкае землеўладанне, але не атрымалі падтрымкі сярод землеўладальнікаў. Яна абмежавалася складаннем інвентароў памешчыцкіх маёнткаў.

Працэс разлажэння феадальных адносін закрануў у Беларусі і прамысловасць. Павялічылася колькасць мануфактур, у тым ліку і з прымяненнем наёмнай працы. Станоўчае значэнне на развіццё прамысловасці і гандлю аказала ўключэнне Беларусі ў агульнарасійскі рынак і будаўніцтва дарог, водных шляхоў зносін: Бярэзінскага канала, рэканструкцыя Агінскага і Днепра-Бугскага каналаў.

У цэлым жа прамысловасць Беларусі першай паловы XIX ст. насіла ў асноўным дробнатаварны характар, але з 1850-х гг. пачаўся хуткі рост капіталістычных мануфактур, узбуйненне майстэрань і пашырэнне прымянення ў іх наёмнай працы. Менавіта ў 20-я гг. XIX ст. пачалі ўзнікаць першыя фабрыкі і заводы: суконныя прадпрыемствы ў мястэчках Хомск і Косава на Гродзеншчыне, мукамольны завод у Магілёве і інш. Усяго ў Беларусі ў 1860 г. налічвалася 942 прамысловых прадпрыемстваў (без уліку вінакуранных) з пераважна наёмнай працай. Прадукцыя фабрычных прадпрыемстваў ужо пераўзыходзіла мануфактурную, хаця фабрык і рабочых, якія працавалі ў іх, было менш у 3–4 разы.

У першай палове XIX ст. вызначылася і спецыялізацыя прамысловасці Беларусі: у асноўным развівалася лёгкая прамысловасць, пераважна тэкстыльная, па перапрацоўцы лесу і сельскагаспадарчай прадукцыі.

З развіццём капіталістычных адносін звязаны і рост гарадоў. За паўстагоддзе колькасць гарадскога насельніцтва павялічылася ў 4 разы: з 80 да 320 тыс. Адпаведна пашыраўся і гандаль.

У другой палове XIX ст. ў свеце разгарнуўся тэхналагічны пераварот, які стаў працягам прамысловай рэвалюцыі і суправаджаўся паскарэннем эканамічнага развіцця краін Еўропы, ЗША, Японіі. Гэта выявілася ў паскораным развіцці прамысловасці, у першую чаргу, цяжкай. Удасканальваўся паравы рухавік, а ў канцы XIX ст. быў вынайдзены рухавік унутранага згарання. Вялікае значэнне мела асваенне электрычнасці і вынаходніцтва электрарухавіка.

З адкрыццём электрычнасці пачаўся пераварот у сродках сувязі: былі адкрыты тэлеграф, тэлефон, радыё, якія звязалі паміж сабой еўрапейскія краіны, а затым і ЗША. Значныя адкрыцці былі зроблены ў вобласці хіміі, біялогіі.

Паспяхова развіваўся транспарт. На змену паруснікам у пачатку XX ст. канчаткова прыйшлі параходы. Хутка расла сетка чыгуначных дарог, у канцы XIX ст. з’явіўся аўтамабільны транспарт. Хуткімі тэмпамі праходзіла мадэрнізацыя прамысловых прадпрыемстваў. Усё гэта стымулявала развіццё машынабудавання, павелічэнне аб’ёмаў вытворчасці жалеза, нафты, вугалю.

Прамысловы пераварот садзейнічаў пашырэнню механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і, як вынік, павышэнню яе эфектыўнасці.

У той жа час у выніку прамысловай рэвалюцыі абвастрылася канкурэнцыя паміж вядучымі краінамі. У канцы XIX ст. Англія страціла сваё лідзіруючае становішча, яе дагналі ў сваім прамысловым развіцці Германія, Бельгія, Францыя і Швейцарыя. Хуткімі тэмпамі развівалася эканоміка ў Японіі і ЗША. Да пачатку XX ст. Злучаныя Штаты выйшлі на першае месца ў сусветнай прамысловай вытворчасці. Усё гэта абвастрала барацьбу за рынкі збыту і перадзел калоній.

Хуткі рост колькасці фабрык і заводаў, пашырэнне аб’ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі, ускладненне тэхналагічнага працэсу патрабавалі павелічэння капіталаўкладанняў. Гэта прывяло да ўзнікнення акцыянерных таварыстваў. Пачалося аб’яднанне прадпрыемстваў у манаполіі: картэлі, сіндыкаты, канцэрны, трэсты. Гэты працэс пашырыўся ў пачатку XX ст., калі манапалістычныя аб’яднанні пачалі ўстанаўліваць кантроль над цэлымі галінамі прамысловасці, складваліся міжнацыянальныя і транснацыянальныя карпарацыі, якія разгарнулі барацьбу за эканамічны перадзел свету. Канцэнтрацыі вытворчага і банкаўскага капіталаў садзейнічаў сусветны крызіс, які адбыўся ў 1900–1903 гг. Усё гэта прывяло да перарастання капіталізму ў імперыялізм, што характэрна і для Расіі.

Расія пазней за еўрапейскія краіны ўступіла на шлях капіталістычнага развіцця. Яна значна адставала ад іх у сваім эканамічным развіцці, але тэмпы роста аб’ёмаў прамысловай вытворчасці былі высокімі. Расія хутка даганяла заходнія краіны і хаця ў пачатку XX ст. яшчэ не дасягнула ўзроўню ЗША, Германіі і Англіі, але ўжо параўнялася з французскай прамысловасцю. Асаблівасцю эканамічнага развіцця Расіі ў гэты перыяд была таксама значна большая, чым у краінах Захаду, ступень манапалізацыі прамысловасці і банкаў, перапляценне адносна развітага аграрнага капіталізму з сярэдневяковым паўфеадальным землеўладаннем.

Беларусь па-ранейшаму заставалася аграрнай ускраінай Расійскай імперыі, але сельская гаспадарка ўсё больш набывала таварны характар, пасля адмены прыгоннага права шырэй стала выкарыстоўвацца наёмная праца, актыўней сталі ўжывацца элементы механізацыі. Панская гаспадарка ўсё цясней звязвалася з рынкам, станавілася прадпрымальніцкай. Гэтаму садзейнічала выгаднае палажэнне Беларусі, якая суседнічала з еўрапейскімі

краінамі, развітая сетка чыгунак, будаўніцтва якіх пачалося з 1862 г. Сялянская гаспадарка, хаця ў ёй панаваў дробнатаварны ўклад, таксама набывала рысы буржуазнага характару. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы праяўлялася перш за ўсё ў інтэнсіфікацыі і паглыбленні спецыялізацыі земляробства, пашырэнні ўжывання машын і ўдасканаленых прылад працы, паляпшэнні агракультуры, выкарыстанні наёмнай рабочай сілы, сацыяльна-класавай палярызацыі сялянства.

У 1860–1870-х гг. асноўнай галіной земляробства па-ранейшаму заставалася збожжавая, прычым значная частка прадукцыі з панскіх гаспадарак ішла на продаж. Але ў 1880–1890-я гг. у сувязі са зніжэннем цэн на збожжа, абумоўленым прытокам на еўрапейскія рынкі збожжавых вырабаў з ЗША, Канады, Аргенціны, вырошчванне таварнага хлеба ў Беларусі стала нявыгадным. Акрамя таго, сельская гаспадарка Беларусі, якая знаходзілася ў зоне рызыкоўнага земляробства, не магла канкурыраваць з зернявымі раёнамі Украіны, адкуль таксама пачало паступаць па чыгунцы збожжа. У гэтых умовах памешчыкі і сялянская буржуазія ў канцы XIX ст. пачалі пераарыентоўваць свае гаспадаркі на малочна-мясную жывёлагадоўлю. За перыяд 1883–1900 гг. пагалоўе прадукцыйнай жывёлы вырасла ў два разы, у тым ліку, кароў – у 2,4 разы. Выводзіліся палепшаныя пароды жывёлы, тэхнічная перапрацоўка малочных прадуктаў. У маёнтках былі адкрыты больш за 200 сыраварных і масларобчых заводаў. У выніку ў 1890-я гг. у параўнанні з 1870-мі гг. вываз малочных прадуктаў на продаж павялічыўся ў 4 разы, а вываз мясной прадукцыі – амаль у 2 разы. У заходніх і цэнтральных рэгіёнах Беларусі была даволі распаўсюджанай танкарунная авечкагадоўля.

Развіццё малочна-мясной жывёлагадоўлі паўплывала на структуру пасяўных плошчаў. У 7,7 разоў пашырыліся пасевы кармавых траў, галоўным чынам, у памешчыцкіх гаспадарках. У пачатку XX ст. заходні рэгіён стаў трэцім пасля Польшчы і Прыбалтыкі па ўдзельнай вазе кармавых траў у агульнай пасяўной плошчы.

Акрамя мяса-малочнай накіраванасці, у Беларусі вызначылася спецыялізацыя рэгіёнаў па вырошчванню тэхнічных культур, у першую чаргу, бульбы. Па яе вытворчасці заходнія рэгіёны разам з Прыбалтыкай займалі першае месца ў Еўрапейскай Расіі. Рост гандлёвага бульбаводства быў звязаны не толькі з вытворчасцю

кармоў для жывёлы, але, галоўным чынам, з развіццём вінакураннай вытворчасці ў памешчыцкіх маёнтках. У канцы XIX ст. сярэдняя штогадовая вытворчасць 40-градуснага разбаўленага спірту ў пяці заходніх губернях складала больш за 8 млн. вёдзер. Значная колькасць бульбы накіроўвалася на продаж ў іншыя рэгіёны. У паўночнай Беларусі асноўным накірункам стала ільнаводства. Гэта працаёмкая культура патрабавала вялікай колькасці наёмнай рабочай сілы.

Рост вінакурэння, развіццё масларобчых, сыраварных, алейных, суконных і іншых сельскагаспадарчых падсобных прадпрыемстваў адыгрывалі важную ролю ва ўсталяванні капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы. Гэтыя напрамкі спецыялізацыі захаваліся і ў пачатку XX ст. Як і раней, павялічваліся пасевы тэхнічных і кармавых культур: бульбы, буракоў, ільну і каноплі. Важнай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці заставалася жывёлагадоўля.

Значна палепшылася тэхнічнае аснашчэнне сельскагаспадарчай вытворчасці, пашыраліся рыначныя сувязі.

Разам з тым, у другой палове XIX ст. і пачатку XX ст. развіццё капіталістычных адносін у беларускай вёсцы спалучалася з рэшткамі феадалізму. Найбуйнейшым перажыткам прыгонніцтва заставалася панская зямельная ўласнасць. У гэты час памешчыкам належала 50,3% прыдатнай для апрацоўкі зямлі, сяляне валодалі 33,4% надзельнай зямлі, астатняя была ва ўласнасці дзяржавы, царквы. Пры гэтым для Беларусі было характэрным менавіта буйнае памешчыцкае землеўладанне. Адпаведна захоўвалася малазямелле асноўнай часткі сялян, адпрацовачныя павіннасці за карыстанне сялянамі панскай зямлёй.

Перажыткамі феадалізму ў парэформенных пазямельных адносінах у Беларусі з'яўляліся цераспалосіца, якая спалучалася з дробнапалосіцай сялянскіх угоддзяў, а таксама паўфеадальныя натуральныя павіннасці, абмежаванне грамадзянскіх правоў сялянства.

Усё гэта было характэрным і для пачатку XX ст. Памешчыцкая сістэма гаспадарання паказала сваю нядольнасць адаптавацца да новых капіталістычных адносін. У выніку да 1914 г. у банках было закладзена дзве трэціх памешчыцкіх зямель.

Прамысловасць Беларусі ў 1860–1870-я гг. развівалася марудна, пазней рост значна паскорыўся. Гэта было перш за ўсё звязана з

агульным прамысловым уздымам у свеце. Развіваліся тры асноўныя формы арганізацыі вытворчасці: дробнатаварная, мануфактурная і фабрычна-заводская. Колькасць рамесных майстэрань за 40 гадоў павялічылася ў 8 разоў і дасягнула у 1900 г. 84 тыс. са 144 тыс. рабочых, прычым 67 тыс. былі наёмнымі. Колькасць мануфактур таксама за гэты час павялічылася ў два разы. Але вызначальнай рысай прамысловасці стала бурнае развіццё фабрык і заводаў, асабліва ў канцы XIX ст. Гэты перыяд можна лічыць пачаткам індустрыялізацыі. На працягу 1880–1890-х гг. XIX ст. у Беларусі было пабудавана ў чатыры разы больш прадпрыемстваў, чым за два папярэдніх дзесяцігоддзі. Да ліку найбольш буйных і найбольш тэхнічна дасканалых прадпрыемстваў належалі Добрушская папяровая фабрыка, суконныя фабрыкі ў Альбярціне (Гродзенская губерня) і Парэччы (Мінская губерня), Гродзенская тытунёвая фабрыка, ільнопрадзільная фабрыка "Дзвіна" ў Віцебску. Фабрыкі і заводы давалі амаль палову ўсёй прамысловай прадукцыі.

Разам з тым, нягледзячы на будаўніцтва фабрык і заводаў, па колькасці пераважалі дробныя прадпрыемствы. Пры гэтым трэба адзначыць як асаблівасць Беларусі тое, што большасць прадпрыемстваў, у тым ліку, фабрык і заводаў, знаходзіліся не ў гарадах, а ў сельскай мясцовасці. Гэта было абумоўлена наяўнасцю таннай рабочай сілай у вёсках, а таксама структурай прамысловай вытворчасці: пераважалі прадпрыемствы па перапрацоўцы лесу і сельскагаспадарчай сыравіны. Другараднае значэнне мелі іншыя прамысловыя галіны: гарбарная, шкляная і іншыя.

Да пачатку XX ст. у Беларусі быў завершаны прамыслова-тэхнічны пераварот, у асноўных галінах прамысловасці і транспарту канчаткова зацвердзілася перавага фабрычна-заводскай вытворчасці. Пры захаванні ў асноўным той галіновай структуры вытворчасці, якая склалася ў XIX ст., у XX ст. назіраліся пэўныя змены. У выніку крызіса 1900–1903 гг. узмацнілася канцэнтрацыя вытворчасці, узрасла ўдзельная вага буйных прадпрыемстваў, павялічылася колькасць рабочых на іх. Канцэнтрацыя вытворчасці абумовіла ўтварэнне акцыянерных кампаній. У канцы XIX ст. у Беларусі дзейнічалі 10 акцыянерных таварыстваў. У пачатку XX ст. іх колькасць павялічылася да 34, прычым частка з іх была з удзелам інвестыцый замежнага капітала. Сведчаннем канцэнтрацыі і манапалізацыі вытворчасці стала з'яўленне сіндыкатаў і манапа-

лістычных аб'яднанняў: сіндыкат кафельных заводчыкаў у Копысі, сіндыкат піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю ў Оршы, камітэт запалкавых фабрыкантаў Заходняга краю ў Мінску. З канца XIX ст. у эканамічным жыцці Беларусі значную ролю пачалі адыгрываць банкі: Мінскі камерцыйны банк і філіялы акцыянерных банкаў небеларускага паходжання.

Развіццё капіталістычных адносін, індустрыялізацыя не прывялі да паляпшэння жыцця асноўнай масы насельніцтва. У сельскай мясцовасці ўзмацнялася сацыяльная дыферэнцыяцыя грамадства. У пачатку XX ст. больш заможны слой сялянства складаў каля 8%. У той жа час з 1877 па 1905 гг. колькасць малазямельных гаспадарак (з надзелам да 15 дзесяцін) узрасла ў 2 разы і склала 84,5% усіх гаспадарак. Беззямельныя і малазямельныя сяляне з'яўляліся базай для фарміравання сельскага і гарадскога пралетарыята – наёмнай рабочай сілы. У канцы XIX ст. на памешчыкаў і сельскую буржуазію працавалі 182 тыс. парабкаў. Колькасць прамысловых рабочых, з улікам рамеснікаў і чыгуначнікаў, у пачатку XX ст. дасягнула 350 тыс. Узровень жыцця іх быў таксама нізкім. Пры фактычна ненарміраваным рабочым дні заробкі беларускіх рабочых былі на 20% ніжэйшымі, чым у прамысловых цэнтрах Расіі, дзве трэціх іх ішлі на харчаванне і наём кватэры. Нізкі ўзровень жыцця сялян і рабочых прывялі да новай з'явы канца XIX–пачатку XX стст.– эміграцыйнага руху. Даследчыкі лічаць, што ў пачатку XX ст. па эканамічных прычынах за мяжу выехала ад 200 да 500 тыс. беларусаў. Такім чынам, эканамічнае жыццё Беларусі сведчыць аб развіцці капіталізму і яго вышэйшай стадыі – імперыялізму, але ён не паспеў набыць класічныя формы і ў 1913 г. Беларусь працягвала заставацца аграрным прыдаткам Расійскай імперыі.

### 4.2. Палітыка расійскай улады ў беларускіх землях у першай палове XIX ст.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі палітыка ўлады ў цэлым была накіравана на іх зліццё з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Але першапачаткова ўлады ўлічвалі спецыфіку сацыяльна-эканамічнага і грамадскага жыцця насельніцтва гэтага рэгіёна і не пераходзілі да адкрытай русіфікатарскай палітыкі. Яна пачала пашырацца пасля паўстання 1830–1831 гг.

У сацыяльна-адміністрацыйнай сферы беларускія землі да пачатку XIX ст. былі падзелены згодна з унутраным расійскім адміністрацыйным падзелам на 5 губерняў, якія ў сваю чаргу аб’ядноўваліся ў 2 генерал-губернатарствы: Літоўскае (Віленская, Гродзенская, Мінская губерніі) і Беларускае (Віцебская, Магілёўская губерніі). Пазней тэрмін Белая Русь быў заменены паняццем “Паўночна-Заходні край”. Губерніі падзяляліся на паветы, паветы – на воласці (акрамя 1830–1861 гг.). Адміністрацыйны апарат у асноўным адпавядаў расійскаму, але захоўваліся некаторыя старыя назвы пасад, напрыклад, павятовы маршалак і інш. Спачатку ў беларускіх губернях працягваў дзейнічаць Статут ВКЛ 1588 г., але ў 1831 г. у Віцебскай і Магілёўскай, а ў 1840 г. – у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях ён быў адменены і ў Беларусі было ўведзена расійскае заканадаўства.

Прыватнаўласніцкія гарады і мястэчкі выкупляліся ўладамі і згодна з даравальнай граматай гарадам 1785 г. іх жыхары раўняліся ў правах з іншым гарадскім насельніцтвам Расійскай імперыі, дзяліліся на 6 разрадаў, кіраўніцтва ажыццяўлялася гарадской думай на чале з гарадскім галавой. Магдэбургскае права скасоўвалася. Некаторы час у беларускіх гарадах яшчэ захоўвалася дзеянне Статута 1588 г.

Магнаты і шляхта павінны былі прынесці прысягу новым уладам, пасля чаго яны набывалі правы расійскіх дваран. Тыя ж, хто адмаўляўся прынесці прысягу, павінны былі за кароткі тэрмін прадаць свае маёнткі і з’ехаць за мяжу. Забараняліся канфедэрацыі, сеймы, правы шляхты былі істотна абмежаваны.

Сяляне з-за іх галечнага становішча спачатку былі вызвалены на два гады ад падаткаў, у наступныя дзесяць гадоў яны браліся на льготнай аснове, але затым пачаліся спаганяцца ў поўным размеры. Уводзіліся рэкруцкія наборы.

Нацыянальная палітыка расійскіх улад спачатку была даволі памяркоўнай. Справаводства, кнігадрукаванне, навучанне ў школах, як і раней, ажыццяўляліся на польскай мове. Але адначасова праводзілася палітыка пратэкцыянізма рускай мове. Такім чынам, беларусы падвяргаліся двайному нацыянальнаму прыгнёту. З 1830-х гг., пасля падаўлення паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве, польскі ўплыў паступова пачаў выцясняцца, узамен яго разгарнулася актыўная русіфікацыя беларускага насельніцтва. Адначасова пачаўся

так званы “разбор” шляхты, накіраваны на выключэнне дробнай шляхты заходніх губерняў са складу дваранства. Ён заключаўся ў праверцы дакументаў, пацвярджаючых шляхецкае званне. Не вытрымаўшых праверку шляхцічаў пераводзілі ў саслоўе аднадворцаў у сельскай мясцовасці і грамадзян у гарадах.

Для яўрэяў указам ад 23 верасня 1794 г. устанаўлівалася мяжа аседласці. Згодна з ёй, яўрэі маглі сяліцца толькі на беларускіх, літоўскіх і часткова ўкраінскіх землях, пры гэтым ім забаранялася набываць маёнткі. Падаткі ж яны павінны былі плаціць у двайным памеры. Пазней яўрэйскаму насельніцтву было забаронена займацца сельскай гаспадаркай і яно пераважна сканцэнтравалася ў мястэчках і невялікіх гарадах.

У адносінах да рэлігійных аб’яднанняў улады спачатку таксама займалі ўзважаныя пазіцыі. Каталіцызм не забараняўся, нават часова была адноўлена дзейнасць ордэна езуітаў. Але дзяржаўнай канфесіяй стала праваслаўе. Улады матэрыяльна падтрымлівалі праваслаўных святароў, выдзялялі сродкі для будаўніцтва праваслаўных храмаў. Але пасля паўстання 1794 г. каталіцкаму і ўніяцкаму духавенству было забаронена схіляць у сваю веру людзей. Уніятаў пачалі пераводзіць у стан праваслаўных. Гэтыя дзеянні ўлады заканадаўча былі замацаваны 12 лютага 1839 г. на ўніяцкім саборы ў Полацку. На ім было прынята рашэнне аб далучэнні ўніяцкай царквы да рускай праваслаўнай.

### 4.3. Вайна 1812 г. і Беларусь. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX стст.

У пачатку XIX ст. у выніку дзяржаўнага перавароту ў Францыі да ўлады прыйшоў Напалеон. У 1804 г. ён аб’явіў сябе імператарам. У выніку ваенных дзеянняў Напалеон падпарадкаваў амаль усю Заходнюю і Цэнтральную Еўропу. Антыфранцузская кааліцыя, у якую ўваходзіла і Расія, пацярпела паражэнне. У 1807 г. у Тыльзіце паміж Расіяй і Францыяй быў заключаны мір, адной з умоў якога было стварэнне на землях, адабраных у Прусіі, Вялікага герцагства Варшаўскага. Напалеон разлічваў на гэта герцагства як на плацдарм на выпадак вайны з Расіяй. На працягу наступных гадоў адносіны паміж Расіяй і Францыяй заставаліся абвостранымі, перш за ўсё, з-за імкнення абедзвюх краін да еўрапейскай гегемоніі і з-за

кантынентальнай блакады Англіі. Гэтыя канфлікты прывялі да нападзення Францыі на Расію.

12 чэрвеня 1812 г. 600-тысячная армія Напалеона, у якую ўваходзілі і прадстаўнікі падпарадкаваных Францыі народаў Еўропы, перасекла дзяржаўную мяжу Расійскай імперыі. Ёй супрацьстаялі тры разрозненыя расійскія арміі агульнай колькасцю 200 тыс. чалавек. Каб аб’яднацца і сабрацца з сіламі, яны пачалі з баямі адыходзіць на ўсход. У час адступлення ваенныя дзеянні адбыліся каля Кобрына, Міра, Полацка, Магілёва. Да канца ліпеня тэрыторыя Беларусі была акупіравана французамі. Каб набыць прыхільнікаў, 19 чэрвеня 1812 г. Напалеон аб’явіў аб адраджэнні Вялікага княства Літоўскага і ўтварыў часовы орган улады – Камісію Вялікага княства Літоўскага. Але на самой справе Беларусь была падзелена, як і ў Францыі, на дэпартаменты, кантоны на чале з французскай адміністрацыяй, усталяваўся акупацыйны рэжым, сутнасць якога заключалася ў зборы правіянта для французскага войска і яго папаўненні за кошт рэкрутаў з мясцовага насельніцтва. Польская шляхта ў асноўным прыхільна сустрэла французаў, але значная частка беларускага насельніцтва, нездаволеная рабаўніцтвам і гвалтам, не падтрымала акупантаў. На тэрыторыі Беларусі пачалі ўтварацца партызанскія атрады. Вядома, што яны дзейнічалі ў Барысаўскім, Дрысенскім, Полацкім і іншых паветах.

Французская армія пасля бітвы на Барадзінскім полі здолела без бою заняць Маскву, але, знясіленая, у кастрычніку 1812 г. вымушана была пачаць адступленне назад, на захад па спустошанай Смаленскай дарозе. Адначасова перайшлі ў наступленне і расійскія войскі. На зваротным шляху на тэрыторыі Беларусі, асабліва ў час пераправы праз р. Беразіну каля г. Барысава, французская армія панесла катастрафічныя страты.

Вайна нанесла Беларусі вялікія спусташэнні. У выніку рабаванняў гаспадарка была разбурана, многія паселішчы, асабліва на ўсходзе, спалены, пачаліся голад, масавыя эпідэміі. Пасяўныя плошчы, колькасць жывёлы скараціліся ў два разы. Але расійскі ўрад не зменшыў на спустошаных землях падаткі, захаваў старыя прыгонніцкія парадкі, больш таго, маніфестам ад 12 снежня 1812 г. аб’яўлялася дараванне мясцовым памешчыкам, якія падтрымалі Напалеона, з вяртаннем ім іх маёнткаў. Пасля паражэння ў Расіі Напалеон ужо не здолеў паспяхова весці ваенныя дзеянні супраць

кааліцыі еўрапейскіх дзяржаў, якія зноў падняліся супраць яго, і пасля некалькіх няўдалых бітваў Напалеон быў схоплены і сасланы на востраў Святой Алены. Згодна з рашэннямі Венскага кангрэса еўрапейскіх дзяржаў, які праходзіў з кастрычніка 1814 па чэрвень 1815 гг., у Еўропе аднаўляліся зрынутыя раней манархічныя рэжымы, ліквідаваліся тыя пераўтварэнні, якія адбыліся ў перыяд Французскай буржуазнай рэвалюцыі і напалеонаўскіх войн, па новаму вызначаліся межы дзяржаў. Большая частка Вялікага герцагства Варшаўскага на правах аўтаноміі адышла да Расіі і стала называцца Каралеўствам Польскім.

Вынікі Венскага кангрэса, наданне аўтаноміі Каралеўству Польскаму, а таксама абяцанне Аляксандра І аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. вызвалі рост прапольскіх патрыятычных настрояў сярод значнай часткі шляхецкай інтэлігенцыі і вучнёўскай моладзі.

У 1817 г. сярод студэнтаў Віленскага ўніверсітэта ўзнікла тайнае таварыства філаматаў (аматараў навук). Арганізатарамі яго былі А. Міцкевіч, Т. Зан. Таварыства мела філіялы ў іншых навучальных установах Беларусі. У 1820 г. было створана другое таварыства – філарэтаў (прыхільнікаў дабрачыннасці). Члены таварystваў вывучалі беларуска-літоўскі край, займаліся культурна-асветніцкай, навуковай дзейнасцю, прапагандавалі ідэі свабоды і роўнасці людзей і народаў. Але яны крытыкавалі царскі ўрад і таемна выказваліся за аднаўленне Рэчы Паспалітай. У 1823 г. гэтыя таварыствы былі выкрыты і распушчаны, а найбольш актыўныя члены падвергліся ганенням.

У 1825 г. К.Г. Ігельстромам, А.І. Вягеліным, М.І. Рукевічам было створана таварыства “Ваенныя сябры” з ліку афіцэраў Літоўскага корпуса, мясцовай шляхты, чыноўнікаў, вучнёўскай моладзі. Члены таварыства падзялялі ідэі дзекабрыстаў і 24 снежня 1825 г. зрабілі спробу падняць паўстанне ў Літоўскім корпусе ў час прыняцця прысягі на вернасць імператару Мікалаю І, але пацярпелі няўдачу.

У сярэдзіне 1820-х гг. тайныя таварыствы ў Беларусі былі разгромлены, але антыўрадавыя настроі сярод пэўных пластоў насельніцтва захоўваліся. Ідэі аднаўлення Рэчы Паспалітай былі папулярнымі сярод патрыятычна настроеных людзей польскай арыентацыі, асабліва ў Каралеўстве Польскім. Рэвалюцыя ў Францыі, нацыянальна-вызваленчыя рухі ў Бельгіі, Італіі далі штуршок для паўстання ў Варшаве, якое пачалося 29 лістапада 1830 г. Мэтай яго

было аднаўленне Рэчы Паспалітай ў межах 1772 г. Яно ахапіла ўсю Польшчу, на бок паўстаўшых перайшла польская армія. Хутка ў кіраўніцтве выявіліся два накірункі: кансерватыўны на чале з князем А. Чартарыйскім, які ставіў адну мэту – аднаўленне Рэчы Паспалітай; і левы на чале з І. Ляляведем, які выступаў таксама і за буржуазна-дэмакратычныя свабоды, надзяленне сялян зямлёй з адначасовай грашовай кампенсацыяй памешчыкам. У Варшаве быў утвораны Часовы ўрад, пазней ён быў перайменаваны ў Нацыянальны ўрад, скліканы сейм, які прыняў “Маніфест польскага народа”.

У 1831 г. паўстанне перакінулася на беларускія землі, пераважна паўночна-заходнія паветы Мінскай губерні і Віленскую губерню. Тут дзеяннямі паўстанцаў кіраваў утвораны ў студзені 1831 г. Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. На месцах таксама ствараліся павятовыя ўрады, якія пачалі праводзіць рэкруцкія наборы. Усяго ў паўстанні на беларускіх землях прынялі ўдзел каля 10 тыс. чалавек, але дзейнічалі паўстанцкія атрады стыхійна. У канцы мая на дапамогу паўстанцам з Польшчы быў накіраваны атрад пад камандаваннем генерала Д. Хлапоўскага колькасцю 700 чалавек, пазней – яшчэ 12-тысячны корпус генералаў А. Гелгуда і Г. Дэмбінскага. 19 чэрвеня 1831 г. пад Вільняй расійскае войска нанесла паражэнне аб’яднаным сілам паўстанцаў і да канца ліпеня паўстанне ў Беларусі і Літве было падаўлена. Многія яго ўдзельнікі былі асуджаны, маёнткі канфіскоўваліся. Была скасавана аўтаномія Царства Польскага. Пачаўся “разбор” шляхты, быў адменены Статут ВКЛ 1588 г. Расійскі ўрад перайшоў да больш актыўнай палітыкі русіфікацыі.

Тым не менш, нягледзячы на рэпрэсіі і русіфікацыю, грамадскі рух у 30–50-я гг.XIX ст. не спыніўся. У 1836 г. у Вільні пад кіраўніцтвам Франца Савіча пачало дзейнічаць “Дэмакратычнае таварыства”, якое выступала за адзінства ў барацьбе супраць самадзяржаўя, за вызваленне сялян і надзяленне іх зямлёй. Пазней, на працягу 1846–1849 гг. у Вільні, Мінску і іншых беларускіх гарадах існавала тайная арганізацыя “Саюз свабодных братоў”, якая налічвала больш за 200 членаў. Саюз таксама ставіў мэтай звяржэнне самадзяржаўя і ажыццяўленне дэмакратычных пераўтварэнняў. Гэтыя арганізацыі былі выкрыты і разгромлены. Але і ўлады былі вымушаны некалькі лібералізаваць сваю палітыку

ў заходніх губернях. У сярэдзіне XIX ст. палітычная сітуацыя ў Беларусі прадаўжала заставацца нестабільнай.

У другой палове XIX ст. значнай з’явай у нацыянальна-вызваленчым руху стала паўстанне 1863–1864 гг. Ужо ў час яго падрыхтоўкі выявіліся дзве палітычныя групоўкі: “белыя” і “чырвоныя”. Першыя абмяжоўваліся адной мэтай: аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. мірнымі сродкамі. “Чырвоныя” ставілі больш радыкальныя мэты: яны выказваліся за аднаўленне Польшчы праз паўстанне, устанаўленне рэспубліканскага ладу. Найбольш радыкальныя з іх выказваліся за самавызначэнне народаў, ліквідацыю памешчыцкага землеўладання.

Для падрыхтоўкі і кіравання паўстаннем у Варшаве ў 1862 г. быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК), а ў Вільні – Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), фармальна падначалены ЦНК. Старшынёй апошняга з кастрычніка 1862 г. быў К. Каліноўскі.

Паўстанне пачалося ў Польшчы 22 студзеня 1863 г., раней вызначанага тэрміну. ЛПК падтрымаў яго, 1-га лютага абвясціў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі і абнародаваў праграму, якая, у прыватнасці, прадугледжвала перадачу сялянам бясплатна зямельных надзелаў, якімі яны да гэтага карысталіся. Але ў сакавіку ЦНК, дзе пачалі пераважаць “белыя”, незадаволены сепаратызмам і радыкальнасцю ЛПК, адхіліў ад улады апошні, у тым ліку і К. Каліноўскага, і замяніў яго Аддзелам па кіраўніцтву правінцыямі Літвы на чале з памешчыкам Я. Гейштарам.

З пачаткам паўстання ў Беларусі, галоўным чынам, у заходніх паветах пачалі стварацца атрады паўстанцаў, у асноўным, з ліку дробнай шляхты, рамеснікаў, навучэнцаў, афіцэраў, якія пакінулі армію. Сяляне, якія складалі асноўную масу насельніцтва, склалі толькі 18 % сярод удзельнікаў паўстання. На гэта паўплывалі, з аднаго боку, антыпольская прапаганда і рэпрэсіўныя меры з боку царскіх улад, з другога боку, змяншэнне выкупных плацяжоў для сялян і адмена для іх палажэння часоваабавязаных. У выніку паўстанне не прыняло шырокага размаху і ператварылася ў дзейнасць разрозненых партызанскіх атрадаў. Усяго ў Беларусі ў першай палове 1863 г. дзейнічалі каля 15 тысяч паўстанцаў, якія не маглі супрацьстаяць рэгулярным войскам. За гэты час адбылося 46 сутычак паўстанцаў з карнікамі, найбольш буйныя з іх – бітва каля в.

Мілавіды і захоп Горак. У чэрвені 1863 г., пасля арышту многіх членаў Аддзела па кіраўніцтву правінцыямі Літвы, на чале паўстання зноў стаў К. Каліноўскі, які ўтварыў падпольны ўрад – Чырвоны жонд, але паўстанне ўжо ішло на спад. Восенню 1863 г. барацьба на Беларусі спынілася, а ў 1864 г. былі разгромлены і апошнія атрады ў Польшчы. 22 сакавіка 1864 г. К. Каліноўскага павесілі ў Вільні. На Беларусі і ў Літве было абвешчана ваеннае палажэнне, 128 удзельнікаў паўстання пакараны смерцю, каля 13 тыс. асуджаны на катаргу ці высланы ў адміністратыўным парадку.

Пасля паўстання 1863–1864 гг., у апошняй трэці XIX ст., на беларускіх землях адбылося каля 400 сялянскіх выступленняў. У гэты час выразнікамі іх інтарэсаў сталі народнікі, якія лічылі, што Расія можа прыйсці да сацыялізму, мінуючы капіталізм, праз сялянскую абшчыну. Агульнарасійскае аб’яднанне “Зямля і воля”, утворанае ў 1861 г., выступала за перадачу зямлі сялянам без выкупу, за народаўладдзе. У 1879 г. арганізацыя “Зямля і воля” распалася на дзве часткі: “Чорны перадзел”, дзе на першы план ставілася барацьба за раздзел памешчыцкай зямлі, і “Народную волю”, якая выступала за ўзмацненне палітычнай барацьбы і індывідуальны тэрор. Народніцкія гурткі дзейнічалі ў Віцебску, Гродна, Мінску, Магілёве, Слуцку і іншых гарадах Беларусі. У 1879–1880 гг. у Мінску існавала падпольная народніцкая друкарня, дзе выдаваліся лістоўкі і іншая літаратура. У 1884 г. беларускія студэнты, якія вучыліся ў Пецярбурзе, арганізавалі групу “Гоман”, якая мела ўжо больш выразную беларускую нацыянальна-вызваленчую накіраванасць. Яна імкнулася аб’яднаць народніцкія гурткі ў Беларусі і ўстанавіла сувязі з некаторымі з іх. Былі таксама выдадзены два нумары аднайменнай газеты.

Пасля забойства народавольцамі Аляксандра II, выканаўцам якога з’явіўся І.Я. Грынявіцкі, народніцкія арганізацыі былі разгромлены і на іх змену прыйшлі ў 1890-я гг. ліберальныя народнікі, якія адмовіліся ад індывідуальнага тэрора. Народавольскія гурткі, уцалелыя пасля разгрому і блізкія да іх арганізацыі, якія дзейнічалі і ў 1890-х гг., часцей пачалі ўжываць іншую назву – “сацыялісты-рэвалюцыянеры”. Але ў гэты час ужо распаўсюджваліся марксістскія ідэі і сацыял-дэмакратычны рух, пачаў пашырацца рабочы рух, з’явіліся першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі, дзе рабочыя вывучалі марксізм, створаны першыя рабочыя арганізацыі. Праўда, у

адрозненне ад Расіі, у Беларусі ў сувязі з асаблівасцямі прамысловага развіцця рабочы рух быў менш арганізаваным і насіў эканамічны характар. У 1870-я гг. у Беларусі адбылося 7 забастовак, у 1880-я гг. – дзесяць, у 1890-я гг. – ужо 95.

У 1897 г. у Вільні адбыўся з'езд яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый Літвы, Беларусі і Польшчы, на якім быў утвораны Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (БУНД), які галоўнай мэтай лічыў барацьбу за паляпшэнне эканамічнага становішча яўрэйскіх рабочых.

У 1898 г. у Мінску прайшоў першы з'езд сацыял-дэмакратычных арганізацый, на якім была ўтворана Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП), якая выступіла за звяржэнне самадзяржаўя і ўстанаўленне дыктатуры пралетарыята. Праўда, на другім з'ездзе ў 1903 г. РСДРП раскалолася на дзве плыні: бальшавікоў, якія адстойвалі ідэю сацыяльнай рэвалюцыі, і меншавікоў, прыхільнікаў рэформ.

У 1902 г. узнікла партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), якія дабіваліся замены самадзяржаўя дэмакратычнай рэспублікай, галоўным чынам, шляхам індывідуальнага тэрора, выступалі за перадачу зямлі сялянам на прынцыпах ураўняльнага размеркавання. У гэтым жа годзе групы партыі польскай сацыялістычнай (ППС), якія дзейнічалі ў Літве і Заходняй Беларусі, аб'ядналіся ў рэгіянальную арганізацыю – ППС у Літве. Яны таксама стаялі на пазіцыях народніцкага сацыялізму, але ў праграме і выпускаемай літаратуры не было нават успамінаў пра Беларусь.

У 1903 г. частка нацыянальных дзеячаў на чале з братамі Антонам і Іванам Луцкевічамі правяла ў Вільні першы з'езд Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, якая была перайменавана ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду. У прынятай праграме прадугледжваліся ў якасці бліжэйшых мэтаў звяржэнне царызму, перадача зямлі сялянам на ўмовах ураўняльнага землекарыстання, развіццё беларускай культуры, прадстаўленне Беларусі краявой аўтаноміі з сеймам у Вільні, а ў перспектыве – знішчэнне капіталістычнага ладу, скасаванне прыватнай уласнасці на зямлю, утварэнне незалежнай дэмакратычнай рэспублікі. Беларуская Сацыялістычная Грамада была першай палітычнай арганізацыяй, якая арыентавалася на нацыянальныя інтарэсы беларусаў.

Пад уплывам левых палітычных партый у пачатку XX ст. пачаўся ўздым рабочага руху. У 1901–1904 гг. адбылося 408 забастовак, у якіх прынялі ўдзел 56 тыс. чалавек. За гэты ж час 95 разоў рабочыя выходзілі на дэманстрацыі. Яны, як правіла, праходзілі пад аховай узброеных дружыннікаў. У беларускіх вёсках у 1901–1904 гг. адбылося 116 сялянскіх выступленняў, у асноўным, у форме патраў і лясных парубак, захопу памешчыцкіх зямель і сервітутных угоддзяў.

У пачатку 1905 г. у сувязі з растрэлам 9 студзеня мірнай дэманстрацыі ў Пецярбурзе пачалася першая руская рэвалюцыя. Хваля выступленняў пратэсту пракацілася па ўсёй імперыі, у тым ліку, і па Беларусі. У студзені стачкі, дэманстрацыі ахапілі каля 30 гарадоў і мястэчак, у іх прынялі ўдзел каля 60 тыс. чалавек. У красавіку–чэрвені пачаўся новы пад'ём рабочага руху, колькасць удзельнікаў эканамічных і палітычных стачак, дэманстрацый дасягнула 200 тыс. чалавек. Высокі ўзровень эканамічнай і палітычнай барацьбы рабочых назіраўся і ў наступныя месяцы. Большасцю выступленняў кіравалі мясцовыя арганізацыі РСДРП і Бунда. Адначасова за першае паўгоддзе 1905 г. адбылося 290 сялянскіх выступленняў, што амаль у тры разы перавысіла іх колькасць за папярэднія 4 гады. Да восені сялянскім рухам былі ахоплены ўсе паветы Беларусі. У кастрычніку-снежні 1905 г. палітычныя стачкі пачалі спалучацца з паўстаннямі, узброенай барацьбой. Пачаліся хваляванні сярод салдат царскай арміі.

У час усерасійскай кастрычніцкай палітычнай стачкі рэвалюцыйным рухам былі ахоплены 53 гарады і мястэчкі Беларусі, а колькасць удзельнікаў палітычных стачак і дэманстрацый дасягнула 164 тыс. чалавек. У Гродне, Бабруйску, Брэсце адбыліся выступленні салдат. У гэтых умовах царскі ўрад пайшоў на ўступкі. 17 кастрычніка 1905 г. Мікалай II падпісаў маніфест, згодна з якім народу абяцаліся палітычныя свабоды, утваралася дзяржаўная Дума з заканадаўчымі правамі. Але ўжо на наступны дзень, 18 кастрычніка, у Мінску былі растраляны ўдзельнікі мітынгу, якія сабраліся на прывакзальнай плошчы з нагоды прыняцця царскага маніфеста. 52 чалавекі былі забіты, 124 паранены. Кастрычніцкая стачка і царскі маніфест актывізавалі кансерватыўны і ліберальна-буржуазны рух. Узніклі ўсерасійскія манархічныя партыі "Саюз рускага народа", "Савет аб'яднанага дваранства", "Айчынны саюз"

з рэгіянальнымі аддзеламі, у тым ліку, і ў Беларусі, а таксама ліберальна-буржуазныя–канстытуцыйныя дэмакраты (кадэты), “Саюз 17 кастрычніка”.

У лістападзе-снежні 1905 г., нягледзячы на палітычныя ўступкі царызма, рэвалюцыйны рух працягваўся. Ён перарос у снежаньскую палітычную стачку, якая ахапіла таксама 17 гарадоў і мястэчак Беларусі. Масавы характар набылі сялянскія выступленні. Вышэйшай ступенню рэвалюцыі стала ўзброенае паўстанне ў Маскве, пасля чаго яна пайшла на спад. Пачаліся рэпрэсіі супраць актыўных удзельнікаў выступленняў.

Былі разгромлены многія мясцовыя арганізацыі левых партый. 3 чэрвеня 1907 г. царскі ўрад разагнаў Дзяржаўную думу і арыштаваў сацыял-дэмакратычную фракцыю. Летам гэтага года Беларуская Сацыялістычная Грамада прыняла рашэнне аб самароспуску. Найбольш актыўныя члены і кіруючыя кадры Грамады згрупіраваліся вакол газеты “Наша ніва” і перайшлі ў асноўным да культурна-асветніцкай работы. Першая рэвалюцыя пацярпела паражэнне, але яна садзейнічала ператварэнню самадзяржаўя ў канстытуцыйную манархію.

### 4.4. Адмена прыгоннага права і буржуазныя рэформы другой паловы XIX–пачатку XX стст. Асаблівасці іх правядзення ў Беларусі

Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы, яе супярэчнасць з развіваючыміся капіталістычнымі адносінамі, нездавальненне сялянства сваім эканамічным становішчам прымусілі царскі ўрад адмяніць прыгоннае права. Для падрыхтоўкі рэформы ў студзені 1857 г. быў створаны Сакрэтны камітэт на чале з царом. Дваранскія губернскія камітэты, якія працавалі з наступнага года, прапанавалі некалькі праектаў рэформы. Пасля іх разгляду 19 лютага 1861 г. імператар Аляксандр II падпісаў “Маніфест” і “Палажэнні” аб адмене прыгоннага права. У “Агульным Палажэнні” вызначаліся асабістыя і маёмасныя правы сялян, парадак кіравання і выканання павіннасцяў. Да Беларусі адносіліся два мясцовых Палажэнняў. Адно прымянялася да расійскіх, а таксама Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дзе існавала абшчынная форма землекарыстання, другое – да Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, дзе было падворнае

землекарыстанне. Згодна з імі, сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і зямлю за выкуп.

Ва ўсходняй Беларусі ў залежнасці ад якасці зямлі вызначаліся надзелы на кожнага чалавека мужчынскага полу ад 1 да 5,5 дзесяцін. У заходняй частцы Беларусі за сялянамі замацоўваліся ранейшыя надзелы, якімі яны карысталіся да рэформы. Калі ў памешчыкаў заставалася менш адной трэці зямлі, якую яны мелі раней, або памеры сялянскіх надзелаў перавышалі вышэйшую норму, то лішкі памешчык меў права адрэзаць і далучыць да сваіх зямель. Атрымаць зямлю ва ўласнасць сяляне маглі толькі за выкуп, сума якога вызначалася аброкам, капіталізаваным з 6% гадавых. Такім чынам, памешчык працягваў атрымліваць гадавы даход, роўны памеру былога гадавога аброка. Сяляне павінны былі выплаціць адразу 20% сумы выкупа зямлі, астатнія 80 % выплочвала памешчыку дзяржава. Гэтая сума аб’яўлялася сялянскім доўгам дзяржаве, які трэба было вярнуць за 49 гадоў пры 6% гадавых. Пасля адмены прыгоннага права як мінімум на працягу 9 гадоў сяляне лічыліся часоваабавязанымі і павінны былі несці ранейшыя павіннасці: плаціць аброк і адпрацоўваць баршчыну, ім не дазвалялася выйсці з сельскай абшчыны.

Рэформа у тым выглядзе, у якім яна праводзілася, калі сяляне працягвалі адбываць ранейшыя павіннасці, а памешчыкі пакінулі сабе больш паловы ўсіх зямель, прычым найбольш прыдатных для апрацоўкі, калі быў завышаны кошт выкупа зямлі, не магла задаволіць насельніцтва. Гэтая нездаволенасць таксама знайшла выражэнне ў паўстанні пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. Каб адцягнуць сялян ад удзелу ў паўстанні, урад пайшоў на некаторыя ўступкі земляробам Беларусі і Літвы. Было адменена становішча часоваабавязаных, на 20% зніжаны выкупныя плацяжы, беззямельныя надзяляліся 3 дзесяцінамі зямлі.

16 мая 1867 г. быў прыняты закон аб дзяржаўных сялянах, якіх налічвалася ў Беларусі 20% ад усёй колькасці сельскага насельніцтва. Зямля, якой яны да гэтага часу карысталіся, пераходзіла ў іх уласнасць, але за выкуп. Пры гэтым, у адрозненне ад прыватнаўласніцкіх, дзяржаўныя сяляне самі павінны былі ўносіць усе выкупныя плацяжы, якія, праўда, былі ніжэйшымі, чым у былога панскага сялянства.

Пасля сялянскай рэформы 1861 г. урад прыняў рад мер па ўдасканаленню сельскага кіравання. У губернях утвараліся губернскія па сялянскіх справах установы, у паветах уводзіліся пасады міравых пасярэднікаў і павятовыя міравыя з’езды, з 1874 г. – павятовыя па сялянскіх справах установы і з 1899 г. – земскія павятовыя начальнікі і павятовыя з’езды. На месцах дзейнічалі валасныя сходы, валасныя праўленні, валасныя сялянскія суды, у сёлах – сельскія сходы і старасты. Гэтыя меры былі першымі крокамі на шляху стварэння органаў мясцовага самакіравання.

Наступным крокам стала земская рэформа 1864 г. Згодна з ёй, у паветах і губернях ствараліся выбарныя земскія ўстановы, якія займаліся кіраўніцтвам мясцовай гаспадаркай, народнай асветай, медыцынскім абслугоўваннем, дабрачыннасцю. Земствы насілі ўсесаслоўны характар, усе мелі права выбіраць сваіх прадстаўнікоў – галосных–на павятовыя земскія сходы, на якіх у сваю чаргу выбіралі прадстаўнікоў у павятовую земскую ўправу. Земствы і іншыя мясцовыя сялянскія ўстановы з’яўляліся абмежаванымі органамі самакіравання. Яны не мелі органаў выканаўчай улады і залежалі ад мясцовай адміністрацыі, фактычна выконвалі ўсё, што патрабавалі ад іх урадавыя чыноўнікі. Але нават у такім выглядзе яны не былі ўведзены у Беларусі, Літве і Правабярэжнай Украіне, паколькі пасля паўстання 1863 г. царскі ўрад не давяраў мясцовым апалячаным памешчыкам, якія маглі мець уплыў у земствах.

Першая спроба ўтварыць земскія ўстановы ў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях была зроблена ў 1903 г, але яны не выбіраліся, а прызначаліся міністрам унутраных спраў і губернатарамі і знаходзіліся пад іх кантролем. Толькі ў 1911 г. у гэтых губернях былі ўведзены выбарныя земствы, але выбары праводзіліся па нацыянальным (польскай і рускай) курыям, прычым апошняя абавязкова павінна была пераважаць. Быў уведзены таксама высокі маёмасны цэнз для выбаршчыкаў. Пры гэтым за губернатарамі і міністрам унутраных спраў засталося права прыпыняць любыя рашэнні земскіх устаноў, яны ж зацвярджалі старшынь і членаў павятовых земскіх управаў. У заходніх беларускіх губернях нават такія земствы не былі ўведзены.

У 1864 г. была праведзена таксама судовая рэформа. Суды абвяшчаліся ўсесаслоўнымі, галоснымі і з незалежнымі ад урада выбарнымі суддзямі. У судовым працэсе прадугледжваўся ўдзел

адвакатаў, пры гэтым у разглядзе судовых спраў па крымінальных учынках і грамадзянскіх справах удзельнічалі выбарныя прысяжныя засядацелі.

Стваралася судовая сістэма. Разглядам дробных спраў займаўся міравы суд са спрошчаным судаводствам, які ўзначальваў выбарны міравы суддзя. Судом другой інстанцыі быў павятовы з'езд міравых суддзяў. Найбольш важныя справы разглядалі акруговыя суды, якія падзяляліся на крымінальныя і грамадзянскія, судзебныя палаты, якія аб'ядноўвалі некалькі губерняў. Вышэйшай судовай інстанцыяй лічыўся Сенат. У Беларусі рэформа пачалася са спазненнем, з 1872 г. Міравыя суддзі тут не выбіраліся, а прызначаліся міністрам юстыцыі. Са спазненнем, з 1882 г., у беларускіх губернях былі ўведзены інстытуты прысяжных засядацеляў, акруговыя суды, судовыя палаты, прычым прысяжныя засядацелі таксама зацвярджаліся ўладамі.

З 1875 г., са спазненнем на 5 гадоў, у Беларусі пачалося правядзенне гарадской рэформы. Сутнасць яе заключалася ва ўвядзенні выбарнага гарадскога самакіравання: гарадской думы, гарадской ўправы, гарадскога галавы. Выбары праводзіліся па трох курыях (сходах): буйныя ўласнікі, якія плацілі трэцюю частку агульных збораў, выбіралі трэцюю частку галосных, гэта значыць, прадстаўнікоў у гарадскую думу. Адпаведна праводзіліся выбары па курыі сярэдніх уладальнікаў і па трэцяй курыі дробных уласнікаў. Выбары праводзіліся на аснове маёмаснага цэнзу, а выбарныя кіраўнікі дум зацвярджаліся міністрам унутраных спраў або губернатарам, яны ж маглі прыпыніць любое рашэнне гарадской управы.

Падобна іншым рэформам, напрамак у бок усесаслоўнасці мела і школьная рэформа, якая праводзілася з 1864 г. і прадугледжвала пашырэнне сеткі пачатковых школ, падзел гімназій на рэальныя і класічныя, увядзенне пэўнай аўтаноміі і выбарнасці для ўніверсітэтаў. Апошняе не адносілася да Беларусі, дзе ў гэты час не існавалі ВНУ, не было і земскіх школ. Тут у кожнай губерніі былі адкрыты дырэкцыі народных вучылішч, якія ажыццяўлялі кантроль за працай школ і настаўнікаў.

У 1865 г. былі зацверджаны часовыя Правілы аб друку. Яны адмянялі папярэднюю цэнзуру для твораў не менш чым 10 друкаваных аркушаў, але выдаўцы прадаўжалі несці судовую адказнасць за выпускаемую прадукцыю. Для выданняў меншых памераў і

перыядычнага друку папярэдняя цэнзура захоўвалася. У Беларусі згодна з асобнымі цыркулярамі генерал-губернатара друк поўнасцю заставаўся пад кантролем мясцовай адміністрацыі.

Ваенная рэформа, якая пачалася з 1862 г., уводзіла ўсеагульную воінскую павіннасць. Тэрміны службы складалі 6 гадоў у арміі і 7 – на флоце. Для асоб з вышэйшай адукацыяй тэрмін службы зніжаўся да шасці месяцаў, сярэдняй – да 1,5 года і ніжэйшай – да 4 гадоў. У сувязі з увядзеннем воінскай павіннасці ўтвараліся ваенныя акругі для арганізацыі набора навабранцаў.

У Беларусі, дзе рэформы праводзіліся пазней і з абмежаваннямі, яны адразу сутыкнуліся з контррэформамі, якія пачалі ўводзіцца з 1866 г., пасля замаху на імператара і асабліва з 1881 г., пасля забойства Аляксандра II. З 1866 г. суддзі былі падначалены губернатарам, узмацніўся адміністрацыйны нагляд за фарміраваннем складу прысяжных. У 1887 г. фактычна была адменена галоснасць судоў, а міністр юстыцыі атрымаў права прыпыняць судовыя разгляды.

Узмацніўся адміністрацыйны нагляд за пачатковымі школамі і народнымі вучылішчамі, пачала пашырацца сетка царкоўнапрыходскіх школ. Зноў уводзіліся саслоўныя абмежаванні для вучобы ў сярэдніх навучальных установах. У друку зноў уводзілася папярэдняя цэнзура. Мясцовая адміністрацыя пасля 1881 г. атрымала права забараняць органы друку, прыпыняць дзейнасць земстваў і гарадскіх дум. З 1899 г. уводзіўся інстытут земскіх начальнікаў для кантролю за дзейнасцю земстваў. Новае Гарадавое палажэнне, прынятае ў 1892 г., значна павышала маёмасны цэнз на выбарах у гарадскія думы.

У пачатку XX ст. з мэтай стварэння для сябе апоры ў вёсцы ўрад па прапанове старшыні Савета Міністраў П. А. Сталыпіна пачаў правядзенне аграрнай рэформы. Пачаткам яе стаў Указ імператара ад 9 лістапада 1906 г., які канчаткова прыняў сілу закона 14 чэрвеня 1910 г. пасля ўхвалення Дзяржаўнай Думай і Дзяржаўным Саветам. Згодна з ім, ліквідавалася сялянская абшчына, сяляне атрымалі права выхаду з яе, замацавання за сабой надзельнай зямлі ў поўную ўласнасць з правам свабоднай куплі-прадажы. Пры выхадзе з абшчыны зямля зводзілася ў адзін масіў у выглядзе хутароў, калі гаспадар перавозіў туды і гаспадарчыя пабудовы, або водрубаў, калі хатнія пабудовы заставаліся ў вёсцы. Згодна з Законам 1910 г. і

Законам ад 29 мая 1911 г. аб землеўпарадкаванні ліквідацыю абшчыны і перасяленне сялян на хутары і водрубы землеўпарадкавальныя камісіі маглі рабіць прымусова. Усяго на хутары і водрубы выйшлі 12 % сялян, у асноўным, з усходняй Беларусі.

Дзяржаўныя і земскія ўстановы аказвалі сялянам-уласнікам пэўную агранамічную і тэхнічную дапамогу. Сялянскі пазямельны банк, крэдытныя кааператыўныя ўстановы імкнуліся аблегчыць шляхам прадстаўлення пазык куплю-продаж зямлі.

Важным напрамкам рэформы стала перасяленне сялян, якія не мелі зямлі або выказвалі пажаданне аб яе продажу, на свабодныя землі ў Сібіры або на Далёкім Усходзе. У 1907–1914 гг. з пяці заходніх губерняў перасяліліся 335,4 тысячы пераважна беззямельных або малазямельных сялян, 10% з іх затым вымушаны былі вярнуцца ў родныя мясціны.

Рэформа закранула пераважна заможных сялян, якія выкарысталі яе для таннай скупкі зямлі, і сялянскую беднату, якая замацоўвала за сабой надзельную зямлю, каб тут-жа яе прадаць і канчаткова парваць з земляробствам. Яна садзейнічала сацыяльнаму расслаенню ў вёсках, развіццю ў сельскай мясцовасці капіталістычных адносін, канцэнтрацыі капіталістычнай зямельнай уласнасці.

## 4.5. Першая сусветная вайна і Беларусь. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі

У пачатку XX ст. абвастрыліся супярэчнасці з-за калоній, рынкаў збыту і сфер уплыву паміж еўрапейскімі дзяржавамі і, перш за ўсё, паміж каланіяльнай дзяржавай Англіяй і хутка набіраючай эканамічную і ваенную моц Германіяй. Гэта прывяло да ўтварэння дзвюх ваенна-палітычных блокаў дзяржаў: Германія, Аўстра-Венгрыя, з аднаго боку, Францыя, Англія і Расія, з другога, і пачатку 19 ліпеня (1 жніўня) 1914 г. вайны паміж імі. Гэта вайна з цягам часу перарасла ў сусветную, у якой прынялі ўдзел 33 краіны з насельніцтвам звыш 1,5 млрд. чалавек. Першапачаткова германскі блок імкнуўся шляхам "бліцкрыга" разграміць Францыю, каб пазбегнуць вайны на два фронты. Расійскія войскі, каб аблегчыць становішча саюзнікаў, пачалі актыўныя дзеянні ў Галіцыі і Усходняй Прусіі. Паступова пасля перадыслакацыі нямецкіх войск Усходні фронт стаў галоўным: тут к 1915 г. была сканцэнтравана

большая частка аўстра-германскіх дывізій. Пасля некалькіх паражэнняў расійская армія пакінула тэрыторыю Польшчы, частку заходняй Беларусі і толькі ў кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск–Паставы–Смаргонь–Баранавічы–Пінск. Прыкладна 25 % тэрыторыі Беларусі аказалася ў нямецкай акупацыйнай зоне. Тут быў установлены акупацыйны рэжым, які суправаджаўся рэквізіцыямі, увядзеннем прымусовых работ, розных падаткаў і інш. Але і ў гэтых умовах беларускія палітычныя дзеячы спрабавалі разгарнуць нацыянальна-вызваленчы рух. У 1915 г. быў утвораны Беларускі народны камітэт (БНК) на чале з А. Луцкевічам. Пад яго кіраўніцтвам пачала выпускацца газета “Гоман”, працавалі таварыствы “Золак”, ”Навуковае таварыства”, ”Беларускі вучыцельскі саюз” і інш. У снежні 1915 г. быў выпушчаны “Універсал Вялікага Княства Літоўскага”, у якім адзначалася аб намеры ўтварыць канфедэратыўную дзяржаву. Але немцы аддалі перавагу літоўцам і згадзіліся на ўтварэнне ў пачатку 1917 г. літоўскай Рады (Тарыбы), кіруючага органа літоўскай дзяржаўнасці пад пратэктаратам Германіі.

На неакупіраванай немцамі тэрыторыі Беларусі склалася складанае сацыяльна-эканамічнае становішча. У расійскую армію было мабілізавана каля паловы мужчын. 1,5 млн. чалавек былі эвакуіраваны ўглыб Расіі, адначасова ў Беларусі аказалася каля 1,7 млн. бежанцаў з заходніх рэгіёнаў Расійскай імперыі. Большая частка прамысловасці, звыш 400 прадпрыемстваў, таксама была эвакуіравана, астатняя пераведзена на выпуск ваеннай прадукцыі. На 70% скараціліся пасяўныя плошчы. Адпаведна пачаў адчувацца востры дэфіцыт прадуктаў харчавання, прамысловых тавараў, у некалькі разоў узраслі цэны на іх, што выклікала нездавальненне насельніцтва. Гэта праявілася ў ажыўленні рабочага руху, захопу сялянамі памешчыцкай маёмасці. Пачаліся хваляванні сярод салдат, найбольш буйным з якіх стала выступленне 4 тыс ваеннаслужачых на Гомельскім размеркавальным пункце ў кастрычніку 1916 г. Нарастала нездавальненне і ў цэнтральных рэгіёнах Расіі.

23 лютага (8 сакавіка) 1917 г. у Петраградзе пачаліся стыхійныя хваляванні, якія да 27 лютага перараслі ва ўзброенае паўстанне. 2 сакавіка 1917 г. цар Мікалай II адрокся ад прастола. З ліку дэпутатаў Дзяржаўнай думы быў створаны часовы ўрад, які спачатку ўзначаліў князь Г. Львоў, затым А. Керэнскі. У ходзе паў-

стання быў сфарміраваны таксама Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які меў рэальную ўладу ў сталіцы. Такім чынам, утварылася двоеўладдзе. Савет, дзе пераважалі меньшавікі і эсэры, падтрымаў Часовы ўрад, але аставіў за сабой права кантроля за яго дзейнасцю. Канчатковае рашэнне аб будучым дзяржаўным ладзе, як і пытанне аб зямлі, былі адкладзены да Устаноўчага схода.

Пасля атрымання звестак аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе ў Мінску 7 сакавіка 1917 г. быў утвораны Камітэт грамадскай бяспекі як орган мясцовага кіравання Часовага ўрада. Падобныя камітэты ўзніклі і ў другіх буйных гарадах Беларусі. Часовы ўрад скасаваў пасады губернатараў і павятовых спраўнікаў, а іх функцыі перадаў урадавым і павятовым камісарам, імі сталі, як правіла, старшыні губернскіх і павятовых земскіх управ. Адначасова з Камітэтам грамадскай бяспекі быў створаны і Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Такія ж Саветы пачалі ўтварацца і ў другіх гарадах. Усяго ў Беларусі ўзнікла каля 150 Саветаў розных назваў, у іх, за выключэннем Мінскага, пераважалі меншавікі, бундаўцы, эсэры. Такім чынам, у Беларусі таксама назіралася двоеўладдзе, але асаблівасцю было тое, што ў гэтым рэгіёне знаходзілася стаўка вярхоўнага камандавання і дыслацыраваліся вайсковыя часці. Ваенныя сталі трэцяй рэальнай сілай, якая аказвала свой уплыў на далейшае развіццё падзей. Але і ў арміі таксама пачалася дэмакратызацыя, ва ўсіх вайсковых падраздзяленнях былі створаны вайсковыя камітэты. Хаця яны і прызналі Часовы ўрад, але часта не падпарадкоўваліся камандаванню і нават бралі дзейнасць камандзіраў пад свой кантроль. Паступова вызначалася і чацвёртая сіла – нацыянальныя арганізацыі, якія выпрацавалі праграмы нацыянальнага адраджэння.

Пасля рэвалюцыі пачалі аднаўляцца і пашыраць сваю дзейнасць палітычныя партыі: кадэты, эсэры, бундаўцы, сацыял-дэмакраты. Аднавіла сваю дзейнасць і Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ), якая летам 1917 г. ужо налічвала каля 5 тысяч членаў. Акрамя яе, узніклі яшчэ 23 нацыянальныя арганізацыі, найбольш буйнымі з іх з’яўляліся Беларуская партыя народных сацыялістаў (БПНС), Беларуская народная грамада, Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць беларусаў і іншыя. 25–27 сакавіка 1917 г. яны правялі ў Мінску свой з’езд і выбралі Беларускі нацыянальны камітэт на чале з буйным памешчыкам Р. Скірмунтам для падрыхтоўкі выбараў у

Беларускую краявую раду. Рада падтрымала Часовы ўрад, але дабівалася аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі.

## Тэма 5. Фарміраванне і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917 – 1941 гг.)

*5.1. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці*
*5.2. Асаблівасці пераходу БССР да мірнага жыцця. Новая эканамічная палітыка. Правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі.*
*5.3. Культурнае развіццё Беларусі ў 1917 – 1941 гг..*

### 5.1. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці

Нявырашанасць галоўных пытанняў, якія ставіліся народам у часы лютаўскай рэвалюцыі, пагаршэнне становішча мас, няўдачы на фронце падарвалі давер народа да ўлады. Палітычны крызіс асабліва абвастрыўся пасля 4 ліпеня 1917 г., калі была растраляна масавая дэманстрацыя, якая прайшла ў Петраградзе пад лозунгамі перадачы ўлады Саветам і заключэння міру. Перыяд двоеўладдзя скончыўся перамогай буржуазіі. Страціў уплыў і Беларускі нацыянальны камітэт, дзе пераважалі прадстаўнікі маёмасных слаёў насельніцтва. 10 ліпеня ў Мінску адбыўся другі з’езд беларускіх арганізацый, на якім замест БНК была створана Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый, больш левая па свайму складу і кіраўніцтву. Пазней, у кастрычніку 1917 г., яна была пераўтворана ў Вялікую Беларускую раду. У Раду ўвайшлі і прадстаўнікі Цэнтральнай Беларускай вайсковай Рады, якая была выбрана на з’ездзе воінаў-беларусаў Заходняга фронту 18–24 кастрычніка 1917 г.

Ва ўмовах паглыбленага палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага крызісу галоўнакамандуючы генерал Л. Карнілаў вырашыў устанавіць ваенную дыктатуру. Для гэтага ён рушыў з фронта частку войсковых фарміраванняў на Петраград. Адпор выступленню аказалі бальшавікі. Пад іх кіраўніцтвам пры Саветах пачалі стварацца часовыя рэвалюцыйныя камітэты, чырвонагвардзейскія атрады, якія блакіравалі на шляху руху карнілаўскіх часцей вузлавыя чыгуначныя станцыі і адначасова вялі прапаганду сярод салдат. Пасля падаўлення карнілаўскага выступлення ўплыў бальшавікоў узмацніўся, у многіх Саветах прайшлі перавыбары.

Бальшавікі ўзялі курс на ўзброенае паўстанне, якое адбылося 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. у Петраградзе. У гэты ж дзень II з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў сфарміраваў часовы ўрад на чале з У.І. Леніным, абраў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт, прыняў дэкрэты аб міры і зямлі.

Калі ў Мінску стала вядома аб перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе, Мінскі Савет аб'явіў аб пераходзе краявой улады ў яго рукі. 27 кастрычніка пры ім быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт.

У гэты ж дзень быў таксама створаны ў Мінску Камітэт выратавання рэвалюцыі на чале з эсэрам Т.М. Калатухіным, які не прызнаў савецкую ўладу. Яго падтрымалі мінская гарадская дума, стаўка. У горад былі ўведзены воінскія часці. Але падыход з фронта на дапамогу Мінскаму Савету бліндзіраванага цягніка змяніў суадносіны сіл і Камітэт выратавання рэвалюцыі быў распушчаны. На працягу кастрычніка – лістапада адносна хутка і бяскроўна Савецкая ўлада перамагла і ў другіх гарадах Беларусі, а таксама на Заходнім фронце. У лістападзе 1917 г. адбыліся тры з'езды Саветаў: з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, трэці з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, другі з'езд армій Заходняга фронта. Выбраныя імі выканаўчыя камітэты аб'ядналіся ў Абласны Выканаўчы Камітэт Заходняй вобласці (Аблвыканкамзах), які стаў галоўным органам улады ў Беларусі. Выканаўчым органам стаў Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці. Апошнім горадам, дзе была ўсталявана савецкая ўлада, стаў Магілёў. Толькі з дапамогай балтыйскіх маракоў 5–10 студзеня 1918 г. тут была ліквідавана стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага і праведзены губернскі з'езд Саветаў.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі Вялікая Беларуская рада адхіліла прапанову Аблвыканкамзаха аб сумесным кіраванні Беларуссю і разам з Беларускім абласным камітэтам (БАК), які быў створаны на Усерасійскім сялянскім з'ездзе, пачала рыхтаваць з'езд для рашэння пытання аб будучым дзяржаўным будаўніцтве і органах улады. Афіцыйна Усебеларускі кангрэс, на які былі запрошаны 1872 дэлегаты, пачаў працаваць 15 снежня 1917 г. На ім выявіліся тры плыні: незалежнікі (у асноўным, прадстаўнікі ВБР, ЦБВР) выступалі за незалежнасць Беларусі, цэнтр, галоўным

чынам, дэлегаты ад БАКа, члены БСГ, эсэры, выступаў за аўтаномію Беларусі ў складзе дэмакратычный федэратыўнай Расіі і, так званыя, асімілятары, якія лічылі найбольш мэтазгодным захаваць існуючае палажэнне Паўночна-Заходняга краю. Дэлегаты выбралі прэзідыум, прынялі парадак дня і пасля абмеркавання яго на секцыях вечарам 16 снежня сабраліся на пленарнае пасяджэнне. З’езд выказаўся за захаванне сувязі з Расійскай Дэмакратычнай федэратыўнай Рэспублікай, але не прызнаў мясцовую ўладу Аблвыканкамзаха і пастанавіў “вылучыць са свайго складу орган краявой улады ў асобе Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў”, якому ўручыць кіраванне Беларуссю да склікання Беларускага ўстаноўчага сходу. У адказ у ноч з 17 на 18 снежня Аблвыканкамзах распусціў з’езд. На падпольным пасяджэнні 18 снежня прэзідыум з’езда абʼявіў сябе пастаянна дзеючым органам улады – Саветам з’езда, быў выбраны выканкам Савета і прынята рашэнне аб скліканні II Усебеларускага кангрэса.

У гэты час у снежні 1917 – студзені 1918 гг. у Брэсце праходзілі перагаворы аб міры паміж Германіяй і Савецкай Расіяй. Савецкі бок не згадзіўся з цяжкімі ўмовамі міру, прапанаванымі Германіяй, і немцы 18 лютага пачалі наступленне. Дзейнічаючы сумесна з часцямі польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага, яны хутка падышлі да Мінска. 19 лютага савецкія органы ўлады эвакуіраваліся ў Смаленск. У гэтых умовах выканкам з’езда абʼявіў сябе адзінай мясцовай уладай. 21 лютага ён прыняў Першую Устаўную грамату і сфарміраваў урад – Народны Сакратарыят Беларусі на чале з Я. Варонка, але дзяржаўнасць не абвясціў.

9 сакавіка выйшла 2-я Устаўная грамата, у якой абвяшчалася Беларуская Народная Рэспубліка ў этнаграфічных межах рассялення беларусаў. Вызначаліся заканадаўчы орган БНР – Рада і выканаўчы – Народны Сакратарыят Беларусі. Абвяшчалася аб скасаванні прыватнай уласнасці на зямлю, увядзенні васьмігадзіннага рабочага дня.

25 сакавіка 1918 г. была прынята 3-я Устаўная грамата, у якой дэкларыравалася незалежнасць Беларусі.

Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася ўжо пасля таго, як па ўмовах Брэсцкага міру паміж Германіяй і Расіяй ад 3 сакавіка 1918 г. 85% тэрыторыі Беларусі адыходзілі да Германіі, другімі словамі, ва ўмовах нямецкай акупацыі. Таму абвяшчэнне дзяржаў-

насці і, тым больш, яе незалежнасці насіла дэкларатыўны характар, паколькі рэальная ўлада належала нямецкаму камандаванню. Афіцыйна Германія не прызнала БНР, не праявілі да яе цікавасці і краіны Антанты і ЗША, але акупацыйныя ўлады не перашкаджалі займацца культурна–асветніцкай дзейнасцю. Калі ж кіраўніцтва БНР паспрабавала стварыць свае ўзброеныя сілы, гэта вызвала процідзеянне акупацыйных улад. 25 красавіка 1918 г. Рада звярнулася да кайзера з тэлеграмай, у якой заявіла аб тым, што толькі пад апекай Германіі Беларусь бачыць сваю будучыню. Гэта паглыбіла палітычны крызіс. З Рады выйшлі эсэры, БСГ, меншавікі. Пасля гэтага была фактычна створана новая Рада, дзе пераважалі Р. Скірмунт і іншыя прадстаўнікі заможных колаў. Яна заняла адкрыта прагерманскую пазіцыю: скасавала палажэнні 2-й Устаўной граматы БНР адносна адмены ўласнасці на зямлю і ўвядзення 8-гадзіннага рабочага дня, аб'явіла, што на тэрыторыі Беларусі не дзейнічаюць пастановы РСФСР, нават выступіла з пратэстам, калі згодна з дадатковай дамоўленасцю з Савецкай Расіяй Германія ў жніўні 1918 г. пачала частковы вывад войск з Беларусі. Улічваючы змены ў арыентацыі Рады БНР, акупацыйныя ўлады перадалі ў яе веданне гандаль, сацыяльную апеку, асвету і культуру. Адносныя поспехі былі дасягнуты ў галіне адукацыі і навукі: адкрыты каля 150 беларускіх школ, Мінскі педагагічны інстытут, настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы. Былі заснаваны выдавецтва, беларускі клуб з тэатрам, беларуская бібліятэка і кнігарня. Выдаваліся газеты “Гоман”, “Вольная Беларусь”, створаны Беларускае навуковае, культурна-асветніцкае таварыствы.

Беларуская Народная Рэспубліка спыніла сваё існаванне на тэрыторыі Беларусі адначасова з выгнаннем акупантаў. Дзеячы БНР эмігрыравалі і частка іх увайшла ў склад Літоўскай Тарыбы.

Такім чынам, утварэнне БНР было спробай рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці, але не рэальнай дзяржаўнасцю. Заслуга БНР перш за ўсё ў тым, што перад грамадскасцю было заяўлена аб існаванні беларускага нацыянальнага руху і неабходнасці вырашэння праблемы Беларускай дзяржавы.

Пасля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі Савецкая Расія дэнансавала Брэсцкі дагавор. Германскія войскі пачалі адыходзіць з захопленых тэрыторый. 10 снежня быў вызвалены Мінск. Спачатку Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт

23 снежня 1918 г. прыняў рашэнне аб уключэнні беларускіх зямель ў склад Расійскай Федэрацыі, але супраць выступілі беларускія секцыі пры ЦК РКП(б), Белнацкам, які дзейнічаў са студзеня 1918 г. як аддзел Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР і Мінгубрэўкам, створаны адразу ж пасля вызвалення Мінска. 24 снежня 1918 г. Пленум ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). На нарадзе ў Наркамнацы РСФСР, якая адбылася 27 снежня з удзелам прадстаўнікоў Аблвыканкамзаха, Белнацкама, былі вырашаны пытанні аб урадзе ССРБ, межах рэспублікі, кіруючым партыйным цэнтры.

30–31 снежня 1918 г. у Смаленску адбылася VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б), дэлегаты якой прадстаўлялі 5 беларускіх губерняў. Канферэнцыя абвясціла сябе I з’ездам Камуністычнай партыі Беларусі і прыняла рэзалюцыю аб утварэнні ССРБ. У склад рэспублікі ўвайшлі Мінская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні, частка паветаў Віленскай, Ковенскай, Смаленскай губерняў, дзе пражывалі пераважна беларусы. Быў створаны часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад на чале з З.Х. Жылуновічам, які 1 студзеня 1919 г. апублікаваў маніфест, дзе абвяшчалася аб утварэнні ССРБ, а таксама аб нацыяналізацыі фабрык, заводаў, чыгунак, банкаў, зямлі. 5 студзеня ўрад пераехаў у сталіцу ССРБ г. Мінск. У студзені прайшлі валасныя, павятовыя, губернскія з’езды Саветаў, на якіх адбыліся выбары дэлегатаў на першы рэспубліканскі з’езд Саветаў. I Усебеларускі з’езд Саветаў рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх дэпутатаў адбыўся 2–3 лютага 1919 г. у Мінску. На ім была прынята дэкларацыя аб утварэнні ССРБ і ўстанаўленні федэратыўных сувязяў паміж Савецкай Беларуссю і РСФСР, Канстытуцыя ССРБ, вызначаны кіруючыя органы ўлады. У адпаведнасці з Канстытуцыяй вярхоўная ўлада належала з’езду Саветаў Беларусі, а ў перапынку паміж з’ездамі – Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту (ЦВК). З’езд зацвердзіў межы рэспублікі ў складзе Мінскай і Гродзенскай губерняў. Тэрыторыі Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў адышлі да Расіі. Была прынята таксама дзяржаўная сімволіка.

У заключэнне з’езд прыняў рашэнне аб аб’яднанні ССРБ і Літоўскай ССР у адну дзяржаву. Аналагічнае рашэнне прыняў неўзабаве і першы з’езд Саветаў Літвы. 27 лютага 1919 г. на сумесным

пасяджэнні ЦВК Беларусі і Літвы былі створаны кіруючыя органы – ЦВК Літоўска-Беларускай ССР і СНК гэтай дзяржавы. Некалькі пазней, 4–6 сакавіка 1919 г., на сумесным з'ездзе была створана аб'яднаная партыйная арганізацыя на чале з ЦК КП (б) Літвы і Беларусі. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ствараласся ў складзе 5 губерняў: Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і Сувалкаўскай. Пачалася нацыяналізацыя зямлі, прамысловых прадпрыемстваў, праводзілася палітыка "ваеннага камунізму".

Літоўска-Беларуская Рэспубліка праіснавала нядоўга. Ужо летам 1919 г., калі польскія акупанты захапілі значную частку беларускай тэрыторыі, наркаматы Літ. Бел. ССР былі перайменаваны ў аддзелы Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, а ваенныя падраздзяленні згодна з дамоўленасцю з Расіяй увайшлі ў склад Чырвонай Арміі. Калі ж пасля контрнаступлення Чырвонай Арміі на зноў вызваленай тэрыторыі ўрадам РСФСР 2 красавіка 1920 г. была прызнана Літоўская Рэспубліка, а 12 ліпеня з ёй быў падпісаны мірны дагавор, устаноўлены пагранічныя межы, пры гэтым Вільня з Віленскім краем былі перададзены Літве, Літоўска-Беларуская Рэспубліка перастала існаваць і юрыдычна.

У канцы 1918 г. была адноўлена Польская дзяржава. Правячыя колы Польшчы на чале з Ю. Пілсудскім, абапіраючыся на падтрымку краін Антанты і ЗША і, па сутнасці, справакаваныя імі, выступілі за пашырэнне тэрыторыі рэспублікі да межаў, існаваўшых да 1772 г. У выніку ў лютым 1919 г. Польшча пачала ваенныя дзеянні супраць савецкай Расіі. Паколькі асноўныя сілы Чырвонай арміі былі заняты на Паўднёвым фронце, палякі, добра ўзброеныя за кошт заходніх дзяржаў і падмацаваныя французскай 70-тысячнай арміяй, пачалі хутка прасоўвацца наперад, 22 красавіка яны занялі Вільню, сталіцу Літоўска-Беларускай ССР. Урад пераехаў у Мінск, але і гэты горад таксама 8 жніўня быў захоплены польскімі войскамі. Да сярэдзіны ліпеня 1919 г. польскія інтэрвенты акупіравалі больш паловы тэрыторыі Беларусі. Лінія фронта стабілізіравалася толькі восенню па лініі Дзвінск–Полацк–Лепель–Барысаў–Бабруйск–р. Прыпяць. Кіраўніцтва Літбела эвакуіравалася ў Смаленск, але Літоўска-Беларуская Рэспубліка спыніла сваё існаванне ўжо фактычна з лета 1919 г.

На захопленай тэрыторыі Беларусі палякі ўстанавілі акупацыйны рэжым. У гэтых умовах Рада БНР пачала перамовы з польскімі ўладамі аб аднаўленні БНР. Польскі бок быў не супраць уключэння беларускіх зямель у Польшчу на правах культурна-нацыянальнай аўтаноміі. З гэтай мэтай у жніўні 1919 г. у Мінску быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт. Для практычнай рэалізацыі задуманага плана з дазволу польскіх акупацыйных улад 12 снежня 1919 г. у Мінску прайшло пасяджэнне Рады БНР. Прыхільнікі злучэння з Польшчай, у тым ліку, група БНК, аказаліся ў меншасці. Большасць Рады, якую складалі ў асноўным эсэры, выступілі супраць далучэння да Польшчы. Яны пацвердзілі Устаўную Грамату БНР ад 25 сакавіка 1918 г. аб незалежнасці Беларусі, перавыбралі ўрад і абвясцілі новую, Народную Раду. Прыхільнікі польскай арыентацыі стварылі Найвышэйшую Раду БНР на чале з А. Луцкевічам. Але на самай справе палякі не пайшлі нават на стварэнне марыянетачнай рэспублікі, урад А. Луцкевіча хутка распаўся, сам ён адышоў ад палітычнай дзейнасці і стаў працаваць выкладчыкам у Віленскай гімназіі.

Зменены палітычны курс беларускіх эсэраў наблізіў іх да камуністаў. Яны сталі на шлях узброенай барацьбы з польскімі акупантамі і ў снежні 1919 г. у Смаленску дамовіліся з бальшавікамі аб сумесных дзеяннях. Да пытання аб умовах аднаўлення беларускай дзяржаўнасці было вырашана вярнуцца пасля вызвалення Беларусі ад палякаў. Эсэры і бальшавікі пачалі ствараць партызанскія атрады, пашыраць узброеную барацьбу супраць польскіх інтэрвентаў. Пад кіраўніцтвам камуністаў дзейнічалі партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі, якія налічвалі каля 4 тысяч чалавек. Беларусь была падзелена на раёны з паўстанцкімі цэнтрамі, якія кіравалі партызанскімі атрадамі. Для кардынацыі дзеянняў ЦК РКП(б) накіраваў сваіх прадстаўнікоў ва ўтвораны эсэрамі Беларускі паўстанцкі камітэт. Паступова ўсе партызанскія эсэраўскія атрады аб’ядналіся ў адзіную арганізацыю – Народную ваенную самаабарону (НВС). У выніку збліжэння з бальшавікамі частка беларускіх дзеячаў на чале з У. Ігнатоўскім парвала з эсэрамі, утварыла Беларускую камуністычную арганізацыю і на правах калектыўнага члена ўвайшла ў склад РКП(б). БКА, якая з’яўлялася часткай народнай самаабароны, стала сувязным звяном паміж эсэраўскай і камуністычнай плынямі партызанскага руху.

Вясной 1920 г. становішча бальшавікоў на франтах грамадзянскай вайны палепшылася, што дазволіла перакінуць значныя сілы, у тым ліку, 1-ю конную армію (камандуючы С.М. Будзённы), на польскі фронт. Чырвоная Армія перайшла ў наступленне. 11 ліпеня быў вызвалены Мінск, 14 ліпеня – Вільня. Пасля вызвалення Мінска бальшавікамі і эсэрамі быў створаны Мінскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт як часовы рэгіянальны орган кіравання ваеннымі і грамадзянскімі справамі. Зноў паўстала пытанне аб беларускай дзяржаўнасці. Паколькі перад гэтым Расія прызнала Літоўскую рэспубліку, пытанне аб аднаўленні Літоўска-Беларускай ССР ужо не падымалася.

31 ліпеня 1920 г. у г. Мінску адбылося сумеснае пасяджэнне прадстаўнікоў ваенрэўкома, кіруючых работнікаў Кампартыі Літвы і Беларусі, прафсаюзаў, Беларускай камуністычнай арганізацыі, Бунда, на якім была прынята Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Паколькі ў гэты час ваенныя дзеянні яшчэ працягваліся і будучае было яшчэ няпэўным, дэкларацыя не акрэсліла межаў Беларусі. Да склікання з’езда Саветаў уся ўлада ў рэспубліцы перадавалася Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту БССР. Бальшавіцкія арганізацыі выйшлі з КП(б) ЛіБ і аб’ядналіся ў Камуністычную партыю (бальшавікоў) Беларусі. Эсэры не падпісалі пагаднення, паколькі яны патрабавалі прызнання незалежнасці Беларусі ў яе этнаграфічных межах і перадачы ўлады ўраду В. Ластоўскага, вываду Чырвонай Арміі і стварэння ўласнага войска. Бальшавікі не згадзіліся з гэтым і эсэры перайшлі ў апазіцыю, пачалі барацьбу супраць савецкай улады, у тым ліку, узброеную. Другі Усебеларускі з’езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, які адбыўся 13–17 снежня 1920 г. у Мінску, зацвердзіў паўторнае абвяшчэнне БССР у межах 6 паветаў Мінскай губерні з колькасцю насельніцтва 1,5 млн. чалавек, прыняў дадаткі да Канстытуцыі, згодна з якімі кіруючымі органамі рэспублікі былі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў, выбраў урад рэспублікі. Такім чынам, было юрыдычна зацверджана аднаўленне беларускай дзяржаўнасці. Фактычна ж на тэрыторыі Беларусі працягвалі дзейнічаць законы РСФСР.

У гэты час, калі наступленне Чырвонай Арміі пасля шэрагу поспехаў закончылася няўдачай пад Варшавай, 17 жніўня 1920 г.

пачаліся мірныя перагаворы паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. Абодва бакі згадзіліся на ўстанаўленне мяжы, згодна з якой Заходняя Беларусь заставалася ў зоне польскай акупацыі. Канчаткова гэтыя межы былі замацаваны заключаным 18 сакавіка 1921 г. у г. Рызе савецка-польскім мірным дагаворам.

Пасля ўтварэння БССР тут прадаўжалі дзейнічаць законы Расійскай Федэрацыі, праводзілася агульная знешняя і ўнутраная палітыка. Усё гэта падштурхоўвала да больш цеснага саюза, перш за ўсё, са сваім усходнім суседам – Савецкай Расіяй, дзе быў усталяваны аднатыпны палітычны і эканамічны ўклад. Ужо 16 студзеня 1921 г. быў заключаны двухбаковы дагавор паміж БССР і РСФСР аб ваенным і эканамічным саюзе. Згодна з ім, утвараліся аб'яднаныя народныя камісарыяты па найбольш важных напрамках: ваенных і марскіх спраў, знешняга гандлю, фінансаў, працы, шляхоў зносін, пошты і тэлеграфа. У 1922 г. праблема аб'яднання савецкіх рэспублік стала прадметам сістэматычнага абмеркавання на партыйных з'ездах і пасяджэннях ЦВК. З прадстаўнікоў ад Украінскай, Беларускай рэспублік, РСФСР, Закаўказскай Федэрацыі была створана камісія па падрыхтоўцы дагавора аб больш цесным саюзе. 14 снежня 1922 г. за гэтую прапанову выказаўся Усебеларускі з'езд Саветаў. Аналагічныя рашэнні прынялі і з'езды іншых рэспублік. 30 снежня 1922 г. у Маскве дэлегацыі ад рэспублік аб'явілі сябе I Усесаюзным з'ездам Саветаў і зацвердзілі Дэкларацыю аб утварэнні СССР на прынцыпах раўнапраўя, дабраахвотнага ўвахода і выхада з Саюза і свабоднага доступа ў яго склад іншым дзяржавам. З'езд зацвердзіў таксама Дагавор аб утварэнні СССР, выбраў вярхоўны орган улады – Цэнтральны Выканаўчы Камітэт. Пазней, на II Усесаюзным з'ездзе Саветаў 31 студзеня 1924 г. была прынята Канстытуцыя СССР, якая папярэдне абмяркоўвалася на з'ездах Саветаў саюзных рэспублік.

З уваходам Беларусі ў склад СССР склаліся спрыяльныя ўмовы для ўзбуйнення тэрыторыі рэспублікі за кошт рэгіёнаў з пераважаючай колькасцю беларусаў, якія заставаліся ў складзе РСФСР.

Па прапанове беларускага боку пры ЦВК СССР была створана спецыяльная камісія і згодна з яе вывадамі 7 сакавіка 1924 г. Прэзідыум ЦВК СССР прыняў пастанову аб уключэнні ў склад БССР 15 паветаў Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. VI Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся 13–16 сакавіка 1924 г., канчаткова зацвердзіў гэтае рашэнне. Такім чынам, тэрыторыя

Беларусі і колькасць насельніцтва павялічыліся больш чым у два разы. Адначасова адбылася рэарганізацыя губерняў і паветаў: на тэрыторыі Беларусі былі ўтвораны 10 акруг і 100 раёнаў. Пазней, у верасні 1926 г., да Беларусі былі далучаны дадаткова г. Гомель з Гомельскім і Рэчыцкім раёнамі і, такім чынам, тэрыторыя Беларусі павялічылася яшчэ на 15,5 тыс. квадратных кіламетраў, а насельніцтва – на 649 тысяч чалавек. У выніку двух узбуйненняў колькасць насельніцтва Беларусі дасягнула 5 млн. чалавек або ў тры разы больш у параўнанні з 1920 г., значна ўзрос яе эканамічны і культурны патэнцыял.

Перыяд дзяржаўнага адраджэння супаў з нацыянальным, што знайшло адлюстраванне ў палітыцы беларусізацыі. Ужо з утварэннем БССР беларуская мова атрымала статус дзяржаўнай, пашырылася сетка беларускамоўных школ. У 1920 г. пачаў працаваць Беларускі палітэхнічны інстытут, у 1921 г. – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1922 г. – Інстытут беларускай культуры. Ствараліся беларускія выдавецтвы, бібліятэкі, установы культуры. Але менавіта якасць аднаго з важнейшых напрамкаў дзяржаўнай палітыкі працэс беларусізацыі набыў з ліпеня 1924 г., калі другая сесія ЦВК БССР прыняла пастанову ”Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі”. У шырокім сэнсе пад беларусізацыяй разумелася наданне пераважна беларускай мове з улікам рускай, польскай, яўрэйскай моў статуса дзяржаўнай, арганізацыя сеткі беларускамоўных навучальных устаноў, развіццё беларускай літаратуры, друку, краязнаўчая работа па вывучэнню Беларусі, вылучэнне на кіруючыя пасады перш за ўсё беларусаў, перавод справаводства на беларускую мову, утварэнне нацыянальных адміністрацыйных адзінак, тэрытарыяльных часцей Чырвонай Арміі. Адным з асноўных напрамкаў у гэтай працы стала выпрацоўка літаратурнай беларускай мовы: распрацаваны правапіс, граматычныя правілы, створаны адпаведныя падручнікі, слоўнікі. З 1921 г. пры Народным сакратарыяце асветы БССР пачала працаваць Навукова-тэрміналагічная камісія, якая затым была рэарганізавана ў Інстытут беларускай культуры.

Пытанні практычнай рэалізацыі палітыкі беларусізацыі неаднаразова выносіліся на абмеркаванне партыйных, савецкіх органаў, была разгорнута шырокая тлумачальная работа сярод насельніцтва. Яна ўлічвалася і ў працэсе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай

рэформы. У час першага ўзбуйнення, калі пашырылася тэрыторыя рэспублікі і замест паветаў і валасцей утварыліся раёны і сельсаветы, былі створаны, акрамя беларускіх, яшчэ 70 іншых нацыянальных сельскіх саветаў і адзін нацыянальны (польскі) раён з цэнтрам у Дзяржынску. Да канца 1928 г. 80% школ, амаль усе ўстановы і кіруючыя структуры рэспублікі былі пераведзены на беларускую мову. Але празмернае фарсіраванне тэмпаў беларусізацыі, правядзенне яе ў большасці выпадкаў адміністрацыйнымі мерамі выклікалі ў часткі насельніцтва адмоўную рэакцыю і ў пэўнай ступені дыскрэдытавалі нацыянальную ідэю. У канцы 1920-х гг. палітыка беларусізацыі пачала паступова згортвацца.

Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва праходзіла ў абставінах усталявання аднапартыйнай сістэмы кіравання. У 1921 г. спыніў сваю дзейнасць Бунд, частка яго членаў увайшла ў склад КП(б)Б. Даволі ўплывовай на Беларусі была Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, якая налічвала больш за 20 тысяч членаў. Але пасля адказу эсэраў у ліпені 1920 г. ад супрацоўніцтва з бальшавікамі, перахода іх ў апазіцыю БПС-Р стварыла сетку падпольных арганізацый пад агульнай назвай “Зялёны дуб” і зрабіла няўдалую спробу арганізаваць восенню 1920 г. паўстанне супраць савецкай улады, пасля чаго яе ўплыў сярод насельніцтва стаў падаць. У лютым 1921 г. 860 найбольш актыўных яе членаў былі арыштаваны і інтэрніраваны ў Заходнюю Беларусь, якая знаходзілася пад уладай Польшчы. У выніку ў чэрвені 1924 г. БПС-Р самараспусцілася. Распаду апазіцыйных сіл садзейнічала і амністыя ўдзельнікам антысавецкіх нацыянальных арганізацый і фарміраванняў, якая была абʼяўлена ў 1923 г. ЦВК СССР і ЦВК БССР. Пасля гэтага ў 1925 г. на нарадзе ў Берліне большая частка дзеячаў БНР таксама заявіла аб самароспуску гэтай арганізацыі і выразіла жаданне вярнуцца ў БССР, якую яны прызналі цэнтрам нацыянальнай кансалідацыі беларусаў.

У выніку з сярэдзіны 1920-х гг. грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, як і ў цэлым ў СССР, было зведзена да дзейнасці адной партыі – камуністычнай, якая пачала хутка расці колькасна. Адначасова пачала ўстанаўлівацца жорсткая цэнтралізацыя кіравання ўнутры партыі, а паколькі яна стала кіруючай, то і ў цэлым у краіне. Партыя паступова брала пад кантроль усё

грамадска-палітычнае і культурнае жыццё. Гэта адмоўна адбілася і на дэмакратызацыі вытворчага жыцця. Пытанні, якія раней вырашаліся калектыўна на сходах працоўных, цяпер станавіліся справай вузкага кола кіраўнікоў. Дыктатура пралетарыята, якая раней абвяшчалася бальшавікамі, паступова замянялася дыктатурай партыйна-адміністрацыйнага апарата. Улада Саветаў, якая таксама раней шырока прапагандавалася, была фактычна ліквідавана, а Саветы падпарадкаваны партыйным органам. Зніжэнне іх ролі адмоўна адбілася і на актыўнасці людзей у час выбарчых кампаній.

Напрыклад, на выбарах Саветаў у Беларусі ў 1924–1925 гг. удзельнічала ў сярэднім 35–40% выбаршчыкаў. Таму адначасова з узмацненнем ідэалагічнай апрацоўкі мас ў кіраўніцтве дзейнасцю Саветаў усё шырэй сталі прымяняцца дырэктыўныя меры. Але і ў гэтых умовах узрастала працоўная і грамадска-палітычная актыўнасць насельніцтва, актывізавалася дзейнасць прафсаюзаў і камсамольскіх арганізацый.

Пераход да аднапартыйнай улады ва ўмовах, калі большую частку камуністаў складалі людзі з ніжэйшай адукацыяй, здольныя толькі выконваць кіруючыя ўказанні зверху, складанасць знешнепалітычнага становішча, калі Савецкая краіна знаходзілася ў варожым акружэнні, барацьба за ўладу паміж рознымі групоўкамі, перш за ўсё, трацкістамі і сталінскім акружэннем, нарэшце, асабістыя якасці характару І.В. Сталіна, які стаў на чале СССР, стваралі спрыяльныя ўмовы для складвання цэнтралізаванай сістэмы кіравання, росквіт якой прыйшоўся на 1930-я гады і суправаджаўся палітычнымі рэпрэсіямі.

Пачатак жа рэпрэсій адносіцца да часу згортвання палітыкі беларусізацыі, якая была расцэнена камісіяй ЦК ВКП(б) як спроба буржуазных нацыяналістаў рэстаўрыраваць буржуазны лад і адарваць Беларусь ад Савецкага Саюза. Спачатку барацьба супраць нацыянальна-дэмакратычных настрояў вялася на ўзроўні крытыкі на партыйных і савецкіх з’ездах, але з 1930 г. рэпрэсіўныя органы пачалі арышты па абвінавачванню ў прыналежнасці да так званага “Саюза вызвалення Беларусі”, сапраўдная наяўнасць якога да гэтага часу дакладна не выяўлена. Было арыштавана 108 чалавек, частка была асуджана на розныя тэрміны заключэння. Справа СВБ дала пачатак кампаніі ідэалагічнага тэрора супраць “нацыянал-дэмакратаў”.У прыватнасці, у Беларускай Акадэміі навук быў арышта-

ваны кожны трэці супрацоўнік. Хваля рэпрэсій закранула таксама значную частку беларускіх літаратараў. Пазней пачаліся агульнасаюзныя судовыя працэсы па справах "Працоўнай сялянскай партыі", "Прампартыі" і іншых антысавецкіх арганізацый, дзейнасць якіх таксама дакладна да гэтага часу не ўстаноўлена. Гэтыя працэсы закранулі і Беларусь як частку СССР. Пік рэпрэсій прыйшоўся на сярэдзіну 1930-х гадоў і асабліва на 1937 г. Усяго ва ўсходняй Беларусі ў перадваенныя гады па палітычных матывах было рэпрэсіравана, па розных звестках, ад 40 да 90 тыс. жыхароў, з іх 16050 рэпрэсіраваны ў 1937–1938 гг.

## 5.2. Асаблівасці пераходу БССР да мірнага жыцця. Новая эканамічная палітыка. Правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі

Пасля заканчэння польскай акупацыі зноў утвораная Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка знаходзілася ў своеасаблівым палітычным і эканамічным становішчы. Яна займала невялікую тэрыторыю з шасці паветаў Мінскай губерні, што, безумоўна, ускладняла паўнацэннае дзяржаўнае і сацыяльна-эканамічнае будаўніцтва, арганізацыю абароны, правядзенне знешняй палітыкі, наладжванне эканамічных сувязяў. У выніку ваенных канфліктаў, якія працягваліся амаль 10 гадоў, дзвюх рэвалюцый эканоміка Беларусі аказалася разбуранай. З-за падзелу Беларусі і дзяржаўна-тэрытарыяльных змен былі парушаны эканамічныя сувязі. Аб'ёмы валавай прадукцыі ў прамысловасці скараціліся ў параўнанні з даваенным узроўнем у 5 разоў, у сельскай гаспадарцы – у 2 разы. Праўда, у выніку канфіскацыі памешчыцкай зямлі сяляне павялічылі сваё землекарыстанне на 32,7%, але на іх плечы вялікім цяжарам лягла харчразвёрстка, уведзеная ў гады "ваеннага камунізму". Згодна з ёй, сяляне павінны былі прадаваць дзяржаве лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі па цвёрдых цэнах. Харчатрады ж часам забіралі ў сялян не толькі лішкі, але і частку неабходных для жыцця запасаў. У адказ земляробы пачалі скарачаць пасевы, засяваючы толькі плошчы ў памерах пражытачнага мінімуму. Палітыка "ваеннага камунізму", якая прадугледжвала, акрамя харчразвёрсткі, усеагульную працоўную павіннасць, адказ ад таварна-грашовых адносін, гандлю, нацыяналізацыю прамысловасці

і жорсткую цэнтралізацыю кіраўніцтва эканомікай, вызывала нездавальненне насельніцтва. Пагоршылася і становішча рабочых.

З-за разбурэння прамысловасці і транспарту вырасла беспрацоўе, рэзка знізіўся жыццёвы ўзровень. У шэрагу мясцовасцяў Беларусі да 1922 г. фактычна працягвалася скрытая грамадзянская вайна. Многія сяляне прыхільна адносіліся да эсэраўскіх падпольных груп арганізацыі “Зялёны дуб”. Каля 13 тысяч чалавек налічвалі ўзброеныя фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі рэспублікі або базіраваліся на польскай тэрыторыі і адтуль рабілі рэйды.

Падобнае эканамічнае і палітычнае становішча ў пачатку 1920-х гадоў было характэрным для ўсёй Расіі. У шэрагу губерняў пачаліся паўстанні, найбольш буйнае адбылося ў Тамбоўскай губерні, а найбольш небяспечнае для ўлад – у Кранштаце. Але сітуацыя ў Беларусі, якая ў гады першай сусветнай і савецка-польскай войнаў знаходзілася ў зоне баявых дзеянняў, была асабліва складанай. Восенню 1920 г. рэспубліка была на мяжы агульнага паўстання, якое рыхтавалі эсэры. Яно не адбылося, але ў шэрагу паветаў: Сенненскім, Аршанскім, Слуцкім і інш. адбыліся лакальныя ўзброеныя выступленні супраць бальшавікоў, якія, аднак, былі хутка падаўлены.

У гэтых умовах Савецкая ўлада пайшла на прынцыповую змену палітычнага курса, менавіта, частковую і часовую рэстаўрацыю капіталізма, дапушчэнне прыватнай уласнасці і прадпрымальніцтва, але пад кантролем дзяржавы. Гэтыя змены, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай “новая эканамічная палітыка”, пачаліся з сакавіка 1921 г., калі адпаведнае рашэнне прыняў Х з’езд Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў). У Беларусі новая эканамічная палітыка праводзілася ў асаблівых сацыяльна-эканамічных умовах, звязаных перш за ўсё з больш моцнай, чым у другіх рэгіёнах, эканамічнай разрухай, нявырашанасцю тэрытарыяльна-дзяржаўнага будаўніцтва, асаблівасцямі сацыяльна-эканамічнай структуры вытворчасці, дзе дамініруючае палажэнне займала сельская гаспадарка, а прамысловасць ў асноўным складвалася з дробных саматужных прадпрыемстваў, разрывам эканамічных сувязяў з іншымі рэгіёнамі ў выніку падзелу рэспублікі, памежным палажэннем Беларусі і больш складаным з нагоды гэтага палітычным становішчам.

Стрыжнем новай эканамічнай палітыкі стала замена харчразвёрсткі харчпадаткам і развіццё таварна-грашовых адносін. Падатак быў значна меншым за развёрстку: спачатку ён складаў прыкладна 20 % ад гадавога даходу гаспадаркі, затым быў зніжаны да 10 %, пры гэтым паступова заменены грашовым. Падатак быў фіксіраваны, у залежнасці ад плошчы пасеваў, даводзіўся ў пачатку года, пасля яго выплаты селянін мог свабодна карыстацца лішкамі, у тым ліку, і прадаваць. У 1922 г. Прэзідыум ЦВК БССР прыняў дэкрэт "Аб свабодным выбары форм землекарыстання" і "Асноўны закон аб працоўным землекарыстанні", згодна з якімі аднолькава законнымі прызнаваліся арцелі, абшчыны, прыватнае землекарыстанне, пераход на хутары або вотрубы. Дазвалялася здача зямлі ў арэнду і выкарыстанне наёмнай працы, праўда, у абмежаванай колькасці і пры ўмове ўдзелу ў працы членаў сям'і наймальніка.

Усё гэта стымулявала павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Асаблівасцю Беларусі стала супадзенне правядзення новай эканамічнай палітыкі з перадачай зямлі сялянам і ўзбуйненнем тэрыторыі. Пры гэтым улады заахвочвалі шляхам прырэзак дадатковых надзелаў пераход сялян на хутары, вотрубы, падтрымлівалі выхад групамі сем'яў на невялікія пасёлкі. У выніку да 1928 г. больш за 25% двароў выбралі хутары, вотрубы і пасёлкі. Заахвочвалася сялянская кааперацыя, калі людзі аб'ядноўваліся ў кааператывы для сумеснай вытворчасці або для аб'яднання сваіх фінансаў. Да 1928 г. ёю, прычым пераважна спажывецкай і крэдытнай, было ахоплена да 50% гаспадарак. Развівалася і вытворчая кааперацыя. Да 1928 г. у Беларусі, у асноўным на былых памешчыцкіх землях і землях дзяржфонду, былі створаны 434 камуны, арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, у якія ўвайшлі 7,5 % двароў, у асноўным, з ліку незаможных сялян і батракоў. Трэба адзначыць, што сельская гаспадарка давала ў гэты час да 10 % прыросту ў год. Большасць сельскага насельніцтва сталі складаць серадзнякі.

З адменай нацыяналізацыі прамысловасці, якая праводзілася ў гады "ваеннага камунізма", пачала ажыццяўляцца дэнацыяналізацыя дробнай і часткі сярэдняй прамысловасці, перадача прадпрыемстваў у кааператыўную ўласнасць, каля 300 прадпрыемстваў былі здадзены ў арэнду, у тым ліку, і былым уладальнікам. 167 найбольш рэнтабельных прадпрыемстваў, якія засталіся ў дзяржаўнай

уласнасці, пераводзіліся на гаспадарчы разлік. З 1925 г. улады дазволілі выкарыстоўваць у прамысловасці ў абмежаванай колькасці наёмных работнікаў. Больш ліберальным стаў і характар кіравання эканомікай. У Беларусі быў створаны Вышэйшы савет народнай гаспадаркі (ВСНГ), якому падпарадкоўваліся аб'яднанні прамысловых прадпрыемстваў–сіндыкаты, трэсты, якія працавалі на ўмовах гаспадарчага разліку і самафінансавання.

Важнай мерай, якая садзейнічала аздараўленню эканомікі ў гады новай эканамічнай палітыкі, стала грашовая рэформа. У выніку некалькіх дэнамінацый, праведзеных у 1922–1924 гг., была ўстаноўлена цвёрдая грашовая адзінка – чырвонец, які раўняўся 10 дарэвалюцыйным рублям, або 7,74 гр. золата, або 5,14 доларам ЗША. Быў збалансаваны бюджэт і забаронена грашовая эмісія. У 1921 г. аднавілася дзейнасць дзяржбанка, ствараліся спецыялізаваныя акцыянерныя, камерцыйныя банкі, таварыствы ўзаемнага крэдыту. Былі ўведзены тарыфы, адноўлена грашовая аплата працы, шырока практыкавалася здзельная аплата працы і іншыя меры стымулявання. Гэта садзейнічала росту прадукцыйнасці працы.

Захаваўшы за сабой манаполію на знешні гандаль, дзяржава каля 70 % рознічнага гандлю перадала прыватным гандлярам, што таксама садзейнічала мабільнасці тавараабароту.

У выніку правядзення новай эканамічнай палітыкі да 1927 г. была поўнасцю адноўлена сельская гаспадарка, зменшылася колькасць безконных і безкароўных двароў, прамысловасць Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню. Папоўніўся спажывецкі рынак, павялічыў абароты гандаль, пачаў павышацца жыццёвы ўзровень насельніцтва. Аднак з увядзеннем новай эканамічнай палітыкі вызначыўся і шэраг праблем: рост беспрацоўя ў гарадах, сацыяльнае расслаенне на багатых і бедных, маёмасная няроўнасць, перыядычныя эканамічныя крызісы, якія адмоўна адбіваліся на стабільнасці вытворчасці, праблемы з закупкамі сельскагаспадарчых тавараў, што выклікала іх недахоп ў гарадах, нездавальненне значнай часткі насельніцтва, рабочых і сялян, якія павінны былі з'яўляцца сацыяльнай базай савецкай улады і г.д. У выніку новая эканамічная палітыка пачала згортвацца. Паступова ажыццяўляўся пераход да адміністрацыйных метадаў кіравання эканомікай, якія часам паўтаралі асобныя метады палітыкі "ваеннага камунізму". Трэба ўлічваць і абвастрыўшаеся знешнепалітычнае становішча. З

сярэдзіны 1920-х гг. новая эканамічная палітыка пачала замяняцца курсам на фарсіраваную індустрыялізацыю і калектывізацыю.

Індустрыялізацыя ў БССР ажыццяўлялася як састаўная частка адзінага працэсу прамысловай мадэрнізацыі ў СССР, створанага ў 1922 г., але мела і адметнасці. Улічваючы адсутнасць мясцовых радовішч нафты, вугалю, металаў, памежнае становішча Беларусі, Савецкая ўлада, да таго ж няўпэўненая ў трываласці палітычнага становішча рэспублікі, размешчанай па суседству з варожай Польшчай, зрабіла стаўку не на цяжкую прамысловасць, а на традыцыйную лёгкую, заснаваную на перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, лесу і іншай мясцовай сыравіны. Паколькі беларуская прамысловасць была ў асноўным прадстаўлена дробнымі саматужна-рамесніцкімі прадпрыемствамі, дзе працавалі амаль ¾ рабочых рэспублікі, планавалася ўцягнуць іх у працэс індустрыялізацыі шляхам стварэння прамысловых арцеляў. Раней Беларусь была аграрнай акраінай Расійскай імперыі і значна адставала ў прамысловым развіцці ад больш развітых цэнтральных рэгіёнаў краіны, таму была зроблена стаўка на больш высокія і паскораныя тэмпы развіцця прамысловасці, адпаведна, і асігнаванні на гэтыя мэты былі ў два разы большымі, чым, напрыклад, у цэнтральнай Расіі.

Крыніцамі фінансавання індустрыялізацыі былі прыбыткі з прадпрыемстваў, адноўленых і пабудаваных у папярэднія гады, банкаў, гандлю, сродкаў, атрыманых з аграрнай сферы, рэжым эканоміі, унутраныя займы ў насельніцтва. Трэцяя частка сродкаў паступіла з саюзнага бюджэту.

Курс на правядзенне індустрыялізацыі, яе асноўныя напрамкі вызначыў XIV зъезд ВКП(б), які адбыўся ў снежні 1925 г. Ужо ў 1925–1928 гг. у рэспубліцы былі пабудаваны 150 новых прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку, буйнейшая электрастанцыя – БелДРЭС (каля г. Оршы), станкабудаўнічы завод “Энергія” у Мінску. У першую пяцігодку, з 1928 па 1932 гг., планавалася павялічыць выпуск прамысловай прадукцыі ў Беларусі ў 3,8 разы. Для выканання гэтых абавязацельств быў узяты курс на адміністрацыйную сістэму кіравання, якая спалучалася з шырокай масавай прапагандай, падтрымкай стаханаўскага руху. Пастаўленая мэта ўздыму ў кароткі тэрмін эканомікі і праз яе паляпшэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва вызвала працоўную актыўнасць.

За гады першай пяцігодкі ў БССР былі пабудаваны 538 прамысловых прадпрыемстваў, з іх 78 буйных, у тым ліку, швейная фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі”, трыкатажная фабрыка “КІМ” у г. Віцебску, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, “Гомсельмаш” і іншыя. Усяго за гэты час аб’ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 2,7 разы. Гэта высокія тэмпы роста, але яны адставалі ад планавых паказчыкаў. Важным сацыяльным фактарам была ліквідацыя ў 1931 г. беспрацоўя. За гады другой пяцігодкі (1933–1937 гг.) аб’ём прамысловай вытворчасці павялічыўся ў 1,9 разы, што таксама было ніжэй запланаванага. Пачалі працаваць Аршанскі ільнокамбінат, Гомельскі шкляны, Крычаўскі цэментны і іншыя заводы, якія мелі важнае значэнне для развіцця эканомікі Беларусі. У гэты час шырокае распаўсюджванне ў СССР, у тым ліку і ў Беларусі, атрымаў стаханаўскі рух, што ў пэўнай ступені спрыяла росту прадукцыйнасці працы.

З 1938 г. пачаў выконвацца трэці пяцігадовы план, які прадугледжваў паскоранае развіццё прамысловасці, перш за ўсё, машынабудавання. Былі зданы ў эксплуатацыю Мінскі радыёзавод, Рагачоўскі кансервавы камбінат і іншыя прадпрыемствы. Усяго за гады перадваенных пяцігодак былі ўведзены ў дзеянне і рэканструяваны 1863 прадпрыемствы, з іх 400 адносна буйных, узровень прамысловасці ва ўсходняй Беларусі павялічыўся ў параўнанні з 1913 г. у 8,1 разоў, рэспубліка з аграрнай ператварылася ў індустрыяльна-аграрную. З’явіліся новыя галіны, адпаведныя навукова-тэхнічнаму прагрэсу, напрыклад, станка -і машынабудаванне, хімічная, паліўная прамысловасці, пры гэтым трэба ўлічваць, што каля 80% прадукцыі выраблялася з мясцовай сыравіны. Змянілася сацыяльная структура насельніцтва, каля 20% сталі складаць рабочыя. Але рэальны ўзровень жыцця насельніцтва, з улікам інфляцыі, к 1940 г. быў прыкладна такім жа, як і ў 1928 г., калі згортвалася новая эканамічная палітыка.

Агульная тэндэнцыя да ўмацавання і пашырэння адміністрацыйных метадаў кіравання, развіцця, так званага, сацыялістычнага ўклада ў эканоміцы, неэфектыўнасць дробнатаварнай сельскагаспадарчай вытворчасці ва ўмовах забароны стварэння буйных гаспадарак, заснаваных на наёмнай працы, прывялі да ўстанаўлення курса на фарсіраваную калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Штуршком для гэтых дзеянняў стаў крызіс хлебанарыхтовак

1927/1928 гг., калі ў сувязі са зніжэннем закупачных цэн узніклі цяжкасці з закупкамі ў сялян зерня. Дяржава перайшла да прымусовых метадаў закупак прадуктаў харчавання.

У снежні 1927 г. курс на калектывізацыю быў афіцыйна вызначаны на XV з'ездзе ВКП(б). Згодна з першым пяцігадовым планам, у 1928–1933 гг. у Беларусі планавалася аб'яднаць у калгасы 9,8 % сялянскіх гаспадарак. Гэта ў цэлым былі даволі рэальныя задачы, улічваючы, што ў гэты час беднякі складалі каля 30 % сельскага насельніцтва. Але ў лістападзе 1929 г. у газеце “Праўда” быў апублікаваны артыкул І.В. Сталіна “Год вялікага пералому”, у якім ён адзначыў, што сяляне сталі ахвотна ўступаць у калгасы, таму мэтазгодна паскорыць працэс калектывізацыі, сутнасць якога заключалася ў пераводзе хутарскіх, аднаасобных гаспадарак, усіх форм сельскагаспадарчай кааперацыі да адной – сельскагаспадарчай арцелі з абагульненнем пасяўных плошчаў і сродкаў вытворчасці. У пастанове ЦК ВКП(б) ад 5 студзеня 1930 г. “Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву” для Беларусі як нечарназёмнага раёна не вызначаліся канкрэтныя тэрміны абагульнення сялянскіх гаспадарак.

Але партыйнае кіраўніцтва рэспублікі ў адміністрацыйным запале прыняло рашэнне аб'явіць Беларусь зонай суцэльнай калектывізацыі і завяршыць яе да 1931 г. Пачалося нездаровае спаборніцтва за хутчэйшае выкананне гэтага задання. Шляхам масіраванай прапаганды, а таксама і адміністрацыйнымі мерамі мясцовыя ўлады дабіліся таго, што ўжо да 1 сакавіка 1930 г. у калгасы ўступілі 457,5 тыс. гаспадарак, што склала 58% іх агульнай колькасці. Прымусовыя меры, пераважна ў адносінах да заможных і сярэдніх слаёў сялянства, вызвалі нарастанне пасіўнага і актыўнага супраціўлення. Пасіўнае заключалася ў скрытай антыкалгаснай прапагандзе, адмове ад уплаты падаткаў, масавым забою жывёлы (зімой 1929/1930 гг. яе колькасць зменшылася на трэць). Актыўнае выражалася ў адкрытых выступленнях, якіх зарэгістравана ў рэспубліцы ў 1930 г. каля 2 тысяч.

Створаныя калгасы ў большасці былі невялікімі, з 10–20 двароў, у многіх з іх была дрэнна арганізавана праца, матэрыяльная база заставалася вельмі слабай, у 1929 г. у Беларусі налічвалася толькі 190 трактараў. Таму адразу ж пасля выхаду ў свет 2 сакавіка 1930 г. артыкула І.В. Сталіна “Галавакружэнне ад поспехаў” і адпаведнай

пастановы ЦК ВКП(б) пачаўся масавы адток сялян з калгасаў: за месяц выйшла 356 тыс. гаспадарак, а працэнт калектывізацыі знізіўся да 13,6%.

Але гэтыя дзеянні ўлад былі хутчэй тактычным крокам, каб зменшыць сацыяльнае напружанне ў вёсцы. Ужо з восені 1930 г. пачалася новая хваля калектывізацыі. На пачатак 1932 г. у БССР было аб’яднана ў калгасы звыш 388 тыс. гаспадарак, або 50,4%, праўда, хутка з-за чарговага адтока сялян і безгаспадарчасці на месцах распалася каля 1000 калгасаў і працэнт калектывізацыі адпаведна знізіўся да 43,7 %. Актыўную ролю ў правядзенні калектывізацыі сталі адыгрываць у гэтыя гады машынна-трактарныя станцыі і створаныя пры іх палітаддзелы. Першыя МТС з’явіліся ў 1929 г., да 1932 г. іх колькасць павялічылася да 57. Яны мелі 1500 трактараў і абслугоўвалі 33% калгасаў.

У 1930-я гг. улады пачалі праводзіць палітыку “ліквідацыі кулацтва як класа”. Заможныя сяляне дзяліліся на 3 катэгорыі: адкрытыя “контррэвалюцыянеры” падвяргаліся суду, другая катэгорыя падлягала адміністрацыйнай высылцы ў паўночныя або ўсходнія рэгіёны краіны, трэцяя перасялялася ў межах раёна, іх маёмасць канфіскоўвалася. Усяго, па няпоўных даных, было “раскулачана” звыш 15 тысяч сялянскіх гаспадарак.

Да 1934 г. маштаб калектывізацыі ўзрос да 72,6 %. Было абагульнена чатыры пятых пасяўных плошчаў. У 1935 г. у калгасы ўступілі яшчэ 106,4 тысячы сялянскіх двароў, што павысіла працэнт калектывізацыі да 85,6%. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ва ўсходніх абласцях БССР ступень абагульненасці сялянскіх гаспадарак дасягнула 93,4%. У 1940 г. ва ўсходняй Беларусі ўжо налічвалася 236 МТС, а трактарны парк павялічыўся да 9,7 тыс. машын. Узрасла колькасць іншай тэхнікі, але, як і раней, пераважала ручная праца. Былі прыняты два Статуты сельскагаспадарчай арцелі, вызначылася ўнутраная структура калгасаў, якія складаліся з брыгад і звенняў. Аплата працы праводзілася як прадуктамі, так і ў невялікіх сумах грашыма згодна з выпрацаванымі працаднямі. Але ў перадваенны час ураджайнасць сельскагаспадарчых культур, іх валавыя зборы, прадукцыйнасць жывёлы заставаліся на даволі нізкім узроўні.

У выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў паступова, пачынаючы з другой пяцігодкі, пачаў паляпшацца жыццёвы

ўзровень насельніцтва. У 1935 г. былі адменены карткі на прадукты харчавання, у 1936 г. – на прамысловыя тавары. Людзі сталі лепш харчавацца, апранацца, хаця рэальная зарплата ў 1937 г. заставалася яшчэ даволі нізкай. Калі ў 1914 г. сярэднямесячная зарплата рабочага складала 93% пражытачнага мінімума, то ў 1927 г., у гады новай эканамічнай палітыкі, яна складала 67%, а ў 1937 г. – ужо 47 %. Як значнае дасягненне, адзначалася, што ў 1934–1936 гг. сялянам было прададзена 13 тыс. веласіпедаў і 1,4 тыс. патэфонаў. Былі ўведзены бясплатнае лячэнне, адукацыя.

### 5.3. Культурнае развіццё Беларусі ў 1917–1941 гг.

З першых гадоў свайго існавання савецкі ўрад адной з галоўных задач ў вобласці культурнага будаўніцтва вызначыў ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці. У Беларусі гэта праблема была асабліва актуальнай, паколькі 67,3% насельніцтва Беларусі было непісьменным. У 1920 г. была створана Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці. Нягледзячы на вялікія цяжкасці ў матэрыяльным забяспячэнні вучэбнага працэссу і востры недахоп педагагічных кадраў, у БССР былі адкрыты звыш 4 тыс. школ. У школах і пунктах ліквідацыі непісьменнасці для дарослых у 1921 г. пачалі вучобу 392250 чалавек. Да 1932 г. іх колькасць узрасла да 417 тыс. чалавек. Пастyпова павялічваліся асігнаванні на адукацыю. У 1924 г. на гэтыя мэты было выдзелена каля 5 млн. руб, у 1926 г.–ужо 15 млн. руб., прычым з кожным годам капіталаўкладанні ў адукацыю ўзрасталі і да 1932 г. дасягнулі 144 млн. руб. Адпаведна пашыралася і сетка школ. У 1927/1928 навучальным годзе іх налічвалася 5,5 тыс., у тым ліку 4940 – з беларускамоўнай формай навучання, а ў 1940–1941 г, з улікам школ, адкрытых у заходніх рэгіёнах Беларусі, у БССР ужо дзейнічалі 13043 пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ, у якіх навучалася 1,8 млн. дзяцей. За 20 перадваенных гадоў ліквідавалі непісьменнасць і малапісьменнасць каля 2 млн. дарослых. Спачатку ў пачатковых школах адсутнічала прадметная сістэма навучання, вёўся пошук новых форм арганізацыі вучэбнага працэса, адчуваўся недахоп падручнікаў і метадычнай літаратуры. Уніфікацыя сістэмы адукацыі адбылася ў пачатку 1930-х гг., калі былі ўстаноўлены агульныя тыпы школ: пачатковая, няпоўная сярэдняя,

сярэдняя, асновай навучання сталі класы і прадметныя ўрокі, распрацаваны падручнікі згодна з адзінымі праграмамі па прадметах, па адзінай шкале ацэньваліся веды вучняў, была ўведзена школьная форма адзення.

У 1931 г. БССР першай з саюзных рэспублік ажыццявіла пераход да ўсеагульнай пачатковай адукацыі. У гэты час у школах вучыліся 91 % васьмігадовых дзяцей. У 1932 г. СНК БССР прыняў пастанову аб увядзенні абавязковай усеагульнай сямігадовай адукацыі, якая ў асноўным была выканана да 1939 г. У 1939 г. XVIII з’езд ВКП(б) паставіў ужо задачу пераходу да ўсеагульнага сярэдняга навучання ў гарадах і завяршэння працы па ўводу ўсеагульнай сямігадовай адукацыі ў вёсцы. У выніку гэтай працы, якая пазней атрымала назву “культурная рэвалюцыя”, да пачатку вайны пісьменнасць насельніцтва ўсходніх вобласцей БССР склала 85%. Гэта быў значны крок наперад ў культурным развіцці беларускага народа, нягледзячы на складанасці, якія прадаўжалі існаваць ў сістэме адукацыі: перагружанасць класаў, адносна невялікая (10%) колькасць педагогаў з вышэйшай адукацыяй і інш.

Інтэнсіўнае развіццё прамысловасці, пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы, пашырэнне культурнага будаўніцтва выклікалі вялікую патрэбу ў кваліфікаваных кадрах. Складанасць станаўлення вышэйшай школы заключалася, перш за ўсё, у тым, што да рэвалюцыі ў Беларусі не было ВНУ, адпаведна адсутнічалі навуковыя кадры, матэрыяльная база. Але ўжо ў 1919 г. аднавіў работу Горацкі земляробчы інстытут, затым перайменаваны ў акадэмію. У 1918–1919 гг. Віцебскі, Магілёўскі, Мінскі, Гомельскі настаўніцкія інстытуты былі пераўтвораны ў педагагічныя інстытуты. У снежні 1920 г. на базе Мінскага палітэхнічнага вучылішча адкрыўся Беларускі палітэхнічны інстытут. 30 кастрычніка 1921 г. пачаў працаваць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Каб аблегчыць падрыхтоўку кадраў з асяроддзя рабочых і сялян, пры ВНУ адкрываліся рабочыя факультэты. Адначасова са стварэннем сістэмы вышэйшай адукацыі ішла рэарганізацыя ВНУ. У 1931 г. на 11 вышэйшых навучальных устаноў была падзелена Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, 7 самастойных інстытутаў былі створаны на базе асобных кафедр БДУ, але праз два гады зноў пачалося іх узбуйненне. У прыватнасці, у 1933 г. адкрыўся Інстытут народнай гаспадаркі, аднавіў сваю работу рэарганізаваны раней палітэхнічны інстытут. У цэлым

да 1941 г. у Беларусі была створана разгалінаваная сетка ўстаноў вышэйшай адукацыі, якая складалася з 25 ВНУ, у тым ліку, і мастацкага накірунку, дзейнічала, напрыклад, Беларуская дзяржаўная кансерваторыя. У іх навучаліся 21,5 тысяч студэнтаў, 76,6% з іх складалі беларусы.

Адначасова ствараласся сетка сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У 1939/1940 навучальным годзе толькі ва ўсходніх вобласцях БССР ужо працавалі 102 тэхнікумы з колькасцю 33,6 тыс. навучэнцаў.

У выніку значнай работы, якая была праведзена ў 1921–1941 гг., Беларусь ў перадваенныя гады па ўзроўню адукацыі насельніцтва дасягнула сярэднееўрапейскіх стандартаў.

1920-я гг. сталі часам нараджэння беларускай савецкай навукі. Яе асновай стала вузаўская навука. Менавіта прафесарска-выкладчыцкія кадры аб'ядноўвалі навукоўцаў, у першую чаргу, гуманітарнага напрамку. Першым жа самастойным навуковым цэнтрам стаў утвораны ў 1922 г. Інстытут беларускай культуры, які ў 1929 г. быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук. У 1931 г. яна складалася з 14 навуковых інстытутаў. Асноўнымі напрамкамі навуковых даследаванняў гэтай навуковай установы былі біялогія, геалогія, гісторыя і літаратура. Акрамя Акадэміі, у 1930-я гг. сталі працаваць і іншыя профільныя навукова-даследчыя інстытуты: Віцебскі ветэрынарна-бактэрыялагічны інстытут, Беларускі навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі і інш. Да 1940 г. у рэспубліцы ўжо дзейнічала 51 навуковая ўстанова. Але значны ўрон развіццю адукацыі і навукі нанеслі рэпрэсіі ў адносінах да педагагічных і навуковых кадраў, якія прайшлі ў 1930-я гг.

У 1920-я гг. склаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускай літаратуры: развіццё адукацыі, культурна-асветніцкая праца, палітыка беларусізацыі, якая праводзілася ў гэтыя гады, падтрымка літаратурнай творчасці ўладамі, адносная дэмакратызацыя. Хутка развівалася выдавецкая справа: ужо ў 1928 г. тыраж кніг складаў 2,8 млн., у тым ліку, 1,8 млн. беларускамоўных, ў 1938 г. – адпаведна ўжо 14,7 млн. і 12,3 млн.

У 1920-я гг.ў літаратуру ўліўся значны прыток маладых пісьменнікаў і паэтаў, у тым ліку, з вёскі. На ўзроўні рэспублікі і нават раёнаў ствараліся шматлікія творчыя аб'яднанні, ішоў пошук новых форм працы, вялася барацьба паміж рознымі напрамкамі. Найбольш

буйнымі літаратурнымі аб'яднаннямі былі “Маладняк” (створанае ў 1923 г.), “Узвышша” (1926 г.), “Полымя” (1927 г.). Усе яны мелі свае часопісы. Асноўнымі тэмамі прозы і паэзіі таго часу стала звяртанне да чалавека – працаўніка, адлюстраванне, прычым з пэўным рамантызмам і ідэалізацыяй, тых перамен, якія адбыліся ў гістарычным лёсе беларускага народа. 1920-я гады вызначаны творчай актыўнасцю як пісьменнікаў старэйшага пакалення– Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, так і нядаўна прыйшоўшых у літаратуру маладых паэтаў і празаікаў – М. Чарота, К. Крапівы, А. Дудара, Я. Пушчы, А. Куляшова і іншых. Асабліва плённа ў першай палове 1920-х гг. развівалася паэзія. Менавіта ў гэты час Я. Купала напісаў сваю паэму “Безназоўнае”, Я. Колас – паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”, Ц. Гартны – зборнік “Песні працы і змагання”, М. Чарот – паэму “Босыя на вогнішчы”. У прозе гэтага часу пераважалі апавяданні, але ў другой палове 1920-х гг. з'явіліся і больш буйныя творы – трылогія Я. Коласа “На ростанях”, раманы М. Зарэцкага “Сцежкі-дарожкі”, Ц. Гартнага “Сокі цаліны” і інш. Асноўнай тэматыкай паэзіі і прозы былі падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Менавіта ім прысвяцілі свае творы М. Лынькоў, П. Трус, З. Бядуля, К. Чорны і інш.

З канца 1920-х гг. у літаратуры ўсё больш стаў адчувацца ідэалагічны ўплыў улады. У 1928 г. на базе арганізацыі “Маладняк” была створана Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП). Гучнейшай стала крытыка твораў асобных пісьменнікаў, якіх абвінавачвалі ў “нацдэмаўшчыне”, а пазней частка літаратараў была рэпрэсіравана. Да 1934 г. пісьменніцкія аб'яднанні былі зліты ў адзіны саюз пісьменнікаў Беларусі, а ў літаратуры стаў пераважаць адзіны напрамак – метад сацыялістычнага рэалізма. У 1930-я гг. творчая актыўнасць пісьменнікаў і паэтаў не знізілася, але амаль усе творы прысвячаліся тэме грамадзянскай вайны, будаўніцтву новага жыцця, індустрыялізацыі і калектывізацыі. Летам 1940 г. была праведзена першая дэкада беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. Але дасягненні беларускай літаратуры ў канцы 1930-х гг. маглі б быць большымі, каб не рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі. У пачатку 1941 г. Саюз пісьменнікаў БССР налічваў толькі 74 чалавекі.

Першыя дзесяцігоддзі станаўлення савецкай ўлады на Беларусі адзначыліся яе адмоўным стаўленнем да рэлігіі. Царква была

аддзелена ад дзяржавы, перастала карыстацца яе падтрымкай, а школа, у сваю чаргу, была аддзелена ад царквы. Усё гэта суправаджалася ўзмацненем антырэлігійнай прапаганды. Было створана таварыства “Саюз ваяўнічых бязбожнікаў” з разгалінаванай сеткай нізавых звенняў, выпускаўся адпаведны часопіс. Справа даходзіла да закрыцця культавых устаноў і канфіскацыі царкоўных каштоўнасцяў у карысць дзяржавы. З 1500 праваслаўных храмаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Усходняй Беларусі ў пачатку 1920 -х гг., да 1936 г. засталося толькі 180, а да 1940 г. іх колькасць зменшылася да некалькіх дзесяткаў. У той жа час савецкі ўрад падтрымліваў так званую абнаўленчую царкву, якая ў цэлым прызнала савецкую ўладу і выступала за дэмакратызацыю царкоўнага жыцця. У выніку ўнутры беларускай Праваслаўнай царквы адбыўся раскол: частка святароў заняла прымірэнчую пазіцыю, а частка засталася ў апазіцыі і ў 1927 г. на з’ездзе ў Мінску абвясціла аб стварэнні Беларускай аўтакефальнай Праваслаўнай царквы (БАПЦ). Аднак з сярэдзіны 1930-х гг. пачалася новая хваля антырэлігійнай кампаніі, якая на гэты час суправаджалася і ўзмацненнем рэпрэсій, перш за ўсё, супраць дзеячаў БАПЦ. Была ліквідавана і абнаўленчая царква. Да канца 1930-х гг. царкоўнае жыццё ў БССР амаль цалкам спынілася.

Такая ж палітыка ўлад праводзілася і ў адносінах да каталіцкай царквы з той толькі розніцай, што рэпрэсіі супраць каталіцкіх святароў пачаліся яшчэ з пачатку 1920-х гг, прычым іх, як правіла, абвінавачвалі ў сувязах з польскай разведкай. Да часу ўз’яднання Заходняй і Усходняй Беларусі ў 1939 г. у БССР засталіся незачыненымі толькі 10 касцёлаў, прычым яны не дзейнічалі, паколькі практычна ўсе ксяндзы былі рэпрэсіраваны.

У 1920-я гг. ў Беларусі, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, шырока разгарнулася горадабудаўніцтва. Гэта было звязана з правядзеннем індустрыялізацыі, культурнай рэвалюцыяй, сацыяльнай палітыкай, якую праводзілі ўлады. Перш за ўсё, развівалася прамысловая архітэктура. Яе адметнасцямі былі функцыянальнасць і рацыяналізм, шырокае выкарыстанне жалезабетонных і металічных канструкцый. Будынкі былі даволі простымі па сваёй планіроўцы і знешняму выгляду, але фасады ўпрыгожваліся дэкаратыўнай тынкоўкай, складанымі карнізамі. Прыкладам могуць служыць будынкі завода “Энергія” ў Мінску, запалкавай фабрыкі ў Барысаве,

фабрыкі штучнага шоўку ў Магілёве. У гады першай пяцігодкі былі распрацаваны праекты забудовы г. Мінска і іншых гарадоў Беларусі. У гэты ж час пачалося будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў даволі спрошчанай планіроўкі, ў асноўным прамавугольнай формы з лаканічным вырашэннем аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі і мінімумам дэкору. Шырока разгарнулася будаўніцтва школ, як правіла, адносна невялікіх двухпавярховых будынкаў, устаноў культуры, бальніц. Яны былі таксама адносна невялікімі, за выключэннем бальнічных комплексаў, якія разлічваліся на 500–1000 ложкаў, напрыклад, 1-я клінічная бальніца ў Мінску (1928–1931 гг.), архітэктар Г. Лаўроў.

У 1930-я гг., калі матэрыяльнае становішча рэспублікі значна ўмацавалася, былі распрацаваны генеральныя планы забудовы Мінска, Віцебска, Гомеля, Магілёва, Оршы, дзе значнае месца адводзілася ўжо манументальным будынкам, перш за ўсё, адміністрацыйнага і культурнага прызначэння. Іх адметнасцю былі большая дэкаратыўнасць, наяўнасць портыкаў, каланад. Вядучымі архітэктарамі ў гэты час былі І. Лангбард, Г. Лаўроў, А. Воінаў. Да найбольш значных будынкаў таго часу можна аднесці Дом урада, галоўны корпус Акадэміі навук, тэатр оперы і балета, Дом Чырвонай Арміі ў Мінску, кінатэатр “Радзіма”, Дом Саветаў ў Магілёве (архітэктар І. Лангбард), вучэбныя корпусы палітэхнічнага інстытута, універсітэцкі гарадок БДУ, будынак інстытута фізкультуры, гасцініцу “Беларусь”, рэспубліканскі палац піянераў у Мінску, гасцініца “Днепр” у Магілёве (архітэктары Г. Лаўроў і А. Воінаў). Усе гэтыя будынкі спалучаюць у сабе функцыянальнасць, дэкаратыўнасць, гармонію і некаторыя з іх захаваліся ў добрым выглядзе да цяперашніх дзён.

У першыя гады савецкай улады значнай з'явай у развіцці выяўленчага мастацтва стала віцебская школа жывапісу, у якой пераважалі авангардысты К. Малевіч, М. Шагал, Л. Лісіцкі, В. Ермалаева і іншыя. Гэтае аб'яднанне атрымала назву “сцвярджальнікі новага мастацтва” (“УНОВИС”–“Утвердители нового искусства”). Пазней вядучым стылем у выяўленчым мастацтве стаў сацыялістычны рэалізм, прычым, у адрозненне ад акадэмічнага рэалізму, тут больш адчувалася палітызаванасць. У рэчышчы сацыялістычнага рэалізму працавалі мастакі В.В. Волкаў, Я.А. Зайцаў, І.В. Ахрэмчык, Я.Я. Красоўскі, якія падрыхтавалі шэраг карцін на

тэму грамадзянскай вайны. Падзеі айчыннай гісторыі, фальклорныя тэмы і сюжэты сталі галоўнымі для мастака М.М. Філіповіча. Праблемы сацыялістычнага будаўніцтва, партрэты вядомых людзей знайшлі адлюстраванне ў творчасці мастакоў М.П. Станюты, М.Л. Тарасікава, Я.М. Кругера. У жанры пейзажаў вызначыліся В.К. Бялыніцкі-Біруля, У.М. Кудрэвіч.

У сувязі з утварэннем у 1924 г. беларускага дзяржаўнага выдавецтва нарадзілася і беларуская савецкая кніжная графіка. Пачынальнікамі ў гэтай справе сталі М. Філіповіч, А. Тычына і інш. У галіне графікі значнае распаўсюджанне атрымалі плакат і карыкатура.

З развіццём тэатраў набірала моц тэатральна-дэкаратыўнае мастацтва.

Уздзеянне афіцыйнай ідэалогіі і развіццё манументальнай прапаганды адчувалася і ў скульптуры. Але гэта не змяншае мастацкую каштоўнасць твораў З.І. Азгура, А.А. Бембеля, А.В. Грубэ, А.М. Бразера і іншых скульптараў, якія стварылі шэраг партрэтаў сучаснікаў, манументальныя кампазіцыі, што ўпрыгожылі Дом урада, Дом Чырвонай Арміі, Палац піянераў і школьнікаў. У 1925 г. мастацкая секцыя Інбелкульта арганізавала першую Усебеларускую мастацкую выстаўку, пазней беларускія мастакі выстаўлялі свае творы не толькі на падобных беларускіх, але і на ўсесаюзных выстаўках.

Важнай падзеяй для аматараў жывапісу стаў першы з’езд мастакоў БССР (1938 г.), які ўтварыў Саюз мастакоў БССР, прыняў яго статут. У гэты ж час у Беларусі пачалі дзейнічаць Рэспубліканскі і абласныя дамы народнай творчасці, праводзіліся рэспубліканскія алімпіяды рабоча-калгаснай самадзейнасці.

1920–1940-я гг. сталі часам росквіту беларускіх самадзейных і прафесійных тэатраў. Ужо 14 верасня 1920 г., адразу ж пасля вызвалення Мінска ад польскіх акупантаў, у горадзе быў адкрыты Беларускі дзяржаўны тэатр, які з 1926 г. стаў называцца Першым Беларускім дзяржаўным тэатрам (БДТ-1). На яго сцэне ставіліся п'есы Я. Купалы, М. Горкага, М. Чарота.

У лістападзе 1926 г. ў Віцебску быў створаны Другі Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2), дзе таксама ставіліся п'есы беларускіх і расійскіх драматургаў. Добра быў вядомы ў рэспубліцы і Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам У. Галубка, які пачаў

сваю дзейнасць у жніўні 1920 г. і пазней стаў называцца Трэцім Беларускім дзяржаўным тэатрам (БДТ-3). Толькі з 1920 па 1928 гг. тэатр паказаў каля 2 тыс. спектакляў, даў 300 канцэртаў, пераважна ў, так званай, «глыбінцы». У 1930-я гг. колькасць тэатраў павялічылася: адкрыліся польскі, яўрэйскі, рускі тэатры, тэатр юнага гледача і іншыя. Вельмі распаўсюджанымі у гэтыя гады былі тэатры рабочай моладзі (ТРАМы), самадзейныя калектывы. У пачатку 1930-х гг. на аснове Мінскага тэатра рабочай моладзі быў створаны Беларускі дзяржаўны тэатр рабочай моладзі (БелТРАМ), па сутнасці, прафесіянальны творчы калектыў. У 1931 г. пачаў творчую дзейнасць першы ў Беларусі калгасна-саўгасны тэатр у Гомелі, затым падобныя тэатры з'явіліся і ў іншых гарадах рэспублікі. У іх ставіліся спектаклі беларускіх драматургаў.

На развіццё музычнага мастацтва значны ўплыў аказалі адкрыццё дзяржаўных кансерваторыі, філармоніі, тэатра оперы і балета. Плённа працавалі беларускія савецкія кампазітары Я.К. Цікоцкі, Р.К. Пукст, А.Я. Туранкоў, М.М. Чуркін і іншыя. Вядучым жанрам у творчасці беларускіх кампазітараў былі оперы і сімфоніі, пераважна на гістарычныя тэмы і патрыятычнай накіраванасці. Ставіліся як класічныя, так і беларускія творы.

У разглядваемы перыяд у Беларусі атрымаў распаўсюджанне і такі від мастацтва, як кіно. Спачатку здымаліся дакументальныя стужкі, якія апрацоўваліся і манціраваліся на базе Ленінградскай кінастудыі. Першым жа мастацкім творам стала кінастужка «Лясная быль» (1926 г.), якая была пастаўлена рэжысёрам Ю.В. Тарычам. Фільм расказваў аб падзеях грамадзянскай вайны на тэрыторыі Беларусі. Першым беларускім гукавым фільмам стала кінапраграма «Пераварот», пастаўленая ў 1930 г. Ю.В. Тарычам. У канцы 1930-х гг. мастацкая кінастудыя «Савецкая Беларусь» была пераведзена ў г. Мінск. У стварэнні беларускага кінематографа прынялі плённы ўдзел не толькі беларускія спецыялісты і акцёры, але і вядомыя майстры савецкага кіно, напрыклад, акцёры М.К. Чаркасаў, М.М. Сіманаў і іншыя.

У арганізацыі культурна-масавай, выхаваўчай працы важная роля належала таксама бібліятэкам, клубам, музеям, розным самадзейным гурткам, якія пачалі масава стварацца ў савецкі перыяд. Так, у 1940 г. ужо дзейнічалі 31 музей і іх філіялы.

Такім чынам, беларуская культура ў 1917–1941 гг. развівалася ў складаных, супярэчлівых умовах, абумоўленых вынікамі сацыяльных узрушэнняў, ідэалагізацыяй культурнай палітыкі, рэпрэсіямі супраць інтэлігенцыі. Тым не менш, у перыяд правядзення беларусізацыі ў БССР і ў пазнейшы час у цэлым беларуская культура перажывала ўздым. Былі вырашаны праблемы непісьменнасці і малапісьменнасці, створана сістэма адукацыі, зроблены пераход да ўсеагульнага пачатковага і, у асноўным, сямігадовага навучання, развівалася вышэйшая школа, створаны навуковыя ўстановы, атрымалі развіццё беларуская літаратура, тэатр, мастацтва, музычная культура.

## Тэма 6. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы

*6.1. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель у 1920-я – 1930-я гг.*

*6.2. Грамадска-палітычны рух у Заходняй Беларусі. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.*

*6.3. Культура Заходняй Беларусі ў 1920-я – 1930-я гг.*

### 6.1. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель у 1920-я – 1930-я гг.

Згодна з умовамі Рыжскага міру, заключанага ў 1921 г., Заходняя Беларусь, дзе пражывала звыш 4 млн. чалавек, аказалася пад уладай Польшчы. Яна была падзелена на 4 ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Беластоцкае і Віленскае, якія ў сваю чаргу дзяліліся на гміны. Паколькі гэта тэрыторыя гранічыла з СССР і заставалася небяспека аддзялення “крэсаў усходніх”, польскія ўлады не імкнуліся развіваць тут прамысловасць. Структура эканомікі захавала асноўныя рысы дарэвалюцыйнага часу. Прамысловасць была прадстаўлена прыкладна 2 тысячамі прадпрыемстваў, але 80 % з іх былі дробнымі, а агульны аб’ём вытворчасці ў 1939 г. не дасягнуў узроўню 1913 г. і ў 9 разоў быў меншым, чым у БССР. Асноўнымі галінамі вытворчасці былі перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны і лесу. Найбольш буйнымі прадпрыемствамі лічыліся запалкавая фабрыка ў Пінску, тытунёвая і фанерная фабрыкі ў Гродна, шклозавод “Нёман” у Лідскім павеце.

На развіцці прамысловасці адмоўна адбіліся эканамічныя крызісы 1924–1926 гг. і асабліва 1929–1933 гг. Колькасць прадпрыемстваў скарацілася на 17%, а занятых рабочых – на 42% і склала каля 60 тысяч чалавек. Рабочыя ў “Крэсах Усходніх” атрымлівалі зарплату ў 1,5–2 разы меньшую, чым у цэнтральных раёнах Польшчы, прычым значную частку заробка адымалі штрафы. Таму нярэдкімі былі забастоўкі рабочых.

85% жыхароў Заходняй Беларусі жылі ў вёсцы і займаліся земляробствам. Але гэты рэгіён заставаўся зонай буйнейшага ў Еўропе памешчыцкага землеўладання: 1,7% памешчыкаў валодалі больш чым паловай зямель, у сярэднім адна памешчыцкая гаспадарка складала каля 500 гектараў. У той жа час астатняя частка

сельскага насельніцтва мелі ў сярэднім 7 гектараў, а 70% сялян адносіліся да беднякоў, якія апрацоўвалі да 5 гектараў зямлі. Акрамя малазямелля, праблемай таксама заставаліся церазпалосіца і сервітуты.

У 1925 г. сейм Польшчы прыняў закон "Пра парцэляцыю, камасацыю і асадніцтва". Сутнасць яго заключалася ў парцэляцыі– прадажы часткі памешчыцкіх і дзяржаўных зямель (парцэл), камасацыі–хутарызацыі сялянскіх гаспадарак і ліквідацыі такім чынам церазпалосіцы. Згодна з законам, ліквідаваліся сервітуты, сяляне трацілі права карыстацца сумеснымі выганамі і лясамі. Да 1929 г. сялянам было прададзена каля 450 тыс. гектараў зямель, прычым перавага аддавалася этнічным палякам, якія перасяляліся на беларускія землі, але праблема малазямелля ўсё ж не была вырашана. Да 1939 г. на хутары было перасялена 70% сялянскіх гаспадарак, што было выгадна, перш за ўсё, заможным хутаранам. Улады выкарысталі камасацыю для перасялення на хутары ў пагранічнай зоне ваенных каланістаў – асаднікаў з мэтай стварыць санітарны кардон каля БССР. Асаднікі атрымлівалі бясплатна або на льготных умовах ад 10 да 45 гектараў зямлі, якую затым часцей за ўсё здавалі ў арэнду малазямельным сялянам. Усяго на хутары перасяліліся каля 10 тысяч асаднікаў.

Цяжкае эканамічнае становішча прымушала жыхароў Заходняй Беларусі мігрыраваць за мяжу ў пошуках сезоннай працы або на пастаяннае месца жыхарства. З 1921 па 1939 гг. такім чынам выехалі з родных мясцін каля 130 тысяч чалавек.

Польскія ўлады праводзілі на землях Заходняй Беларусі паланізацыйную палітыку і акаталічванне. З 500 праваслаўных храмаў 300 былі пераўтвораны ў касцёлы. 359 беларускіх школ, якія існавалі ў пачатку 1920-х гг., былі закрыты. Спынілі сваю дзейнасць і дзве настаўніцкія семінарыі. Толькі дзякуючы намаганням Таварыства беларускай школы, якое дзейнічала з 1921 па 1937 гг., у 1927 г. урад дазволіў адкрыць 24 беларускія і 49 змешаных польска-беларускіх школ, прычым беларускія школы пазней зноў спынілі сваё існаванне. Але і польскіх школ не хапала. Па стану на 1939 г. 35% насельніцтва Заходняй Беларусі былі непісьменнымі. Тут не было беларускіх тэатраў, музычных установ. У тры разы скарацілася колькасць беларускіх газет і часопісаў, да 1939 г. іх засталося толькі 8. Але і ў гэтых складаных умовах не згасала беларускае

слова, галоўным чынам, у мастацкай літаратуры. Да гэтага часу адносіцца літаратурная дзейнасць Максіма Танка, Янкі Брыля, і іншых.

## 6.2. Грамадска-палітычны рух ў Заходняй Беларусі. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР

Складанае эканамічнае, культурнае, нацыянальнае становішча насельніцтва падштурхоўвала народныя масы да рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Перыядычна, асабліва ў гады крызісаў, узрастаў стачачны рух. Ужо з 1921 г. разгарнулася партызанская барацьба, удзел у ёй прынялі каля 6 тысяч чалавек. Паводле афіцыйных звестак, у 1922–1923 гг. партызаны здзейснілі больш за 1000 нападаў на памешчыцкія маёнткі, паліцэйскія ўчасткі.

У 1923 г. была ўтворана Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Нягледзячы на тое, што, згодна з крымінальным кодэксам, прыналежнасць да камуністычнай партыі каралася пажыццёвым турэмным зняволеннем, у яе шэрагах налічвалася да 4 тыс. чалавек. Прыкладна столькі ж юнакоў і дзяўчат аб'ядноўваў і створаны ў наступным годзе Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). КПЗБ лічылася часткай Кампартыі Польшчы, але фактычна і арганізацыйную, і матэрыяльную дапамогу ёй аказвала КП(б)Б. КПЗБ і КСМЗБ стаялі на чале ўзброенай барацьбы. II канферэнцыя КПЗБ 30 лістапада 1924 г. узяла курс на падрыхтоўку ўзброенага паўстання, але яно пацярпела няўдачу. З восені 1925 г. на змену ўзброенаму супраціўленню ў Заходняй Беларусі на першы план усё больш сталі выходзіць легальныя формы барацьбы.

У 1921–1923 гг. значны ўплыў сярод сялянства мелі беларускія эсэры. Але на іх дзейнасць значны ўплыў аказаў крызіс у БПС-Р, яе самароспуск пад націскам ЦК КП(б)Б у Савецкай Беларусі. Каля 300 чалавек левых эсэраў утварылі Беларускую рэвалюцыйную арганізацыю (БРА) і ўліліся ў склад КПЗБ. Нацыянальны ўхіл, але зусім другі праграмны напрамак мела Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД). Яна выступала за эвалюцыйны шлях развіцця, абмежаваныя рэформы, у прыватнасці, за надзяленне сялян зямлёй, але за выкуп, дэмакратычныя свабоды, захаванне духоўных

каштоўнасцяў. У апазіцыі да польскага ўрада таксама знаходзілася дзейнічаўшая ў Заходняй Беларусі Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, якая прытрымлівалася легальных парламенцкіх форм барацьбы. Больш радыкальная частка яе членаў выдзелілася ў беларускую партыю незалежных сацыялістаў, якая пайшла на зблiжэнне з КПЗБ.

Летам 1925 г. левыя сілы  кансалідаваліся ў масавую легальную арганізацыю – Беларускую сялянска-работніцкую грамаду (БСРГ). Яна дзейнічала легальна, выкарыстоўваючы сродкі масавай прапаганды, сеймавую фракцыю – пасольскі клуб. БСРГ дабівалася дэмакратычных свабод, перадачы зямлі сялянам без выкупу, скасавання асадніцтва, увядзення васьмігадзіннага рабочага дня, аб’яднання беларускіх зямель у адзінай незалежнай рэспубліцы. Хутка колькасць членаў грамады дасягнула 120 тысяч чалавек. Занепакоеныя ростам папулярнасці БСРГ, улады ў 1927 г. распусцілі грамаду і арыштавалі каля 500 яе актывістаў, 56 яе кіраўнікоў у1928 г. на працэсе ў Вільне былі асуджаны на розныя тэрміны зняволення. У гэтым жа годзе прайшлі некалькі судовых працэсаў над камуністамі і камсамольцамі ў Гродна і Беластоку. Пасля ліквідацыі грамады адзінай легальнай формай барацьбы стала дэпутацкая фракцыя, якая пасля выбараў у сейм ў 1928 г. склала 5 чалавек. Яны ўтварылі ў сейме Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб “Змаганне”, які даволі цесна супрацоўнічаў з КПЗБ. Гэты клуб працаваў нядоўга, у 1930 г. яго кіраўніцтва было арыштавана.

Тым не менш, забастовачны рух і іншыя праявы супраціўлення не спыняліся, наадварот, актывізаваліся ў сувязі з крызісам 1929–1933 гг. У гэты час па гарадах прайшлі забастоўкі, дэманстрацыі, адбылося каля 500 выступленняў сялян. Найбольш значнымі з іх былі масавая дэманстрацыя працоўных у м. Косава, якая закончылася растрэлам яе ўдзельнікаў, узброеныя выступленні сялян в Асташына Навагрудскага павета у 1932 г., сялян Кобрынскага павета ў 1933 г., пазней – паўстанне нарачанскіх рыбакоў.

У першай палове 1930-х гадоў стала больш выразнай рэпрэсіўная палітыка ўлад. У жніўні 1930 г. улады распусцілі сейм, узмацніліся рэпрэсіі супраць ТБШ. Былі ўведзены надзвычайныя суды, у 1934 г. у г. Бяроза-Картузская быў створаны адзін з першых канцэнтрацыйных лагераў. Пачаліся арышты. КПЗБ зрабіла спробу стварыць

адзіны народны антыфашысцкі фронт, але пасля некаторага ажыўлення ў 1936–1937 гг. пачаўся спад рабочага і сялянскага руху. Негатыўны ўплыў на развіццё нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху аказаў роспуск у 1938 г. Камінтэрнам Камуністычнай партыі Польшчы і, адпаведна, Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Пазней, у 1956 г. савецкі ўрад зрабіў афіцыйную заяву аб тым, што абвінавачванне Кампартыі Польшчы, яе састаўных частак КПЗБ і КПЗУ у 1938 г. у сувязях з польскімі спецслужбамі было справакавана, а на самой справе дзейнасць КПП, КПЗБ, КПЗУ ацэньваецца высока.

У пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны, калі Германія ўжо захапіла большую частку Польшчы, а польскі ўрад эмігрыраваў за межы краіны, 17 верасня 1939 г. Чырвоная Армія ўступіла ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Згодна з дагаворам "Аб дружбе і граніцах" паміж Германіяй і СССР мяжа паміж Савецкім Саюзам і Германіяй пралегла па так званай "Лініі Керзана" і супала з этнічнай мяжой паміж палякамі і беларусамі. На вызваленых тэрыторыях утвараліся часовыя органы ўлады: управы у ваяводскіх і павятовых цэнтрах, сялянскія камітэты – у мястэчках і вёсках. Адначасова арганізоўваліся ўзброеныя атрады рабочых, атрады сялянскай міліцыі. Пачаліся выбары дэлегатаў на Народны сход Заходняй Беларусі, які адбыўся 28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку. Ён прыняў Дэкларацыі аб дзяржаўнай уладзе, аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці і аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель.

2 лістапада 1939 г. нечарговая V сесія Вярхоўнага Савета СССР і 12 лістапада нечарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР заканадаўча замацавалі ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Такім чынам, этнічныя беларускія землі увайшлі ў адну дзяржаву, за выключэннем Вільні і Віленскага краю, якія 10 кастрычніка 1939 г. згодна з дагаворам паміж СССР і Літвой былі перададзены Літоўскай рэспубліцы. Замест ваяводстваў у Заходняй Беларусі былі ўтвораны 5 вобласцяў, пачаліся сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні: нацыяналізаваны 1700 прадпрыемстваў, разгарнуліся іх рэканструкцыя, будаўніцтва новых фабрык і заводаў, ліквідавана беспрацоўе, уведзены васьмігадзінны рабочы дзень. Сялянам перададзена каля 1 млн. гектараў памешчыцкай зямлі, каля 75 тысяч

галоў жывёлы. Масавая калектывізацыя у той час яшчэ не праводзілася, хаця агітацыя за ўтварэнне калгасаў пачалася, каля 7% сялянскіх гаспадарак да 1940 года былі абагульнены, створаны 101 машынна-трактарная станцыі, у якіх налічвалася да 100 трактараў і аўтамашын. Значныя змены адбыліся ў сацыяльна-культурнай сферы: адкрыты каля 6 тыс. школ, 12 тэхнікумаў. 5 інстытутаў, каля 100 кінатэатраў, 300 установ культуры, было ўведзена пенсійнае забяспячэнне, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Але ў той жа час пачаліся рэпрэсіі супраць былых памешчыкаў, асаднікаў, іх дэпартацыя на ўсход.

### 6.3. Культура Заходняй Беларусі ў 1920-я – 1930-я гг.

У адпаведнасці з Рыжскім мірным дагаворам 1921 г. урад Польшчы павінен быў даць беларусам і украінцам усе правы, якія забяспечвалі б ім свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў. Аднак гэтыя абавязацельствы польскім бокам не выконваліся. Кіраўнікі буржуазнай Польшчы праводзілі вялікадзяржаўную, шавіністычную палітыку. Яны не прызнавалі беларусаў за нацыю і імкнуліся як мага хутчэй іх акаталічыць і апалячыць. Нацыянальныя дзеячы Беларусі і беларуская мова праследаваліся.

Тым не менш, нягледзячы на моцны нацыянальны прыгнёт і абмежаваныя магчымасці для праяўлення і развіцця беларускай культуры, культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі не замірала. Перадавыя колы беларускай інтэлігенцыі абаранялі беларускую культуру ад нападкаў рэакцыйных сіл, вялі шырокую культурна-асветніцкую працу.

Важную ролю ў грамадска-палітычным і культурна-масавым жыцці Заходняй Беларусі іграла культурна-асветніцкая арганізацыя ”Таварыства беларускай школы”, створаная ў 1921 г. У пачатку 30-х гг. XX ст. яно налічвала каля 500 гурткоў і 30 тыс. чалавек. Дзейнічала 12 акруговых упраў ТБШ. ТБШ вяла працу па адкрыцці беларускіх школ, бібліятэк, хат-чытальняў, арганізоўвала мастацкую самадзейнасць, выдавала падручнікі, песеннікі, стварала драматычныя гурткі. Пад націскам грамадскага руху польскія ўлады ў 1928–1929 гг. вымушаны былі даць дазвол на адкрыццё новых беларускіх і польска-беларускіх школ, амаль у 100 школах увесці беларускую

мову як прадмет. Дзякуючы намаганням ТБШ і іншых прагрэсіўных арганізацый, пэўнае развіццё атрымалі фальклор, літаратура, мастацкая самадзейнасць. У розных выданнях друкаваліся творы К. Сваяка, У. Жылкі, М. Васілька, А. Салагуба, П. Пестрака, М. Машары, В. Таўлая, М. Засіма, М. Танка (Я.І. Скурко), Я. Брыля, С. Пяюна і інш. Іх творчасць адлюстроўвала народную долю, барацьбу працоўных за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Адразу звярнуў на сябе ўвагу літаратурных і грамадскіх колаў ужо першы зборнік вершаў М. Танка "На этапах". Славу выдатнага паэта прынеслі аўтару паэмы "Журавінны цвет", "Нарач", "Сказ пра Вяля", "Каліноўскі", многія вершы. У 1937 г. выйшлі зборнікі вершаў "З сялянскіх ніў" М. Васілька, "З-пад стрэх саламяных" М. Машары. Паэтычны талент В. Таўлая праявіўся ў паэме "Таварыш".

Б. Тарашкевіч, І. Лагіновіч, А. Станкевіч і іншыя друкавалі актуальныя публіцыстычныя матэрыялы. Галоўным чынам, у Вільні выдаваліся беларускія падручнікі. У 1921 г. была выдадзена "Хрэстаматыя беларускай літаратуры", якую склаў М. Гарэцкі. У 1927 г. выйшла "Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)" І.С. Дварчаніна. Выдаваліся падручнікі для беларускіх школ С. Рак-Міхайлоўскага, С. Паўловіча і інш. Плённую культурна-асветніцкую работу вёў Р.Р. Шырма, які арганізоўваў мастацкую самадзейнасць, дапамагаў ствараць народныя хоры ў розных мясцінах. Вялікую каштоўнасць для беларускай культуры меў збор ім музычнага фальклору, народных песень. У рэпертуары хароў таго часу пераважалі такія песні, як "А хто там ідзе?", "Ой ты, Нёман-рака", "Чаму ж мне не пець" і інш. Аўтар знакамітай песні "Дзе чутны мовы нашай гукі", кампазітар і публіцыст А. Стэповіч падрыхтаваў рукапіс спеўніка "За Бацькаўшчыну".

На вечары мастацкай самадзейнасці з аматарскай пастаноўкай п'ес збіраліся сотні людзей. Ставіліся "Паўлінка" Я. Купалы, "Суд" У. Галубка, "Міхалка", "У зімовы вечар" Э. Ажэшкі, "Атрута" М. Гарэцкага, "Модны шляхцюк" К. Каганца і інш. Але развіццё беларускага нацыянальнага тэатра сустракала на сваім шляху рашучыя перашкоды з боку польскіх улад. Пастаноўка п'ес, дэкламацыя вершаў, выступленні самадзейных хораў знаходзілі жывы водгук у простых людзей, будзілі іх думкі і пачуцці, уздымалі нацыянальную свядомасць, клікалі да барацьбы.

У 20–30-я гг. XX ст. у Заходняй Беларусі развівалася і выяўленчае мастацтва. Сваім нацыянальным каларытам вызначыўся таленавіты мастак і скульптар, адзін з прыхільнікаў гістарычнага рамантызму Я.Н. Драздовіч. Захоплены гармоніяй Сусвету, ён першым з беларускіх жывапісцаў стварыў шмат карцін на касмічную тэму ("Сустрэча вясны на Сатурне", "Жыццё на Сатурне", "Жыццё на Месяцы", "Жыццё на Марсе"). Пры гэтым нават на чужых, невядомых планетах Я. Драздовіч згадваў краявіды роднай Беларусі, яе прыроду. Услед за Н. Ордай мастак шмат зрабіў для занатавання на сваіх малюнках многіх помнікаў старажытнага дойлідства, курганаў, капліц, гумнаў, хат.

У залаты фонд беларускага жывапісу ўвайшлі таксама карціны "Беларусы", "Шляхам жыцця", "Усяслаў Полацкі" П.А. Сергіевіча; "Бег", "Жніво", "Ля студні" М.К. Сеўрука, "Прыдарожныя бярозы", "Рынак у Слоніме" А.Д. Карніцкага, творы Я.М. Горыда, М. Васілеўскага і іншых. Працягваў маляваць, афармляць спектаклі і выкладаць у Віленскім універсітэце вядомы мастак Ф.Э. Рушчыц (1870–1936 гг.). Нейкі час у Вільні працаваў тэарэтык і практык авангарда мастак У. Стрэмінскі (1893–1952 гг.). Нягледзячы на розныя стылі і манеру напісання карцін, жывапіс Заходняй Беларусі захаваў нацыянальную адметнасць, свежасць, каларыт.

Важнай для росту самасвядомасці беларусаў была дзейнасць Беларускага навуковага таварыства (Вільня, з 1918 г.) і Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча (з 1921 г.). На ніве беларушчыны працавалі таксама збіральнік беларускага музычнага фальклору, кампазітар Антон Грыневіч (1877–1937 гг.), аўтар больш за 100 твораў кампазітар Ян Тарасевіч (1889–1961 гг.), драматург Францішак Аляхновіч, ксёндз Адам Станкевіч (1891–1949 гг.) і іншыя.

Аднак у 1937 г. дзейнасць ТБШ была спынена. Пачалася ліквідацыя беларускай нацыяльнай школы і ў 1939 г. беларуская адукацыя ў Заходняй Беларусі фактычна ўжо не існавала. Закрываліся не толькі школы, гімназіі, семінарыі, але і клубы, бібліятэкі, спынена выданне большасці беларускіх газет і часопісаў, забаранялася выкарыстанне беларускай мовы ў дзяржаўных установах і органах мясцовага самакіравання, узмацнілася акаталічванне. У выніку такой палітыкі колькасць непісьменных сярод беларусаў складала амаль 50%. Колькасць беларусаў у Віленскім

універсітэце, адзінай ВНУ у “крэсах усходніх”, у 1934 г. складала толькі 1,55%, а ў 1937/1938 навучальным годзе з 3110 студэнтаў беларусаў было толькі 36 (1,15%). Ва ўсёй Польшчы ў 1935 г. студэнтаў беларусаў было каля 200 чалавек, або 0,5% ад усіх студэнтаў ВНУ, але і гэта былі пераважна дзеці заможных сялян і дробнай буржуазіі.

Нягледзячы на падзел Беларусі на заходнюю і ўсходнюю часткі, яе культура захавала пэўную адметнасць і адзінства. У той жа час палітыка паланізацыі ў Заходняй Беларусі нанесла яе культурнаму развіццю значныя страты.

## Тэма 7. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн

*7.1. Міжнародныя адносіны напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны.*

*7.2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.*

*7.3. Акупацыйны рэжым. Партызанскі і падпольны рух.*

*7.4. Вызваленне Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў. Завяршэнне Другой сусветнай вайны.*

### 7.1. Міжнародныя адносіны напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны

У 1930-я гг. міжнароднае становішча ў свеце ўскладнілася. На Далёкім Усходзе Японія пачала агрэсію супраць Кітая. Утварыўшы на захопленай частцы кітайскай тэрыторыі марыянетачную дзяржаву – Манчжоу-го, яна пачала з гэтага плацдарма варожыя дзеянні на ўсходняй мяжы СССР. На еўрапейскім плацдарме ў Германіі і Італіі былі ўсталяваны фашысцкія рэжымы і гэтыя краіны пачалі хутка нарошчваць ваенную моц з мэтай перагляду межаў, сфер уплыву і міжнародных адносін, якія ўсталяваліся пасля Першай сусветнай вайны. Ім супрацьстаялі у першую чаргу Францыя і Англія – пераможцы Першай сусветнай вайны, якія не хацелі страціць свае калоніі і іншыя набытыя тэрыторыі, а таксама свой уплыў у Еўропе. У парушэнне ўмоў Версальскага дагавора ў Германіі была ўведзена ўсеагульная воінская павіннасць, разгарнуліся падрыхтоўка магутнай рэгулярнай арміі, выпуск цяжкага ўзбраення, хуткімі тэмпамі ствараліся ваенна-паветраныя і ваенна-марскія сілы. Савецкі Саюз у гэтых умовах імкнуўся не ўмешвацца ў канфлікты еўрапейскіх дзяржаў. Адначасова савецкі ўрад спрабаваў стварыць сістэму еўрапейскай бяспекі з мэтай стрымлівання агрэсараў, але безпаспяхова.

З другога боку, у 1936 г. Германія, Італія і Японія заключылі "Антыкамінтэрнаўскі пакт", накіраваны ў першую чаргу супраць СССР. З гэтага ж года Германія і Італія пачалі тэрытарыяльныя захопы: Італія захапіла Абісінію (Эфіопію), Германія ўвяла войскі ў дэмілітарызаваную рэйнскую зону, пазней, у 1938 г. – у Аўстрыю. У

1939 г. Італія акупіравала Албанію. У гэты час японскія групіроўкі войск пачалі ваенныя дзеянні супраць СССР спачатку ў раёне возера Хасан, пазней, у 1939 г., на рацэ Халхін-Гол, дзе былі разгромлены савецкімі і мангольскімі вайсковымі падраздзяленнямі. Але для СССР міжнародная абстаноўка заставалася вельмі напружанай. Японія працягвала займаць варожую пазіцыю. У Еўропе кіраўнікі Францыі і Англіі імкнуліся нейкім чынам улагодзіць Германію, таму ў верасні 1938 г. у Мюнхене згадзіліся на ўступку Германіі часткі Чэхаславакіі, што прывяло пазней да поўнай анексіі гітлераўцамі гэтай краіны. Перагаворы, якія ў 1939 г. пачалі СССР, Англія і Францыя, закончыліся безвынікова.

Ва ўмовах узрастання міжнароднай напружанасці і з'яўлення небяспекі супрацьстаяння кааліцыі дзяржаў на Усходзе і Захадзе СССР прыняў прапанову Германіі заключыць пакт аб ненападзенні. Гэты дагавор з сакрэтным дадаткам быў падпісаны 23 жніўня 1939 г.

1 верасня 1939 г., у адпаведнасці з прынятым яшчэ ў красавіку планам "Вайс", Германія пачала ваенныя дзеянні супраць Польшчы. Польская армія значна ўступала нямецкай ў колькасных і якасных адносінах, таму на працягу некалькі тыдняў ваенныя дзеянні былі фактычна скончаны разгромам гэтай краіны.

3 верасня 1939 г., згодна з заключанымі з Польшчай дамоўленасцямі, Англія і Францыя аб'явілі вайну Германіі. Неўзабаве ў вайну ўступілі Аўстралія, Новая Зеландыя, Індыя. Лакальны ваенны канфлікт, такім чынам, перарастаў у сусветную вайну

Ва ўмовах, калі польская дзяржава фактычна спыніла сваё існаванне, 17 верасня 1939 г. войскі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую мяжу і да 25 верасня Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна ўз'ядналіся з Усходняй Беларуссю і Украінай. 28 верасня 1939 г. быў заключаны дадатковы дагавор з Германіяй, які замацоўваў новыя дзяржаўныя межы.

Вільня і Віленскі край, якія таксама былі вызвалены Чырвонай Арміяй ад улады Польшчы, згодна з дагаворам, заключаным 10 кастрычніка 1939 г. паміж СССР і ўрадам Літвы, адышлі да Літоўскай рэспублікі.

На працягу 1939 і 1940 гг. Германія праводзіла актыўныя дзеянні па далучэнню новых тэрыторый. Вайна з Англіяй і Францыяй, якая

спачатку атрымала назву “дзіўнай” з-за пасіўнасці бакоў, абярнулася актывізацыяй дзейнасці Германіі, якая захапіла Бельгію, Галандыю і ў чэрвені 1940 г. прымусіла капітуляваць Францыю. Былі захоплены таксама Данія, Нарвегія, а ў красавіку 1941 г. – Югаславія. Такім чынам, да лета 1941 г. амаль уся Еўропа была акупіравана Германіяй.

СССР таксама пачаў умацоўваць свае заходнія межы. 29 лістапада 1939 г., пасля няўдалых перагавораў з фінскім урадам аб перадачы ў арэнду паўвострава Ханка і пераносу дзяржаўнай мяжы ўглыб Карэльскага перашэйка савецкі ўрад парваў дыпламатычныя адносіны з Фінляндыяй і 30 лістапада пачаў вайну. Пасля цяжкіх баёў і значных страт да сакавіка 1940 г. абарона праціўніка была прорвана і 12 сакавіка быў падпісаны мір, згодна з якім да СССР адыходзіла тэрыторыя на Карэльскім перашэйку і ў раёне Мурманска. У ліпені 1940 г. у выніку змены ўрадаў у Літве, Латвіі і Эстоніі была аб’яўлена савецкая ўлада і прыбалтыйскія рэспублікі ўвайшлі ў склад СССР. У жніўні 1940 г.савецкі ўрад запатрабаваў ад Румыніі перадачы СССР Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, у выніку была ўтворана Малдаўская ССР.

Пасля акупацыі амаль усёй Еўропы Германія пачала рыхтавацца да інтэрвенцыі на Англію, але няўдачы ў паветраным супрацьстаянні, цяжкасці пры фарсіраванні праліва Ла-Манш, а таксама супярэчнасці на перагаворах паміж Германіяй і СССР у Берліне ў лістападзе 1940 г. прывялі да таго, што 18 снежня 1940 г. Гітлер вярнуўся да свайго ранейшага стратэгічнага курса на пашырэнне тэрыторыі на ўсходзе і зацвердзіў дырэктыву № 21 – план “Барбароса”. Германія пачала рыхтавацца да вайны з СССР.

## 7.2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі

Згодна з планам “Барбароса” супраць СССР было сканцэнтравана 190 дывізій, у тым ліку 19 танкавых і 14 матарызаваных, 4 паветраных флоты, у складзе якіх налічвалася каля 5,5 млн. салдат і афіцэраў, каля 4,3 тыс. танкаў, 47 тыс. гармат, каля 5,5 тысяч самалётаў. Чырвоная Армія к чэрвеню 1941 г. налічвала каля 5 млн. чалавек, з іх на заходніх межах знаходзілася каля паловы яе складу. Але па колькасці танкаў і самалётаў Чырвоная Армія не ўступала нямецкай.

22 чэрвеня 1941 г. Германія без аб'яўлення вайны пачала ваенныя дзеянні супраць СССР. На яе баку выступілі таксама Італія, Фінляндыя, Венгрыя і Румынія. Гітлер і ваеннае камандаванне разлічвалі на ўнутраную слабасць савецкай улады, міжнацыянальныя канфлікты і, галоўным чынам, на ваенную магутнасць германскай арміі, што дазволіць, на іх думку, правесці "бліцкрыг", разграміць СССР за некалькі тыдняў.

Наступленне вялося сіламі трох груп армій – "Поўнач", "Цэнтр" і "Поўдзень", пры гэтым значная частка бронетанкавых сіл і авіяцыі была сканцэнтравана ў цэнтры. Войскі Заходняй асобнай вайсковай акругі, якія дыслацыраваліся ў Беларусі, на напрамку галоўнага ўдара вермахта, мелі прыкладна аднолькавую колькасць танкаў і самалётаў, але ўступалі праціўніку ў жывой сіле і лёгкім узбраенні.

Стварыўшы 3–4-кратную перавагу ў сілах на напрамках галоўных удараў, нямецкія арміі хутка прарвалі абарону савецкіх войск у раёнах Брэста і Гродна і пачалі хутка рухацца ў напрамку Мінска. Спробы правесці контрудары з боку Беластока і ў раёне Камянца–Жабінкі значных вынікаў не далі. Жорсткія баі разгарнуліся ў раёне Мінска, дзе было знішчана 100 і падбіта больш за 200 танкаў праціўніка, але 28 чэрвеня горад быў захоплены і ў акружэнне трапілі значныя сілы савецкіх войск.

Каля месяца гераічна змагаліся з ворагам абаронцы Брэсцкай крэпасці.

У канцы чэрвеня напружаныя баі шлі на Бабруйскім і Барысаўскім напрамках. У раёне Бабруйска мужна абараняліся байцы 4-га паветрана-дэсантнага корпуса. На р. Бярэзіна каля Барысава амаль тры дні стрымлівалі праціўніка часці 1-й Маскоўскай пралетарскай дывізіі і курсанты танкавага вучылішча. Яны нанеслі значны ўрон нямецкім войскам, але вымушаны былі адступіць.

Няўдачай закончылася спроба савецкага камандавання стварыць новую лінію абароны па р. Днепр–Заходняя Дзвіна. Гераічна абараняла г. Віцебск 153-я стралковая дывізія. Жорсткія баі разгарнуліся ў раёне г. Лепеля, тут 6–10 ліпеня сіламі двух мехкарпусоў у напрамку Сянно быў праведзены контрудар. З двух бакоў у баях удзельнічалі да 1500 танкаў. У ходзе баёў была знішчана матарызаваная дывізія праціўніка, значная колькасць гармат, транспартных сродкаў, жывой сілы, зніжаны тэмп прасоўвання войск вермахта. Але з дапамогай рэзерваў і авіяцыі немцы спынілі контрнаступ-

ленне савецкіх войск, якія са стратамі адышлі да г. Оршы. У г. Оршы 14 ліпеня ўпершыню былі ўведзены ў дзеянне рэактыўныя ўстаноўкі, якія затым атрымалі назву "Кацюшы".

23 дні працягвалася абарона г. Магілёва. Не здолеўшы захапіць горад лабавым ударам, гітлераўцы фарсіравалі Днепр на флангах каля гарадоў Шклоў, Быхаў, Чавусы і такім чынам акружылі горад. Але і ў акружэнні байцы 172-й стралковай дывізіі і народнага апалчэння 10 дзён стрымлівалі націск 6 пяхотных і танкавых дывізій праціўніка. Толькі 12 ліпеня 1941 г. у 12-гадзінным баю на Буйнічскім полі вораг страціў каля 30 танкаў. У ноч з 25 на 26 ліпеня абаронцы Магілёва зрабілі спробу прарвацца з акружэння, часткі гэта ўдалося, але многія загінулі.

На гомельскім напрамку быў нанесены контрудар у напрамку Бабруйска, у выніку часова былі вызвалены Жлобін і Рагачоў. Кавалерыйская група ў складзе 3 дывізій пад камандаваннем генерала А. Гарадавікова ў ходзе кавалерыйскага рэйда вызваліла Глуск, Старыя Дарогі. Нягледзячы на частковыя поспехі, гэтыя контрудары не змянілі агульны ход ваенных дзеянняў, але адцягнулі буйныя сілы праціўніка, нанеслі яму значныя страты. У цэлым жа Чырвоная Армія панесла ў Беларусі вялікія страты і вымушана была адступаць. Але і гітлераўскае камандаванне, сутыкнуўшыся з жорсткай абаронай на цэнтральным напрамку, павінна было змяніць свае планы. Гітлер аддаў загад часова прыпыніць наступленне ў цэнтры, каб умацаваць флангі групы армій "Цэнтр". Такім чынам, быў выйграны час для арганізацыі рубяжоў абароны на маскоўскім напрамку.

Згодна з атрыманай дырэктывай, 25 дывізій вермахта, галоўным чынам, танкавых і матарызаваных, павярнулі на гомельскі напрамак, дзе абараняліся 13-я і 21-я арміі. 19 жніўня Гомель быў захоплены ворагам і да канца жніўня ўся тэрыторыя Беларусі аказалася ў зоне акупацыі.

Такім чынам, з аднаго боку, план "Барбароса", які прадугледжваў заканчэнне вайны за 3–4 тыдні, з-за супраціўлення савецкіх войск быў правалены. Вораг панёс значныя страты і Беларусь была захоплена толькі ў выніку 2-месячных баёў.

З другога боку, Чырвоная Армія ў пачатковы перыяд вайны атрымала вельмі вялікія страты ў салдатах, афіцэрах, ваеннай тэхніцы. Гітлер і яго акружэнне ў канцы ліпеня былі ўпэўнены, што

вайна супраць СССР ужо выйграна. Якія ж прычыны няўдач ў пачатковы перыяд вайны?

Вызначыць дакладную дату нападу Германіі на СССР, калі яна неаднаразова пераносілася, а звесткі разведорганаў былі вельмі супярэчлівымі, было практычна нельга. Таму адмоўную роль сыграў фактар нечаканасці і парушэння міжнародных норм. Войны звычайна пачыналіся з фармальнага аб'яўлення, што давала хаця б мінімум часу для прывядзення войск у баявую гатоўнасць. З прычыны нечаканасці нападу трэцяя частка самалётаў была знішчана прама на аэрадромах, што забяспечыла люфтваффе панаванне ў паветры і, як вынік, эфектыўнае знішчэнне жывой сілы і тэхнікі праціўніка ў час бамбардзіровак. Тут адыгралі ролю і палітычны пралік І. Сталіна, пралікі, нераспарадлівасць і неарганізаванасць савецкага камандавання, якія часам мяжуюць са злачынствам, калі, напрыклад, неразгрупаваныя і амаль не замаскіраваныя самалёты на пагранічных аэрадромах фактычна ператварыліся ў мішэні, а зенітная артылерыя 4-й арміі перад самым нападзеннем была вывезена за 400 км на ўсход для вучэнняў.

Нягледзячы на значныя поспехі ў індустрыялізацыі, за адносна кароткі час савецкая прамысловасць, у тым ліку і ваенна-прамысловы комплекс, не маглі пераадолець адставанне ад заходніх краін у тэхнічным прагрэсе. У выніку ў пачатку вайны нямецкія войскі не толькі пераўзыходзілі савецкія колькасна, але і па агнявой моцы, мабільнасці. Нямецкія пяхотныя дывізіі ў асноўным былі ўзброены аўтаматычнай зброяй, механізаваны, добра забяспечаны радыёсувяззю. Адсутнасць жа радыёсувязі і залежнасць ад правадной сувязі фактычна паралізавалі кіраванне савецкімі войскамі ў пачатковы перыяд вайны, не давалі магчымасці аператыўна кіраваць падраздзяленнямі падчас бою або пры манеўраванні. Гітлераўцы выкарысталі такія часовыя перавагі, як мілітарызацыя эканомікі, працяглая падрыхтоўка да вайны, адмабілізаванасць і якасць узброенасці войск, загадзя сканцэнтраваных у пагранічнай паласе. На патрэбы вермахта працавала эканоміка амаль усёй Еўропы. Камандаванне мела ўжо накоплены двухгадовы практычны вопыт вядзення ваенных дзеянняў, выпрацаваную і апрабіраваную тактыку стварэння ўдарных бронетанкавых групіровак для прарыва абароны праціўніка.

У адрозненне ад адмабілізаванай нямецкай арміі, Чырвоная Армія і яе камандаванне дзейнічалі ва ўмовах маральна-псіхалагічных

абставін мірнага часу, што дапускала і фармалізм у баявой падрыхтоўцы, і часам грэбаванне якасцю ў ажыццяўленні неабходных мер падрыхтоўкі да абароны, у першыя дні і нават месяцы вайны камандаванне часам праяўляла разгубленасць. Нягледзячы на ўрокі савецка-фінляндскай вайны, арганізацыя баявой вучобы заставалася адарванай ад рэальных умоў магчымага ваеннага становішча, мелі месца прыпіскі ў справаздачнасці, простая расхлябанасць. Чырвоная Армія не была падрыхтавана да вядзення сучаснай вайны, вучылася ваяваць ужо ва ўмовах супрацьстаяння рэальнаму праціўніку, адступлення пад націскам пераўзыходзячых сіл вермахта.

Негатыўную ролю ў няўдачах першых месяцаў вайны адыгралі і рэпрэсіі сярод каманднага саставу Чырвонай Арміі, хаця, напрыклад, камандны састаў Заходняга фронта на дзень пачатку вайны меў дастатковы вопыт і падрыхтоўку, каб ажыццяўляць неабходнае кіраўніцтва баявымі аперацыямі.

## 7.3. Акупацыйны рэжым, партызанскі і падпольны рух

Згодна з нямецкім генеральным планам “Ост,” землі Беларусі і прылеглых тэрыторый павінны былі каланізаваны і ў перспектыве ўвайсці ў тэрыторыю Германіі з карэнным насельніцтвам. Для гэтага 25% беларусаў, якіх акупанты лічылі блізкімі да арыйскай расы, планавалася анямечыць, астатніх перасяліць або знішчыць.

Быў уведзены новы адміністрацыйны падзел, які парушыў тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі. Паўднёвыя яе землі адыходзілі да рэйхскамісарыята “Украіна”, заходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад Усходняй Прусіі, Віцебская, Магілёўская, амаль уся Гомельская і некаторыя раёны Мінскай і Палескай абласцей уключаліся ў зону так званай “вобласці армейскага тылу” групы армій “Цэнтр”, цэнтральная ж частка рэспублікі, уключаючая 77 раёнаў, была аднесена да генеральнай акругі “Беларусь” рэйхскамісарыята “Остланд”. Вышэйшым органам кіравання тут з’яўляўся Генеральны камісарыят. Адміністрацыйны апарат ў асноўным складаўся з нямецкіх служачых. У якасці дапаможных мясцовых устаноў акупанты стварылі гарадскія і раённыя ўправы на чале з начальнікамі раёнаў або бургамістрамі гарадоў. На месцах ствараліся воласці на чале са старшынямі, ў вёсках прызначаліся старасты. Работу мясцовых грамадзянскіх органаў улады кантралявалі шэфы – “камі-

сары”,”каменданты”, “зондэрфюрэры” і інш. У кіраўніцтве захопленымі тэрыторыямі акупанты абапіраліся на рэпрэсіўны апарат: пяць ахоўных дывізій, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі, асобныя карныя, так званыя, нацыянальныя батальёны, спецыяльныя падраздзяленні – айнзатцкаманды і зондэркаманды, СС, гестапа, а таксама на паліцэйскія фарміраванні. Гітлераўцы таксама імкнуліся выкарыстаць у сваіх мэтах людзей, якія былі незадаволены савецкай уладай або эмігрантаў, якія знаходзіліся да яе ў апазіцыі. Людзей, якія супрацоўнічалі з акупантамі, пазней сталі называць калабарацыяністамі. З іх ліку акупанты стварылі арганізацыі: Беларускую народную самапомач (БНС), Саюз беларускай моладзі (СБМ), Раду даверу, якая затым у 1943 г. была пераўтворана ў Беларускую цэнтральную раду, Беларускую краёвую абарону (БКА), але ў іх склад была ўцягнута нязначная частка насельніцтва.

Стрыжнем акупацыйнага рэжыму стала палітыка генацыду. На Беларусі было створана 260 канцэнтрацыйных лагераў, дзе загінулі 1,4 млн. чалавек. Толькі ў канцлагеры Трасцянец каля Мінска было знішчана 206 тыс. вязняў. Існавала больш за 100 гета. Адно з найбольш буйных гета знаходзілася ў г. Мінску, там загінула каля 100 тыс яўрэяў, а ўсяго ў Беларусі гітлераўцы растралялі больш за 700 тыс. беларускіх яўрэяў. Пад выглядам барацьбы з партызанамі фашысты ажыццявілі за гады вайны 140 карных аперацый, у асноўным, супраць мірнага насельніцтва. Былі спалены разам з жыхарамі 628 вёсак, а ўсяго за гады акупацыі гітлераўцы знішчылі на тэрыторыі Беларусі каля 3 млн. савецкіх грамадзян і ваеннапалонных. 380 тыс. чалавек, пераважна беларускай моладзі, былі адпраўлены на прымусовую работу ў Германію, трэцяя іх частка там і загінула.

Акупанты пачалі прамое рабаванне захопленых тэрыторый. У Германію было вывезена больш за 90% станочнага і тэхнічнага абсталявання, каля 22 тыс. аўтамашын, трактараў, камбайнаў, вялікая колькасць лесу, жывёлы, прадуктаў харчавання. На астаўшыхся прамысловых прадпрыемствах быў установлены 10–12-гадзінны рабочы дзень у спалучэнні з мізэрным заробкам. За правіннасці, сабатаж адміністрацыя мела права адпраўляць рабочых у канцлагеры.

У сельскай мясцовасці гітлераўцы спачатку захавалі калгасы, толькі ўвялі ў іх прымусовую працу. Пазней яны былі перайменаваны ў “абшчынныя гаспадаркі”, а з чэрвеня 1943 г. акупанты

пачалі перадаваць зямлю ў прыватную ўласнасць, але ўвялі нормы абавязковых паставак, якія дасягалі паловы вырашчанага ўраджаю.

Ужо з канца чэрвеня 1941 г. на акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі Беларусі пачаў разгортвацца партызанскі рух. Першыя атрады ўзначалілі партызанскія камандзіры В.З. Корж, Ц.П. Бумажкоў, Ф.І. Паўлоўскі, М.Ф. Шмыроў. Да канца 1941 г. на Беларусі ўжо дзейнічалі каля 500 партызанскіх атрадаў і груп, а колькасць партызан дасягнула 12 тыс. чалавек. Праўда, частка атрадаў і груп у першыя месяцы акупацыі была разгромлена, частка зімой самараспусцілася або перайшла на паўлегальнае становішча. Але каля паловы атрадаў і груп у цяжкіх умовах працягвалі весці барацьбу з ворагам.

Пасля разгрому нямецкіх войск пад Масквой партызанскі рух яшчэ больш пашырыўся, набыў арганізаваны характар. У маі 1942 г. быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху на чале з першым сакратаром ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка, у верасні гэтага ж года – Беларускі штаб партызанскага руху, які ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б)Б П.З. Калінін. У далейшым на базе партызанскіх атрадаў пачалі ствараецца брыгады і злучэнні, партызанскія зоны. У 1943 г. партызаны, колькасць якіх дасягнула больш за 120 тыс. чалавек, кантралявалі значную частку тэрыторыі Беларусі. Да сярэдзіны 1944 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 374 тыс. партызан, якія аб'ядноўваліся ў 1255 атрадаў і 213 брыгад. Яны рабілі засады, ўзрывалі масты, наносілі значны ўрон акупантам. За тры гады барацьбы ў тыле ворага партызаны знішчылі каля паўмільёна гітлераўцаў, пусцілі пад адхон 11150 эшалонаў, разграмілі 948 гарнізонаў, узарвалі каля 5,5 тысяч мастоў, знішчылі каля 20 тыс. аўтамашын, 305 самалётаў, падбілі або ўзарвалі 1355 танкаў і бронемашын. Найбольш буйнымі па маштабнасці і эфектыўнасці былі тры этапы "рэйкавай вайны". У час першага этапа, з пачатку жніўня да сярэдзіны верасня 1943 г., партызаны пусцілі пад адхон 836 варожых эшалонаў, узарвалі 184 чыгуначных мастоў, пашкодзілі сотні кіламетраў чыгуначнага палатна. У выніку другога этапа, які атрымаў назву "канцэрт" і працягваўся з верасня да лістапада 1943 г., было ўзарвана 61 тыс. чыгуначных рэек, 1041 эшалон, 72 чыгуначных масты. Трэці этап пачаўся 20 чэрвеня 1944 г., напярэдадні аперацыі "Баграціён". У выніку яго былі паралізаваны важнейшыя чыгуначныя магістралі на тэрыторыі Беларусі, што аблегчыла савецкім войскам вызваленне рэспублікі ад акупантаў.

Каля 70 тыс. членаў налічвалі падпольныя арганізацыі, што дзейнічалі на тэрыторыі рэспублікі. Найбольшай эфектыўнасцю дзеянняў вызначыліся падпольшчыкі Мінска, Оршы, Гомеля, Магілёва, Асіповіч і іншых гарадоў Беларусі. Акрамя дыверсій, знішчэння жывой сілы і тэхнікі, партызаны і падпольшчыкі аказвалі вялікую дапамогу савецкаму камандаванню ў зборы разведвальнай інфармацыі, праводзілі агітацыйную работу сярод насельніцтва. Толькі ў Мінску за гады акупацыі было здзейснена больш за 1500 дыверсій, у тым ліку забойства генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ, іншых высокапастаўленых гітлераўскіх чыноўнікаў.

Кіравалі партызанскім і падпольным рухам у Беларусі падпольныя абкамы і райкамы Камуністычнай партыі, абкамы і райкамы камсамола.

### 7.4. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Завяршэнне Другой сусветнай вайны

Нягледзячы на няўдачы ў пачатковы перыяд вайны і вялікія страты, якія панесла Чырвоная Армія ў гэты час, паступова супраціўленне ворагу станавілася больш жорсткім. У вельмі кароткі тэрмін ва ўмовах ваеннага часу на ўсходзе краіны была адноўлена ваенная прамысловасць, якая, дзякуючы самаахвярнай працы працаўнікоў тылу, пачала хутка набіраць тэмпы развіцця. У выніку на фронт стала паступаць усё больш узбраення, тэхнікі. Чым далей гітлераўскія войскі прасоўваліся ўглыб СССР, тым большыя страты яны неслі ад дзеянняў чырвонаармейцаў і партызанскіх дыверсій. На цэнтральным участку фронта ў кастрычніку 1941 г. гітлераўцы наблізіліся да Масквы, але не здолелі прарваць умацаваныя рубяжы абароны сталіцы, якія абаранялі часці Чырвонай Арміі пад агульным камандаваннем Г.К. Жукава. Спробы штурма сталіцы ў лістападзе і пачатку снежня таксама былі няўдалымі. 5–6 снежня савецкія войскі перайшлі ў контрнаступленне і да пачатку студзеня 1942 г. адкінулі ворага на 100–250 км. Перамога пад Масквой стала фактычна паваротным этапам ў Вялікай Айчыннай вайне. Ворагу былі нанесены вялікія страты ў тэхніцы і жывой сіле. Войскі Калінінскага фронта ў ходзе наступлення ўжо ў пачатку 1942 г. наблізіліся да межаў Беларусі. Умацавалася знешнепалітычнае палажэнне СССР. Японія не адважылася ўступіць у вайну з СССР і 7 снежня 1941 г.

пачала ваенныя дзеянні супраць ЗША. Гэта прымусіла ЗША адыйсці ад нейтралітэта і ўступіць у вайну з Японіяй і Германіяй. Пачала фарміравацца антыгітлераўская кааліцыя.

У 1942 г. гітлераўцы здолелі захапіць амаль ўсю тэрыторыю Украіны, акупіравалі Крым і пачалі наступленне на Каўказ і Сталінград. У ходзе Сталінградскай бітвы, якая праходзіла з 17 ліпеня 1942 г. па 2 лютага 1943 г., была акружана 330-тысячная групіроўка праціўніка. Вермахт страціў каля 1,5 млн. салдат і афіцэраў. Страты Чырвонай Арміі за гэты час саставілі 1,2 млн. чалавек.

У гэты час саюзныя войскі разграмілі нямецка-італьянскую групіроўку войск ў Паўночнай Афрыцы ў бітве каля Эль-Аламейна.

Спробы нямецкага камандавання ўзяць рэванш і зноў авалодаць стратэгічнай ініцыятывай, якія мелі месца летам 1943 г., таксама закончыліся правалам. У Курскай бітве, якая працягвалася 50 дзён, з 5 ліпеня па 23 жніўня 1943 г., вораг атрымаў паражэнне і, страціўшы каля 50 дывізій, 1,5 тыс. танкаў, 3,7 тыс. самалётаў, вымушаны быў адступіць. Разгром войск вермахта на Курскай дузе, контрнаступленне Чырвонай Арміі, вызваленне левабярэжнай Украіны і Кіева азначалі завяршэнне карэннага пералома ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны і пачатак вызвалення тэрыторыі СССР, у тым ліку, і Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў. 23 верасня1943 г. быў вызвалены першы раённы цэнтр БССР – горад Камарын. 26 лістапада 1943 г. савецкія войскі ачысцілі ад акупантаў абласны цэнтр – г. Гомель, куды адразу ж пераехалі ўрадавыя ўстановы Беларусі. У выніку асенне-зімняга наступлення Чырвонай Арміі былі вызвалены 32 раёны Беларусі, створаны плацдармы для далейшых наступальных дзеянняў.

Канчатковае вызваленне Беларусі было здзейснена ў ходзе аперацыі "Баграціён", якую правялі войскі 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў. Яна працягвалася з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 г. На тэрыторыі Беларусі трымала абарону моцная групоўка ворага, якая налічвала 1,2 млн. салдат і афіцэраў, 9500 пушак і мінамётаў, 1350 самалётаў і 900 танкаў. Чырвоная Армія пераўзыходзіла праціўніка ў жывой сіле ў 2 разы, артылерыі – ў 3,7 разы, авіяцыі – амаль у 3 разы, танках – у 5,8 разоў. Ужо ў першыя дні наступлення на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках войскі 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га

Беларускіх франтоў прарвалі абарону гітлераўцаў і акружылі ў раёне Віцебска 5 нямецкіх дывізій, а войскі 1-га Беларускага фронта на Бабруйскім напрамку ў раёне Бабруйска – 6 дывізій. Да 27 чэрвеня Віцебскі "кацёл" быў ліквідаваны, гітлераўцы страцілі каля 30 тыс. забітымі, паранеными або палоннымі. У ходзе бабруйскай аперацыі было забіта і паранена каля 40 тысяч салдат і афіцэраў вермахта. Спробы гітлераўскага камандавання стрымаць націск Чырвонай Арміі на ўмацаваным рубяжы па р. Бярэзіна таксама былі безпаспяховымі. 1 ліпеня войскі 3-га Беларускага фронта вызвалілі г. Барысаў і прадоўжылі наступленне ў напрамку Мінска. З самага пачатку аперацыі "Баграціён" значную дапамогу Чырвонай Арміі аказвалі беларускія партызаны. Ужо 20 чэрвеня яны правялі заключны этап рэйкавай вайны, фактычна паралізаваўшы важнейшыя чыгуначныя магістралі. Калі ж пачаліся наступальныя дзеянні, партызаны дзейнічалі ў якасці праваднікоў, захоплівалі пераправы на рэках, рабілі засады на шляху адступаючага ворага, удзельнічалі ў танкавых дэсантах, вызваленні населеных пунктаў.

3 ліпеня 1944 г. была вызвалена сталіца Беларусі – г. Мінск. У ходзе Мінскай аперацыі была акружана і на працягу тыдня разгромлена групоўка праціўніка колькасцю 105 тыс. салдат і афіцэраў. Працягваючы наступленне, войскі трох беларускіх франтоў 16 ліпеня вызвалілі г. Гродна, 28 ліпеня – Брэст. Гэтым самым было завершана вызваленне ад нацысцкіх акупантаў усёй тэрыторыі Беларусі. Адначасова войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта паспяхова наступалі ў Прыбалтыцы. У ходзе заключнага этапа аперацыі "Баграціён" былі вызвалены частка Літвы, Латвіі, усходнія раёны Польшчы. Такім чынам, Чырвоная Армія прарвала абарону праціўніка ў глыбіню і шырыню да 500 кіламетраў. Гітлераўцы і іх саюзнікі страцілі забітымі і паранеными больш за паўмільёна салдат і афіцэраў. Склаліся ўмовы для далейшага наступлення на тэрыторыю Германіі.

Аперацыя "Баграціён" садзейнічала поспехам савецкіх войск і на поўдні. У ходзе летняга і асенняга наступлення Чырвонай Арміі была вызвалена тэрыторыя Украіны, Малдавіі, пачалося вызваленне краін Усходняй Еўропы. Найбольш буйнымі аперацыямі тут сталі Львоўска-Сандамірская і Яска-Кішынёўская. Да канца 1944 г. гітлераўцы страцілі на ўсходнім фронце да 170 дывізій. Былі выведзены з вайны Румынія, Балгарыя, Венгрыя і Фінляндыя.

Амаль адначасова з ваеннымі дзеяннямі ў Беларусі 6 чэрвеня 1944 г. саюзныя англійскія і амерыканскія войскі высадзіліся на ўзбярэжжы Паўночнай Францыі. 15 жніўня яны зрабілі высадку і на поўдні Францыі. Такім чынам, быў адкрыты другі фронт у Еўропе. Да канца года саюзнікі вызвалілі Францыю, Бельгію і падышлі да межаў Германіі.

У студзені 1945 г. войскі шасці франтоў пачалі Вісла-Одэрскую і Усходне-Прускую наступальныя аперацыі, якія закончыліся вызваленнем большай часткі Польшчы, а таксама разгромам варожай групіроўкі пад Кёнігзбергам. Страты праціўніка склалі каля ста дывізій. Чырвоная Армія выйшла на р. Одэр і 16 красавіка 1945 г. пачала Берлінскую аперацыю. У ёй прынялі ўдзел войскі трох Беларускіх і першага Украінскага франтоў колькасцю да 2,5 млн. салдат і афіцэраў. Была дасягнута таксама вялікая перавага ў тэхніцы. У ходзе жорскіх баёў Берлін быў акружаны і 25 красавіка савецкія войскі і войскі саюзнікаў злучыліся на р. Эльба. 2 мая берлінскі гарнізон капітуляваў і ў ноч з 8 на 9 мая прадстаўнікі пераможанай Германіі, з аднаго боку, і СССР, ЗША, Англіі і Францыі, з другога, падпісалі акт аб капітуляцыі Германіі.

На Патсдамскай канферэнцыі, якая адбылася 17 ліпеня–2 жніўня 1945 г., кіраўнікі СССР, Англіі і ЗША абмеркавалі пытанні пасляваеннага ўладкавання, вызначылі статус і сістэму кіравання Германіяй, удакладнілі дзяржаўныя межы. У асобнай дэкларацыі саюзнікі прапанавалі Японіі капітуляваць. Пасля таго, як японскі ўрад адхіліў гэтую дэкларацыю, выконваючы ўзятыя абавязацельствы перад саюзнікамі і ўлічваючы, што тэрмін заключанага раней паміж СССР і Японіяй пакта аб ненападзе скончыўся, СССР 8 жніўня аб’явіў вайну Японіі. У ходзе Маньчжурскай аперацыі, якая працягвалася з 9 жніўня па 2 верасня 1945 г., савецкія войскі разграмілі мільённую Квантунскую японскую армію. Былі высажаны дэсанты на Паўднёвы Сахалін і Курыльскія астравы. 2 верасня 1945 г. Японія падпісала акт аб капітуляцыі. Другая сусветная вайна скончылася.

Савецкі Саюз унёс рашаючы ўклад у разгром нацысцкай Германіі. На працягу ўсёй вайны да 75% усіх узброеных сіл вермахта знаходзіліся на Усходнім фронце. Тут было разгромлена больш за 600 дывізій праціўніка, або дзве трэціх усіх яго сіл. З агульных страт Германіі ў 13,6 млн. чалавек больш за 10 млн.

загінулі на савецка-германскім фронце. СССР страціў за гады вайны 27 млн. чалавек, з іх каля 9 млн. салдат і афіцэраў, астатнія – мірныя жыхары.

У Беларусі у гады вайны і нацысцкай акупацыі загінуў амаль кожны трэці жыхар рэспублікі, 1,3 млн. беларусаў ваявалі на фронце, больш за 300 тыс. узнагароджаны ардэнамі і медалямі, 440 чалавек удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

## Тэма 8.Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (1945–1991 гг.)

*8.1. Міжнародныя адносіны пасля Другой сусветнай вайны. БССР на міжнароднай арэне.*

*8.2. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі Беларусі. Грамадска-палітычнае жыццё і спробы рэфармавання эканомікі ў 1950–1960-я гг.*

*8.3. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё БССР у 1970–1980-я гг.*

*8.4. Культура Беларусі ў 1945–1980 - х гг.*

### 8.1. Міжнародныя адносіны пасля Другой сусветнай вайны. БССР на міжнароднай арэне

Пасля Другой сусветнай вайны Германія і яе саюзнікі страцілі свае пазіцыі ў сусветнай палітыцы. На роль сусветнага лідэра ўсё больш актыўна пачалі прэтэндаваць ЗША. За гады вайны ЗША сканцэнтравалі больш за тры чацвёртых залатога запасу свету і 60 % аб’ёмаў сусветнай прамысловай прадукцыі. Іх людскія страты за гады Другой сусветнай вайны склалі толькі сотую частку ад страт, якія панёс Савецкі Саюз, затое валавы нацыянальны прадукт павялічыўся за гэты час у два разы. Авалоданне ядзернай зброяй дазваляла ЗША дзейнічаць з пазіцыі сілы, аб чым сведчыць выкарыстанне ў жніўні 1945 г. ядзерных бомб пры бамбардыроўцы японскіх гарадоў Хірасіма і Нагасакі.

У той жа час, нягледзячы на вялікія страты ў вайне, другой звышдзяржавай станавіўся СССР. Яго аўтарытэт як пераможцы нацысцкай дзяржавы значна вырас у свеце. Савецкі Саюз меў самую магутную на той час армію. Ён таксама значна ўзмацніў свае пазіцыі ў Еўропе за кошт краін т.зв. сацыялістычнага лагеру. Пачалася барацьба за сусветнае лідэрства паміж гэтымі звышдзяржавамі.

На аснове Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін пачалося ўладкаванне свету. Гэта адносілася як да змен у геапалітычным уплыве розных краін ў цэлым, так і канкрэтна ў тэрытарыяльных зменах. Гэты працэс закрануў і Беларусь, дзе Беластоцкая вобласць і некалькі раёнаў Брэсцкай вобласці былі перададзены Польшчы.

Змянілася і палітычная сітуацыя. Да вайны толькі СССР прадстаўляў сацыялістычную краіну. Пасля вайны пры ваеннай, фінансавай, дыпламатычнай падтрымцы СССР на шлях сацыялізму сталі Албанія, Балгарыя, Венгрыя, Польшча, Румынія, Чэхаславакія, Югаславія, ГДР – усяго 8 краін. Пазней на шлях сацыялізму пры падтрымцы СССР сталі Паўночная Карэя, Кітай, В'етнам, Куба. Усяго ў краінах прасавецкага блока пражывала трэцяя частка насельніцтва свету. Яны атрымалі назву "сусветная сістэма сацыялізма". Еўрапейскія прасавецкія краіны для каардынацыі эканамічнай і ваеннай палітыкі стварылі ў 1949 г. Савет эканамічнай узаемадапамогі, у 1955 г. – Арганізацыю Варшаўскага дагавора.

Ім супрацьстаялі заходнія капіталістычныя краіны на чале з ЗША. У 1949 г. яны аб'ядналіся ў ваенны саюз–Арганізацыю Паўночнаатлантычнага дагавора (НАТО). Пачалося ваеннае, эканамічнае, ідэалагічнае супрацьстаянне дзвюх сістэм, якое атрымала назву "халодная вайна". Пачатак яе быў пакладзены ў 1946 г., калі ў г. Фултане ў прысутнасці прэзідэнта ЗША Г. Трумэна былы прэм'ер-міністр Англіі У. Чэрчыль абвінаваціў СССР у пагрозе Захаду і прапанаваў аб'яднацца супраць СССР і распаўсюджвання ім камунізму. Годам пазней, у сакавіку 1947 г. прэзідэнт ЗША Г. Трумэн сфармуляваў праграму падтрымкі "свабодных народаў" і стрымлівання камунізма. Яна заключалася ў тым, што ЗША бралі на сябе права прама або ўскосна ўмешвацца ва ўнутраныя справы дзяржаў. Пачалася гонка ўзбраенняў, у адказ на распрацоўку ЗША ядзернай зброі СССР у 1949 г. таксама выпрабаваў атамную бомбу.

Узмацнілася эканамічная інтэграцыя сярод краін Заходняй Еўропы. Каб павысіць свой уплыў у Еўропе, ЗША пачалі правядзенне ў жыццё "плана Маршала". Ён заключаўся ў выдзяленні еўрапейскім краінам каля 17 млрд. долараў для аднаўлення эканомікі, але пры ўмове выканання пэўных палітычных патрабаванняў. Гэты план прынялі 18 еўрапейскіх краін. Для практычнай рэалізацыі плана (размеркаванне дапамогі) у 1948 г. была створана Арганізацыя Еўрапейскага Эканамічнага супрацоўніцтва (АЕЭС). 5 мая 1949 г. у Лондане 10 краін стварылі Савет Еўропы, а яшчэ пазней, у 1957 г. 6 заходнееўрапейскіх дзяржаў стварылі Еўрапейскае эканамічнае супольніцтва (ЕЭС), унутры якога былі зняты ўсе мытныя бар'еры.

Пачаўся распад каланіяльнай сістэмы. Першымі ў 1940–1950-я гг. атрымалі незалежнасць у Азіі Інданэзія, В'етнам, Індыя, у

Афрыцы – Лівія, Егіпет, Туніс, Марока, Судан, Гана, Гвінея. Пазней, у 1960-я гг. яшчэ 17 дзяржаў Афрыкі атрымалі незалежнасць. У выніку незалежнымі сталі каля 40 дзяржаў з насельніцтвам 1,5 млрд. чалавек.

Пасля Другой сусветнай вайны змяніўся міжнародны статус і БССР. Яна атрымала магчымасць згодна з прынятым Вярхоўным Саветам СССР 1 лютага 1944 г. Законам непасрэдна ўступаць у дыпламатычныя адносіны з іншымі краінамі. У сакавіку 1944 г. быў створаны Народны камісарыят замежных спраў БССР, які ў 1946 г. быў перайменаваны ў адпаведнае міністэрства. 27 красавіка 1945 г. рэспубліка разам з іншымі краінамі выступіла ў якасці стваральніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. 26 чэрвеня 1945 г. міністр замежных спраў Беларусі К.В. Кісялёў ад імя ўрада БССР падпісаў Статут ААН. Удзел у рабоце ААН даў магчымасць БССР, па першае, выкарыстоўваць яе трыбуну для выступленняў з рознымі ініцыятывамі, напрыклад, "Аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў" і інш., па другое, больш актыўна ўдзельнічаць у міжнародных арганізацыях, у тым ліку, такіх уплывовых, як Сусветны Савет міру, ЮНЭСКО (арганізацыя па пытаннях адукацыі, навукі і культуры), МАГАТЭ (Міжнароднае агенства па атамнай энергіі) і інш., па-трэцяе, удзельнічаць у падрыхтоўцы і прыняцці канвенцый (за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе БССР падпісала больш за 30 міжнародных дагавораў, канвенцый па розных пытаннях), па-чацвёртае, выкарыстоўваць ААН для рашэння ўнутраных праблем. Напрыклад, праз ААН Беларусь атрымала значную матэрыяльную дапамогу як краіна, якая найбольш пацярпела ў гады нацысцкай акупацыі. Хаця ў пасляваенныя гады Беларусь дзейнічала у рэчышчы знешняй палітыкі СССР, але, тым не менш, адмаўляць самастойныя дзеянні БССР на міжнароднай арэне таксама нельга.

У другой палове 1950-х гг., пасля пашырэння правоў саюзных рэспублік, у Беларусі з'явіліся больш шырокія магчымасці для міжнароднага супрацоўніцтва. Канкрэтнай праявай гэтага стала адкрыццё ў 1958 г. прадстаўніцтва БССР пры ААН. У наступныя гады Беларусь паслядоўна выступала за забарону ядзернай зброі, яе выпрабаванняў, патрабавала ўсеагульнага і поўнага раззбраення, знішчэння хімічнай зброі. Пры ўдзеле БССР ААН прыняла такія важныя рашэнні, як "Дэкларацыя аб наданні незалежнасці каланіяльным краінам і народам", "Дагавор аб абмежаваннях выпрабаванняў ядзернай зброі" і

інш. У цэлым, да сярэдзіны 1980-х гг. Беларусь падпісала больш за 160 міжнародных дагавораў і пагадненняў, у 1974–1975 гг. яна выбіралася пастаянным членам Савета бяспекі ААН.

Акрамя ААН, другім важным напрамкам удзелу Беларусі ў міжнародным жыцці ў пасляваенныя гады стала развіццё гандлёва-эканамічных зносін з заходнімі краінамі. Гэтаму спрыяла і геапалітычнае становішча Беларусі. Яна знаходзілася ў непасрэднай блізасці ад заходніх межаў СССР, тут маецца развітая сетка аўтадарог і чыгунак, на тэрыторыі Беларусі дзейнічаў шэраг прадпрыемстваў агульнасаюзнага падпарадкавання. Вялікім попытам карысталася прадукцыя такіх прадпрыемстваў, як МАЗ, МТЗ, Гомсельмаш, станкабудаўнічых заводаў Мінска, Віцебска і інш. Ужо ў 1950-я гг. на экспарт пастаўлялася прадукцыя 120 прадпрыемстваў рэспублікі. У 1952 г. у Мінску было створана аддзяленне Усесаюзнай гандлёвай палаты, якое ў 1972 г. было пераўтворана ў Гандлёва-прамысловую палату БССР. Рэспубліка, такім чынам, атрымала магчымасць удзельнічаць у міжнародных кірмашах, праводзіць такія кірмашы ў сябе. Толькі ў 1960-я гг. у Мінску было праведзена больш за 30 міжнародных выставак. У 1950–1980-я гг. 80% гандлёва-эканамічных сувязяў Беларусі прыпадала на краіны сацыялістычнага лагера, на долю капіталістычных краін у 1970–1980 гг. прыпадала 20,2% экспартных паставак.

Значнае месца ў супрацоўніцтве Беларусі з замежнымі краінамі ў пасляваенныя гады займалі культурныя сувязі. З 1958 г. пачало дзейнічаць Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі, да 1970 г. ў рэспубліцы былі створаны каля 100 падобных мясцовых таварыстваў, якія падтрымлівалі сувязі з 400 арганізацыямі амаль 70 краін свету. Але прыярытэт аддаваўся перш за ўсё краінам сацыялістычнага лагера. Шырыліся кантакты па лініі прафсаюзаў, створанага ў 1958 г. Камітэта маладзёжных арганізацый рэспублікі.

Дзейснай формай развіцця міжнародных культурных зносін з'яўлялася супрацоўніцтва ў галіне літаратуры. За 1946–1985 гг. за мяжой вышлі ў свет 342 творы 55 беларускіх пісьменнікаў. За гэты ж час колькасць перакладзеных кніг замежнай літаратуры склала каля 500 выданняў агульным накладам звыш 4 млн. экзэмпляраў.

Адным з важных накірункаў пашырэння культурных сувязяў стала таксама супрацоўніцтва ў галіне адукацыі У гэтым плане

нараду з іншымі вядучымі вузамі рэспублікі значнае месца займаў і займае палітэхнічны інстытут (БНТУ). Падрыхтоўка замежных спецыялістаў ў БПІ пачалася з 1960 г. У 1965 г. колькасць замежных студэнтаў у ім дасягнула 100 чалавек, а ў 1980-я гг. ў БПІ ужо кожны год навучалася да 1000 замежных студэнтаў, а ўсяго па рэспубліцы – да 10 тыс. Праўда, пасля распаду СССР іх колькасць скарацілася.

Такім чынам, у 1950–1980-я гг. пашырыліся міжнародныя сувязі Беларусі, разнастайнымі сталі іх формы і змест, хаця самастойнасць БССР была абмежавана рамкамі агульнасаюзнай палітыкі.

### 8.2. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі Беларусі. Грамадска-палітычнае жыццё і спробы рэфармавання эканомікі ў 1950–1960-я гг.

Другая сусветная вайна мела цяжкія наступствы для Беларусі. Захопнікі разбурылі і спалілі 209 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, 9200 вёсак. Загінулі каля 3 млн. чалавек. Агульныя матэрыяльныя страты прыраўніваліся 35 рэспубліканскім гадавым бюджэтам. Па агульнаму ўзроўню эканомікі Беларусь была адкінута да 1928 г., а па асобных паказчыках – да 1913 г.

Аднаўленне народнай гаспадаркі і сацыяльнай сферы пачалося адразу ж пасля вызвалення рэспублікі ад нацысцкіх захопнікаў – з восені 1943 г. Вялікую дапамогу ў гэтым аказаў саюзны ўрад. У Беларусь былі накіраваны рэпарацыйныя кампенсацыі ў памеры 1,5 млрд. долараў, у 1944–1945 гг. з саюзнага бюджэта было выдзелена каля 1,7 млрд. рублей. За гэты ж час рэспубліка атрымала абсталяванне для 60 заводаў, каля 6 тыс. трактараў, грузавых аўтамашын і камбайнаў, 158 тыс кароў. Сюды ішлі эшалоны з будаўнічымі матэрыяламі, тэхнікай, насеннем, жывёлай. Але, тым не менш, асноўны цяжар аднаўлення гаспадаркі лёг на людзей. У першыя дні вайны і адразу ж пасля вызвалення 1 млн. 300 тыс. чалавек былі прызваны ў армію, 380 тыс. у гады акупацыі дэпартаваны ў Германію, каля паўтара мільёна эвакуіраваліся на ўсход. Кожны трэці жыхар рэспублікі загінуў у час вайны. Таму пасля вайны востра адчуваўся недахоп рабочай сілы. Напрыклад, у Віцебску на момант вызвалення засталося толькі 400 жыхароў, таму працу на некаторых прадпрыемствах пачыналі 5–10 чалавек.

У такіх складаных умовах з дапамогай іншых народаў СССР ужо да сярэдзіны 1945 г. працоўныя Беларусі аднавілі каля 8 тыс. прамысловых прадпрыемстваў або каля чвэрці іх даваеннай колькасці, больш 10 тыс. км чыгункі. Выпрацоўка электраэнергіі дасягнула да канца 1945 г. 46,4% даваеннай. Але ў 1945 г. было выраблена толькі 20% прамысловай прадукцыі ў параўнанні з 1940 г. Пасяўныя плошчы ў сельскай гаспадарцы складалі толькі 75% даваеннага ўзроўню, адпаведна на 30% быў ніжэйшы збор зерня, у два разы – бульбы.

У верасні 1946 г. быў прыняты чацвёрты пяцігадовы план, які ставіў мэтай да канца пяцігодкі дасягнуць даваеннага ўзроўня эканомікі. Выдзеленыя аб'ёмы капіталаўкладанняў раўняліся тром перадваенным пяцігодкам.

У прамысловасці ставілася задача не толькі дасягнуць даваенны узровень, але і зрабіць структурную перабудову. Больш увагі стала ўдзяляцца цяжкай прамысловасці, у тым ліку, стварэнню новых для Беларусі галін: аўтабудаванню, трактарабудаванню, выпуску гідратурбін і інш. Дзякуючы працоўнаму гераізму жыхароў Беларусі, за гады пяцігодкі былі пабудаваны Мінскі трактарны, Мінскі аўтамабільны заводы, мотавелазавод, тонкасуконны камбінат, Віцебскі дывановы камбінат і іншыя буйныя прадпрыемствы. У выніку ў 1950 г. аб'ём прамысловай прадукцыі ў рэспубліцы перавысіў даваенны на 15%. На наступную пяцігодку перад прамысловасцю ставілася яшчэ большая задача: павялічыць аб'ём валавай прамысловасці на 80%. Капіталаўкладанні павінны былі ўзрасці ў параўнанні з папярэдняй пяцігодкай у 1,5 разы. На самай жа справе, за 1951–1955 гг. валавы аб'ём прамысловасці павялічыўся больш чым у 2 разы. Былі пабудаваны 150 буйных прамысловых прадпрыемстваў і больш за 200 дробных. Сярод іх Мінскі падшыпнікавы і гадзіннікавы заводы, радыёзавод, завод ацяпляльнага абсталявання, камвольны камбінат, Аршанскі завод швейных машын, Віцебская шоўкапрадзільная фабрыка і інш.

Больш складаным было становішча ў сельскай гаспадарцы. У вёсках засталіся, галоўным чынам, жанчыны, старыя і дзеці. Нягледзячы на дапамогу сельскагаспадарчай тэхнікай, жывёлай, у калгасах цяглавай сілы востра нехапала. У першую пасляваенную вясну калгаснікі ўручную ўскапалі тысячы гектараў зямлі. З-за недахопу ўгнаенняў ураджаі былі вельмі нізкімі: 5–7 цэнтнераў з гектара

збожжа і 50–70 цэнтнераў бульбы. Сур'ёзнай дапамогай вёсцы ў аднаўленні сельскай гаспадаркі стала шэфства працоўных гарадоў. Дзякуючы самаадданай працы сельскіх працаўнікоў, да 1950 г. пасяўныя плошчы і пагалоў'е жывёлы былі даведзены да 94–96% ад даваеннага ўзроўню, але планы пяцігодкі па вытворчасці асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі не былі выкананы. Тым не менш, у снежні 1947 г. была адменена карткавая сістэма на харчовыя і прамысловыя тавары.

У 1949 г. пачалася масавая калектывізацыя ў Заходняй Беларусі. Яна праводзілася такімі ж фарсіраванымі тэмпамі, як і ў 1930-я гг. у Усходняй Беларусі, але больш значную дапамогу праз МТС дзяржава аказвала тэхнікай. Да канца 1950 г. тут былі арганізаваны 6054 калгасы, якія аб'ядналі каля 84 % усіх гаспадарак. Толькі ў 1952 г., згодна з пастановай Савета Міністраў СССР "Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР", з Заходняй Беларусі былі прымусова дэпартаваны за межы рэспублікі 4431 "кулацкія" сям'і.

У наступнай пяцігодцы аб'ёмы пасяўных плошчаў, ураджайнасць сельскагаспадарчых культур, пагалоўе жывёлы і яе прадукцыйнасць раслі марудна і толькі да 1955 г. сельская гаспадарка Беларусі па асноўным паказчыкам дасягнула даваеннага ўзроўню. Галоўнымі прычынамі былі слабая матэрыяльная зацікаўленнасць калгаснікаў у працы, недастатковае фінансаванне, паколькі асноўныя сродкі накіроўваліся на развіццё прамысловасці.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе хуткімі тэмпамі разгортвалася жыллёвае будаўніцтва. Ужо ў 1946–1950 гг. было пабудавана жыллё для 2 млн. чалавек. Гэта быў значны крок, калі ўлічыць памеры разбурэнняў у Беларусі, але жыллёвая праблема заставалася вострай.

Адставанне прамысловасці ад навукова-тэхнічнага прагрэса, маруднае развіццё сельскай гаспадаркі, мноства праблем у сацыяльнай сферы патрабавалі правядзення сацыяльна-эканамічных рэформ. Яны пачаліся з 1953 г., пасля смерці І.В. Сталіна. У верасні 1953 г. першым сакратаром ЦК КПСС быў выбраны М.С. Хрушчоў. У краіне быў абвешчаны курс на дэмакратызацыю. У 1953–1956 гг. былі пашыраны правы саюзных рэспублік ў прыняцці заканадаўчых актаў, рашэнні пытанняў, звязаных з адміністрацыйным падзелам, у планіраванні, кіраванні прамысловасцю. 850 прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання былі перададзены Беларусі. Некалькі павы-

сілася роля Саветаў, актывізавалася дзейнасць пастаянных дэпутацкіх камісій, яны атрымалі права кантроля за дзейнасцю прадпрыемстваў і ўстаноў, якія знаходзіліся на іх тэрыторыі. У лютым 1956 г. на XX з'ездзе КПСС быў асуджаны культ асобы Сталіна. Пачалася рэабілітацыя рэпрэсіраваных у папярэднія гады. Усяго ў СССР у 1956–1961 гг. былі рэабілітаваны каля 700 тыс. рэпрэсіраваных, у тым ліку, 29 тыс. у Беларусі.

У эканоміцы ў другой палове 1950-х гг. быў узяты курс на больш актыўнае ўключэнне прадпрыемстваў рэспублікі ў навукова-тэхнічны прагрэс і пераарыентацыю прамысловасці на выпуск тавараў народнага спажывання. У другой палове 1950–пачатку 1960-х гг. характэрнай асаблівасцю прамысловасці ў Беларусі стала апераджальнае развіццё новых неметалаёмкіх галін – прыборабудавання і электронікі. Пабудаваны Мінскі, пазней Баранавіцкі заводы аўтаматычных ліній, вылічальных машын, Полацкі нафтаперапрацоўчы завод, Гомельскі завод вымяральных прыбораў, Беларускі аўтазавод у Жодзіна і інш. Аднаўляліся і мадэрнізіраваліся асноўныя вытворчыя фонды, старая тэхніка замянялася новай. У выніку, у 1960 г. агульны аб'ём прамысловай прадукцыі ў БССР павялічыўся ў параўнанні з 1940 г. у 4,2 разы. Але паступова ўсё выразней пачала праяўляцца супярэчлівасць паміж дасягнутым узроўнем развіцця вытворчасці і старымі метадамі і формамі кіравання. У 1957 г. была зроблена няўдалая спроба замяніць галіновую сістэму кіравання праз міністэрствы на тэрытарыяльную. Мэтай яе было прыблізіць кіраванне непасрэдна да прадпрыемстваў. У Беларусі замест 9 міністэрстваў быў створаны адзін орган кіравання – Савет народнай гаспадаркі БССР, які падпарадкоўваўся Савету Міністраў рэспублікі. На справе наблізіць кіраўніцтва да вытворчасці не ўдалося, наадварот, адбыўся разрыў гаспадарчых сувязяў і адносін.

1950–1960-я гг. сталі таксама часам станаўлення хімічнай прамысловасці Беларусі. У 1958 г. былі зацверджаны планы развіцця хімічнай і газавай прамысловасці СССР да 1965 г. Згодна з імі, у 1958–1964 гг. была пабудавана першая чарга Салігорскага калійнага камбіната, у пачатку 1960-х гг. пачалося будаўніцтва Гродзенскага азотна-тукавага завода, Гомельскага хімічнага завода, некалькі пазней – Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна, Полацкага хімічнага камбіната. Гэта значна пашырыла магутнасці прамысловасці Беларусі, але ў той жа час ускладніла экалагічную сіту-

ацыю ў гэтых рэгіёнах. Змены ў праграмах прывялі да таго, што замест пяцігодкі на 1959–1965 гг. быў прыняты новы, сямігадовы план. У цэлым ён быў паспяхова выкананы. Замест запланаванага роста ў 1,8 разы аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 2,1 разы (дарэчы, і па Саюзу планы сямігодкі былі выкананы). Апераджальнымі тэмпамі развівалася энергетыка, былі ўведзены ў эксплуатацыю Мінская ТЭЦ, Лукомльская ДРЭС, завершана стварэнне адзінай энергасістэмы. Вытворчасць электраэнергіі павялічылася ў 3,1 разы пры плане 2,6.

Значныя меры былі ажыццяўлены ў галіне сельскай гаспадаркі. Яны былі вызначаны вераснёўскім (1953 г.) Пленумам ЦК КПСС і заключаліся ў наступным. Павышана матэрыяльная зацікаўленнасць калгаснікаў, здзейснены пераход на грашовую аплату працы. У 2–3 разы былі павышаны закупачныя цэны на прадукты сельскай гаспадаркі, значна павялічаны інвестыцыі ў сельскую гаспадарку, пашырана гаспадарчая самастойнасць калгасаў. Падатак з калгаснікаў быў зніжаны ў 2 разы, а з 1958 г. ён быў наогул адменены. У 1958 г. МТС былі рэарганізаваны ў РТС, а тэхніка прададзена калгасам. Адначасова з калгасаў былі спісаны запазычанасці МТС за папярэднія гады. Праводзілася вялікая работа па меліярацыі балот: да 1960 г. меліяратыўная сетка ўжо ахоплівала 500 тыс. гектараў, прычым яе абслугоўванне дзяржава ўзяла на сябе. Адмоўным у гэтай справе стала парушэнне экалогіі Беларускага Палесся.

Прынятыя меры некалькі палепшылі становішча ў сельскай гаспадарцы, але ў цэлым харчовая праблема не была вырашана. З нагоды гэтага кіраўніцтва СССР вырашыла пашырыць пасяўныя плошчы за кошт асваення цалінных і залежных зямель. На працягу 1954–1956 гг. былі ўзараны 36 млн. гектараў цалінных зямель, што склала 30% усіх сельскагаспадарчых угоддзяў. На асваенне цаліны паехалі і 60 тыс. жыхароў Беларусі. Яны заснавалі ў Казахстане 24 саўгасы. У першыя гады гэта давала плённыя вынікі: доля цаліннага збожжа складала да паловы ўсяго валавага збору зерня, але затым глебы спустошыліся і ўраджаі сталі нізкімі. Тады М.С. Хрушчоў прыняў валюнтарысцкае рашэнне аб паўсюдным распаўсюджванні пасеваў кукурузы, у тым ліку, і за кошт скарачэння вытворчасці іншых сельскагаспадарчых культур. У гэтым ён памылкова бачыў універсальны сродак вырашэння харчовай праблемы. Пашырэнне пасеваў кукурузы, сапраўды, дазволіла

палепшыць кармавую базу для жывёлагадоўлі, але, з другога боку, прывяло да дэфіцыту іншых прадуктаў раслінаводства, перш за ўсё, хлеба.

У першае дзесяцігоддзе пасля смерці І.В. Сталіна, з прыходам да ўлады новага кіраўніцтва краінай значныя змены адбыліся і ў сацыяльнай палітыцы. Хутка развівалася жыллёвае будаўніцтва. У 1951–1958 гг. у гарадах і пасёлках рэспублікі было ўведзена ў эксплуатацыю больш за 14 млн. кв. м жылля супраць 4 млн. кв. м у папярэдняй пяцігодцы, да 1965 г. было пабудавана яшчэ 29 млн. кв. м. Такім чынам, жыллёвыя ўмовы за гэтыя 15 гадоў палепшылі каля 4 млн. чалавек, амаль палова ўсіх жыхароў рэспублікі. Павялічылася аплата працы, у выніку рэальныя даходы працоўных ужо ў 1958 г. выраслі ў параўнанні з 1950 г. на 60%. У 1956 г. быў прыняты Закон аб пенсійным забяспячэнні калгаснікаў. Праўда, мінімальныя пенсіі складалі толькі 12 рублёў у месяц, таму пенсіянеры, як правіла, працягвалі працаваць. Паменшылася працягласць працоўнага дня, а затым быў зроблены пераход на пяцідзённы працоўны тыдзень. Пастунова паляпшалася медыцынскае абслугоўванне людзей.

Такім чынам, у другой палове 1950-х гг. канчаткова завяршыўся этап аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі, што ў лепшы бок абвергла самыя аптымістычныя прагнозы заходніх эканамістаў і палітолагаў. Пры гэтым прамысловасць Беларусі была не проста адноўлена, а, па сутнасці, створана нанава. З’явіліся новыя, сугучныя навукова-тэхнічнаму прагрэсу галіны, астатнія заводы і фабрыкі былі забяспечаны сучаснай тэхнікай. Гэта ператварыла Беларусь у індустрыяльна-аграрную рэспубліку з адносна дынамічным узроўнем развіцця. Але, з другога боку, непаваротлівасць цэнтралізаванай сістэмы кіравання і недастатковае стымуляванне працы тармазілі аператыўнае ўкараненне ў вытворчасць навейшых дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэса. Акрамя таго, Беларусь, якая не мела ў дастатковай меры сваёй сыравіны і энерганосьбітаў, трапляла ва ўсё большую эканамічную залежнасць ад цэнтра, пастунова ператваралася ў зборачны цэх. Спробы рэформ 1960-х гг. былі палавінчатымі, яны праводзіліся зверху, не былі падмацаваны матэрыяльнымі стымуламі і не знайшлі адпаведнага водгуку ў нізах.

## 8.3. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё Беларусі ў 1960–1980-я гг.

Да пачатку 1960-х гг. Савецкі Саюз ператварыўся ў магутную індустрыяльна-аграрную дзяржаву. Тэмпы роста нацыянальнага дахода складалі каля 10% у год. Змянілася структура эканомікі. З’явіліся нафтахімічная прамысловасць, вытворчасць штучных матэрыялаў, радыёэлектроніка. Усё гэта было характэрна і для БССР як часткі СССР.

Але краіна развівалася пераважна па экстэнсіўнаму шляху. У канцы 1950-х гг. пачаліся шматлікія эканамічна не прадуманыя, пражэкцёрскія рэформы і рэарганізацыі, накшталт кукурузнай эпапеі, фарсіраванай пабудовы камуністычнага грамадства і г.д. Краіну ліхаманілі раздзяленні кіруючых органаў на прамысловыя і сельскагаспадарчыя, узбуйненні раёнаў, калгасаў, ліквідацыя хутароў. Нягледзячы на ўзрослую колькасць сельскагаспадарчых машын, механізацыя асноўных тэхналагічных працэсаў была яшчэ недастатковай. Калгасы не мелі поўнай самастойнасці, яны часта залежылі ад валюнтарысцкіх загадаў зверху, аплата працы, хаця і павысілася, але заставалася нізкай.

У выніку развіццё аграрнага сектара адставала ад прамысловага, ураджайнасць збожжавых культур не перавышала ў сярэднім 10–12 цэнтнераў з гектара, бульбы – 70–100 цэнтнераў. Гэта ўспрымалася як правал аграрнай палітыкі М.С. Хрушчова. З 1961 г. пачаў адчувацца дэфіцыт прадуктаў харчавання. Краіна пачала закупляць збожжа за мяжой.

У кастрычніку 1964 г. М.С. Хрушчоў быў абвінавачаны ў “валюнтарызме і суб’ектывізме” і вызвалены з займаемых пасад. Першым сакратаром ЦК КПСС стаў Л.І. Брэжнеў, старшынёй Савета Міністраў СССР – А.М. Касыгін.

Новае кіраўніцтва пачало эканамічныя рэформы. Іх пачатак быў пакладзены сакавіцкім (1965 г.) пленумам ЦК КПСС, які разгледзеў пытанні развіцця сельскай гаспадаркі. Была зменена сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, уводзіўся цвёрды і нязменны план на пяць гадоў для кожнага суб’екта гаспадарання, вызначаліся меры матэрыяльнага стымулявання за звышпланавую прададзеную прадукцыю (50% надбаўка). Пры гэтым дзяржаўныя планы закупак збожжа зніжаліся. У паўтары–два разы павышаліся

закупачныя цэны, павялічваліся капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку, пастаўкі сельскагаспадарчай тэхнікі. Павышалася самастойнасць калгасаў і саўгасаў, уводзіліся элементы гаспадарчага разліку.

У верасні 1965 г. пленум ЦК КПСС абмеркаваў праблемы кіравання прамысловасцю, удасканалення планавання і ўзмацнення матэрыяльнага стымулявання развіцця прамысловай вытворчасці. З больш чым 100 паказчыкаў для справаздачнасці, якія раней спускаліся прадпрыемствам зверху, былі астаўлены толькі 8, прычым галоўным крытэрыем ацэнкі эффектыўнасці работы завода або фабрыкі станавілася не валавая вытворчасць прадукцыі, а аб’ём яе рэалізацыі. Павышалася самастойнасць прадпрыемстваў, уводзіўся гаспадарчы разлік. Прадпрыемствам дазвалялася самастойна расходаваць частку сродкаў для развіцця вытворчасці, матэрыяльнага стымулявання, будаўніцтва жылля, развіцця сацыяльнай сферы.

Змянілася і сістэма кіравання прамысловасцю: ліквідаваны саўнаргасы і адноўлены міністэрствы. Павялічваліся капіталаўкладанні. Праведзеныя рэформы ў цэлым станоўча адбіліся на эканамічным развіцці як Савецкага Саюза, так і Беларусі. Восьмая пяцігодка (1966–1970 гг.) стала адным з самых дынамічных перыядаў развіцця СССР. Сярэднегадавыя тэмпы прыроста прамысловай прадукцыі ў Беларусі складалі 12%. Былі ўведзены ў эксплуатацыю 78 буйных прадпрыемстваў. Удасканальвалася сістэма дзейнасці існуючых заводаў і фабрык. Новым стала стварэнне 222 вытворчых і навукова-вытворчых аб’яднанняў, напрыклад, створанае на базе радыёзавода аб’яднанне “Гарызонт”, на базе Мінскага механічнага завода – Беларускае оптыка-механічнае аб’яднанне, Мінскае вытворчае аб’яднанне вылічальнай тэхнікі, навукова-вытворчае аб’яднанне “Інтэграл” і іншыя. Многія прадпрыемствы пераходзілі на выпуск новай прадукцыі. Рост аб’ёмаў прамысловасці працягваўся і ў наступныя гады. За 1971–1985 гг. на развіццё прамысловасці было затрачана 23 млрд. рублёў, у тры разы больш, чым за 15 папярэдніх гадоў. За гэты час уведзены ў эксплуатацыю 136 буйных фабрык і заводаў. Даволі высокімі заставаліся тэмпы роста аб’ёмаў прамысловай вытворчасці – у сярэднім каля 10% кожны год, прычым асноўную долю прадукцыі выраблялі буйныя прадпрыемствы, пабудаваныя ў пасляваенныя гады. Вынікам развіцця эканомікі БССР да сярэдзіны 1980-х гг.

з'явілася стварэнне буйнага тэрытарыяльна-галіновага прамысловага комплексу, у якім у 1985 г. налічвалася каля 1500 прадпрыемстваў. Больш паловы з іх уваходзілі ў склад вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняў. Вызначальны напрамак набылі такія галіны прамысловасці, як энергетыка, машынабудаванне і прыборабудаванне, хімія і нафтахімія, электроніка і радыёэлектроніка, вытворчасць мінеральных угнаенняў і інш. Агульны аб'ём прамысловай прадукцыі ў 1985 г. перавысіў даваенны ўзровень ў 38 разоў. Разам з тым, прамысловасць Беларусі ўсё больш інтэгравалася ў агульнасаюзную.

Значныя змены ў 1970–1980 гг. адбыліся і ў сельскай гаспадарцы. У гэты час была значна ўмацавана матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў і саўгасаў, да 1985 г. яны валодалі 88 тыс. аўтамашын, 131 тыс. трактараў, 35 тыс. збожжаўборачных камбайнаў. За 15 гадоў у сельскую гаспадарку было ўкладзена 18 млрд. рублей, але і аддача была адпаведнай. Практычна ўсе калгасы і саўгасы сталі рэнтабельнымі, праўда, гэтаму спрыяў і вельмі танны кошт энерганосьбітаў.

З сярэдзіны 1960-х гг. усё выразней пачала вызначацца спецыялізацыя не толькі па рэгіёнах, але і ўнутры раёнаў сярод гаспадарак. У цэлым сельская гаспадарка рэспублікі пачала спецыялізавацца на развіцці жывёлагадоўлі, прычым заходняя частка – на малочна-мясным напрамку, цэнтральная і ўсходняя – на мяса-малочным. У раёнах асобныя гаспадаркі рабілі ўпор на развіццё свінагадоўлі, другія на адкорме жывёлы, трэція больш увагі надавалі дойнаму статку.

Пачалі будавацца жывёлагадоўчыя комплексы з адносна высокай ступенню механізацыі асноўных працаёмкіх працэсаў. Перавод сельскай гаспадаркі на прамысловую аснову, стварэнне буйных спецыялізаваных аграпрадпрыемстваў, павелічэнне аб'ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці прывялі да стварэння ў 1970-я гг. адзінага аграпрамысловага комплексу у Беларусі.

У гэты час у рэспубліцы шырока разгарнуліся меліярацыйныя работы. У 1985 г. плошча меліярыраваных зямель была даведзена да 2,8 млн. гектараў зямлі. Яны давалі амаль трэцюю частку ўсёй прадукцыі раслінаводства і 40% кармоў. Значна павялічыліся аб'ёмы ўнясення ў глебу арганічных і асабліва мінеральных угнаенняў. Але меўшыя месца парушэнні тэхналогій вялі да павелі-

чэння экалагічных праблем. Але, з другога боку, павышэнне ўрадлівасці глебы ў спалучэнні з палепшанай агратэхнічнай культурай працы, увядзеннем матэрыяльнага стымулявання праз канчатковыя вынікі працы (гаспадарчы разлік, брыгады і звенні канечнай прадукцыі) у цэлым спрыяльна адбіліся на развіцці сельскай гаспадаркі. Ураджайнасць збожжавых культур павысілася з 10–12 ц. у сярэднім з гектара ў 1960-я гг. да 25–30 ц. у сярэдзіне 1980-х гг., таксама амаль удвая – ураджайнасць бульбы. У пачатку 1980-х гг. па вытворчасці мяса і малака на душу насельніцтва Беларусь дагнала развітыя краіны Захаду і ЗША, але тэмпы роста эканомікі запавольваліся. Неэфектыўна выкарыстоўваліся крэдыты і капіталаўкладанні, раслі затраты.

Дасягнутыя ў цэлым поспехі ў эканоміцы спрыялі паляпшэнню дабрабыту працоўных. Рэальныя даходы павысіліся амаль у два разы. За 1960–1985 гг. сярэднямесячная аплата працы ў прамысловасці вырасла з 63 р. да 173 р., аплата працы сельскіх працаўнікоў амаль дасягнула узроўню прамысловых рабочых і склала ў сярэднім 154 р. Гэта, з улікам бясплатнага жылля, сімвалічнай платы за камунальныя паслугі, іншымі сацыяльнымі льготамі дазваляла дасягнуць хаця і незаможнага, але прыстойнага ўзроўню жыцця.

У цэлым эканоміка, сацыяльная сфера рэспублікі ў другой палове 1960-1970-х гг. развіваліся даволі дынамічна, дзякуючы працавітасці беларускага народа, даволі эфэктыўнаму стылю кіраўніцтва таго часу, перш за ўсё, К. Т. Мазурава і П.М. Машэрава.

Але ў гэтыя гады ўжо намецілася тэндэнцыя да зніжэння тэмпаў развіцця: з 9–10% сярэднягадавога прыроста валавага прадукта ў 8-й пяцігодцы да 5–6% ў сярэднім за год у 1981–1985 гг. Гэтыя тэмпы роста былі, тым не менш, вышэйшымі за агульнасаюзныя, якія знізіліся да 3,5% у сярэднім за год. Праўда, трэба ўлічваць важкасць гэтых працэнтаў з улікам павялічвання агульнага аб’ёма вытворчасці. З-за складанай сістэмы цэнтралізаванага кіраўніцтва навейшыя навуковыя дасягненні зачастую марудна ўкараняліся ў вытворчасць, што не дазволіла ў поўнай меры забяспечыць выхад эканомікі БССР, як і ў цэлым СССР, на сусветны узровень навукова-тэхнічнага прагрэса. За кошт навукова-тэхнічных дасягненняў забяспечвалася толькі 50% прыросту прадукцыйнасці працы, паранейшаму яшчэ была высокай доля ручной працы.

Рост рэальных даходаў працоўных і, як вынік гэтага, павышэнне пакупной здольнасці, з аднаго боку, і, з другога, недастатковая пераарыентаванасць з цяжкай прамысловасці на вытворчасць тавараў народнага спажывання прывялі да з'яўлення дэфіцыту тавараў і ўтварэння ў гандлёвых кропках чэргаў. За 1971–1985 гг. грашовая маса павялічылася больш чым у 3 разы, а таварная – толькі ў 2 разы.

Паступова нарасталі негатыўныя з'явы, прычым не толькі ў эканоміцы, але і ў грамадска-палітычным жыцці. Замест пошуку шляхоў да мадэрнізацыі эканамічнай, грамадска-палітычнай і дзяржаўнай сфераў правячая партыя КПСС замацоўвала сябе як стрыжань адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Гэта знайшло заканадаўчае адлюстраванне і ў прынятай ў кастрычніку 1977 г. новай Канстытуцыі СССР. Саветы былі адцеснены партыяй на задні план. Узмацніўся ідэалагічны кантроль за прэсай, да народа даводзілася толькі пазітыўная інфармацыя аб поспехах краіны "развітага сацыялізма".

З выбраннем у сакавіку 1985 г. Генеральным Сакратаром ЦК КПСС М.С. Гарбачова пачаліся эканамічныя і палітычныя рэформы, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай "перабудова". М.С. Гарбачоў аб'явіў курс на развіццё галоснасці, дэмакратыі, павышэнне самастойнасці суб'ектаў гаспадарання. Асновай эканамічных рэформ сталі прынятыя ў 1987 г. законы аб дзяржаўным прадпрыемстве. Згодна з імі, пачаўся перавод прадпрыемстваў і аб'яднанняў на гаспадарчы разлік. На гэтыя ўмовы з 1988 г. у Беларусі перайшлі прадпрыемствы прамысловасці, аграпрамысловы комплекс, транспарт, будаўнічыя арганізацыі. Пачатак рэформ ажыццяўляўся ў рамках існаваўшага гаспадарчага механізма, праходзіў супярэчліва. З аднаго боку, укараняліся гаспадарчы разлік і самастойнасць, з другога боку, яны стрымліваліся амаль 100% дзяржаўным заказам. Акрамя таго, прадпрыемствы, атрымаўшыя адносную свабоду, пачалі ўзвінчваць цэны на сваю прадукцыю, здымаць з вытворчасці танныя вырабы. Дэфіцыт тавараў дайшоў да такой ступені, што ўлады пачалі ўводзіць розныя карткі і купоны для рэгламентаванага размеркавання. Хутка раслі цэны і інфляцыя. Становішча яшчэ больш пагоршылася ў сувязі з Чарнобыльскай аварыяй, якая здарылася 26 красавіка 1986 г. 23% тэрыторыі Беларусі былі забруджаны радыёнуклідамі. У зону адсялення трапілі звыш 2 млн.

чалавек, выведзена з сельскагаспадарчага абарота больш за 20 % сельскагаспадарчых угоддзяў, ліквідавана 415 населенных пунктаў. Агульныя страты склалі каля 235 млрд дол. ЗША або 32 гадавых бюджэты БССР. У першыя гады было адселена 27,7 тыс. чалавек. У 1989 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў доўгатэрміновую праграму мінімізацыі вынікаў аварыі на 1990–1995 гг., згодна з якой было адселена больш за 300 тыс. чалавек, пачала ажыццяўляцца праграма аздараўлення людзей, пражываючых на забруджанай тэрыторыі, ў першую чаргу, дзяцей. Але распад СССР пакінуў Беларусь, па сутнасці, адзін на адзін з гэтай бядой, тым больш, што першая палова 1990-х гг. вельмі цяжка адбілася і на эканамічным развіцці рэспублікі з-за непрадуманых рэформ. Меры па ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай АЭС прымаюцца ўвесь час, але на гэта ідзе значная частка рэспубліканскага бюджэта.

У цэлым, нягледзячы на ўсе гэтыя праблемы, Беларусь у другой палове 1980-х гг. за кошт накопленага раней эканамічнага і навукова-тэхнічнага патэнцыяла развівалася ў параўнанні з другімі рэспублікамі СССР адносна стабільна. Кожны год ажыццяўляўся прырост прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1989 г. вытворчасць прамысловай прадукцыі у адносінах да 1985 г. склала 122 %, сельскагаспадарчай – 136%. У 1986–1990 гг. ураджайнасць збожжавых склала ў сярэднім 29,5 ц. з гектара супраць 21,5 ц. з гектара ў гады папярэдняй пяцігодкі. У 1990 г. у рэспубліцы на душу насельніцтва мяса, малака, збожжа выраблялася амаль стольксі, колькі, напрыклад, у ЗША.

З канца 1980-х гг. рэформы ў сувязі з пераходам да рыначнай эканомікі пачалі суправаджацца паступовым разбурэннем старога эканамічнага механізма. Былі прыняты шэраг законаў “Аб уласнасці”, “Аб прадпрымальніцтве”, “Аб арэндзе” і іншыя. ”Шокавая тэрапія” прывяла да яшчэ большага зніжэння жыццёвага ўзроўня насельніцтва.

Змены ў эканоміцы суправаджаліся дэмакратызацыяй і ў выніку разбурэннем старай палітычнай сістэмы. Важнае значэнне мела работа па рэабілітацыі грамадзян – ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Галоснасць адкрыла магчымасць крытыкі дзейнасці ўладных структур. Паступова пачала фарміравацца палітычная апазіцыя. У Беларусі гэты працэс пачаўся з хуткага роста нефармальных аб’яднанняў, напрыклад, “Талака”, “Альтэрнатыва”, “Тутэйшыя”, якія

займаліся пытаннямі мовы, літаратуры, гісторыі і культуры. Аднак паступова іх дзейнасць станавілася ўсё больш палітызаванай і накіраванай на крытыку ўлад. У кастрычніку 1988 г. быў праведзены несанкцыянаваны мітынг, дзе галоўнай тэмай сталі палітычныя рэпрэсіі і крытыка кіраўніцтва краінай. Улады ўпершыню задзейнічалі сілавыя структуры. Канец 1988 і першая палова 1989 гг. праходзілі пад знакам узмацнення апазіцыі, што вылілася ў стварэнні палітычнай арганізацыі – Беларускага народнага фронту, які з цягам часу пачаў ужо выступаць з антысавецкіх і антыкамуністычных пазіцый.

У 1988 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон аб выбарах народных дэпутатаў на альтэрнатыўнай аснове, а ў 1989 г. аналагічны Закон прыняў Вярхоўны Савет БССР. На праведзеных 4 сакавіка 1990 г. выбарах ў Вярхоўны Савет БССР апазіцыя, якая выступала пад лозунгам крытыкі ўрада, здолела правесці значную колькасць сваіх прадстаўнікоў дэпутатамі ў Вярхоўны Савет і стварыць там даволі моцную парламенцкую апазіцыю. Пад яе уплывам 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю “Аб дзяржаўным суверэнітэце БССР”.

Такім чынам, на рубяжы 1980–1990-х гг. у Беларусі, як і ў цэлым у СССР, узмацніліся эканамічны і палітычны крызісы, якія затым выліліся ў ліквідацыю савецкай эканамічнай і палітычнай сістэмы.

### 8.4. Культура Беларусі ў 1945–1980-х гг

За гады вайны значныя страты панесла сістэма адукацыі: знішчаны дзве трэціх школьных будынкаў, амаль уся вучэбна-метадычная база. Але ўжо да 1945 г. былі адноўлены 11 тысяч школ, значная колькасць з іх - з беларускай формай навучання. Поўнасцю ж сетка адукацыі была адноўлена да 1950 г., хаця не хапала памяшканняў, падручнікаў, педагагічных кадраў. Улічваючы, што многія дзеці не маглі набыць адукацыю ў гады акупацыі, да 1950 г. былі адкрыты 950 школ рабочай і сялянскай моладзі. За кошт вяртання педагогаў з дзеючай арміі і падрыхтоўкі іх у ВНУ быў значна палепшаны якасны склад настаўнікаў: да 1955 г. каля 50% з іх мелі вышэйшую і няпоўную вышэйшую адукацыю.

У 1958 г. быў прыняты Закон “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў

СССР”, згодна з якім сямігадовыя школы пераўтвараліся ў васьмігадовыя, а дзесяцігадовыя – у адзінаццацігадовыя з ухілам на працоўную адукацыю. Але з 1964 г. было вырашана зноў вярнуцца да 10-гадовага навучання.

У 1966 г. была пастаўлена задача перахода да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, якая да 1975 г. у цэлым была выканана. За гэты час умацавалася матэрыяльная база сістэмы адукацыі, большасць школ працавалі ў тыпавых будынках, дзе былі таксама спортзалы, майстэрні. Новым стала адкрыццё школ-інтэрнатаў, прадметных кабінетаў. 65% настаўнікаў мелі вышэйшую адукацыю. Але былі і праблемы. Абавязковае дзесяцігадовае навучанне часам прыводзіла да прыніжэння патрабавальнасці за якасць ведаў. Паступова зніжалася сфера выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі, хаця прамых забарон на яе ўжыванне ў вучэбным працэсе з боку ўлад не было.

У 1984 г. была праведзена яшчэ адна рэформа агульнаадукацыйнай школы, згодна з якой навучанне пачыналася з 6 гадоў і працягвалася 11 гадоў. У цэлым, у 1980-я гг. у СССР, у тым ліку і ў Беларусі, склалася якасная сістэма школьнага навучання, якая была прызнана адной з лепшых у свеце.

Развівалася сістэма вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Хуткае эканамічнае развіццё БССР выклікала неабходнасць падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Таму пасля вайны былі адкрыты шэраг ВНУ і адпаведна расла колькасць студэнтаў, якія вучыліся ў іх. У пасляваенныя гады аднавілі сваю працу вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія існавалі да вайны, пазней дадаткова былі адчынены 7 новых ВНУ па тэхнічных спецыяльнасцях, 5 гуманітарных. Агульная ж колькасць ВНУ у Беларусі павялічылася з 24 у 1946 г. да 33 у 1985 г., а колькасць студэнтаў адпаведна з 13 тыс. да 182 тысяч. Вядучымі навучальнымі ўстановамі ў рэспубліцы былі і застаюцца БДУ і БПІ (з 1 красавіка 2002 г.-БНТУ). У палітэхнічным інстытуце, напрыклад, у 1980-я гг. набывалі веды і спецыяльнасці каля 27 тысяч студэнтаў. Па якасці развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусь выйшла на ўзровень развітых краін свету.

З 31 да 139 павялічылася ў пасляваенныя гады колькасць сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У сярэдзіне 1980-х гг. у іх займаліся каля 150 тысяч навучэнцаў.

У 1944 г. была адноўлена дзейнасць Акадэміі навук, прычым ў яе структуры былі створаны шэраг новых навукова-даследчых інстытутаў. Навуковыя распрацоўкі рабілі і супрацоўнікі ВНУ. Напрыклад, пры БПІ быў створаны шэраг навукова-даследчых праблемных лабараторый, пачаў дзейнічаць эксперыментальны завод “Палітэхнік”. Менавіта Беларускі палітэхнічны інстытут стаў ініцыятарам стварэння першага ў рэспубліцы вучэбна-навукова-вытворчага аб’яднання БПІ-МАЗ.

Ствараліся і іншыя галіновыя навукова-даследчыя інстытуты, іх колькасць у 1985 г. склала каля 200, а колькасць навуковых работнікаў павялічылася з 7 тыс. у 1960-я гг. да 42,5 тыс. у 1985 г. У Еўропе добра вядомы беларускія навуковыя школы ў галіне матэматыкі, фізікі. Высокага ўзроўню дасягнулі геалагічная, біялагічная, сельскагаспадарчая, геаграфічная і іншыя галіны навукі. Пэўныя поспехі былі дасягнуты ў гуманітарных навуках, хаця яны былі ў большай ступені, чым іншыя, палітызаваныя. Але на развіцці навукі адмоўным чынам адбіваліся адносная слабасць яе матэрыяльна-тэхнічнай базы, адміністрацыйна-валявыя метады кіравання.

У літаратуры пасляваенных гадоў выразна прасочваліся некалькі напрамкаў: узвелічэнне подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, пафас стваральнай працы і маральна-этычныя праблемы сучасніка. На змену апісальнасці літаратурных твораў 1950-х гг. пазней прыйшло больш глыбокае асэнсаванне падзей і людскіх характараў, іх унутранага свету. Апошняе стала больш характэрным у 1960-я гг., калі XXII з’езд у якасці адной з галоўных трох задач паставіў праблему выхавання “новага чалавека”. У цэлым, нягледзячы на ідэалагічны кантроль з боку партыйных органаў і галоўнага ўпраўлення па ахове дзяржаўных тайн у друку (Галоўліт) пры Савеце Міністраў БССР, літаратура развівалася досыць паспяхова, перш за ўсё таму, што літаратары менш былі залежнымі ад фінансавых праблем па выпуску кніг, іх рашала дзяржава.

У пасляваенныя гады працягваў плённа працаваць Якуб Колас. У 1947 г. ён завяршыў шматгадовую працу над паэмай “Рыбакова хата”, якая была адзначана Сталінскай прэміяй. Глыбокае асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны, псіхалагічных партрэтаў людзей у гады ваенных выпрабаванняў характэрны для празаічных твораў В. Быкава, М. Лынькова, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, А. Адамовіча. Маральна-этычным праблемам сучаснасці прысве-

чаны раманы І. Мележа, Я. Брыля, І. Шамякіна. Гістарычную тэматыку развіваў у сваіх творах У. Караткевіч.

Даволі паспяхова развівалася беларуская паэзія. У пасляваенныя дзесяцігоддзі шырока раскрыўся талент беларускіх паэтаў К. Крапівы, А. Куляшова, П. Броўкі, П. Панчанкі, П. Глебкі, Н. Гілевіча, М. Лужаніна і іншых. У 1980-я гг. з'явіўся шэраг твораў паэтаў новага пакалення А. Вялюгіна, К. Кірыенкі, Р. Барадуліна, Я. Сіпакова, В. Зуёнка.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны была вядучай ў беларускім кінематографе і тэатры. Да асэнсавання гэтых падзей звярнуліся драматургі К. Крапіва, А. Маўзон, К. Губарэвіч,А. Кучар.

Маральна-этычныя праблемы сучаснасці знайшлі адлюстраванне ў драматычных творах і камедыях А. Макаёнка, К. Крапівы, А. Дударава, А. Петрашкевіча. У гэты час у Беларусі працавалі 17 тэатраў.

Пасляваенныя гады характарызаваліся ўзмацненнем ролі Галоўліта, які строга рэгламентаваў літаратурнае жыццё, ажыццяўляў кантроль за рэпертуарам тэатраў; наглядаў за "чысцінёй" прадстаўляемых гледачам п'ес, прычым гэта суправаджалася барацьбой з "касмапалітамі" як выразнікамі ідэалогіі культуры буржуазнага Захада.

У гэты час своеасаблівыя адносіны склаліся паміж урадам і царквой. У гады вайны акупанты ў прапагандысцкіх мэтах дазволілі адкрываць храмы, аднавіць дзейнасць Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы. Адпаведна, была ўзноўлена частка царкоўных прыходаў. Але падчас вызвалення Беларусі ад нацысцкіх акупантаў вышэйшае духавенства таксама эвакуіравалася ў Германію.

Многія з прыходаў пасля вызвалення Беларусі працягвалі сваю дзейнасць. У 1950 г. у рэспубліцы налічвалася каля 1000 цэркваў і малітоўных дамоў, 500 касцёлаў. Дзейнасць афіцыйна зарэгістраваных рэлігійных абшчын не забаранялася, але без падтрымкі дзяржавы. Больш таго, актывізавалася антырэлігійная прапаганда. Пачаў выходзіць часопіс "Навука і рэлігія", ва ўсіх вышэйшых навучальных установах быў уведзены прадмет "Асновы навуковага атэізму". Павольна, але працягвала скарачацца колькасць праваслаўных храмаў і каталіцкіх культавых пабудоў. За першую пасляваенную пяцігодку, пераважна ў заходніх раёнах Беларусі, была зачынена чацвёртая частка касцёлаў. Адраджэнне Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы пачалося ў гады перабудовы.

1950–1980-я гг. сталі часам росквіту беларускага кінематографа. Кожны год студыя “Беларусьфільм” выпускала шэраг фільмаў розных жанраў, пераважна па ваеннай тэматыцы. Многія з іх сталі вядомымі далёка за межамі рэспублікі.

У музычным мастацтве таксама выразна праявіліся дзве галоўныя тэмы: гісторыка-патрыятычная і ваенна-патрыятычная. У гэты час шырокую вядомасць набылі оперы, сімфоніі Я. Цікоцкага, Р. Пуксты, Ю. Семянякі, У. Алоўнікава. Цэнтрам музычнага жыцця рэспублікі былі тэатр оперы і балета, дзяржаўная філармонія і адкрыты ў 1971 г. дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР. Высокай актыўнасцю і майстэрствам адрозніваецца творчасць беларускіх кампазітараў І. Лучанка, Э. Ханка, Л. Захлеўнага. У 1960–1970-я гг. папулярнасць набылі вакальна-інструмянтальныя ансамблі, найбольш вядомыя з іх – “Песняры”, “Верасы”, “Сябры”, фальклорна-харэаграфічны ансамбль “Харошкі”.

Развівалася выяўленчае мастацтва. Тут таксама пераважалі гістарычная і ваенна-патрыятычная тэматыкі, а таксама партрэтны жанр і пейзаж. Тэме вайны прысвечаны палотны мастакоў М. Савіцкага, Я. Зайцава, В. Волкава, Я. Ціхановіча, І. Давідовіча, А. Шыбнёва, гісторыі – Я. Кудрэвіча, П. Сергіевіча. У жанры пейзажа плённа працавалі мастакі І. Ахрэмчык, У. Кудрэвіч, В. Цвірка, М. Данцыг.

У той жа час для многіх мастакоў, у тым ліку і Я. Зайцава, В. Цвіркі і інш., была характэрна наўмысная манументальнасць, часам парадпасць, афіцыйнасць. Гэта ярка праявілася пры ўсхваленні на палотнах І.В. Сталіна.

У архітэктуры першых пасляваенных гадоў працягвалі пераважаць рысы, так званага, “сталінскага ампіра”, характэрнымі асаблівасцямі якога з’яўляюцца манументальнасць, багаты дэкор, скульптурныя кампазіцыі, каланады, але з 1950-х гг. пачаў мяняцца архітэктурны воблік гарадоў. З аднаго боку, пачалася масавая забудова мікрараёнаў згодна з тыпавымі праектамі, з другога, з’явіўся шэраг пабудоў у стылі мадэрн паводле індывідуальных праектаў. Гэта, напрыклад, палацы мастацтва і спорту, павільён ВДНГ, кінатэатр “Кастрычнік”.

Значнае развіццё ў пасляваенныя дзесяцігоддзі атрымала манументальнае мастацтва Беларусі. У гэты час створаны мноства мемарыялаў і помнікаў, прысвечаных подзвігу савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш значнымі з іх з’яўляюцца

ансамбль плошчы Перамогі ў г. Мінску з абеліскам-помнікам воінам Савецкай Арміі і партызанам, загінуўшым у баях з нацызмам, мемарыяльныя комплексы “Хатынь”, “Курган славы”, “Брэсцкая крэпасць-герой” і інш., а таксама помнікі Я. Купалу, Я. Коласу ў Мінску, Ф. Скарыне ў Полацку і інш.

На пасляваенныя гады прыходзіцца росквіт таленту Заіра Азгура, які стварыў вялікі цыкл скульптурных партрэтаў палітычных дзеячаў, прадстаўнікоў беларускай культуры мінулага. Ярка праявілася таксама творчасць беларускіх скульптараў А. Бэмбеля, С. Селіханава, А. Анікейчыка і іншых.

Такім чынам, пасляваенны перыяд адрозніваецца значным уздымам беларускай прафесійнай культуры, хаця пошукі новага даволі часта сутыкаліся з рэаліямі палітычнага жыцця, якое вызначала месца дазволенага. Пачалося паступовае выцясненне беларускай мовы.

## Тэма 9. Суверэнная Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст.

*9.1. Распад СССР і абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.*

*9.2. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі на сучасным этапе.*

*9.3. Культура Беларусі на сучасным этапе.*

### 9.1. Распад СССР і абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь

Няўдалыя рэформы другой паловы 1980-х гг., палітыка дэмакратызацыі палітычнага жыцця, памылкі ў кіраванні краінай прывялі ў канцы 1980-х гг. да эканамічнага і палітычнага крызісу ў СССР, які адбіўся таксама на эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў краінах Усходняй Еўропы. Сацыялістычны лагер распаўся. Польшча, Венгрыя, Чэхаславакія, Балгарыя, Румынія, Югаславія, ГДР, якія ўваходзілі ў яго склад, змянілі эканамічны і палітычны курс, але гэта абярнулася рэзкім спадам у іх эканоміцы ў пачатку 1990-х гг.

Прыкладна ў гэты ж час адбыліся масавыя акцыі пратэсту ў асобных саюзных рэспубліках СССР, якія ў красавіку 1989 г. у Тбілісі, студзені 1990 г. у Баку, пазней у Вільнюсе былі падаўлены пры дапамозе сілавых структур. Пачаўся так званы "парад суверэнітэтаў": у 1988 г. аб дзяржаўным суверэнітэце аб'явіла Эстонія, у 1989 г. – Літва, у 1990 г. аналагічнае рашэнне прынялі Вярхоўныя Саветы Грузіі, Расійскай Федэрацыі, Украіны. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР таксама прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце. Згодна з ёй, у Беларусі ўстанаўлівалася вяршынства законаў БССР, дэкларавалася перадача ва ўласнасць рэспублікі ўсіх матэрыяльных каштоўнасцяў, якія меліся на яе тэрыторыі.

У сярэдзіне 1990 г., урад СССР распрацаваў праграму выхаду эканомікі з крызісу і пераходу да рынačных адносін, што фактычна азначала згортванне сацыялістычнай мадэлі эканомікі і палітычнай сістэмы і пераход да капіталізму. Аналагічную пастанову «Аб пераходзе Беларускай ССР да рыначнай эканомікі» прыняў 13 кастрычніка 1990 г. і Вярхоўны Савет БССР. Згодна з ёй, прадпрыемствы пераводзіліся на поўную самастойнасць, пачалі масава

ствараца розныя кааператывы, камерцыйныя ўстановы, банкі і г.д., куды перапампоўваліся сродкі з дзяржаўнай маёмасці. Адначасова ва ўмовах гіперінфляцыі пад сімвалічныя працэнты крэдытаў палітыка-эканамічныя групы, якія стаялі ва ўладзе, пачалі прыватызацыю ў асабістых мэтах дзяржаўныя фінансавыя сродкі, ствараць розныя прыватныя фірмы і г.д., што атрымала ў народзе назву "прыхватызацыя". Актывізавала дзейнасць па развалу палітычнай сістэмы апазіцыя.

Пагаршэнне эканамічнага становішча людзей у спалучэнні з дзейнасцю апазіцыі прывяло да масавых акцый пратэсту, якія адбыліся ў другой палове 1990 г. і пачатку 1991 г. Паўстала рэальная пагроза існавання СССР як адзінай дзяржавы. У гэтых умовах 17 сакавіка 1991 г. быў праведзены рэферэндум па пытанню аб лёсе СССР. 76,4 % удзельнікаў рэферэндума выказаліся за захаванне Савецкага Саюза, у Беларусі – 82,7% ад колькасці выбаршчыкаў. У чэрвені 1991 г. быў падрыхтаваны, а 15 жніўня апублікаваны ў прэсе праект Дагавора аб Саюзе Суверэнных Дзяржаў (ССД), які меў супярэчлівы характар. Яго падпісанне была намечана на 20 жніўня 1991 г. Лічачы, што гэты дагавор можа прывесці да дэзінтэграцыі краіны, група дзяржаўных дзеячаў зрабіла спробу адхіліць Прэзідэнта СССР М.С. Гарбачова ад пасады, для чаго 19 жніўня быў створаны Дзяржаўны камітэт па надзвычайнаму становішчу і аб'яўлена аб перадачы яму ўсёй паўнаты ўлады. Але супраць выступіў Прэзідэнт РСФСР Б.М.Ельцын, які аб'явіў захоп улады ДКНС незаконным, а членаў – дзяржаўнымі злачынцамі. Члены ДКНС, з аднаго боку, і Прэзідэнт СССР М. Гарбачоў, з другога, праявілі нерашучасць, што дазволіла Б. Ельцыну ўстанавіць кантроль над сітуацыяй. 23 жніўня была прыпынена, а затым часова забаронена дзейнасць КПСС і адпаведна КПБ. Такім чынам, была знішчана сіла, якая з'яўлялася стрыжнем палітычнай і эканамічнай сацыялістычнай сістэмы.

Няўдача дзяржаўнага перавароту і адхіленне ад улады сіл, якія стаялі за захаванне адзінай дзяржавы, перамога Б. Ельцына і фактычны выхад з Саюза Расіі падштурхнулі працэс распаду СССР. Да канца жніўня саюзныя рэспублікі прынялі пастановы, у якіх падтрымалі ідэю нацыянальна-дэмакратычных сіл аб абвяшчэнні незалежнасці. 25 жніўня 1991 г. нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла закон « Аб наданні статусу канстытуцыйнага Закона

Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Па патрабаванню апазіцыі старшыня Вярхоўнага Савета БССР М.І. Дземянцей падаў у адстаўку і на гэтую пасаду быў выбраны яго намеснік С.С. Шушкевіч.

На працягу верасня 1991 г. быў прыняты шэраг законаў, якія замацоўвалі палітычную і эканамічную самастойнасць Беларусі: аб змене назвы, новай сімволіцы, стварэнні ўласных сілавых структур, войска, дзяржаўнай уласнасці і іншых. Да канца года была зроблена спроба стварыць замест СССР канфедэрацыю дзяржаў, але супраць гэтага выступіла Украіна. 5 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Украіны прыняў адозву «Да парламентарыяў і народаў свету», у якой адзначалася, што Дагавор 1922 г. аб утварэнні СССР Украіна лічыць адносна сябе несапраўдным і нядзеючым. 7 снежня 1991 г. без ведама Прэзідэнта СССР М.С. Гарбачова кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны С. Шушкевіч, Б. Ельцын і Л. Краўчук сустрэліся ў Віскулях (Белавежская пушча) і 8 снежня падпісалі Пагадненне аб дэнансацыі Дагавора аб стварэнні СССР 1922 г., затым было зацверджана Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 10 снежня 1991 г. ратыфікаваў гэтае Пагадненне. 21 снежня 1991 г. у г. Алма-Ата прадстаўнікамі 11 былых саюзных рэспублік было прынята рашэнне аб стварэнні замест Савецкага Саюза даволі няпэўнага дзяржаўнага ўтварэння – СНД. 25 снежня 1991 г. М.С. Гарбачоў афіцыйна зняў з сябе паўнамоцтвы Прэзідэнта СССР. Савецкі Саюз перастаў існаваць.

## 9.2. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі на сучасным этапе

Перыяд 1991–1994 гг. характэрны аслабленнем палітычнага і эканамічнага кіраўніцтва краінай, вострай барацьбой за ўладу ў Вярхоўным Савеце паміж прыхільнікамі капіталізацыі грамадства і іх праціўнікамі. У гэты час ствараюцца шэраг палітычных партый, да 1995 г. іх было зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь 34. Але яны былі адносна нешматлікімі і не аказвалі істотнага ўплыву на ход падзей. Акрамя таго, на тэрыторыі Беларусі

дзейнічалі таксама больш за 500 розных грамадскіх арганізацый. Пры Вярхоўным Савеце РБ была створана камісія па распрацоўцы новага праекта Канстытуцыі Рэспублікі, але з-за ўнутрыпарламенцкай барацьбы, змен старшынь Канстытуцыйнай камісіі Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь быў прыняты толькі 15 сакавіка 1994 г. Галоўнай яго асаблівасцю было ўвядзенне інстытута прэзідэнцтва. У выніку выбараў 10 ліпеня 1994 г. першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь стаў А.Р. Лукашэнка. У маі 1995 г. адбыліся новыя выбары ў парламент. Адначасова Прэзідэнт ініцыіраваў правядзенне рэферэндума па пытаннях надання рускай мове нароўні з беларускай статуса дзяржаўнай, аб змене сімволікі, эканамічнай інтэграцыі з Расіяй і аб праве Прэзідэнта датэрміновага роспуску парламента ў выпадку парушэння ім Канстытуцыі РБ. Па ўсіх гэтых пытаннях Прэзідэнт атрымаў падтрымку насельніцтва.

У 1996 г. з мэтай удасканалення палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт ініцыіраваў правядзенне другога рэферэндума, згодна з якім, у прыватнасці, былі ўнесены змены ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Вярхоўны Савет РБ стаў двухпалатным у складзе Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Былі пашыраны правы Прэзідэнта. Практыкавалася скліканне Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Удзельнікі рэферэндума прагаласавалі за перанос Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь на 3 ліпеня, супраць свабоднай куплі–продажу зямлі, супраць адмены смяротнага пакарання. У 2000 г. былі праведзены выбары новага двухпалатнага Парламента, а ў 2001 г. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь зноў быў выбраны А.Р. Лукашэнка. Згодна з вынікамі трэцяга ініцыіраванага Прэзідэнтам рэферэндума, які адбыўся 14 кастрычніка 2004 г., была знята з 81 артыкула Канстытуцыі РБ частка, якая не дазваляла аднаму і таму ж кандыдату балаціравацца на пасаду Прэзідэнта РБ болей дзвюх тэрмінаў. А.Р. Лукашэнка атрымаў права зноў балаціравацца на пасаду Прэзідэнта ў час выбараў 2006 г., у выніку якіх ён атрымаў у сваю падтрымку падаўляючую большасць галасоў выбаршчыкаў. У час парламенцкіх выбараў 28 верасня 2008 г. ні адзін з прадстаўнікоў апазіцыі не быў выбраны дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. 19 снежня 2010 г. адбыліся чарговыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у выніку якіх А.Р. Лукашэнка зноў быў перавыбраны на новы тэрмін. У цэлым жа за гады пасля

ўвядзення прэзідэнцкага кіравання палітычнае становішча ў краіне стабілізавалася, была створана дакладная вертыкаль улады.

У знешнепалітычнай дзейнасці Беларусь з самага пачатку свайго самастойнага развіцця ўзяла курс на шматвектарнасць знешнепалітычнага курса, устанаўленне добрых і ўзаемавыгадных адносін з замежнымі партнёрамі. Асноўныя прынцыпы знешнепалітычнай дзейнасці вызначаны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Законе «Аб зацвярджэнні асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі». Гэта, перш за ўсё, прытрымліванне нормаў міжнароднага права, раўнапраўе, непарушнасць межаў, нейтралітэт і неўмяшанне ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны са 137 дзяржавамі, актывізавала сваю дзейнасць у ААН, увайшла ў склад некалькіх дзесяткаў міжнародных арганізацый. Пасля падпісання 26 лютага 1992 г. Хельсінскага заключнага акта яна стала удзельніцай хельсінскага працэса, увайшла ў склад Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ),- з 1995 г. Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). З мэтай захавання міру і бяспекі Беларусь выступіла з ініцыятывай аб стварэнні ў Еўропе бяз'ядзернай зоны. Яна імкнецца, зыходзячы з агульнапрынятых прынцыпаў міжнароднага права, наладзіць паўнавартаснае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з краінамі ЕС, дыялог з НАТО, зацікаўлена ў развіцці канструктыўных адносін з ЗША, плённым супрацоўніцтве з гэтай краінай па самаму шырокаму спектру праблем. Нягледзячы на абмежавальныя меры эканамічнага характару, якія прымяняюцца ЗША ў адносінах да Беларусі, эканамічныя сувязі з буйнейшымі амерыканскімі кампаніямі працягваюцца, што выгадна абодвум бакам. Характар стратэгічнага партнёрства набываюць сувязі Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай, эфектыўна развіваюцца адносіны з Кубай, краінамі Лацінскай Амерыкі, перш за ўсё, Венесуэлай, Бразіліяй, Аргенцінай. Адным з напрамкаў знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі з'яўляюцца азіяцкі і афрыканскі рэгіёны: устаноўлены дыпламатычныя адносіны больш чым з 80 краінамі.

Але прыярытэтным напрамкам у знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі былі і застаюцца ўзаемаадносіны з Расіяй і краінамі СНД. Нягледзячы на часам узнікаючыя эпізадычныя разнагалоссі па асобных аспектах развіцця эканомікі, Беларусь паслядоўна трымае

курс на паглыбленне эканамічнай і палітычнай інтэграцыі з Расіяй. 2 красавіка 1996 г. быў падпісаны Дагавор аб Супольнасці суверэнных дзяржаў – Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, які забяспечыў грамадзянам абедзвюх краін роўныя правы ў сферы эканомікі, адукацыі, аховы здароўя. Наступнымі крокамі на шляху беларуска-расійскай інтэграцыі сталі заключэнне 2 красавіка 1997 г. Дагавора аб Союзе Беларусі і Расіі і 8 снежня 1999 г. аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, распрацоўка яе Канстытуцыйнага акта. Гэта дазволіла актывізаваць эканамічныя, гандлёвыя сувязі, стварыла базу для адзінай эканамічнай, мытнай, абарончай, гуманітарнай, інфармацыйнай прасторы. Найбольш развітымі сферамі двухбаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з'яўляюцца гандлёва-эканамічнае, ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Рэгулярны характар набылі прамыя кантакты кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Пашыраюцца сувязі Беларусі з краінамі былога СССР. Важным крокам на шляху эканамічнай інтэграцыі стала падпісанне 6 кастрычніка 2007 г. Беларуссю, Казахстанам і Расіяй Дагавора аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні Мытнага Саюза. Гэты Саюз пачаў дзейнічаць з ліпеня 2011 г., калі на граніцах трох дзяржаў быў адменены мытны кантроль. Пазней да гэтага Саюза далучылася Арменія.

У рамках паглыблення інтэграцыйных працэсаў вялікае значэнне надаецца ўдзелу Беларусі ў развіцці Еўразійскай эканамічнай супольнасці (ЕўрАзЭс), забяспячэнню калектыўнай бяспекі праз Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). Пастаянна ўмацоўваецца эканамічнае супрацоўніцтва дзяржаў, якія увайшлі ў гэтыя супольнасці, прыняты шэраг палітычных рашэнняў, накіраваных на ўмацаванне інтэграцыйных працэсаў.

У эканамічнай сферы пасля распада СССР і стварэння суверэнных дзяржаў адбыўся рэзкі пераход да ліберальнай рыначнай эканомікі. Пачалася прыватызацыя прадпрыемстваў і пераход на свабоднае цэнаўтварэнне, у сельскай гаспадарцы быў узяты курс на ліквідацыю калгасаў і замену іх фермерскімі гаспадаркамі. Гэта прывяло да рэзкага зніжэння аб'ёмаў вытворчасці і ўзроўня жыцця насельніцтва. У Беларусі ў 1991–1995 гг. валавы нацыянальны прадукт скараціўся на 35%, рэальная зарплата зменшылася на 50%. За рысай беднасці аказалася 60 % насельніцтва. Становішча яшчэ

больш ускладнялася ў сувязі з узрастаючай інфляцыяй, ростам беспрацоўя, нарастаннем іншых сацыяльных праблем.

З увядзеннем прэзідэнцкага кіравання быў узяты курс на сацыяльна-арыентаваную рыначную эканоміку з моцным дзяржаўным рэгуляваннем. Былі зацверджаны асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг., прыпынена прыватызацыя, яна стала праводзіцца пад кантролем дзяржавы, спыніўся дэмантаж буйнай калгасна-саўгаснай вытворчасці і зроблены ўпор на сельскагаспадарчыя кааператывы.

У выніку прынятых мер па стабілізацыі эканомікі з 1996 г. спыніўся спад вытворчасці і з 1997 г. пачаўся пэўны ўздым. У 2001 г. Беларусь першай на постсавецкай прасторы аднавіла ўзровень вытворчасці 1990 г. Паступова павышаецца рэальная зарплата. Пачалося ажыўленне сельскагаспадарчай галіны эканомікі. У 2001–2005 гг. прырост валавага ўнутранага прадукту ў Рэспубліцы Беларусь штогод складаў у сярэднім 7,5% супраць 3,5% сярэднесусветнага, былі выкананы асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця за пяцігодку. Паступова пачалася выпрацоўвацца беларуская «мадэль» сацыяльна-эканамічнага развіцця, дзе захаваліся сістэма сацыяльнай абароны і сацыяльныя гарантыі для людзей, усталявана моцная дзяржаўная ўлада з апорай на народ, стабільна развіваецца эканоміка. У той жа час Беларусь адкрыта да ўзаемавыгадных эканамічных сувязяў з іншымі краінамі. Яна ўступіла ў міжнародны валютны фонд (МВФ), міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця (МБРР), устаноўлены кантакты з сусветнай гандлёвай арганізацыяй (СГА). Праводзіцца актыўная работа па прыцягванню ў беларускую эканоміку замежных капіталаў, працуюць сумесныя і замежныя прадпрыемствы і філіялы. Дзейнічаюць свабодныя эканамічныя зоны (СЭЗы).

У 2006 г. на III Усебеларускім народным сходзе была абмеркавана і зацверджана Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гг., дзе у якасці асноўнай задачы пастаўлена павышэнне якасці жыцця людзей. Сусветны эканамічны крызіс, які пачаўся ў другой палове 2008 г., ускладніў яе рэалізацыю, але, тым не менш, большасць прагнозных паказчыкаў была выканана. У асноўным паспяхова выконваюцца праграмныя ўстаноўкі сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011–2015 гг., якія былі вызначаны на IV Усебеларускім народным сходзе ў снежні 2010 г.

**9.3. Культура Беларусі на сучасным этапе**

Культура Беларусі канца XX – пачатку XXI стст. мае свае асаблівыя адметнасці. Яна адрозніваецца як значнымі поспехамі і інавацыямі, так і ўзнікшымі ў новай культурна-гістарычнай абстаноўцы праблемамі. Новая інфармацыйная прастора зрабіла беларускую культуру больш адкрытай да сусветнай, што дазваляе шырэй выкарыстоўваць дасягненні апошняй, але і ў пэўнай меры, з другога боку, вядзе да страты нацыянальных адметнасцяў. Пашырыўся ўплыў даволі нізкапробнай замежнай масавай культуры.

Культура стала менш ідэалагізаванай, большая ўвага надаецца агульначалавечым каштоўнасцям. Але, з другога боку, дзяржава стала менш фінансаваць культуру, таму ўзмацніўся камерцыйны ўплыў з боку прыватнага капітала, што не заўсёды станоўча спрыяе росту культурных каштоўнасцей мастацкіх твораў.

Радыкальныя эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя змены 1990-х гг. выклікалі значную цікавасць насельніцтва да сваёй культуры, традыцый беларускага народа. У 1991 г. былі прыняты законы «Аб адукацыі», «Аб культуры ў Беларускай ССР», асноўныя напрамкі нацыянальна-культурнага адраджэння вызначаны ў Канстытуцыі РБ, прынятай у 1994 г.

Грамадзяне Беларусі атрымалі большыя магчымасці знаёмства з раней невядомымі публікацыямі айчынных і замежных аўтараў па праблемах гісторыі, філасофіі, сацыялогіі і інш., а таксама змаглі ўбачыць так званыя "палічныя" кінафільмы рэжысёраў-наватараў, адкрыць для сябе творы мастацкай літаратуры перыяду "застою", якія раней распаўсюджваліся ў “самвыдаце”. Змяніліся адносіны да эмігрантаў, што дазволіла глыбей пазнаёміцца з дзейнасцю супольнасцяў беларусаў за мяжой і іх культурнымі дасягненнямі.

Перабудоўчыя працэсы, гады незалежнасці змянілі таксама стаўленне і да вернікаў і рэлігіі ў цэлым. Вернікі сталі смялей адзначаць рэлігійныя святы, маліцца, а былыя культавыя будынкі пастунова сталі перадавацца канфесіям. Частка гэтых будынкаў была адрэстаўравана, асобныя храмы былі адбудаваны зноў на іх гістарычных месцах (касцёл св. Варвары ў Віцебску, царква Марыі Магдалены ў Мінску, Мікалаеўская царква ў Брэсцкай крэпасці і інш.). Дзяржава аказвае фінансавую падтрымку ў рамонце і

рэстаўрацыі культавых пабудоў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

Больш таго, па сутнасці, упершыню за гады Савецкай улады сталі праектавацца і будавацца новыя цэрквы, касцёлы і кляштары. Усё гэта стала магчымым дзякуючы адмове дзяржавы ад ідэалагічных дагматаў, атэізму і актывізацыі дзейнасці розных канфесій, рэлігійных супольнасцяў. Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, у краіне вызначана свабода выбару атэістычных або рэлігійных перакананняў. У постсавецкі час назіраецца імклівы рост рэлігійных суполак, павелічэнне колькасці храмаў. З 1991 па 2013 гг. агульная колькасць афіцыйна зарэгістраваных рэлігійных суполак павялічылася больш чым у тры разы: з 1000 да прыкладна 3300. Па ліку вернікаў на першым месцы ў Беларусі знаходзіцца праваслаўная царква, яна аб'ядноўвае каля паловы ўсіх рэлігійных суполак, на другім – каталіцкая канфесія, якая налічвае каля 500 суполак, прыкладна 800 суполак складаюць прыхільнікі рэлігійных канфесій евангельскіх хрысціян-баптыстаў і хрысціян веры евангельскай. Увогуле ў Беларусі склалася ўнікальная сітуацыя, калі ў адной дзяржаве мірна суіснуюць 26 розных канфесій. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь будуецца на павазе да ўсіх канфесій, за выключэннем дэструктыўных, захоўванні межканфесійнай згоды. Пільную ўвагу пытанням дзейнасці рэлігійных арганізацый надае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы рэгулярна сустракаецца з вышэйшымі царкоўнымі іерархамі, прымае асабісты ўдзел ва ўрачыстасцях, звязаных з важнейшымі рэлігійнымі святамі. З 2008 г. у Беларусі дзейнічае кансультатыўны міжканфесійны савет пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей, сумесна з царквой ажыццяўляюцца духоўна-асветніцкія праграмы, праводзяцца фестывалі хрысціянскай музыкі, розныя святы і г.д. Яркім прыкладам гэтаму з'яўляецца свята "Радасць Вялікдня", якое штогод стала праводзіцца ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце пад апекай рэктара ўніверсітэта і экзарха ўсёй Беларусі, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага.

У постсавецкі перыяд назіраюцца станоўчыя тэндэнцыі ў развіцці сістэмы адукацыі. З'явіліся новыя тыпы навучальных устаноў – гімназіі, ліцэі, каледжы, а таксама недзяржаўныя вучэбныя ўстановы, уключаючы і вышэйшыя, якія працуюць на платнай аснове, здзейснены пераход на дзесяцібальную сістэму адзнак,

ўведзена тэсціраванне, шырока разгорнута камп'ютэрызацыя вучэбнага працэса. У 1999/2000 навучальным годзе ў Беларусі дзейнічалі 81 дзяржаўная гімназія, 26 ліцэяў, 14 недзяржаўных сярэдніх школ, 150 дзяржаўных і 7 недзяржаўных сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў. У 2012/2013 навучальным годзе працавалі 219 гімназій, 28 ліцэяў, 8 кадэцкіх навучальных устаноў, 2420 сярэдніх школ, 5 гімназій-каледжаў мастацтваў.

Згодна з Пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 жніўня 1996 г. «Аб канцэпцыі рэформы агульнаадукацыйнай школы ў Рэспубліцы Беларусь» была распрацавана трохступенчатая мадэль адукацыі з пераходам на 12-гадовы тэрмін навучання. Пры гэтым рэформа прадугледжвала пераход на 10-бальную сістэму ацэнкі ведаў (уведзена з 1 верасня 2002 г.) і іншыя новаўвядзенні. У красавіку 1999 г. урад Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Праграму развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі на перыяд да 2010 г. Практыка паказала, што больш рацыянальным з'яўляецца 11-гадовае навучанне, таму з 2008 г. былі зроблены адпаведныя карэктывы. Ствараюцца ўмовы для паглыбленага вывучэння асобных прадметаў у базавай школе і профільнага навучання ў старшых класах. Нягледзячы на праблемы ў працы сельскіх школ, звязаныя з дэмаграфічным спадам, у Беларусі дасягнуты 100 % ахоп дзяцей навучаннем. Сталі шырока практыкавацца прадметныя алімпіяды, па выніках якіх пераможцы атрымліваюць права без іспытаў паступаць у ВНУ. Добрая якасць навучання ў беларускіх школах пацвярджае і паспяховы ўдзел школьнікаў ў міжнародных прадметных алімпіядах.

У 2003 г. прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі», згодна з якім праводзіцца работа па рацыяналізацыі і ўдасканаленню вучэбнага працэса ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, дзе займаюцца каля 130 тыс. навучэнцаў.

За апошнія 20 гадоў амаль у два разы павялічылася колькасць ВНУ і студэнтаў, якія ў іх навучаюцца. Новым стала ўвядзенне платнай адукацыі пры захаванні неабходнай колькасці студэнтаў, якія навучаюцца за кошт дзяржавы, з'яўленне, акрамя дзяржаўных ВНУ, сеткі камерцыйных навучальных устаноў. Падчас перабудовы нямала інстытутаў былі пераўтвораны ва ўніверсітэты і акадэміі, адкрыты Баранавіцкі, Палескі дзяржаўныя ўніверсітэты і іншыя. Усяго ў Беларусі налічваецца 55 ВНУ, у тым ліку 10 недзяржаўных. У выніку Беларусь стала адной з самых адукаваных еўрапейскіх

краін. У 2010 г. колькасць студэнтаў ВНУ Беларусі склала 475 чалавек на 10000 насельніцтва. Па паказчыкам сярэдняй і вышэйшай адукацыі краіна выйшла на ўзровень вядучых еўрапейскіх дзяржаў. У 2012 г. пачалася рэформа вышэйшай школы, накіраваная па шэрагу спецыяльнасцяў на пераход да 4–4,5 гадовага навучання.

У сувязі з абвяшчэннем Беларуссю незалежнасці і выхадам са складу СССР у ВНУ рэспублікі былі адкрыты дзесяткі новых спецыяльнасцяў, па якіх раней кадры не рыхтаваліся. У вышэйшых навучальных установах з'явіліся бакалаўрыят і магістратура. Значная ўвага ў сістэме сярэдняй і вышэйшай адукацыі стала ўдзяляцца вывучэнню камп’ютарнай тэхнікі, эканомікі і замежных моў. З сярэдзіны 2002 г. Беларусь пачала прымаць меры па далучэнню да Балонскага працэса. Гэтым тэрмінам прынята вызначаць адукацыйныя рэформы, пачатыя шэрагам еўрапейскіх краін, накіраваныя на стварэнне адзінай еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, выпрацоўку агульнапрызнаных стандартаў у набыцці адукацыі і, як вынік, стварэнне высокай мабільнасці пры выбары месца вучобы або працы. Намаганні з боку ўлад і грамадскасці па ўключэнню Беларусі ў Балонскі працэс актывізаваліся ў 2010 – 2012 гг. У канцы 2011 г. быў створаны грамадскі камітэт па ўключэнню Беларусі ў Ерапейскую прастору вышэйшай адукацыі. Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь накіравала ў Балонскі сакратарыят спачатку заяву аб уступленні ў гэты працэс, а 29 лістапада 2011 г. – адпаведны пакет дакументаў. Важную ролю ў замацаванні прававых норм ў комплексным развіцці сістэмы адукацыі краіны адыгрывае Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, зацверджаны 13 студзеня 2011 г., №243-З.

У сувязі з умацаваннем саюзных адносін Беларусі з Расіяй, якая ўжо раней уступіла ў Балонскі працэс, прымаюцца меры па фармаванні адзінай, але дыферэнцыраванай агульнаадукацыйнай прасторы і ўзгадненню ўсіх кампанентаў заканадаўчых баз у вобласці адукацыі дзвюх сумежных дзяржаў. Так, у мэтах развіцця інтэграцыйных сувязей з Расійскай Федэрацыяй і іншымі краінамі,– у Магілёве быў створаны Беларуска-расійскі універсітэт, дзе займаюцца студэнты Беларусі і Расіі. Штогод тысячы студэнтаў з Расіі, Туркменістана і іншых постсавецкіх рэспублік навучаюцца ў розных ВНУ Беларусі..

У ВНУ сталі пераглядацца і змяняцца вучэбныя планы і праграмы вучэбных дысцыплін. Зведаў змены цыкл сацыяльна-гуманітарных навук. У вышэйшых навучальных установах былі ўведзены курсы гісторыі Беларусі, беларусазнаўства, паліталогіі і іншых дысцыплін. Выдаваліся новыя падручнікі, дапаможнікі, курсы лекцый. Выйшлі з друку шэсць тамоў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", з'явіліся новыя газеты і часопісы ("Спадчына", "Беларускі гістарычны часопіс", "Беларуская мінуўшчына", "Роднае слова", "Культура", “Мастацтва” і інш.).

У 1990-я гг. у даволі складаным становішчы аказалася навука. Як вядома, ў савецкі перыяд Беларусь адрознівалася сваім высокім навуковым патэнцыялам. Але цяжкае эканамічнае становішча ў перыяд перабудовы прывяло да рэзкага зніжэння аб'ёмаў дзяржаўнага фінансавання навукі, што негатыўна адбілася на матэрыяльна-тэхнічнай базе і кадрах. Зменшыўся прыток моладзі ў навуку і, наадварот, павялічылася колькасць навукоўцаў, якія перайшлі ў камерцыйныя структуры або з'ехалі за мяжу, дзе ў той час яны маглі атрымаць лепшыя ўмовы для навуковай працы.

Каб выправіць становішча, у 1993 г. быў прыняты Закон «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі», згодна з якім было некалькі палепшана фінансаванне навукі, а адказнасць за развіццё фундаментальных навуковых даследаванняў ускладзена на Акадэмію навук Беларусі. У складзе НАН Беларусі з'явіліся новыя навуковыя інстытуты. Пашырыліся і міжнародныя сувязі навукоўцаў Беларусі. У 1993 г. Акадэмія навук Беларусі прынята ў якасці нацыянальнага члена ў Міжнародны савет навуковых саюзаў. У 1998 г. прыняты Закон «Аб навуковай дзейнасці», сталі праводзіцца конкурсы на лепшы даследчы праект, вылучацца гранты на правядзенне найбольш перспектыўных даследаванняў. 5 сакавіка 2002 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў дэкрэт «Аб удасканаленні дзяржаўнага кіравання ў сферы навукі». Была створана сістэма дзяржаўнага кіравання, якая складаецца з Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў РБ, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) і Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Гэтыя і іншыя меры дазволілі падняць узровень навуковых даследаванняў. У апошнія гады навука пачынае выходзіць на страчаныя раней рубяжы, стабільна развіваецца, пашыраюцца кантакты з навуковай супольнасцю замежных краін. Арыгінальныя, вельмі

перспектыўныя і значныя адкрыцці былі зроблены беларускімі даследчыкамі ў 2002 г. У прыватнасці, навукоўцы А. Краўкліс К.І. Буянкоў, В. Мінкіна, С. Шабуня, У. Гаўрылюк, У. Зайкін сумесна з працаўнікамі "Белтрансгаза" і французскай фірмай "Эр-Лікід" распрацавалі і ажыццявілі праект па стварэнні рэактара, які пераўтварае прыродны газ у вадарод. Акрамя таго, пад кіраўніцтвам акадэміка А. Мартыненкі ў краіне наладжана вытворчасць нанаматэрыялаў, а гэта значыць, што Беларусь практычна ўвайшла ў клуб нанатэхналагічных дзяржаў. Як вядома, за нанаматэрыяламі велізарная будучыня ўсёй навукі, тэхналогіі і эканомікі.

Яркімі прыкладамі новых дасягненняў беларускай навукі сталі запуск у 2012 г. беларускага касмічнага апарата і палёт у касмічную прастору трэцяга беларускага касманаўта  Алега Навіцкага.

Палітыка галоснасці і дэмакратызацыі жыцця, пераход да рыначных адносін, пабудова незалежнай беларускай дзяржаўнасці наклалі свой адбітак на развіццё літаратуры. З аднаго боку, з'явілася маса твораў невысокай пробы, камерцыйнага характару, сапраўднае мастацтва стала дарагім і недаступным для часткі насельніцтва, па фінансавых прычынах ускладнілася публікацыя высокамастацкіх твораў. З другога боку, у культуры, асабліва літаратуры, з'явіліся напрамкі, тэмы, характэрныя для адраджэнскага перыяду, якія раней замоўчваліся. Тэму рэпрэсій узнялі ў сваіх творах С. Грахоўскі, В. Быкаў. Адраджэнскімі матывамі прасякнуты кнігі Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, А. Разанава і іншых аўтараў..

Са спецхранаў і сховішчаў былі вернуты і надрукаваны працы А. Мрыя, М. Гарэцкага, А. Гаруна, У. Ластоўскага, Л. Геніюш, К. Буйло і шматлікіх іншых літаратараў, у тым ліку, эмігрантаў і раней рэпрэсіраваных. Убачылі святло раней не друкаваўшыяся творы Я. Купалы, Я. Коласа. У Беларусі сталі выдавацца серыі кніг "Нашы знакамітыя землякі", "Беларускі кнігазбор", "Памяць" і іншыя. У 1998 г. да 200-годдзя з дня нараджэння А. Міцкевіча выйшла яго паэма "Пан Тадэвуш" на беларускай, польскай і рускай мовах.

Адной з важных тэм у літаратуры стала гістарычная. У жанры гістарычнай прозы плённа працуюць Л. Дайнэка, У. Арлоў, К. Тарасаў, В. Чаропка, А. Лойка, В. Іпатава. Экалагічная тэма, трагедыя Чарнобыля прагучалі ў творах І. Шамякіна, У. Казько, С. Алексіевіч.

Актывізацыі працы пісьменнікаў садзейнічала сустрэча ў кастрычніку 2011 г. членаў Саюза пісьменнікаў, які на той час налічваў 567 членаў, з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка.

Важную ролю ў прапагандзе кнігі, пашырэнні ведаў чытачоў адыграла правядзенне шэрагу мерапрыемстваў, звязаных з вызначэннем у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка 2012 года як года Кнігі. У краіне былі праведзены шматлікія канферэнцыі чытачоў, дыспуты, выстаўкі кніг, сустрэчы з пісьменнікамі. За год Кнігі ў Беларусі было выдадзена 11344 найменняў кніг і брашур агульным накладам звыш 33 млн. экзэмпляраў. Пры гэтым выданне кніг на беларускай мове ў параўнанні з 2011 годам узрасло на 36%.

Напрамкі, вызначаныя ў літаратуры, характэрны і для беларускай драматургіі. А. Дудараў, С. Кавалёў звярнуліся да гістарычнага мінулага беларускага народа. М. Арэхоўскі, І. Сідарук, наадварот, звярнуліся ў сваіх п'есах да мадэрнісцкіх матываў. У драматургію таксама прышлі і маладыя аўтары – У. Сауліч, А. Курэйчык і інш. Так, у новым стагоддзі расце цікавасць да творчасці драматурга А. Курэйчыка (“Страчаны рай”, “Ілюзіён”). Яго п'еса “П'емонцкі звер” стала лаўрэатам першага драматычнага конкурсу, які праводзілі Міністэрства культуры Расіі сумесна з МХАТ імя А.П. Чэхава.

Па-ранейшаму ў беларускай прозе, паэзіі, драматургіі распрацоўваецца тэма Вялікай Айчыннай вайны.

Новы час прывёў да з'яўлення новых тэатральных студый: тэатры-студыі «Абзац», «Жэст», тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі «Вольная сцэна».

Вядомым далёка за межамі Беларусі стаў творчы калектыў Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Напрыклад, Міжнародная асацыяцыя ў Парыжы, якая дзейнічае пад эгідай ЮНЭСКО, прызнала балет «Страсці» лепшай балетнай пастаноўкай у свеце ў 1995 г., а яго стваральнікам у 1996 г. была прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь.

Працягвае творчыя пошукі і Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Беларусі. Тут былі пастаўлены спектаклі “Джулія”, “Шклянка вады”, “Халопка”, “Хэлло, Долі!”, “Марыца" і інш. На базе гэтага тэатра ў 1991 г. адкрыўся Дзіцячы музычны тэатр, у 1992 г. пачаў працаваць харэаграфічны калектыў “Мінск-балет”.

Далейшае развіццё атрымала музычнае мастацтва. У галіне эстраднай музыкі плённа працуюць кампазітары І. Лучанок, Э. Ханок, В. Іваноў, Л. Захлеўны, Э. Зарэцкі, А. Елісеенкаў. Шмат зрабілі для беларускай музыкі кампазітары і выканаўцы В. Роўда, М. Казінец,, С. Картэс, Д. Смольскі, У. Солтан, а таксама вакальна-інструмянтальныя ансамблі "Песняры", "Верасы", "Сябры", фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі". Беларусь мае высокапрафесійныя музычныя дзяржаўныя калектывы, у тым ліку, Дзяржаўны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам М. Фінберга, Прэзідэнцкі аркестр (кіраўнік В. Бабарыкін), Дзяржаўны камерны хор Беларусі, акадэмічны народны хор імя І. Цітовіча, акадэмічную харавую капэлу імя Р. Шырмы.

Істотнымі падзеямі ў культурным жыцці Беларусі сталі фестывалі музычнага мастацтва – «Славянскі кірмаш» у Віцебску, «Залаты шлягер» у Магілёве, фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, фестываль духоўнай музыкі «Магутны божа» у Магілёве і інш. Па выніках 2000 г. Міжнародная федэрацыя арганізатараў фестываляў прызнала (з 188 прэтэндэнтаў) Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі кірмаш» у Віцебску лепшым.

Інтэнсіфікацыя ўсіх напрамкаў мастацкай творчасці ва ўмовах самастойнага развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь дазволіла маладым музыкантам актыўней удзельнічаць у розных міжнародных конкурсах. Многія з іх сталі лаўрэатамі і дыпламантамі такіх конкурсаў па класе фартэпіяна, віяланчэлі, скрыпкі і іншых музычных інструментаў. Толькі ў 2002 г. лаўрэатамі розных міжнародных конкурсаў сталі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі піяністы К. Красніцкі, А. Паначоўны, баяніст А. Шувалаў.

Адметнай з'явай у развіцці беларускага музычнага мастацтва стала заваёва ў 2005 г. Ксеніяй Сітнік першага месца на дзіцячым конкурсе "Еўрабачанне". Яе поспех годна прадоўжылі Андрэй Кунец (2-е месца, 2006 г.), Аляксей Жыгалковіч (1-е месца, 2007 г.) і іншыя. У мэтах падтрымкі таленавітых дзеячаў мастацтва лепшым выканаўцам і арганізатарам сталі ўручацца прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2003 г. яе лаўрэатамі сталі 16 дзеячаў культуры і мастацтва і 5 творчых калектываў.

Сярод асноўных напрамкаў развіцця беларускага жывапісу канца XX–пачатку XXI стст., як і раней, вызначаецца рэалістычная тэндэнцыя, прадстаўленая палотнамі мастакоў М. Данцыга, Л. Шча-

мялёва, М. Савіцкага, У. Грамыка. Але ў той жа час у мастацтве ўзмацніўся ўплыў мадэрна, дэкаданса, сюррэалізма. Адкрыліся недзяржаўныя галерэі сучаснага мастацтва, з'явіліся новыя творчыя аб'яднанні. Нефармальны ўплыў адчуваецца ў карцінах мастакоў М. Селяшчука, Г. Скрыпнічэнка, В. Альшэўскага, У. Тоўсціка і іншых. У сучасным выяўленчым мастацтве Беларусі выяўляюцца таксама творчыя шуканні і ў новых кірунках: трансавангарда, постмадэрнізму, "метафізічнага", "псіхалагічнага" жывапісу і інш. Выклікае цікавасць няпростае для ўспрыймання эпатажнае мастацтва групы мастакоў-сімвалістаў, якія назвалі свой нефармальны саюз "Магія круга" (У. Герасімаў, А. Савіч, У. Савіч, Ю. Хілько). З пералічанымі сучаснымі мастацкімі кірункамі ўжываюцца ўстойлівыя плыні неатрадыцыяналізму і творчага традыцыяналізму. У жывапісе працягваюць культывацца стылістычныя прыёмы і формы неапрымітывізму або "наіўнага мастацтва" (народнага сялянскага мастацтва, гарадскога выяўленчага фальклору, дзіцячай творчасці і г.д.).

У розных жанрах жывапісу новыя цікавыя працы напісалі А. Кузьміч, А. Марачкін, Ф. Янушкевіч, Г. Вашчанка, А. Кішчанка, Г. Паплаўскі, З. Літвінава, В. Шкаруба і іншыя вядомыя мастакі. Так, любімым вобразам карцін А. Кузьміча сталі мадонны. Чарнобыльскай катастрофе, людскому гору прысвяціў сваю новую серыю карцін (усяго іх 10) пад агульнай назвай "Чорны боль" акадэмік жывапісу М. Савіцкі. У 1991–2001 гг. ён завяршыў другі цыкл работ “Запаветы блажэнства”.

Новым ў беларускім мастацтве апошніх гадоў стала ўзмацненне гістарычнай тэмы, зварот да беларускага фальклору. Гэта характэрна для палотнаў А. Марачкіна, Ф. Янушкевіча, Г. Вашчанкі. Значнай падзеяй у мастацкім жыцці Беларусі сталі пленэры, у прыватнасці, прысвечаныя М. Шагалу, Я. Драздовічу, В. Бялыніцкаму-Бірулі.

Гэтая ж тэма пераважае і ў творах манументальнага мастацтва. За апошнія дзесяцігоддзі ўстаноўлены помнікі К. Тураўскаму ў Тураве і Гомелі, Ф. Скарыне ў Мінску, Празе Лідзе, Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, Е. Полацкай у Полацку, Мінску і Рэчыцы, С. Полацкаму і Ўсяславу Чарадзею ў Полацку, Я. Драздовічу, В. Ваньковічу і М. Гарэцкаму ў Мінску, Ф. Багушэвічу ў Смаргоні, А. Багдановічу ў Халопенічах, А. Міцкевічу ў Навагрудку, Мінску, Н. Ордзе ў г. Іва-

нава, Я. Чачоту ў в. Новая Мыш, М. Шагалу ў Віцебску і інш. Новым стала таксама ўзвядзенне помнікаў князям, якія далі імя таму ці іншаму гораду, напрыклад, князю Давыду ў г. Давыд-Гарадку, князю Барысу ў Барысаве. Шматлікія плошчы і вуліцы беларускіх гарадоў упрыгожыў сваімі арыгінальнымі творамі скульптар Ў. Жбанаў. У цэлым жа беларуская мастацкая культура ў канцы XX–пачатку XXI стст. набыла пэўныя рысы рамантызму.

Сучасная беларуская архітэктура характарызуецца адраджэннем гістарычных і нацыянальных традыцый у спалучэнні з новымі матэрыяламі, архітэктурнымі ідэямі і будаўнічымі тэхналогіямі. У канцы 90-х гадоў XX і пачатку XXI стст. у рэспубліцы сур'ёзная ўвага надавалася рэканструкцыі, абнаўленню і добраўпарадкаванню невялікіх гарадоў і пасёлкаў, чаму ў некаторай ступені спрыялі іх юбілеі, а таксама правядзенне ў іх Дзён беларускай пісьменнасці, “Дажынак”. За апошнія гады непазнавальна змянілі сваё аблічча, наблізіліся да еўрапейскага ўзроўня Полацк, Заслаўль, Барысаў, Мазыр, Пінск, Шклоў, г.п. Мір, Пружаны, Кобрын, Ліда, Маладзечна, Глыбокае, Орша, Бабруйск, Быхаў і іншыя населеныя пункты. Рэстаўрацыі і рэканструкцыі падвергліся таксама старадаўнія сядзібы, мемарыялы, замкі, царкоўныя будынкі, шматлікія вуліцы і плошчы, паркі і скверы, медыцынскія і спартыўныя аб’екты. Сярод іх Нясвіжскі, Мірскі і Лідскі замкі, мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”, Курган славы, Мінская, Нясвіжская, Шклоўская, Магілёўская ратушы і іншыя аб'екты гісторыка-культурнага значэння. Пачалася рэстаўрацыя Быхаўскага замка, Косаўскага, Ружанскага і іншых палацаў, былі распрацаваны і зацверджаны дзяржаўныя праграмы аднаўлення замкаў і вытворчасці слуцкіх паясоў на бліжэйшыя гады. У 2013 г. 5425 аб'ектаў Беларусі мелі статус гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Да найбольш цікавых архітэктурных комплексаў, збудаваных за апошнія дзесяцігоддзі, можна аднесці будынкі Палаца Рэспублікі, аўтавакзала “Маскоўскі”, новага чыгуначнага вакзала, Мінск-арэны, веладрома, крытага футбольнага манежа і Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску, лядовыя спартыўныя палацы і іншыя пабудовы ў гарадах рэспублікі. У Беларусі з'явілася мноства сучасных будынкаў розных устаноў, банкаў, прадпрыемстваў. Пастуপова аднаўляюцца тэмпы жыллёвага будаўніцтва, пераважна за кошт грамадзян і долевых фондаў. Пры пабудове сучасных

будынкаў шырока ўжываюцца спецыяльнае шкло, новыя фарбы, прагрэсіўныя тэхналогіі.

Даволі складаны этап у сваім развіцці прайшло беларускае кіно. У апошнія гады на айчыннай кінастудыі быў створаны шэраг цікавых фільмаў, ў асноўным, гістарычнай тэматыкі. Сярод лепшых фільмаў апошніх гадоў варта назваць "У жніўні 1944-га" (рэж. М. Пташук), "Двое на выспе слёз" (рэж. В. Дашук), "Шляхціч Завальня" (рэж. В. Тураў), "Анастасія Слуцкая" (рэж. Ю. Елхаў) і інш. Айчынныя кінастужкі надаюць сур'ёзную ўвагу экалагічным праблемам, перыпетыям беларускай гісторыі, "меладрамам сучаснасці". Паспяхова развіваецца дакументальнае і анімацыйнае кіно. У жанры гістарычнай меладрамы У. Арловым упершыню быў зняты самы доўгі тэлесерыял (33 серыі) "Праклятая ўтульная хата". З 1993 г. у Мінску праводзіцца міжнародны кінафестываль «Лістапад». З 1997 г. беларускія кінематаграфісты праводзяць нацыянальны кінафестываль у Брэсце. У той жа час назіраецца значнае скарачэнне колькасці фільмаў, выпушчаных на кінастудыі «Беларусьфільм», каля 90% рэпертуара ў рэспубліканскім пракаце складаюць заакіянскія фільмы, якія, як правіла, адносяцца да кітчу (амерыканскія фільмы катэгорый Б і В).

Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, у Беларусі прымаюцца меры па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы культуры, хутчэйшаму развіццю яе прыярытэтных кірункаў, пашырэнню паслуг для насельніцтва ў сферы вольнага часу, актывізацыі творчай дзейнасці моладзі і г.д. Гэта дазволіла павялічыць лік музеяў, тэатраў, канцэртных залаў; выкупіць такія рарытэты, як кнігі "Вялікае мастацтва артылерыі" К. Семяновіча, Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., старажытныя гісторыка-геаграфічныя карты і іншыя каштоўнасці. Пашырыліся міжнародныя культурныя сувязі, узраслі сацыяльная значнасць культуры, яе роля ў жыцці грамадства. У розныя сферы культуры прыйшлі маладыя таленты, з'явіліся новыя арыгінальныя мастацкія творы, узрасла актыўнасць культур нацыянальных меншасцяў, паглыбіліся культурныя сувязі з Расіяй. Шырока былі адзначаны 600-годдзе Грунвальдскай бітвы, 200-годдзе Айчыннай вайны 1812 г., 60-годдзе і 65-годдзе Перамогі над нацызмам і іншыя даты нашай гісторыі. У дні святкавання гэтых юбілеяў адбыліся шматлікія сустрэчы ветэранаў, дзеячаў культуры, рыцарскія баі, святочныя вечарыны, розныя выстаўкі,

былі пабудаваны новыя і адноўлены некаторыя помнікі, якія па розным прычынам раней былі разбураны (напрыклад, героям Айчыннай вайны 1812 г. у Полацку і пад Вілейкай). Новай з’явай для Беларусі стала вызначэнне культурнай сталіцы Беларускай зямлі. У 2010 г. статус культурнай сталіцы атрымаў Полацк, у 2011 г. – Гомель, у 2012 г. – Нясвіж, у 2013 г. – Магілёў, у 2014 г.- Гродна. У 2013 г. горад Магілёў стаў і культурнай сталіцай краін СНД.

З іншага боку, у сферы культурнай дзейнасці назіраюцца і некаторыя адмоўныя тэндэнцыі: адбываецца зніжэнне капіталаўкладанняў у культуру, пераход яе ў значнай частцы на камерцыйную аснову, прыкметны адыход ад традыцыйных маральных і эстэтычных прынцыпаў; зачыняюцца некаторыя клубныя ўстановы, бібліятэкі (без адэкватнай замены, асабліва ў сельскай мясцовасці), памяншаецца лік калектываў мастацкай самадзейнасці і іх удзельнікаў. Нізкай застаецца зарплата працаўнікоў устаноў адукацыі і культуры, што стварае кадравую праблему. У апошнія гады звужаецца сфера ўжывання беларускай мовы, знізілась цікавасць да чытання кніг і інш.

Усё гэта дазваляе зрабіць вывад аб наяўнасці творчага спалучэння ў беларускай культуры нацыянальных традыцый і сучаснасці, дасягненні значных поспехаў і ў той жа час з'яўленні шэрагу новых праблем, звязаных са спецыфікай сучаснага этапа гістарычнага развіцця Беларусі.

## Важнейшыя даты гісторыі Беларусі

100–35 тыс. гг. да н.э З’яўленне першых людзей на тэрыторыі Беларусі

26–24 тыс. гг. да н.э. Верхнепалеалітычныя стаянкі першабытнага чалавека каля в. Юравічы Калінкавіцкага р-на і в. Бердыж Чачэрскага р-на

VI–VII стст. н.э. Славянскі этап засялення Беларусі

VIII–IX стст. н.э. Рассяленне на тэрыторыі Беларусі славянскіх плямён крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў

862 г. Полацк упершыню ўзгадваецца ў пісьмовых крыніцах

980 г. Княжэнне ў Полацку Рагвалода. Захоп Полацка ноўгарадскім князем Уладзімірам. Першае ўзгадванне аб г. Тураве.

988 г. Прыняцце хрысціянства ў Кіеве

992 г. Утварэнне Полацкай епархіі.

1003–1044 гг. Княжэнне ў Полацку Брачыслава Ізяславіча

1005 г. Утварэнне епархіі ў Тураве

1044–1101 гг. Княжэнне ў Полацку Усяслава Брачыславіча

50-я гг. XI ст. Будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора

1067 г. Першы ўспамін у “Аповесці часовых гадоў” аб Мінску ў сувязі з бітвай на Нямізе паміж полацкім князем Усяславам і кіеўскімі князямі Яраславічамі.

1101 г. Падзел Полаччыны на ўдзельныя княствы

1127 г. Падпарадкаванне Полацкага княства Кіеўскаму Мсціславам

1161 г. Стварэнне Лазарам Богшай крыжа Ефрасінні Полацкай

1202 г. Заснаваны ордэн мечаносцаў

1210, 1223 Дамовы Полацка з Рыгай і Смаленскам аб свабодным гандлі па р. Заходняя Дзвіна

1240-я гг. Заснаванне Вялікага

Княства Літоўскага
1240-я гг.–1263 г. Княжэнне Міндоўга ў Вялікім Княстве Літоўскім
1307 г. Уваходжанне ў Вялікае Княства Літоўскае Полацка
1323 г. Перанос сталіцы ВКЛ у Вільна
1348 г. Бітва на р. Стрэве
1363 г. Бітва на р. Сінія Воды
1368,1370,1372 гг. Паходы войск ВКЛ пад кіраўніцтвам Альгерда на Маскву
1385 г. Заключэнне Крэўскай уніі
1390 г. Атрыманне Бярэсцем Магдэбургскага права
1392 г. Востраўскае пагадненне
1392–1430 гг. Княжэнне Вітаўта ў Вялікім Княстве Літоўскім
1399 г. Бітва на р. Ворскле
1401 г. Віленска-Радамская ўнія
1410 г., 15 ліпеня Грунвальдская бітва
1413 г. Гарадзельская ўнія
1432–1436 г. Грамадзянская вайна ў Вялікім Княстве Літоўскім. Абвяшчэнне ў Полацку Вялікага Княства Рускага
1447 г. Прывілей князя Казіміра
1468 г. Судзебнік князя Казіміра
~ 1490 г. – 1551 г. Жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны
1492 г. Прывілей князя Аляксандра
1492–1494,1500–1503, 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг. Войны ВКЛ з Маскоўскім княствам
1500 г. Бітва на р. Ведрашы
1506 г. Разгром татар войскамі ВКЛ пад камандаваннем М. Глінскага пад Клецкам
1514 г., 8 верасня Бітва на р. Крапіўне
1517–1519 гг. Выданне Ф. Скарынам першых друкаваных кніг у Празе
1520 г. Утварэнне першай ў ВКЛ друкарні у Вільна

1529,1566,1588 гг. Прыняцце Статутаў ВКЛ
1557 г. Прыняцце “Уставы на валокі” (зямельная рэформа)
1558–1583 гг. Лівонская вайна
1562 г. Утварэнне друкарні ў г. Нясвіжы
1563 г. Заняцце Полацка рускімі войскамі
1553 г. - Заснаванне Брэсцкай друкарні
1565–1566 гг. Адміністратыўна-тэрытарыяльная і судзебная рэформы
1569 г.,1 ліпеня Заключэнне Люблінскай уніі. Утварэнне Рэчы Паспалітай
1569 г. Вызваленне Полацка войскамі С. Баторыя
1582 г. Ям-Запольскае перамір’е паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай
1596 г. Брэсцкая царкоўная ўнія
1600–1629 гг. Вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй
1609–1618 гг. Вайна Польшчы з Маскоўскай дзяржавай
1648–1651 гг. Антыфеадальная казацка-сялянская вайна
1654–1667 гг. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай
1655 г. Кейданская ўнія
1700–1721 гг. Паўночная вайна
1708 г., 9 кастрычніка Бітва пры Лясной
1740–1744 гг. Паўстанне ў Крычаўскім старостве
1767 г. Стварэнне Таруньскай і Слуцкай канфедэрацый
1768 г. Стварэнне Барскай канфедэрацыі
1772 г. Першы падзел Рэчы Паспалітай
1773 г. Стварэнне Адукацыйнай камісіі
1788–1792 гг. Рэформы Чатырохгадовага сейма
1791 г., 3 мая Прыняцце Канстытуцыі Рэчы Паспалітай
1792 г. Стварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі
1793 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай
1794 г. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі

1795 г. Трэці падзел Рэчы Паспалітай
1803 г. Адкрыццё Віленскага ўніверсітэта
1807–1884 гг. Жыццё і творчасць В.І. Дуніна-Марцінкевіча
1812 г. Вайна Расіі з Францыяй
1812 г.,1 ліпеня Стварэнне Часовага ўраду Вялікага Княства Літоўскага
1830–1831 гг. Паўстанне ў Польшчы, Беларусі, Літве
1831,1840 г. Адмена Статута ВКЛ ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, затым на астатняй тэрыторыі Беларусі
1832 г Закрыццё Віленскага ўніверсітэта
1839 г. Полацкі царкоўны сабор, ліквідацыя ўніяцкай царквы на Беларусі
1840–1857 гг. Правядзенне рэформы П.Д. Кісялёва ў дзяржаўных вёсках
1840–1900 гг. Жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча
1848 г. Стварэнне Горы-Горацкага земляробчага інстытута
1861 г., 19 лютага Адмена прыгоннага права
1862 г. Будаўніцтва першай чыгункі на тэрыторыі Беларусі
1863–1864 гг. Паўстанне ў Польшчы, Літве і Беларусі пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага
1864 г. Закрыццё Горы-Горацкага земляробчага інстытута
1862–1882 гг. Буржуазныя рэформы
1884 г. Стварэнне беларускімі студэнтамі-народнікамі групы “Гоман” у Санкт-Пецярбургу
1897 г. Утварэнне партыі БУНД
1898 г. Першы з’езд РСДРП у Мінску
1902 г. Стварэнне партыі эсэраў
1902–1903 гг. Стварэнне Беларускай Сацыялістычнай Грамады
1905–1907 гг. Першая расійская рэвалюцыя
1906–1913 гг. Выданне газет “Наша доля” і “Наша ніва”
1906–1915 гг. Сталыпінская аграрная рэформа

1907–1913 гг. Дзейнасць першай беларускай тэатральнай трупы І. Буйніцкага

1911 г. Увядзенне земстваў у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях

1914–1918 гг. Першая сусветная вайна

1917 г. Перамога лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі. Стварэнне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў

1917 г., 25–27 сакавіка З'езд беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый. Стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК)

1917 г.,ліпень Другі з'езд беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый. Стварэнне Беларускай цэнтральнай рады (БЦР)

1917 г, 25 кастрычніка Перамога ўзброенага паўстання ў Петраградзе

1917 г., 26 лістапада Стварэнне абласнога выканаўчага камітэта Савета Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) і СНК Заходняй вобласці

1917 г., снежань Першы Усебеларускі з'езд (кангрэс)

1918 г., 18 лютага Пачатак наступлення нямецкіх войск і акупацыі Цэнтральнай і Усходняй Беларусі

1918 г., 20–21 лютага Першая статутная грамата. Стварэнне Народнага сакратарыяту Беларусі

1918 г., 3 сакавіка Заключэнне Брэсцкага міру

1918 г., 9 сакавіка Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР)

1918 г.,25 сакавіка Абвяшчэнне незалежнасці БНР

1918 г.,снежань Вызваленне Беларусі ад нямецкіх акупантаў

1919 г., 1 студзеня Абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі

1919 г., 2–3 лютага Першы Усебеларускі з'езд Саветаў. Прыняцце першай Канстытуцыі ССРБ

1919–1920 гг. Польска-савецкая вайна

1919 г., люты Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР

1920 г., 10 снежня Заснаванне Беларускага палітэхнічнага інстытута

1921 г., 18 сакавіка Рыжскі мірны дагавор

1921 г., 21 сакавіка Дэкрэт аб замене харчразвёрсткі харчпадаткам

1921 г., 30 кастрычніка Утварэнне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

1921 г. Стварэнне першага Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра

1922 г. Адкрыццё ў Мінску Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт)

1922 г., 30 снежня Стварэнне СССР

1923 г., кастрычнік Стварэнне КПЗБ

1924 г., 7 сакавіка Першае ўзбуйненне БССР

1924 г. Пастанова другой сесіі ЦВК БССР аб правядзенні палітыкі беларусізацыі

1925–1927 гг. Дзейнасць у Заходняй Беларусі Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ)

1929 г., 1 студзеня Стварэнне Акадэміі навук БССР

1939 г., 1 верасня Пачатак Другой сусветнай вайны

1939 г., 17 верасня Пераход Чырвонай арміяй савецка-польскай мяжы. Пачатак уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР

1939 г., 28–30 кастрычніка Народны (Нацыянальны) сход у Беластоку абвясціў аб устанаўленні савецкай улады ў Заходняй Беларусі і ўваходжанні ў склад СССР

1939 г., 2 лістапада Нечарговая V сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз’яднанні з БССР

1941 г., 22 чэрвеня Пачатак Вялікай Айчыннай вайны

1941 г., 28 чэрвеня Акупацыя германскімі войскамі Мінска

1941 г., 3–26 ліпеня Абарона Магілёва

1942 г., 9 верасня Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху

1943 г., верасень Пачатак вызвалення Беларусі ад акупантаў

1944 г., 23 чэрвеня – 29 жніўня Беларуская наступальная аперацыя “Баграціён”

1944 г., 3 ліпеня Вызваленне г. Мінска

1945 г, чэрвень Беларусь удзельнічала ў заснаванні ААН

1948 г. Пачатак суцэльнай калектывізацыі ў Заходняй Беларусі

1958 г. Стварэнне Савета народнай гаспадаркі БССР

1965 г. Аднаўленне галіновага прынцыпа кіравання

1986 г., 26 красавіка Аварыя на Чарнобыльскай АЭС

1990 г., 26 студзеня Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь”

1990, 27 ліпеня Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР

1991 г., 25 жніўня Вярхоўны Савет БССР надаў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статус канстытуцыйнага закону

1991 г., 8 снежня “Белавежскае” пагадненне аб спыненні дзейнасці СССР і утварэнні СНД

1994 г., 15 сакавіка Прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

1994 г., 10 ліпеня Выбары першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1995 г., 14 мая Рэспубліканскі рэферэндум

1996 г., красавік Падпісанне Дагавора аб стварэнні Садружнасці Беларусі і Расіі

1996 г.,19–20 кастрычніка Першы Усебеларускі народны сход

1996 г., 24 лістапада Рэспубліканскі рэферэндум

1997 г., 2 красавіка Падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі

2001 г., 18 мая, Другі Усебеларускі народны сход

2001 г., 9 верасня Выбранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка на другі прэзідэнцкі тэрмін

2004 г., 17 кастрычніка На рэспубліканскім рэферэндуме ўнесены змены ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь

2006 г., 2–3 сакавіка Трэці Усебеларускі народны сход

2006 г., 19 сакавіка Выбранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка на трэці прэзідэнцкі тэрмін

2010 г., 6-7 снежня Чацвёрты Усебеларускі народны сход

2010 г., 19 снежня. Выбранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка на чацвёрты прэзідэнцкі тэрмін

2013 г. Пачатак будаўніцтва Беларускай атамнай станцыі ў Астраўцы

Кароткі тэрміналагічны слоўнік

**Арыянства** – плынь у хрысціянстве, прыхільнікі якой адмаўлялі роўнасць Хрыста з Богам-бацькам

**Валока** – мера зямлі, роўная 33 моргам (21, 36 га)

**Вальны сейм** – агульнадзяржаўны

**Веча** – народны сход у гарадах старажытнай Беларусі, які з’яўляўся органам дзяржаўнай улады

**Водруб** – гаспадарка, у якой зямля знаходзіцца за межамі вёскі, а хатнія пабудовы – у вёсцы

**Гетман** – кіраўнік узброеных сіл

**Дыяспара** – частка народа, якая жыве за межамі маці-краіны

**Езуіты** – члены каталіцкага манаскага ордэна, створанага для барацьбы з рэфармацыяй, умацавання каталіцызму і ўлады папства

**Епархія** – царкоўна-адміністрацыйная адзінка ў праваслаўнай, каталіцкай і англіканскай цэрквах

**Закупы** – сяляне-смерды, якія часткова страцілі сваю асабістую свабоду

**Ізгоі** – людзі, якія страцілі сувязь з абшчынай

**Калабарацыяналізм** – супрацоўніцтва часткі насельніцтва з фашысцкім рэжымам

**Кальвінізм** – адна з плыняў пратэстанцызму

**Камасацыя** – хутарызацыя сялянскіх гаспадарак у Заходняй Беларусі

**Канцлер** – кіраўнік дзяржаўнай канцылярыі ў ВКЛ

**Канфесія** – рэлігійнае аб’яднанне, якое мае сваё веравучэнне, культ і арганізацыю

**Лютэранства** – адзін з асноўных кірункаў пратэстанцызму

**Магістрат** – гарадская адміністрацыя ў часы ВКЛ

**Морг** – мера зямлі, роўная 0,71 га

**Непахожыя** – сяляне, якія страцілі права на пераход з аднаго маёнтка ў другі

**Парцэляцыя** – продаж часткі памешчыцкіх і дзяржаўных зямель у Польшчы

**Пахожыя** – сяляне, якія мелі фармальнае права пераходзіць з аднаго маёнтка ў другі

**Праваслаўе** – адзін з кірункаў у хрысціянстве

**Скрыпторыі** – майстэрні па перапісцы кніг

**Смерд** – свабодны селянін – абшчыннік

**Халоп** – цалкам залежны чалавек

**Хутар** – гаспадарка, у якой зямля, дом і гаспадарчыя пабудовы знаходзяцца за межамі вёскі

**Чынш** – грашовы аброк

**Этнагенэз** – працэс фарміравання этнасаў, народаў, нацый

# Літаратура

## Асноўная

1. Лукашенко А.Г. Исторический выбор Беларуси: Лекция Президента Республики Беларусь в Белорусском государственном университете. Минск, 14 марта 2003 г. – Минск, 2003.

2. Беларусазнаўства: навучальны дапаможнік / П. Брыгадзін [і інш.]; пад рэд. П. Брыгадзіна. – Мінск: Завигар, 1997. – 288 с.

3. Бохан, Ю.Н. История Беларуси в контексте мировых цивилизаций: пособие для студентов / Ю.Н. Бохан, Г.П. Бущик, В.И. Голубович; под ред. Н.И. Полетаевой, Ю.Н. Бохана. – Минск: Экаперспектыва, 2012. – 155 с.

4. Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций / П.И. Бригадин. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2007. – 332 с.

5. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. Пособие / Под ред. А.А.Ковалени, Н.С.Сташкевича. – Минск: 2004.

6. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэбны дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акад. МУС РБ, 2003. – 319 с.

7. Гісторыя Беларусі: падручнік: у 2 ч. – Ч.1: Ад старажытных часоў па люты 1917 г. / Я.К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд. – Мінск: Універсітэцкае, 2006. – 448 с.

8. Гісторыя Беларусі: падручнік: у 2 ч. – Ч. 2: Люты 1917 г. – 2004 г. / Я.К.Новік [і інш.]; пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд. – Мінск: Універсітэцкае, 2006. – 463 с.

9. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 6.

10. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: дапаможнік / У.А. Сосна [і інш.]; пад рэд. Л.В.Лойкі. – Мінск: РІВШ, 2005. – 332 с.

11. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачаткуXXI стст.: у 2 кн. – Кн. 1. / А.А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 583 с.

12. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII–пачатку XXI стст.: у 2 кн. – Кн. 2. / М.У. Смяховіч [і інш.]; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 652 с.

13. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии. – Минск: 2003.

14. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX-XIII стст.: Вучэбны дапаможнік для гістарычных факультэтаў ВНУ, / Э.М.Загарульскі.- Мн.: Універсітэцкае, 1998. 240 с.

15. История Беларуси: полный курс: учебное пособие для студентов неисторических специальностей ВУЗов / Ю.Л. Козаков [и др.]. – Минск: Юнипресс, 2010. – 507 с.

16. История Беларуси в контексте мировых цивилизаций: учебное пособие / В.И.Голубович [и др.]; под ред. В.И. Голубовича, Ю.М. Бохана. – Минск: Экаперспектыва, 2008. – 446 с.

17. История Беларуси: пособие для студентов экономических специальностей / авт.-сост. А.Н. Аксенович [и др.]. – Гомель: Белорусский торгово-экономический ун-т потреб. кооперации, 2011. – 155 с.

18. История Беларуси: учеб. пособие для студентов, обеспечивающих получение высш. образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – 310 с.

19. Качаноўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя: вучэбны дапаможнік / А.Г. Качаноўскі [і інш.]. – Мінск БДУ, 2008. – 311 с.

20. Качаноўскі, У.У. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік /У.У.Качаноўскі. – Мінск: Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

21. Ковкель, И.И История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Минск: Аверсэв, 2000. – 592 с.

22. Котов, А.И. История Беларуси и мировые цивилизации / А.И. Котов. – 9-е изд. – Минск: Энцыклапедыкс, 2012. – 235 с.

23. Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага/ А.К.Краўцэвіч.-Жэшаў: 2000.- 238 с.

24. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: Экаперспектыва, 1996.– 510 с.

25. Народная культура Беларусі. Энцыклап. Даведнік./ Мінск: Белар. энцыклапедыя, 2002.- 432 с.

26. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времен до 2012 г. / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 3-е изд.– Минск: Вышэйшая школа, 2012. – 542 с.

27. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мінск: Современная школа, 2009. – 454 с.

28. Трещенок, Я.И. История Беларуси. – Ч.1: Досоветский период / Я.И. Трещенок. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2003. – 176 с.

29. Хрестоматия по истории Беларуси: учебное пособие:в 2 ч. – Ч. 1: С древнейших времен до 1917 г. / сост.: Я.И. Трещенок [и др.]. – Минск: БГУ, 2008. –623 с.

30. Чесновский, М.Э. История внешней политики Беларуси. / М.Э.Чесновский. Историко-методическое пособие. - Минск: 2003.

31. Чигринов, П.Г. Белорусская история: научно-популярный очерк / П.Г. Чигринов. – Минск: Современная школа, 2010. – 928 с.

32. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч [і інш.]; пад рэд. В.І. Галубовіча. – 3-е выд., дап. і перапрац. – Мінск: Экаперспектыва, 1999. – 446 с.

33. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс дзяржавы і права Беларусі: вучэбны дапаможнік / Я.А.Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.

## Дадатковая

1. Баргдановіч, А.І. Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі (1861–1900 гг.) / А.І. Багдановіч. – Мінск: БНТУ, 2012. – 153 с.

2. Беларусь в интеграционных проектах / А.К. Акулик [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2011. – 322 с.

3. Беларусь советская: материалы «круглого стола» / БНТУ; редкол.: В.А. Божанов (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БНТУ, 2012. – 150 с.

4. Бущик, В.В. Человек и общество в условиях социально-политических преобразований / В.В. Бущик. – Минск, 1999. – 263 с.

5. Дзмітрачкоў, П.Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага другой паловы XIII - першая палова XVII стст.: Вучэбны дапаможнік для гістарычных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў / П.Ф.Дзмітрачкоў. Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2003. - 312 с.

6. Дук, Д.У. Полацк XVI-XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У.Дук. –Наваполацк: ПДУ, 2007. - 267 с.

7. Зялінскі, П.І. Гісторыя Беларусі (1917–1945): дапаможнік / П.І. Зялінскі, У.К.Коршук, У.Ф.Ладысеў. – Мінск: БДУ, 2012. – 271 с.

8. История белорусской государственности / В.А. Божанов [и др.]. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2002. – 194 с.

9. Кириенко, В.В. Белорусская ментальность: истоки, современность, перспективы / В.В. Кириенко. – Гомель: ГГТУ им. П.О. Сухого, 2009. – 319 с.

10. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск: РИВШ, 2011. – 352 с.

11. Консолидация белорусского народа во второй половине XIX – XXI вв.: материалы Республиканской научно-теор. конф., 5 декабря 2012 г. / БНТУ; под ред. В.А. Божанова [и др.]. – Минск: БНТУ, 2012. – 204 с.

11. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и добавлениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2010. – 48 с.

12. Кукса, А.Н. Советская модель государственности в истории Беларуси и Украины в 1919–1922 гг. / А.Н Кукса. – Минск: БНТУ, 2012. – 351 с.

13.Марзалюк, И.А. Магілёў у XII-XVIII стст. Людзі і рэчы. / І.А. Марзалюк. – Мн.: Веды, 1998. – 258 с.

14. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гісторыяграфічныя здабыткіі праблемы / В.В. Яноўская [іінш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 311 с.

15. О государственном суверенитете БССР // Советская Белоруссия. – 29 июля 1990.

16. Парламентаризм в Беларуси / В.А. Божанов [и др.]. – Минск: Иппокрена, 2010. – 232 с.

17. Современные глобальные трансформации и проблемы исторического самоопределения восточнославянских народов / под ред. Ч.С. Карвеля. – 3-е изд., перераб. и доп. – Минск: Четыре четверти, 2010. – 548 с.

18. Становление и развитие белорусской государственности / А.Г. Кохановский [и др.]. – Минск: БГУ, 2011. – 44 с.

19. Философия и идеология жизнедеятельности Беларуси: теоретические основы антикризисной модели и механизмы ее реализации / П.Г. Никитенко [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2009. – 621 с.

20. Хрестоматия по истории Беларуси: учебное пособие для студентов высших учебных заведений: в 2 ч. – Ч. 1. С древнейших времен до 1917 г. (сост. Я.И. Трещенок [и др.]; под ред. К.М. Бондаренко. – Минск: издательский центр БГУ, 2008. – 622 с.

21. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2003. – Т. 6.

ЗМЕСТ

Да чытача………………………………………………………………3
Тэма 1. Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі” ......................................................................4
1.1. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі. Перыядызацыя гісторыі Беларусі ...........4
1.2. Крыніцы і гістарыяграфія ..............................................8
Тэма 2. Фарміраванне беларускага этнасу (VI ст. – пачатак XX ст.)……………………………………………14
2.1. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель. Славянскі этап засялення Беларусі. .............14
2.2. Фарміраванне беларускага этнасу ў XIV – XVIII стст……………………………………………..22
2.3. Далейшае развіццё беларускага этнасу ва ўмовах складвання рынкавых адносін у XIX ст.......................................27
2.4. Духоўная і матэрыяльная культура жыхароў беларускіх зямель у IX – XIX стст. ..............................................30
Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст. ...............................................................................49
3.1. Зараджэнне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Полацкае і Тураўскае княствы, іх узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам ...............................................................................49
3.2. Утварэнне і развіццё Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (другая палова XIII – першая палова XVI стст.).......................................................................................56
3.3. Цывілізацыйныя працэсы Новага часу. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – XVIII стст.)......71
Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.) ........................81
4.1. Пачатак індустрыяльнай цывілізацыі. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пасля ўваходжання ў склад Расійскай дзяржавы ......................................................81
4.2. Палітыка расійскай улады ў беларускіх землях у першай палове XIX ст. ..........................................................89

4.3. Вайна 1812 г. і Беларусь. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX стст. ............................ 91
4.4. Адмена прыгоннага права і буржуазныя рэформы другой паловы XIX – пачатку XX стст. Асаблівасці іх правядзення ў Беларусі ............................ 99
4.5. Першая сусветная вайна і Беларусь. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі ............................ 104
Тэма 5. Фарміраванне і ўмацаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917 – 1941 гг.) ... 107
5.1. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці ............................ 107
5.2. Асаблівасці пераходу БССР да мірнага жыцця. Новая эканамічная палітыка. Правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі ............................ 119
5.3. Культурнае развіццё Беларусі ў 1917–1941 гг. ............................ 127
Тэма 6. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы ............................ 136
6.1. Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель у 1920-я – 1930-я гг. ............................ 136
6.2. Грамадска-палітычны рух ў Заходняй Беларусі. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР ............................ 138
6.3. Культура Заходняй Беларусі ў 1920-я – 1930-я гг. .... 141
Тэма 7. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн ............................ 145
7.1. Міжнародныя адносіны напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны ............................ 145
7.2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі ............................ 147
7.3. Акупацыйны рэжым. Партызанскі і падпольны рух ............................ 151
7.4. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Завяршэнне Другой сусветнай вайны ............................ 154
Тэма 8. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (1945–1991 гг.) ............................ 159
8.1. Міжнародныя адносіны пасля Другой сусветнай вайны. БССР на міжнароднай арэне ............................ 159

8.2. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі Беларусі. Грамадска-палітычнае жыццё і спробы рэфармавання эканомікі ў 1950–1960-я гг. ........................................................ 163
8.3. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё Беларусі ў 1960–1980-я гг. ........................................................ 169
8.4. Культура Беларусі ў 1945–1980-х гг. ........................ 175
Тэма 9. Суверэнная Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст. ........................................................ 181
9.1. Распад СССР і абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь ........................................................ 181
9.2. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі на сучасным этапе ........................................................ 183
9.3. Культура Беларусі на сучасным этапе ........................ 188
Важнейшыя даты гісторыі Беларусі ........................................ 200
Кароткі тэрміналагічны слоўнік ........................................ 207
Літаратура ........................................................ 209

Вучэбнае выданне

**БАЛАНДЗІН** Канстанцін Іванавіч
**ХРОМЧАНКА** Дзмітрый Мікалаевіч

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Дапаможнік
для студэнтаў спецыяльнасцей тэхнічнага
і тэхналагічнага профіляў адукацыі

Тэхнічны рэдактар *А.У. Песенька*
Камп'ютарная вёрстка *Д.А. Ісаева*

Падпісана да друку 19.02.2015. Фармат $60\times84^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 12,61. Улік.-выд. арк. 9,86. Тыраж 500. Заказ 430.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/173 ад 12.02.2014. Пр. Незалежнасці, 65. 220013, г. Мінск.